Сямён ШАРЭЦКІ

# АБАРОНІМ
# НАШ ДОМ - БЕЛАРУСЬ

Артыкулы, даклады,
заявы

KAMUNIKAT.org

ВІЛЬНЮС 2000

***Прысвячаю***
***ахвярам, загінуўшым***
***у барацьбе за Незалежнасць***
***нашай Радзімы***

KAMUNIKAT.org

**Сямён Шарэцкі**
Старшыня Вярхоўнага Савета
Рэспублікі Беларусь
Акадэмік ААН, доктар эканамічных навук, прафесар

**Абаронім наш дом - Беларусь.** Выдавецтва ULA. Вільня. 2000 год.
1000 экз.

У кнізе сабраны артыкулы, даклады і заявы за 1997-2000 гады, якія сведчаць аб змаганні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і іншых апазійных дыктатарскаму рэжыму А. Лукашэнкі за абарону незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, а таксама вяртанню яе на дэмакратычны шлях развіцця.

***Адстаім мы сваю Незалежнасць!***
***Беларусь абаронім, бы родную матку!***
***Адбудуем яе, як належыць,***
***Для сябе і для нашых нашчадкаў!***

KAMUNIKAT.org

## ЗАМЕСТ УВОДЗІН

# МЫ МАЕМ МАРАЛЬНАЕ ПРАВА ПРАМА ГЛЯДЗЕЦЬ У ВОЧЫ СВАІМ СУАЙЧЫННІКАМ

**Выступ на сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь**

Паважаныя калегі і прысутныя на нашым паседжанні!

Прайшоўшы месяц пасля апошняга паседжання быў часам далейшага паглыблення крызісных з`яў у грамадстве, што яшчэ ў большай ступені высвятліла няздольнасць сучаснага рэжыма ўлады вывесці краіну з тупіку.

Няздольнасць да кіравання дзяржавай прыводзіць да крызісу самога рэжыму кіравання, што назіраецца ў частых зменах міністраў.

Давайце ўдумаемся: за два з паловай гады ўжо трэці старшыня Нацыянальнага банку, змяніўся віцэ-прэм`ёр, які вядзе пытанні эканомікі, міністр прамысловасці, міністр фінансаў. Ужо трэці міністр абароны. На працягу больш двух месяцаў няма Старшыні Савета Міністраў. За гэты час два разы мянялася назва самога ўраду: ад Савета Міністраў перайшлі да Кабінету Міністраў, цяпер зноў вярнуліся да Савета Міністраў. Замена шыльдаў, мабыць, адзіны рэальны вынік работы ўраду. Усё гэта толькі паралізуе працу кадраў. На працягу значнага часу спецыялісты знаходзяцца ў стане няўпэўненасці і чакання.

Кадравы ператрус, а значыць, і нярвознасць ахапіла і Адміністрацыю Прэзідэнта. Усё гэта сведчыць аб бяздарнай кадравай палітыцы А. Лукашэнкі, яго арыентацыі пры падборы кадраў на асабістую адданасць і пакорлівасць, а не на прафесіяналізм.

У краіне, па сутнасці, паралізавана і дзейнасць парламента, а гэта значыць, што грамадства пачынае жыць у стане беззаконня і самавольства. Выканаўчая ўлада выйшла з-пад кантролю заканадаўчага органа і грамадства ў цэлым, бо кіраўнікі выканаўчай улады на ўзроўні абласцей і раёнаў не абіраюцца, як гэта робіцца ў цывілізаваных краінах, а прызначаюцца адным чалавекам.

Размываецца падзел функцый выканаўчых органаў па вертыкалі, што ў сваю чаргу стварае безадказнасць кадраў. І гэта адна з прычын таго, што прэзідэнт ад ператрусу міністраў і кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў ужо апусціўся да выканання функцый кураратара Камароўскага рынку. Базарныя метады кіравання А. Лукашэнкі распаўсюджваюцца не толькі на Камароўку, але і на ўсю дзяржаву ў цэлым.

Спроба падмяніць законна абраны Вярхоўны Савет нейкай Палатай, акрамя смеху, нічога не выклікае. Што ж гэта за “Палата”, што яе насельнікі не могуць самі, без ціцянкоўскіх апекуноў купіць нават гэткія неабходныя рэчы, як медыцынскія аптэчкі і …сашчэпкі? Аб узроўні працы “Палаты” сведчыць і той факт, што нядаўна сотня дэпутатаў з прыдворнай “палаты” каля гадзіны рашала пытанне аб выдзяленні сабе блакнотаў. І дэбаты былі гарачымі!

Як паказвае сусветная практыка, дыктатарскія рэжымы ў любой краіне не могуць існаваць у яе межах: яны задыхаюцца ў сваіх сацыяльных памыях, якія выкідваюць штодзённа і нават штогадзінна. Не выключэнне і рэжым Лукашэнкі. Дамаганні і спробы стварэння нейкай славянскай дзяржавы - гэта не што іншае, як

імкненне А. Лукашэнкі пашырыць зону свайго ўплыву ва ўмовах малой дзяржавы і разбуранай эканомікі. І я не разумею, чаму асобныя дзеячы Расейскай Федэрацыі паддаліся на гэтую вудачку. Расея - гэта шматнацыянальная дзяржава. І насаджэнне тэорыі славянізму з адзяржаўленнем адной (праваслаўнай) рэлігіі ў гэтай краіне - гэта міна замаруджанага дзеяння. Названая тэорыя шкодная нават у Беларусі. Справа ў тым, што ў нас вельмі шмат рэлігійных канфесій і ўсе яны маюць права на існаванне. У Беларусі пражывае, акрама славянскага насельніцтва больш ста тысяч габрэяў, ёсць татары і людзі іншых, неславянскіх нацыянальнасцяў. І дзяржава павінна ствараць гэткія ўмовы, каб усе яе грамадзяне, незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання, лічылі Беларусь сваім родным домам.

Здзейснены ў рэспубліцы дзяржаўны пераварот і ўзмацненне дыктатарскага рэжыму прывялі да далейшай ізаляцыі яе на міжнароднай арэне.

АБСЕ нават у Чачню, дзе нядаўна ішла вайна, пасылала сваіх наглядальнікаў на выбары, якія прызналі выбары прэзідэнта гэтай рэспублікі легітымнымі. А ў нашай рэспубліцы, як неаднароова адзначалася, у тым ліку і ў друку, ужо ў час падрыхтоўкі да правядзення рэферэндума і галасавання было здзейснена столькі грубых парушэнняў, што названая аўтарытэтная міжнародная арганізацыя палічыла немагчымым мець дачыненне да такога самавольства.

Больш таго, па прычыне праводзімай сучасным рэжымам унутранай і міжнароднай бяздарнай палітыкі ўжо не толькі краіна апынулася ў міжнароднай ізаляцыі, але і кіраўніцтва яе стала аб`ектам насмешак. Той, хто глядзеў у апошнюю дні праграмы расейскага тэлебачання, у прыватнасці, (“Люстэрка”, “Момант ісціны”, выступ адэскіх “Джэнтэльменаў” і Хазанава) не мог не адчуць крыўды і болю за сваю краіну і наш народ, які па праву ганарыўся гэткімі кіраўнікамі, як Кірыл Трафімавіч Мазураў і Пётр Міронавіч Машэраў, Сяргей Осіпавіч Прытыцкі і Ціхан Якаўлевіч Кісялёў.

Паважаныя калегі і прысутныя на нашым паседжанні!

Склаўшаеся становішча ў рэспубліцы Беларусь накладае на нас адказнасць за яе будучыню, за лёс нашых дзяцей і ўнукаў. Кіруючыся гэтым, Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь працаваў у мінулым перыядзе над вырашэннем задач як у галіне ўнутранай, так і ў галіне міжнароднай палітыкі. За гэты час быў вырашаны шэраг арганізацыйных пытанняў, менавіта: скончана фармаванне камісій пры Прэзідыуме Вярхоўнагаг Савета і прызначаны іх старшыні, а ў некаторых камісіях - і намеснікі старшынь.

У сучасны момант пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета створаны наступныя камісіі: Камісія па міжнародных справах (старшыня - П. К. Краўчанка, намеснік старшыні - А. У. Лябедзька); Камісія па правах чалавека (старшыня - М. І. Грыб); Камісія па навуцы і асвеце (старшыня - В. К. Хоміч); Камісія па сацыяльнай абароне насельніцтва (старшыня А. М. Скрыган); Камісія па сродках масавай інфармацыі (старшыня У. П. Нісцюк); Камісія па эканамічнай рэформе і палітыцы (старшыня - В. М. Шлындзікаў, намеснік - Л. М. Гразнова); Камісія па пытаннях развіцця аграпрамысловага комплексу (старшыня - Г. А. Усюкевіч, намеснік - М. К. Грушэўскі); Камісія па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву ( старшыня - У. М. Савічаў, намеснік - Р. П. Пракаповіч).

Для прыцягвання да працы, акрамя дэпутатаў Вярхоўнага Савета, больш шырокага кола навукоўцаў і спецыялістаў Прэзідыум Вярхоўнага Савета лічыць

неабходным і выносіць на ваш разгляд стварэнне побач з названымі Камісіямі Нацыянальных саветаў як грамадскіх фармаванняў, якія ахоплівалі б аналізуемую праблему больш глыбока і маштабна. Прапануецца мець чатыры гэткіх Нацыянальных саветы: Нацыянальна-эканамічны савет (кіраўнік - намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Г. Д. Карпенка), Нацыянальны савет па праблемах духоўнай культуры і сацыяльных адносін (кіраўнік - першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета В. М. Новікаў), Нацыянальны савет па міжнародных адносінах (кіраўнік - старшыня Камісіі па міжнародных справах пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета П. К. Краўчанка), Нацыянальны савет па прававых пытаннях (кіраўнік - старшыня Камісіі па правах чалавека пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета М. І. Грыб). Нацыянальныя саветы ў сваім складзе будуць мець некалькі камітэтаў, якія павінны займацца больш вузкімі праблемамі.

Як ужо паведамлялася ў друку, Нацыянальна-эканамічны савет пачаў сваю працу. У склад яго, акрамя дэпутатаў Вярхоўнага Савета, увайшлі член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі І. М. Нікітчанка, кандыдат тэхнічных навук У. М. Заблоцкі, вядомы дыпламат А. А. Саннікаў і іншыя. Створаны Нацыянальны савет па праблемах духоўнай культуры і сацыяльных адносін. У яго працы прымаюць удзел гэткія вядомыя навукоўцы, як Ю. В. Хадыка, М. П. Касцюк, народныя пісьменнікі В. У. Быкаў і Н. С. Гілевіч, паэт, дыпламат і грамадскі дзеяч Г. М. Бураўкін. У Нацыянальным савеце па прававых пытаннях і правах чалавека будзе працаваць доктар юрыдычных навук, прафесар М. І. Пастухоў.

Патрэбна паскорыць стварэнне і двух іншых Нацыянальных саветаў. З цягам часу, пры адпаведных напрацоўках і ўмовах, на базе названых Нацыянальных саветаў можна будзе сфармаваць урад рэспублікі, а ўжо якім ён будзе - ценявым ці дзеючым - пакажа час.

За мінулы месяц шмат увагі надавалася міжнародным пытанням. А. П. Краўчанка і Ю. Г. Малумаў прымалі ўдзел у паседжанні пастаяннага Камітэту Савета Еўропы. Старшыня Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы Лені Фішэр зрабіла заключэнне, што “новая Канстытуцыя Беларусі незаконная і не адпавядае мінімальным дэмакратычным стандартам, парушае прынцыпы прававой дзяржавы і падзелу ўладаў”, на падставе чаго і было прынята рашэнне гэтай арганізацыяй аб часовым прыпыненні статуса Беларусі як спецыяльна запрошанай на сесіі.

Шукаць прычыну здарыўшагася трэба не ў намаганнях былых кіраўнікоў Вярхоўнага Савета, як аб гэтым пісала Савецкая Беларусь, а ў дзеяннях прэзідэнта, яго блізкага ачольвання.

Аб легітымнасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь сведчаць падзеі, якія адбыліся 16-17 студзеня 1997 года ў Вене на паседжанні пастаяннага камітэта Парламенцкай Асамблеі АБСЕ. Дэлегацыя Вярхоўнага Савета 13 склікання на чале з П. Краўчанкам была прызнана ў якасці прадстаўніка законнага парламенцкага органа. Важна, што больш пяцідзесяці дзяржаў, якія прадстаўлялі тры кантыненты - Еўропу, Азію і Паўночную Амерыку, падцвердзілі статус Вярхоўнага Савета.

Атрымаўшы міжнароднае прызнанне, Прэзідыум Вярхоўнага Савета пачаў прадпрымаць намаганні па актывізацыі працы ў межах супольнасці Беларусі і Расеі, а таксама СНД. Падрыхтаваны і сёння-заўтра будуць накіраваны кіраўнікам парламентаў гэтых краін лісты з дадаткам парушэнняў у час падрыхтоўкі і правядзення так званага рэферэндуму ў Рэспубліцы Беларусь.

За мінулы месяц дэпутаты Вярхоўнага Савета прыклалі нямала намаганняў для прарыву інфармацыйнай блакады. Некаторыя недаацэньваюць гэты накірунак працы. А між тым, мы павінны максімальна выкарыстаць магчымасці апазіцыйнай прэсы для асвятлення дзейнасці Вярхоўнага Савета. Чым больш будзе лгаць лукашэнкаўская прэса, тым большую цікавасць людзі будуць праяўляць да праўдзівага слова.

Заканчваючы свой выступ, хацеў бы, паважаныя калегі, яшчэ раз звярнуцца да вас з заклікам аб неабходнасці захавання нашага адзінства і канцэнтрацыі намаганняў дзеля дабрабыту народа Беларусі. Мы змагаемся за ўмацаванне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года і існаванне законнасці ў краіне, за захаванне суверэнітэту і дзяржаўнай цэласнасці Беларусі. Таму нам, у адрозненне ад тых, хто змаладушнічаў і папраўся ў так званую “Палату”, няма чаго апускаць галаву ўніз. Мы маем маральнае права прама глядзець у вочы сваім суайчыннікам.

***(“Народная воля”, 13 лютага 1997 года)***

KAMUNIKAT.org

# АБАРОНІМ НАШ ДОМ БЕЛАРУСЬ

**Даклад да трэцяй гадавіны з дня прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 год, 15 сакавіка 1997 года.**

Шаноўныя суайчыннікі!

Паважаныя сябры, калегі!

Нашы госці!

Перш за ўсё я хацеў бы сказаць вялікае дзякуй усім тым, хто сёння сабраўся ў гэтай зале, каб адзначыць, мабыць, адно з найбольш вялікіх нашых дзяржаўных святаў - Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Я ведаю, што ўсе вы прыйшлі на гэтае святочнае паседжанне, нягледзячы на грандыёзны інфармацыйны тэрор, запалохванне, арышты людзей і іншыя брудныя метады і прыёмы па зрыву падрыхтоўкі і правядзення дзяржаўнага свята. Гэты факт яскрава сведчыць аб тым, у якой дзяржаве мы з вамі ўжо сёння жывём. А калі да гэтага прыбавіць, што на некалькі дзесяткаў пікетуючых прыганяюць сотні міліцыянтаў, дык паўстае пытанне:

Што ж будзе заўтра?

Паважаныя сябры і калегі! Вялікасць нашага свята абумоўлена той роляю, якую адыгрывае ў дзяржаве Канстытуцыя.

Слова Канстытуцыя, як вядома, паходзіць ад лацінскай мовы і азначае ў перакладзе на беларускую мову - як арганізаванне, пастанова.

Канстытуцыя - гэта асноўны закон дзяржавы, у якім абгрунтаваны грамадскі дзяржаўны лад, сістэма дзяржаўных органаў, парадак іх стварэння і дзейнасці, правы і абавязкі грамадзян.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года, трэція ўгодкі з дня прыняцця якой мы адзначаем, - гэта першая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь як суверэннай і незалежнай дзяржавы. Але ж, калі зазірнуць у гісторыю Беларусі, дык у час існавання Вялікага княства Літоўскага былі ўведзены тры Статуты - у 1529, 1566 і 1588 гадах, якія фактычна адыгрывалі ролю Канстытуцыі. Друкаваліся яны на беларускай мове, якая была ў тыя часы дзяржаўнай. Я ўспомніў аб гэтым таму, што прыняцце названых Статутаў з`яўляецца адной з найбольш яскравых старонак у гісторыі нашай Радзімы, якой мы па праву можам ганарыцца. Статуты Вялікага княства Літоўскага былі адным з найбольш поўных і дасканалых збораў, прычым на колькі гэта было магчыма, самых дэмакратычных у Еўропе законаў тагачаснага права. Менавіта таму Статуты перакладаліся на лацінскую, польскую і рускую мовы. Многія артыкулы Статута 1588 года былі выкарыстаны ў Саборным улажэнні Расейскай дзяржавы 1649 года.

Тры Канстытуцыі Беларускай ССР былі прынятыя ў савецкія гады - ў 1927, 1937 і 1978 гадах.

Такім чынам, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года з`яўляецца вянцом заканатворчасці шматвекавой гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці. І ад імя дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання я хацеў бы падзякаваць усіх тых, хто распрацоўваў гэтую Канстытуцыю, і тых, хто яе прыняў - дэпутатаў Вярхоўнага Савета 12-га склікання.

Прайшло тры гады з дня прыняцця дзеючай Канстытуцыі. Вядома, цяпер можна гаварыць аб станоўчых момантах гэтай Канстытуцыі, можна гаварыць і аб недахопах. Але ж якія б там ні былі і недахопы, з прыняццем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года мы атрымалі галоўнае - Асноўны Закон для пабудовы суверэннай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што Канстытуцыя замацоўвае ў асноўным тое, што ўжо дало жыццё, і на падставе гэтага вызначае напрамак далейшага развіцця грамадства. А паколькі жыццё не стаіць на месцы, развіваецца, дык з цягам часу і некаторыя артыкулы Канстытуцыі трэба мяняць і нават уводзіць новыя. І так робяць усе дзяржавы, у тым ліку і Злучаныя Штаты Амерыкі, дзе Канстытуцыя лічыцца найбольш устойлівай.

Але ж так робяць усе тыя дзяржавы, дзе паважаецца закон і прыклад у гэтым паказваюць кіраўнікі дзяржаў. І вельмі шкада, што ў нашай дзяржаве гэтага няма. Доўгі час беларускі народ не меў сваёй дзяржаўнасці і, пачынаючы з канца XVIII стагоддзя, жыў у складзе той дзяржавы, дзе панаваў манархічны, а пазней - таталітарны лад (гаворачы пра таталітарны лад, я хацеў бы пры гэтым падкрэсліваць, што за гады савецкай улады было многа зроблена для чалавека працы, асабліва ў сацыяльнай сферы, правоў і гарантый грамадзян). Выйшаўшы з таталітарнай дзяржавы, Рэспубліка Беларусь (дарэчы, як і другія самастойныя краіны, якія ўтварыліся на базе былых саюзных рэспублік) нясе на сябе радзімыя знакі таго ладу. Менавіта таму вялікая частка насельніцтва яшчэ ўсё хоча мець не ўмовы для свабоднага ўсебаковага развіцця і творчасці, а спадзявацца на моцнага гаспадара, які б за ўсё адказваў і ўсё даваў. А пры такіх абставінах, ды калі ў канстытуцыі ёсць хоць маленькія шчылінкі, якія не закрываюць магчымасці пранікнення таталітарызму, можа знайсціся асоба, якая ўсё зробіць, каб выкарыстаць гэта ў сваіх інтарэсах. Таталітарызм - гэта як ракавая пухліна, калі ўжо знайшоў сабе месца і ўзнік, дык вельмі цяжка яго пазбавіцца. На жаль, такая бяда не абмінула нашу дзяржаву. Амаль з першых дзён свайго абрання на самую высокую пасаду, прэзідэнт стаў самым вялікім парушальнікам Канстытуцыі. І, як вядома, справа скончылася дзяржаўным пераваротам. У краіне ўмацоўваецца ўлада аднаго чалавека з усімі выцякаючымі з гэтага адмоўнымі вынікамі: для тых, хто мае сваю думку, сталі недаступнымі дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, забараняюцца нават у святочныя дні шэсці людзей і мітынгі на цэнтральных вуліцах і плошчах. Прэзідэнт ужо выдае дэкрэт за дэкрэтам, якія падмяняюць законы. А прабывальнікамі так званай “Палаты прадстаўнікоў” лічыць восьгэтую непрыкрытую ўзурпацыю дзяржаўнай улады за дэмакратыю і задаволены дружнай працай з прэзідэнтам.

У сувязі з гэтым я яшчэ раз хацеў бы звярнуцца да ўсіх тых (і дэпутатаў- “вертыкальшчыкаў”, і гаспадарчых кіраўнікоў), хто робіць злачынства, парушаючы законы, або падтрымлівае тых людзей, якія парушаюць законы: “Няўжо вы думаеце, што ў Беларусі менталітэтам яе грамадзян можа доўга пратрымацца таталітарны лад? Вы ж паглядзіце - на кім ён трымаецца? Сярод тых, у каго сапраўдная ўлада, толькі дзе-нідзе беларус, ды і то паглядзіце - чым ён займаўся раней? Што рабіў дзеля Радзімы? Якое ў яго сумленне?”

Я хацеў бы звярнуцца і да тых, хто знаходзіцца ў органах улады і пакуль запалохана маўчыць, бачачы злачынства, а таксама да вучоных і творчых работнікаў, гаспадарчых кіраўнікоў, генералаў, афіцэраў, ветэранаў і нашай

моладзі: “Чаго мы трасемся і баімся ў сваёй роднай дзяржаве? Чаму мы маўчым, калі бачым, што шмат якія чыноўнікі ўжо так распе則азаліся, што ад іх няма жыцця другім? Давайце ўсе падымемся дружна ды супакоім іх! Бо яны ж не толькі нахабнікі, але ж і вялікія баязліўцы, якія баяцца, каб да іх не падыходзілі бліжэй, як за дзвесце метраў, хто дадумаўся да такога. Але ж напісаць такое мог толькі той, хто адчувае за сабою вялікія грахі і баіцца адказнасці за іх. А адказнасць абавязкова прыйдзе - не сёння дык заўтра.”

Я хацеў бы звярнуцца да сваіх калегаў - дэпутатаў і другіх кіраўнікоў Расейскай Федэрацыі і запытаць - чаму вы робіце ўсё для таго, каб адштурхнуць ад Расеі самую свядомую частку блізкага вам па мове і культуры народу? Няўжо вы не разумееце, што падтрымаўшы дыктатара, вы працягнулі шэраг такіх дзеячоў Расеі як Увараў і Мураўёў, якія ўвайшлі ў гістрыю Беларусі як злачынцы?

Праўда, да гонару расіян, гісторыя Беларусі ведае і іншыя імёны сыноў Расеі - крытыка Мікалая Іванавіча Надзеждзіна, гісторыка Міхаіла Аляксандравіча Максімовіча, рэвалюцыянера-публіцыста Аляксандра Іванавіча Герцэна, рэвалюцыйнага дэмакрата і крытыка Мікалая Аляксандравіча Бакуніна, якія з вялікім пачуццём і павагай адносіліся да беларускай народнасці. І беларускі народ заўсёды будзе ім удзячны, так, як ён сёння ўдзячны кіраўнікам тых міжнародных арганізацый і дзяржаў, якія падтрымалі наш Вярхоўны Савет 13-га склікання ў яго намаганнях па абароне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года. І карыстаючыся гэтай высокай трыбунаю, хачу звярнуцца да прысутных прадстаўнікоў замежных краін і яшчэ раз сказаць нашае шчырае беларускае дзякуй. Перадайце, калі ласка, гэтую падзяку кіраўнікам сваіх краін і парламентаў.

Я асобна хачу звярнуцца да ўсіх народаў Расеі і сказаць ім, што ў Беларусі няма тых сілаў, якія б выступалі супраць інтэграцыі з Расеяй. Жыхары Беларусі, і я гэтым хачу падкрэсліць, што не толькі адны беларусы, а ўсе жыхары рэспублікі, і тым больш не адны прадстаўнікі БНФ, а амаль усе палітычныя сілы выступаюць супраць палітыкі Лукашэнкі, якому ўжо даўно не спіцца без прэстолу кіраўніка вялікай дзяржавы. І гэта не трэба змешваць з інтэграцыяй. Як у свой час Гітлер, якога Лукашэнка лічыць сваім кумірам, ведаў, што ў малой Аўстрыі ён ніколі не задаволіць свае імкненні стаць магутным дыктатарам, і таму для гэтага яму патрэбна была вялікая Германія, так і сёння Лукашэнка ведае, што дыктатарам у поўнай меры ён не стане ў невялікай Беларусі, для гэтага яму патрэбна вялікая Расея, дзе ёсць ядзерная зброя. І гэта вельмі відавочна з яго апошняй прамовы перад расейскімі парламентарыямі. Добрая частка прамовы зведзена да таго, каб падкрэсліць, што ён кіраўнік ужо не Беларусі, ці не столькі Беларусі, колькі супольніцтва Беларусі і Расеі, а ўся інтэграцыя зводзіцца да таго, каб было адно грамадзянства. І не прыхаваным вокам бачна, што Лукашэнку сапраўды трэба адно грамадзянства - і трэба яму гэта для таго, каб вылучыць сваю кандыдатуру на выбарах прэзідэнта новаспечанага саюза дзвюх дзяржаў. У іншым выпадку ніякая інтэграцыя яму не патрэбна.

І таму Селязнёву, Бабурыну і іншым Тулеевым, якія гавораць, што тых людзей, якія сёння выходзяць на вуліцы Менску з пратэстам супраць палітыкі Лукашэнкі, падвучвае хтосьці на Захадзе, я хачу сказаць: па-першае - гэта ў вас таксама, мабыць, не прайшлі радзімыя знакі ад таго таталітарнага ладу, калі ўсе шукалі ворагаў - і ў сваёй дзяржаве, і за мяжой; па-другое, жыхары Беларусі абараняюць суверэнітэт сваёй дзяржавы, як добры гаспадар бароніць свой дом,

калі ў вёсцы пажар. А ў рэшце рэшт, беларусы, як напрыклад, славакі, літоўцы ці іншыя народы, хочуць мець (і яны маюць на гэта законнае права) сваю дзяржаву, размаўляюць на роднай мове, вывучаюць гісторыю сваёй краіны. І гэта нiколькi не шкодзіць працэсу інтэграцыі. Прыклад таму - Еўропа. Там, дзе дзяржаўныя інтарэсы падмацоўваюцца нацыянальнымі інтарэсамі большасці насельніцтва, справы ідуць нашмат лепей. Больш таго, вы бачыце і аб гэтым кожны дзень самі не толькі гаворыце, а ўжо крычыце, што ў вас дома - ў Расейскай Федэрацыі - усё раз`ела карупцыя, разрабавана мноства багацця, па некалькі месяцаў не выплочваецца заробак і пенсіі, цякуць кроў і слёзы. Дык куды ж вы нас цягнеце? Давайце замест авантур сапраўды будзем займацца інтэграцыяй на карысць народаў Беларусі і Расеі. Для гэтага мы стваралі супольнасць. Што яшчэ трэба?

І навогул, паўстае пытанне, ці можна назваць хоць адну краіну ў свеце з дэмакратычным тыпам кiравання, якая б была федэратыўнай і ў якасці ўваходзячых у яе частак былі б нацыянальныя фармаванні? Такія краіны былі, але ж гэта былі або манархіі, або краіны з таталітарным рэжымам, як Савецкі Саюз, Чэхаславакія і іншыя. А пры дэмакратызацыі кiравання федэратыўнай дзяржавай такога тыпу, яна, звычайна распадаецца. Гэта галоўная прычына таго, чаму вось ужо прайшло пяць гадоў, а так і не знойдзены эфектыўныя прынцыпы кiравання Расейскай Федэрацыяй.

Хацелася б яшчэ запытаць у расейскіх дэпутатаў-камуністаў, а таксама ў былых кiраўнiкоў Кампартыі Беларусі, якія падтрымліваюць дыктатара Лукашэнку - няўжо вы не памятаеце, што сярод подпісаў дэпутатаў 12-га склікання, якія напісалі заяву аб сваім выхадзе з КПСС і патрабавалі ўключыць у парадак дня сесіі Вярхоўнага Савета пытанне прыняць пастанову аб роспуску Кампартыі Беларусі і перадачы яе маёмасці Саветам, стаіць прозвішча члена КПСС А. Лукашэнкі? Мяркую, што дававаць Лукашэнку такое, як і тое сумна вядомае інтэрв`ю нямецкай газэце, дзе ён выказаў свае патаемныя думы аб Гітлеры, могуць людзі, або падзяляючы яго дзеянні і мары, або проста страціўшы сумленне.

Шаноўныя калегі і сябры, нашы госці!

Тая трагедыя, якую зараз перажывае наш народ, яшчэ раз вучыць нас таму, што лепшай формай дзяржаўнасці для нашай невялічкай па памерах, унітарнай па складу, населенай людзьмі большасцю адной нацыянальнасці з`яўляецца не прэзідэнцкая, а парламенцкая рэспубліка, аб чым я ўжо не аднойчы гаварыў. Гэтаму вучыць вопыт большасці еўрапейскіх краін. У сувязі са сказаным давайце ўспомнім, што ў праграме камуністаў запісана ў якасці патрабавання - ідэя народаўладання. І супраць увядзення інстытута прэзідэнцтва выступалі не толькі камуністы, але і партыя БНФ, аграрыі і некаторыя іншыя палітычныя сілы.

Каб не было бяды, трэба спадзявацца не на моцнага і сумленнага кiраўнiка, а на сістэму законаў, дэмакратычны механізм іх рэалізацыі і перш за ўсё на Канстытуцыю, згодна з якой несумленны кiраўнiк не мог бы трымацца ва ўладзе. Магу сёння сказаць, што я, як і многія мае калегі, такую структуру кiраўнiцтва дзяржавай прыблізна ўяўляю, сваімі думкамі мы дзяліліся з вядомымі юрыстамі, якія з гэтым згодны. На мой погляд, трэба, каб прэзідэнт абіраўся Вярхоўным Саветам і валодаў больш прадстаўнічымі функцыямі. Вярхоўны Савет - гэта, як вядома, заканадаўчы орган, а Савет Міністраў павінен валодаць у пэўных памерах выканаўчай уладай. Трэба, каб быў Вярхоўны Суд, які сачыў бы і за выкананнем Канстытуцыі. Чатыры вышэйшых асобы: Прэзідэнт, Старшыня Вярхоўнага Савета,

Старшыня Савета Міністраў і Старшыня Вярхоўнага Суда - павінны быць роўнымі па палажэнню ў дзяржаве і незалежнымі адзін ад другога. Больш таго, трэба, каб ніхто з іх аднаасобна не мог прыняць ніякага закону ці нават указу, у тым ліку і па ўзнагародзе людзей, прысваенню вайсковых званняў і гэтак далей, а тым больш па прызначэнню людзей на дзяржаўныя пасады.

Вось у гэтым напрамку і трэба будзе ўдасканальваць Канстытуцыю 1994 года. Але ж пакуль што трэба ўсё зрабіць для таго, каб яна пачала дзейнічаць без усялякага засмечання, што ёй надалі ў час так званага лістападаўскага (1994г.) рэферэндуму.

Няхай жыве і дзейнічае на карысць народа Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года!

Няхай жыве і квітнее суверэнная дэмакратычная наша родная Беларусь!

KAMUNIKAT.org

# ЗГУБІЦЬ СУВЕРЭНІТЭТ - ЗГУБІЦЬ БЕЛАРУСЬ!

**На падставе даклада, зробленага на**
**II Усебеларускім Кангрэсе дэмакратычных сіл**
**15 мая 1997 года**

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь сказана, што мы будуем суверэнную, дэмакратычную, прававую, сацыяльную дзяржаву.

Пры гэтым вядома, што слова “дэмакратыя” ў перакладзе з грэчаскай мовы на беларускую азначае “народаўладдзе”, ці больш дакладна: дэмакратыя - гэта такая форма ўлады, якая прадугледжвае, што ўдзел у кіраванні дзяржавай прымае ўвесь народ, і прызнае свабоду і раўнапраўе ўсіх грамадзян.

Суверэнітэт - слова французкага паходжання і азначае незалежнасць народа і яго дзяржавы пры рашэнні як унутраных, так і знешніх пытанняў.

Такім чынам, каб улада ў дзяржаве была дэмакратычнай, трэба, каб была гарантыя, што ўсе пытанні яе жыцця будуць вырашацца яе народам, гэта значыць, трэба, каб дзяржава была суверэннай і мела права гэта рабіць незалежна ад другой дзяржавы.

Вось чаму дэвізам нашага Кангрэсу з`яўляюцца менавіта гэтыя словы, прычым слова “суверэнітэт” стаіць першым, бо, не вырашыўшы пытання аб суверэнітэце дзяржавы, няма чаго гаварыць і аб дэмакратыі. Калі мы згубім суверэнітэт сваёй дзяржавы і ўвойдзем у склад Расейскай Федэрацыі (аб чым у Маскве, як мы бачым і чуем па тэлевізару, гаворыць сёння як аб ужо само сабою зразумелым), дык і ўсе пытанні наконт дэмакратыі будуць вырашацца ў Маскве. А што такое дэмакратыя па-маскоўску, паказала больш як двухсотгадовая гісторыя: гэта паходы маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча ў Вялікае княства Літоўскае, пасля якіх на месцы беларускіх гарадоў і вёсак заставаліся кроў і попел, гэта забарона імператарам Мікалаем I нават ужываць слова “беларус”, гэта бязлітаснасць галоўнага начальніка Паўночна-Заходняга краю Расейскай імперыі (як тады называлася Беларусь) Міхаіла Мураўёва, з якой ён душыў у 1863-1864 гадах паўстанне беларускіх патрыётаў, гэта злачынствы Гея, Панамарэнкі і Маленкова ў трыццатыя і саракавыя гады ў дачыненні да беларускай інтэлігенцыі. Многія людзі старэйшага пакалення памятаюць, як у Маскве былі сфабрыкаваны матэрыялы для абгрунтавання рэпрэсій супраць вучоных, пісьменнікаў і іншых сумленных патрыётаў беларускага народа: у 1930 годзе прагрымела справа “Саюза вызвалення Беларусі”, у 1933 годзе - “Беларускага нацыянальнага цэнтру”, у 1937-1938 гадах - “Цэнтра штаба нацыянальна-фашысцкай прапаганды”. Дарэчы, звярніце ўвагу, як гэтыя словы пераклікаюцца з тымі, якія сёння мы чуем з вуснаў некаторых маскоўскіх палітыкаў, а пасля гэтага і з вуснаў прэзідэнта Беларусі.

А ў рэшце рэшт “маскоўская дэмакратыя” - гэта і вайна ў Афганістане, гэта і Чачня, з народам якой, як вымушана было на днях прызнацца кіраўніцтва Расейскай Федэрацыі, Расея вяла вайну на працягу чатырохсот гадоў.

Прыводзячы гістарычныя факты, хачу зрабіць агаворку: я паважаю таленавіты рускі народ і яго культуру, захапляюся творамі Пушкіна і іншых рускіх паэтаў і пісьменнікаў, мастакоў і архітэктараў, вучоных і кампазітараў. З павагай стаўлюся да тых рускіх людзей, дарэчы, як і да людзей іншых нацыянальнасцяў,

якія жывуць у Беларусі побач з намі, беларусамі, сумленна працуюць і ўмацоўваюць наша агульны Дом - Рэспубліку Беларусь і яе дзяржаўнасць.

Але, на жаль, сёння ў нашай краіне ў палітыку зноў прыйшло шмат экстрэмістаў, і таму прыходзіцца ўспамінаць гісторыю, бо ў яе павінны вучыцца. Тым больш, што сёння наша Радзіма перажывае вельмі адказны момант, які можна параўнаць у гэтым стагоддзі толькі з 1918 годам ды гадамі Вялікай Айчыннай вайны, калі таксама стаяла пытанне аб жыцці ці смерці беларусаў як нацыі.

Справа ў тым, што дыктатарскі рэжым Лукашэнкі не можа існаваць у межах адной, прытым, такой як Беларусь, краіны, дзе жывуць працалюбівыя, памяркоўныя людзі. У такіх умовах дыктатарскі рэжым гіне ад сваіх сацыяльных нечыстотаў.

Спосаб існавання дыктатарскіх рэжымаў з`яўляецца не стваральная дзейнасць на карысць свайго народа, а барацьба. Таму колькі б ні гаварыў сам дыктатар, і нават каб і сапраўды хацеў хтосьці з яго акружэння працаваць на карысць паляпшэння жыцця народа, ён не зможа гэта рабіць, бо, я яшчэ раз нагадаю, не стварэнне, а пошук ворагаў і барацьба - барацьба з ворагамі сярод свайго акружэння і нават сваіх сем`яў, барацьба з цэлымі партыямі і плынямі, якія залічваюцца ў ворагі, барацьба за пашырэнне прасторы - вось спосаб існавання дыктатарскіх рэжымаў і саміх дыктатараў. І ніякія “ворагі” не перашкаджаюць Лукашэнку займацца стваральнай дзейнасцю, як гэта ўсё яшчэ думаюць некаторыя людзі, а ён, па прычыне сваёй дыктатарскай прыроды, перашкаджае займацца творчай працай усім іншым.

Як у свой час дыктатару, аўстрыйцу па паходжанню, Адольфу Гітлеру патрэбна была вялікая Германія, а далей і ўся Еўропа, так і сёння Лукашэнку для задавальнення сваіх уладалюбівых амбіцый патрэбна ў першую чаргу вялікая Расея з яе патэнцыялам. Пры гэтым я хачу падкрэсліць - толькі спачатку, а пасля будуць Украіна і іншыя дзяржавы. Удумайцеся, аб чым гаварыў Лукашэнка ў час свайго візіту на Украіну? А ўсё аб тым жа саюзе славянскіх народаў і нават прапанаваў свае паслугі па ўрэгуляванню адносін паміж Расеяй і Украінай.

Дык ці не нагадвае сёння тэорыя аб саюзе славянскіх дзяржаў гітлераўскую тэорыю арыйскай расы? Думаецца, што і там, і тут з-пад доўгага кафтана славаблудства відаць карычневыя штаны фашызму. А што такое, як не дыктатарскія замашкі, стварэнне новых восей, як, напрыклад, Мінск - Масква - Пекін, аб чым не так даўно гаварыў Лукашэнка. Гэта ўсё вельмі нагадвае другія восі, якія ўжо ствараліся, і да чаго яны прывялі - добра вядома.

І самае страшнае заключаецца ў тым, што ўсе гэтыя дыктатарскія задумы Лукашэнкі і яго намаганні па іх ажыццяўленню ўпалі на вельмі спрыяльную маскоўскую глебу, дзе яшчэ вельмі шмат палітычных дзеячоў з імперскімі замашкамі! А вось што такі сімбіёз вельмі небяспечны, таксама паказала гісторыя. Вядома, што 23 жніўня 1939 года пасля падпісання так званага “пакта Молатава-Рыбентропа” Іосіф Сталін падняў тост за здароўе Адольфа Гітлера, мэтай якога было стварэнне новага парадку ў Еўропе. Сталін тым тостам, па сутнасці, благаславіў Гітлера на развязванне Другой сусветнай вайны. Больш таго, Рыбінтроп, вярнуўшыся ў Берлін, паведаміў Гітлеру і аб тым, што ў Маскве ён адчуваў сябе так, як нібыта ён быў сярод членаў сваёй партыі! А гэта ўжо зусім жахліва. Бо сёння на стварэнне саюза славянскіх дзяржаў, першым крокам да

якога з`яўляецца саюз Беларусі і Расеі, таксама Лукашэнку благаслаўляюць у той самай Маскве, дзе паднімалі келіхі за “пакт Молатава-Рыбінтропа”.

З Лукашэнкам цалуецца Ельцын; падтрымлівае Лукашэнку Зюганаў, які прыкладам для сваёй дзейнасці лічыць Сталіна; Лукашэнку падтрымлівае Ампілаў, які, як паказала Першамайскай дэманстрацыя ў Маскве, такі ж істэрык, як і Гітлер; Лукашэнку падтрымлівае Селязнёў, які, як паказваюць яго выступу наконт падзей на Беларусі, нічым не ўступае Аляксандру Рыгоравічу; Лукашэнку падтрымліваюць другія маскоўскія славяне і зусім не славяне Тулееў, Жырыноўскі, Лужкоў, сібіракі Бабурын і Харытонаў. Невыпадкова і тое, што Лукашэнка, як у свой час і Гітлер, і Рыбентроп, знайшоў падтрымку ў многіх кіраўнікоў усё той жа кампартыі: як зюганаўцаў, так і чыкінцаў.

І вось, як заявіў віцэ-прэм`ер Расейскай Федэрацыі Сяроў, 23 мая пасля ўсенароднага абмеркавання будзе падпісаны Статут Саюза Беларусі і Расеі. Праўда, прэзідэнт Беларусі, як дыктатар, гаворыць, што навогул, гэтае абмеркаванне не патрэбнае. Як бы хто ні лічыў, але ўсенароднага абмеркавання праекта гэтага статута на самай справе не было. Абмяркоўвалі, у асноўным, усё тыя ж людзі, якія з`яўляюцца ініцыятарамі стварэння саюза. Вось і для правядзення нашага кангрэса таксама давялося шукаць аж трэцюю залу. Людзі, а тым больш кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, запалоханыя, і кожны баіцца, што могуць зняць з работы, калі створыш умовы для людзей, якія скажуць аб тым, пра што яны сапраўды думаюць. Вось гэта таксама характэрная рыса дыктатарскіх рэжымаў - трымаць людзей у страху.

Калі ўважліва прачытаеш надрукаваны ў газэтах праект названага Статута, то, безумоўна, застаецца ўражанне, што ў ім ёсць вельмі шмат прававых недарэчнасцяў, але аб гэтым больш падрабязна скажа шаноўны Міхаіл Іванавіч Пастухоў, які з`яўляецца вядомым у рэспубліцы правазнаўцам. Я толькі хачу падкрэсліць, што ўся гэтая блытаніна не такая ўжо не небяспечная, як некаторыя думаюць. Калі Статут будзе падпісаны ў такім варыянце, як выглядае яго праект, то ён дазваляе зліквідаваць суверэнітэт Рэспублікі Беларусь, таму што згодна яму ўстанаўліваецца грамадзянства Саюза, а грамадзянства сведчыць аб прыналежнасці таго ці іншага чалавека да пэўнай дзяржавы.

Аб ліквідацыі суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, а значыць, і дзяржавы, сведчаць і пункты ”д” і “і” артыкула 14-га, а таксама пункт “г” артыкула 17-га і артыкул 31, якімі прадугледжваюцца свабоднае перамяшчэнне тавараў, паслуг і капіталаў, пераход да адной валюты і стварэнне аднаго эмісійнага цэнтра. Свабоднае перамяшчэнне капіталаў вельмі небяспечна яшчэ і тым, што ў Расеі зараз пануе крымінальны капітал з усімі адмоўнымі яго рысамі, уключаючы і забойствы сваіх канкурэнтаў. Расейскі капітал больш моцны капітал, і таму ён адразу хлыне ў нашу эканоміку, тым больш, што ў Расеі ўжо даўно ўсё распрададзена і разрабавана.

Лукашэнка ўсё палохаў людзей, што апазіцыя быццам бы хоча прадаць усё заходняму капіталу, на што цяпер можна сказаць: па-першае, апазіцыя гэтага ніколі не казала, гэта яшчэ адна і, на жаль, не апошняя хлусня, якая штодня вылятае з вуснаў прэзідэнта. А па-другое, заходні капітал больш цывілізаваны і таму больш бяспечны ў параўнанні з расейскім капіталам.

Разам са свабодай перамяшчэння тавараў трэба чакаць, што нашы рынкі і магазіны запоўняцца таварамі, асабліва спажывецкімі, паўднёвых раёнаў Расеі і

іншых паўднёвых краін, бо, як вядома, мяжа паміж апошнімі і Расейскай Федэрацыяй падобна на рэшата, праз якое пранікаюць не толькі тавары, але і людзі. А беларускія вытворцы апынуцца ў значна горшым стане, хаця і цяпер яны адчуваюць сябе з-за непасільных падаткаў вельмі цяжка. Разам з таварамі і гандлярамі на тэрыторыю Беларусі прыйдзе і той крымінал, якога значна больш у паўднёвых раёнах Расейскай Федэрацыі, чым на Беларусі.

Па сутнасці, аб ліквідацыі суверэнітэту Беларусі сведчыць і артыкул 4, у якім сказана, што ствараемы Саюз будзе мець права міжнароднага суб`екта.

Вельмі небяспечным з`яўляецца і артыкул 11, дзе гаворка ідзе аб задачах і каардынацыі дзеянняў у вайсковай справе. У ім няма агаворкі, што жыхары Беларусі не будуць служыць у войску па-за межамі сваёй рэспублікі. А калі будуць, дык пасля падпісання Статута маладым хлопцам, якія яшчэ не служылі ў войску, будзе зусім не да жартаў, калі іх адправяць у Таджыкістан ці ў іншую нейкую Чачню, дзе Расея мае нейкія свае інтарэсы.

І ўжо вядома, што пры ліквідацыі суверэнітэту Беларусі яшчэ ў большы заняпад прыйдзе нашая нацыянальная культура, аб чым дыктатарскі рэжым не збіраецца і думаць. Культура і этыка - гэта атрыбуты цывілізаванага дэмакратычнага грамадства. Больш таго, у дэмакратычным цывілізаваным грамадстве немагчыма ўявіць палітыку ўвогуле без этычнага сумлення. І калі пагаджаюцца з тым, што быццам можна дараваць прэзідэнту яго бескультурнасць, хамства, калі ён Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага і патрыяршага Экзарха Усяе Беларусі называе “нашым Філарэтам”, аб чым нагадвае ў газэце “Народная воля” прафесар Крукоўскі, дык тады мы пагаджаемся, што чалавек у палітыцы можа не мець нічога людскага. Але ж якіх клопатаў аб развіцці нацыянальнай культуры можна чакаць у такой дзяржаве?

І навогул, калі падсумаваць усё, што нас чакае пры стварэнні падпісанні Саюза Беларусі і Расеі, дык у апошнім абзацы артыкула 3 Статута проста сказана, што перспектыва развіцця саюза накіравана на перспектыўны рух да даобраахвотнага аб`яднання дзвюх дзяржаў. Праўда, далей, як і заўсёды ў такіх выпадках, ідзе славалюбнае прыкрыццё злачыннай змовы - у прыватнасці, сказана, што гэта будзе рабіцца з улікам свабоднага волевыяўлення народаў і Канстытуцый абедзвюх дзяржаў, а таксама з улікам суверэннай роўнасці дзяржаў, номаў і прынцыпаў міжнароднага права.

Усю гэтую гульню ў саюзы трэба расцэньваць не інакш, як імкненне прэзідэнта Лукашэнкі выратаваць свой збанкручаны рэжым і пазбавіцца ад адказнасці за здзейсненыя беззаконне. І гэта трэба ўлічваць у нашых далейшых дзеяннях.

У гэтую небяспечную для Радзімы гадзіну я заклікаю ўсе партыі і рухі адкласці ўбок свае палітычныя спрэчкі і аб`яднацца для абароны і выратавання ад знішчэння нашага агульнага Дома - Беларусі.

***(“Народная воля”, 21 мая 1997 года)***

# БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

**Бліц-інтэрв`ю**

***Пытанні:***

**Што галоўнае, на Ваш погляд, здзейсніў Вярхоўны Савет 13-га склікання за год існавання ў паўпадпольных ўмовах?**

**Ці лічыце Вы, што для Вярхоўнага Савета настаў час атрымаць паўнамоцтвы і кворум, гэта значыць узяць заканадаўчую ўладу ў свае рукі?**

**Як вы ацэньваеце юрыдычны грунт для пазбаўлення дэпутацкага статуса назначэнцаў Палаты прадстаўнікоў і ўзнаўленне правамоцных паседжанняў Вярхоўнага Савета?**

***Адказ:***

Да чарговага лістападаўскага сходу дэпутатаў будзе прадстаўлены даклад, прысвечаны гадавіне існавання заканадаўчага і вышэйшага прадстаўнічага органа ўлады краіны ва ўмовах прэзідэнцкай дыктатуры. Дэпутаты, захаваўшыя вернасць Канстытуцыі 1994 года, у паўпадпольных умовах змаглі, на мой погляд, выканаць тры важнейшыя палітычныя задачы.

Мы дабіліся прызнання сусветнай супольнасцю легітымнасці Вярхоўнага Савета 13-га склікання. Дэпутатам апазіцыі ўдалося захаваць адзінства ў адстойванні Канстытуцыі і законнасці ў Рэспубліцы Беларусь, нягледзячы на прынцыповую розніцу ў ідэалагічных пазіцыях. Дэпутатаў не запалохалі арышты, суды, штрафы, шальмаванне, пагрозы, шантаж.

Прызнаць паўнату сваіх паўнамоцтваў, устанавіць, зыходзячы з Канстытуцыі і законаў, кворум для прыняцця пастаноў і рашэнняў можна было як у студзені бягучага года, так і зараз. Аднак у сувязі з гэтым узнікае шэраг пытанняў. Па-першае, якую частку насельніцтва будуць прадстаўляць гэтыя дэпутаты? Па-другое, якія механізмы рэалізацыі тых законаў, якія мяркуем, будуць прыняты? Па-трэцяе, як будзе ажыццяўляцца матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне правядзення сесіі Вярхоўнага Савета?

Усякая спешка ў рашэнні гэтых пытанняў можа ператварыцца ў фарс, або ў трагікамедыю.

На другую частку пытання я адказаў у папярэднім. У мяне няма ніякага сумневу ў наяўнасці заканадаўчых падстаў для прызнання несапраўднымі мандатаў прэзідэнцкіх назначэнцаў Палаты. У той жа час мы не павінны ўпадабляцца “палатнікам”, якія, парушаючы ўсе наяўныя нормы права, прынялі рашэнне аб спыненні дзейнасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым неабходна памятаць яшчэ і тое, што сусветная супольнасць прызнае Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь толькі таму, што ён стаіць на грунце канстытуцыйнасці і законнасці.

***(“Народная воля”, 13 лістапада, 1997 года)***

# СВАЮ ГІСТОРЫЮ ТРЭБА ВЕДАЦЬ, ПАМЯТАЦЬ І Ў ЯЕ ВУЧЫЦЦА

**Да 80-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі**

У Еўропе цяжка назваць яшчэ адну краіну, у якой лёс народа быў бы такім трагічным, як лёс беларусаў. Узнікшы ў другой палове мінулага тысячагоддзя ў выніку змяшэння славян з балтамі, прародзічы беларусаў - крывічы, радзімічы і дрыгавічы - былі вядомы як высока развітыя па тым часе плямёны. Зазначым, што вялікаруская народнасць склалася ў выніку перамешвання і сімбіёзу славянскіх і фінскіх плямёнаў, аб чым гаварыў вядомы рускі гісторык Васіль Ключэўскі.

Крывічы аднымі з першых ва Усходняй Еўропе стварылі сваю дзяржаву - Полацкае княства. Прычым, як паведамляе адно з народных гераічных скандынаўскіх сказанняў, ужо ў момант запрашэння ў Наўгародскую Русь варагаў (862г.) крывічы-палачане мелі сваіх мясцовых князёў. Прыкладна ў гэты час стварылі сваю дзяржаву і дрыгавічы - Тураўска-Пінскае княства. Дарэчы, першым Кіеўскім вялікім князем, які пачаў аб`ядноўваць розныя плямёны ў адну дзяржаву, быў Алег (879-912г.г.).

Такім чынам, сказаць, што ў беларусаў і вялікарусаў адны карані і называць іх роднымі братамі, як гэта робяць некаторыя палітыкі, ніяк нельга, бо ў фармаванні іх, апроч усходніх славянаў, удзельнічалі і іншыя, прычым ужо зусім не славянскія плямёны. Ды і фармавацца як народнасці беларусы і вялікарусы (а гэта можна сказаць і аб украінцах) пачалі прыкладна ў адзін і той жа час, а таму няма сярод іх старэйшага брата, як няма і малодшых братоў.

Наступны перыяд развіцця беларускай нацыі праходзіў ужо ў Вялікім княстве Літоўскім, дзе, апроч славян, якія складалі большасць насельніцтва дзяржавы, пражывалі таксама балцкае племя жмудзь, латгалы, татары, караімы, габрэі і іншыя. Але ў сувязі з дамінуючым становішчам “руськіх” (так тады называліся будучыя беларусы) дзяржаўнымі сталі і іх мова, і іх герб - Пагоня.

З цягам часу Вялікае княства Літоўскае стала адной з самых буйных і найбольшых дзяржаў у Еўропе. Адметнай рысаю яго было тое, што тут ужо падчас сярэднявечча сцвярджаліся многія дэмакратычныя формы грамадскага і палітычнага жыцця. Гэта праяўлялася ва ўстойлівасці вечавога парадку кіравання, а таксама гуманных і перадавых па тых часах нормах права, замацаваных у Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гадоў.

У XVI-ым стагоддзі ў Вялікім княстве Літоўскім была праведзена аграраная рэформа, у выніку якой пры вызначэнні абавязкаў перад дзяржаваю стала ўлічвацца не толькі колькасць, але і якасць зямлі. Развіваліся рамёствы, у тым ліку і металургічныя, сыравінай для якіх была балотная руда. Інтэнсіўна ішоў працэс росту гарадоў. У 1600 годзе іх было ўжо больш за 500, прычым шмат з якіх былі добра ўладкаванымі. Скажам, у Гародні ўжо ў 1541 годзе існаваў вадаправод.

Вялікі патэнцыял накапіла беларуская нацыя ў галіне духоўнага развіцця. Яна мела, па сведчанню выдатнага паэта Адама Міцкевіча, самы багаты і самы чысты говар, які да таго часу быў ужо цудоўна распрацаваны. У 1570 годзе ў Вільні быў адкрыты каледж, які праз восем гадоў быў пераўтвораны ў Акадэмію. Акадэмія мела свае фабрыкі і друкарні. Студэнты ўсіх факультэтаў вывучалі тут сваю беларускую мову. Пазней Акадэмія была пераўтворана ў Віленскі універсітэт. Заўважым, што ў

Расеі першы універсітэт (Маскоўскі) быў адкрыты толькі ў 1755 годзе. Гісторыя вядомы і такі факт, што "вратами учености" Міхаіла Ламаносава была "Граматыка Мялецiя Смятрыцкага", якая выдадзена амаль за сто гадоў да нараджэння вялікага рускага вучонага ў пасёлку Еўе (цяпер Літоўская Рэспубліка). Першы ў Расеі падручнік па арыфметыцы, слоўнікі: руска-лацінска-нямецкі і руска-лацінска-галандскі - былі складзены і выдадзены беларусам са Случчыны Іллёй Капіевічам.

Беларускі народ нарадзіў і выхаваў такіх волатаў, як хрысціянскія культурныя асветнікі Еўфрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі, дзяржаўныя дзеячы князь Усяслаў Брачыслававіч і вялікі князь Вітаўт, канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега, ваенныя палкаводцы Давыд Гарадзенскі і Канстанцін Астрожскі, гуманісты-асветнікі Мікалай Гусоўскі, Георгій (Францыск) Скарына, Сымон Будны і Васіль Цяпінскі, а таксама шмат іншых выбітных вучоных і дзеячоў культуры, якія, сваімі працамі ўзбагацілі сусветную цывілізацыю.

У беларусаў склаліся свае нацыянальны характар і менталітэт, якія азначаюць сукупнасць устойлівых маральна-псіхалагічных уласцівасцяў, прыналежных да таго ці іншага народа, і якія праяўляюцца ў сваёй самаацэнцы і самаідэнтыфікацыі ў адносінах да працы, людзей іншых нацыянальнасцяў і веравызнанняў, а таксама ў паводзінах у экстрэмальных сітуацыях. Адметнымі рысамі беларусаў з`яўляюцца працалюбівасць і асаблівая павага да зямлі. Беларусы маўклівыя, стрыманыя, асцярожныя, нават крыху баязлівыя. Пражыванне на стыку двух цывілізацыяй (заходняй і усходняй) і ва ўмовах шматканфесійнасці выхавала ў беларускага народа такую рысу як талерантнасць. Яны вельмі любяць сваю Радзіму і найлепш адчуваюць сябе, жывучы на яе тэрыторыі. Таму адной з галоўных рысаў, уласцівых беларусам, з`яўляецца імкненне іх да свабоды і незалежнасці. Гэтае пачуццё беларускі народ захаваў, нягледзячы на нацыянальны ўціск спачатку каралеўскага кіраўніцтва Рэчы Паспалітай, якая была створана ў выніку аб`яднання ў 1569 годзе Вялікага княства Літоўскага і Польшчы, а пасля яе падзелу напрыканцы 18-га стагоддзя - імкненне царскага ўраду Расейскай імперыі вынішчыць у беларусаў усё нацыянальнае і эканамічна прывязаць Беларусь да Расеі, ператварыўшы яе в "Северо-Западный край" апошняй. Гісторыя сведчыць, што каб захаваць сваю нацыянальную годнасць і "людзьмі звацца", беларусам не адзін раз прыходзілася брацца за зброю. Так было, напрыклад, у час паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі (1794г.) і паўстання 1830-1831г.г.), гэтак было і пад час паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага (1863г.). Лагічным завяршэннем барацьбы шматлікіх пакаленняў беларусаў за адраджэнне сваёй дзяржавы стала абвяшчэнне ў 1918 годзе Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Гэтаму ў многім паспрыяла Лютаўская (1917 г.) рэвалюцыя ў Расейскай імперыі, якая разбурыла і механізм прымусовага ўтрымання народаў розных нацыянальнасцяў у адной дзяржаве.

Дэмакратызацыя грамадскага жыцця, у імя чаго адбываюцца народныя рэвалюцыі, патрабуе не толькі свабоды і юрыдычнага і палітычнага раўнапраўя для ўсіх грамадзян краіны, але і суверэнітэту насяляючых яе народаў. Без поўнага дазволу народа вызначыць самім свой лёс, што можа быць забяспечана толькі пры стварэнні сваёй дзяржавы, не можа быць і поўнай дэмакратыі. Таму І Усебеларускі з`езд (снежань 1917 года) выказаўся большасцю галасоў за права беларусаў вызначаць свой лёс.

Але такі крок дэлегатаў Усебеларускага з`езду ўступаў у супярэчнасць з думкай бальшавіцкага ўрада, які быў створаны ў Петраградзе пасля Кастрычніцкага

перавароту. І таму І Усебеларускі з`езд быў прымусова разагнаны, а яго прэзідыум арыштаваны.

Аб пагардлівых адносінах бальшавіцкага ўраду да нацыянальных інтарэсаў беларсаў гаворыць і заключэнне ім 3 сакавіка 1918 года без удзелу прадстаўнікоў Беларусі Брэсцкага мірнага дагавору з Германіяй, згодна якому большая частка нашай Радзімы апынулася пад нямецкай акупацыяй. Таму створаная да гэтага часу Рада БНР і не прызнала абавязковым для сябе Брэсцкі дагавор.

Канчатковае рашэнне аб абвяшчэнні незалежнасці і вольнай беларускай дзяржавы было прынята ноччу з 24 на 25 сакавіка на паседжанні Рады БНР. У ІІІ Устаўной Грамаце гаварылася наконт гэтага літаральна наступнае: “Год назад народы Беларусі разам з народамі Расеі зверглі ярмо расейскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь, не пытаючыся народу, ён кінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускія. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасці, якое гвалтам накінулі расейскія цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай. Самі народы Беларусі, у асобе свайго Установўчага Сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных сувязях Беларусі”. На гэтым жа паседжанні Рады Беларусь адмаўлялася прызнаць Брэсцкі дагавор. Адначасова гаварылася і аб тым, што Беларуская Народная Рэспубліка павінна ахапіць усе беларускія губерніі і сумежныя часткі Вялікаросіі, дзе ёсць беларусы. Рада падцвердзіла ўсе правы і свабоды грамадзян, якія абвяшчаліся ІІ-ой Устаўной Граматай ад 9 сакавіка: слова, друку, сходаў, забастовак, сумлення, недатыкальнасць асобы і жылля, права на аўтаномію, раўнапраўе моў усіх нацыянальнасцяў Беларусі. Зацвярджаўся васьмігадзінны рабочы дзень. Лясы, воды і нетры зямлі аб`яўляліся ўласнасцю БНР, зямля, застаючыся ў прыватнай уласнасці, павінна была бясплатна перадавацца тым, хто яе апрацоўваў.

Была зацверджана дзяржаўная сімволіка БНР, якая з`яўляецца набыткам нацыі, а не палітычнага ладу. Таму дзяржаўным гербам была зацверджана “Пагоня”, якая бярэ свае вытокі ў глыбокай старажытнасці. Так, у Вялікакняскім лісце жыхарам ад 20 лютага 1387 года гаварылася:”Згодна старажытным звычаям, вайсковы паход з`яўляецца абавязкам, які выконваецца за кошт уласных магчымасцяў і сродкаў, у тым выпадку, калі з`яўляецца неабходнасць праследу ворагаў, непрыяцеляў нашых… У праследу ворагаў, якое па-народнаму называецца “Пагоняю”, павінны ўдзельнічаць не толькі рыцары, але і кожны мужчына, які можа насіць зброю, якога б ён не быў паходжання і стану”.

Наступным аргументам, які, напэўна, паўплываў на выбар нашымі далёкімі продкамі ў якасці герба ”Пагоні”, з`яўляецца хрысціянская традыцыя. Як вядома, адным з герояў і святых у хрысціян з`яўляецца Георгій (Юрый), які сядзіць на белым кані з дзідаю, а пад нагамі каня ляжыць забіты змій.

Дзяржаўным сцягам беларусаў было зацверджана белае палотнішча з чырвонаю гарызантальнаю паласою ў цэнтры. Белы колер з`яўляецца сімвалам радасці, дабрадзейнасці і сумлення, якія ўласцівы характару беларусаў. Чырвоны колер - гэта сімвал храбрасці і адвагі, вернасці Радзіме, зноў жа характэрных рысаў беларусаў. Белы колер з чырвонымі стужкамі - гэта колеры Ісуса Хрыста, а значыцца, сімвалы святасці.

За кароткі час існавання БНР яе кіраўніцтвам было шмат чаго зроблена па

вырашэнню праблема ўасветы. У прыватнасці, пашырана сетка пачатковых і сярэдніх школ, створана бюро па напісанню падручнікаў, ад для іх выдання - Таварыства “Асвета”, арганізаваны курсы для настаўнікаў і школьныя інспекцыі. У Менску адкрыўся педагагічны інстытут. Стала выдавацца некалькі газэт і часопісаў. Дзейнічалі беларускі тэатр, Таварыства Драмы і камедыі, працаваў шэраг іншых установ культуры. Была створана і пачала дзейнічаць камісія па арганізацыі Беларускага універсітэту.

Утварэнне БНР з асаблівай цеплынёй падтрымалі шматтысячныя сходы беларусаў, якія знаходзіліся ў іншых краінах. Напрыклад, беларусы горада Адэсы ў прынятай імі 21 красавіка 1918 года Рэзалюцыі пісалі: “Вітаць утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і ўсімі сіламі падтрымаць Беларускі народны ўрад, цвёрда верачы, што ён пры падтрымцы ўсіх беларусаў выканае ўскладзеныя на яго цяжкія і адказныя задачы і выведзе беларускі народ непадзельным на шлях шырокага культурна-творчага і эканамічнага будаўніцтва. Няхай жыве Вольная Беларусь!”

Такім чынам, абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі - гэта была першая рэальная спроба пасля больш чым стагадовага існавання нашага краю ў ”турме народаў” (як называў Уладзімір Ульянаў (Ленін) Расейскую імперыю) здзейсніць нацыянальнае самавызначэнне на буржуазна-дэмакратынай аснове. І гістарычна такая мэта кіраўнікоў БНР была заканамерным, бо ў выніку перамогі буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, якой з`яўлялася Лютаўская 1917 года рэвалюцыя, дзяржава павінна была развівацца па буржуазна-дэмакратычным шляху. І калі адкінуць класавую зашоранасць і пакласці ў аснову аналізу гістарычных падзей іх заканамернасць і ўзаемасувязь, дык Днём незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь павінен лічыцца менавіта дзень 25 сакавіка. Трэба было б таксама аддаць належнае дзяржаўным і грамадскім дзеячам тых гадоў: Язэпу Варонку, Васілю Захарку, Івану Серадзе, Аркадзю Смолічу, Канстанціну Езавітаву, Язэпу Лёсіку, Тамашу Грыбу, Івану і Антону Луцкевічам, Аляксандру Цвікевічу, Сымону Раку-Міхайлоўскаму і іншым. Пашану беларускага народа яны заслужылі сваёй барацьбой за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

На жаль, пастаўленая кіраўніцтвам БНР мэта - стварыць незалежную і вольную Беларусь - не была здзейснена. Прычын таму было шмат. Перш за ўсё неспрыяльныя знешнія і ўнутраныя ўмовы - БНР была створана і існавала пад нямецкай акупацыяй, і германскія інтэрвенты, якія выношвалі планы захопу часткі тэрыторыі Беларусі, не хацелі падтрымліваць стварэнне незалежнай і вольнай беларускай дзяржавы. З утварэннем БНР ніяк не маглі пагадзіцца бальшавікі, галоўнай мэтай якіх было стварэнне сусветнага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. І 1 студзеня 1919 года ў Смаленску ў якасці альтэрнатывы БНР была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь.

Дзеля справядлівасці трэба прызнаць, што ў першыя гады існавання Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі было зроблена таксама нямала для далейшага росту нацыянальнай самасвядомасці народа. Дастаткова сказаць, што ў 1925-26 навучальным годзе на беларускай мове ішло выкладанне ў 79,6 працэнтаў пачатковых школ. Беларусізацыяй было ахоплена 63,2 працэнта сельска-гаспадарчых тэхнікумаў. У 1927 годзе на Беларусі выходзілі 20 газэт, з іх 10 - на беларускай мове, з 16 часопісаў 10 было беларускамоўных. У рэспубліцы былі адкрыты Акадэмія навук, некалькі вучэбных інстытутаў і тэатраў, народная мастацкая школа. Справа дайшла да таго, што ў 1927 годзе нават быў выдадзены “Практычны

беларускі армейскі слоўнік".

Аднак перыяд Беларусізацыі аказаўся, на жаль, вельмі кароткім. Ажыццяўленне будаўніцтва сацыялізму па бальшавіцкаму ўзору мела на ўвазе і адраджэнне імперыялістычнай тэорыі расейскага месіянізма. На змену ленінскай характарыстыкі Расейскай імперыі як "турмы народаў" зноў прайшла тэорыя, згодна з якой заваяванне Расеяй іншых народаў стала паказвацца як дзяржаўная неабходнасць, якая нібыта супадала з інтарэсамі саміх заваяваных народаў. Усе нацыянальна-вызваленчыя рухі, якія не ўкладваліся ў гэтую тэорыю, аб`яўляліся рэакцыйнымі. У пастанове XI з`езда КПБ(б) (лістапад 1927 года) гаварылася: "Калі дробнабуржуазны нацыяналізм і нацынал-дэмакратызм у Беларусі раней быў прагрэсіўнай з`явай - змагаўся з самадзяржаўем і даваў адпор прыгнёту рускага царызму, то ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту ён рабіўся контррэвалюцыйнай з`явай, накіраванай супраць дыктатуры пралетарыяту. Таму барацьба супраць нацыяналізму ўсіх нацый і адценняў, супраць нацыяналістычных ухілаў і нацыянал-дэмакратызму павінна быць і ў далейшым рашуча працягнута". На практыцы гэты заклік скончыўся знішчэннем нацыянальных кадраў.

Гісторыкаў скораных этнасаў прымусілі занава перапісваць гісторыю сваіх нацыяў. Напрыклад, у падручніку "История БССР" пад рэдакцыяй члена-карэспандэнта АПН СССР Л. Абэцэдарскага (Менск, "Народная асвета", 1975) кіраўнікі БНР кваліфікуюцца як "белорусские буржуазные националисты", якія нібыта "надеялись при помощи немецких штыков оторвать Белоруссию от Советской России, установить над трудящимися Белоруссии власть белорусских капиталистов и помещиков". "Эта небольшая группка заклятых врагов рабочих и крестьян, - гаварылася далей у падручніку, - объявила в условиях немецкой оккупации о создании так называемой "Белорусской Народной Республики", да еще назвала эту несуществующую "республику" независимой".

Але, нажаль, сёння, як і ў 1918 годзе, Беларусь зноў апынулася пад пагрозай страты сваёй незалежнасці. Пасля здзяйснення ў лістападзе 1996 года пад выглядам так званага рэферэндуму дзяржаўнага перавароту А. Лукашэнка і яго саўдзельнікі ўзялі курс фактычна на змену дзяржаўнага ладу і стварэнне нейкай "нябачнай дагэтуль дзяржавы", асновай якой, на іх думку, павінен стаць Саюз Беларусі і Расеі. Выцягнута наверх заплеснелая і ілжывая тэорыя аб адных каранях беларусаў і рускіх. На практыцы ўсё гэта азначае, што Рэспубліка Беларусь і яе народ становяцца "разменнай манетай" у палітычных гульнях чалавека, які адкрыта заяўляе аб сваіх сімпатыях да сусветна вядомага дыктатара - фашыста № 1 Адольфа Гітлера. Рэжым Лукашэнкі не толькі растаптаў дэмакратыю ў Беларусі, але, як у свой час і яго папярэднікі (германскі фашызм і сталіншчына), робіцца з кожным днём усё больш небяспечным для ўсёй Еўропы. Таму мы, усе, незалежна ад нацыянальнасці, хто пранікся клопатамі аб далейшым лёсе нашай Радзімы - Рэспублікі Беларусь, павінны аб`яднацца щ не дазволіць знішчыць выпакутаваную ў барацьбе і палітую потам шматлікіх пакаленняў нашых папярэдніх суайчыннікаў беларускую Дзяржаву.

Няхай сёння зноў гучыць і надае нам аптымізму прыйшоўшы да нас з глыбокай старажытнасці, сцвярджальны лозунг, у якім зліліся ў адно і паганскае заклінанне, і хрысціянская малітва, і заклік да барацьбы за сваю свабоду і незалежнасць - "Жыве Беларусь!"

***("Беларуская маладзёжная", 13-20 лютага 1998 год)***

# АСНОЎНЫ ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: СУТНАСЦЬ І ТРАГЕДЫЯ

### Да 4-ай гадавіны з дня прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

15 сакавіка 1994 года Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 12-га скліканняя прыняў першую Канстытуцыю адроджанай, сапраўды суверэннай беларускай дзяржавы - Рэспублікі Беларусь. Яе падпісаў тагачасны Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Мечыслаў Іванавіч Грыб. З таго часу дзень 15 сакавіка стаў дзяржаўным святам - Днём Канстытуцыі.

Канстытуцыя з`яўляецца самым важным законам дзяржавы, які замацоўвае асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу краіны, асноўныя правы і абавязкі грамадзян, будову органаў улады. Канстытуцыя - гэта Асноўны Закон краіны, і ўсё астатняе заканадаўства павінна грунтавацца на Канстытуцыі. Яе абавязаны паважаць і выконваць кожны грамадзянін краіны. Непавага да Канстытуцыі і яе парушэнне лічацца ва ўсіх дзяржавах цяжкім праступкам і караюцца па адпаведнаму закону.

У прэамбуле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пералічаны тыя высакародныя прынцыпы, якімі кіраваліся дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, прымаючы ад імя народа Рэспублікі Беларусь Асноўны Закон дзяржавы. Да іх, у прыватнасці, адносяцца:

адказнасць за цяперашні стан і будучыню Беларусі;

усведамленне сябе паўнапраўным суб`ектам сусветнага супольніцтва і падцвярджэнне сваёй прыхільнасці да агульначалавечых каштоўнасцяў; прызнанне свайго неад`емнага права на самавызначэнне;

улік шматвекавой гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці;

імкненне зацвердзіць правы і свабоды кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

жаданне забяспечыць грамадзянскую згоду, непахісныя ўстоі народаўладдзя і прававой дзяржавы.

У першым артыкуле Канстытуцыі гаворыцца, што “Рэспубліка Беларусь - унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава”. І кожна наступны артыкул Канстытуцыі абгрунтоўвае вызначаную мэту. Так, ужо ў другім артыкуле Канстытуцыі падкрэсліваецца, што ў Рэспубліцы Беларусь чалавек з`яўляецца найвышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы. Дзяржава адказная перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы.

Характэрнай асаблівасцю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994г.) з`яўляецца тое, што ў ёй перш за ўсё разглядаюцца асноўныя правы і абавязкі грамадзян, і толькі пасля гэтага - органы ўлады, чаго, скажам, не было, ды і не магло быць у канстытуцыях сталінскага перыяду, дзе чалавек быў шрубкай дзяржаўнага механізму. Такі новы падыход да размяшчэння раздзелаў канстытуцыі ўжо сам па сабе падкрэслівае дэмакратычна-сацыяльную накіраванасць дзяржавы.

Зыходзячы з міжнародных патрабаванняў да пабудовы дэмакратычнай дзяржавы Кастытуцыя Рэспублікі Беларусь прадугледжвае падзел функцый уладаў: заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Пры гэтым трэба адзначыць, што

спачатку ў падрыхтаваным праекце Канстытуцыі прадугледжвалася мець у Беларусі парламенцкую рэспубліку. І толькі тады, калі праект Канстытуцыі быў амаль ужо гатовы, у яго ўнеслі раздзел аб прэзідэнце з вялікімі паўнамоцтвамі апошняга, што прывяло ў галіне выканаўчай улады да парушэння баланса паміж правамі і абавязкамі. Усе правы аддаваліся прэзідэнту, а абавязкі - ўраду.

Справа ў тым, што тагачасны ўрад і яго старшыня Вячаслаў Кебіч замест пошукаў выйсця з крызіснага становішча сталі патрабаваць ад Вярхоўнага Савета ўсё новых і новых паўнамоцтваў. Да таго часу ўжо быў і прыклад: ва ўсіх астатніх былых саюзных рэспубліках, якія сталі маладымі дзяржавамі, былі абраны прэзідэнты. І Вячаславу Францавічу здавалася, што, калі і ён стане прэзідэнтам і будзе мець вялікую ўладу, справы пойдуць самі сабою. А тое, што гэтая вялікая ўлада можа дастацца зусім іншаму чалавеку, ні В. Кебічу, ні яго атачэнню ў той час нават у галаву не прыходзіла. Тым больш, што ў Вярхоўным Савеце 12-га склікання большасць дэпутатаў складалі былыя наменклатуршчыкі (сакратары абкамаў, райкамаў і гэтак далей), якія прывыклі жыць і працаваць ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы і падтрымлівалі Вячаслава Францавіча.

Так яно і здарылася. Наменклатуршчыкі не падвялі і на гэты раз.

Каб не праваліць справу з прыняццем Канстытуцыі (з ужо ўнесеным раздзелам аб прэзідэнце) дэпутат Генадзь Казлоў нават прапанаваў галасаваць імяннымі бюлетэнямі. Была абрана падліковая камісія, якую ўзначаліў дэпутат Віктар Ганчар (юрыст па адукацыі). Галасаванне ішло амаль тыдзень. Увесь гэты час на дэпутатаў ціснулі, “апрацоўвалі”. І, як вынік: “каманда” В. Кебіча дасягнула свайго. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята. Заставалася толькі пад моцную ўладу абраць моцнага прэзідэнта.

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што супраць увядзення пасады прэзідэнта ў Вярхоўным Савеце 12-га склікання выступала апазіцыя Беларускага Народнага Фронту, якая адмовілася прыняць удзел у галасаванні за Канстытуцыю. Супраць прэзідэнцкай пасады выступалі таксама Партыя камуністаў Беларуская і Аграрная партыя Беларусі.

Як і трэба было чакаць, усё здарылася не так, як думаў В. Кебіч і яго атачэнне. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў абраны Аляксандр Лукашэнка. І ў гэтым няма нічога дзіўнага, бо на той час збяднелае насельніцтва (а такога ў рэспубліцы стала большасць) ужо страціла надзею на асабістыя сілы і чакала нейкага выратавання. Людзі псіхалагічна былі паверыць толькі таму, хто абяцаў мацней пакараць “ворагаў”, якія давялі людзей да галечы, адабраць у багатых “награбленае” дабро і падзяліць яго паміж абяздоленымі. Менавіта такім сярод шасці кандыдатаў у прэзідэнты і быў Лукашэнка. Трагедыя ў тым, што ў цяжкі час, калі большасць людзей губляе веру ў свае сілы і чакае нейкага месію (выратавальніка), сітуацыя амаль заўжды выкарыстоўваецца самаўпэўненымі дэмагогамі, якія з`яўляюцца патэнцыяльнымі дыктатарамі. І А. Лукашэнка не стаў выключэннем з гэтага правіла.

Ужо ў першыя гадзіны лукашэнкаўскага прэзідэнцтва высветлілася, што тая каманда, якая прывяла яго да ўлады, не зможа кіраваць ажыццяўленнем хоць якіх эканамічных рэформаў. Большасць членаў гэтай каманды складалі былыя ваенныя, журналісты і юрысты. Таму пры фармаванні ўрада прыйшлося прыцягваць і тых, хто працаваў ва ўрадзе В. Кебіча і чые прозвішчы называліся кандыдатам у прэзідэнты А. Лукашэнкам сярод карупцыянераў і мафіёзі. Ужо гэта

сведчыла, што ніякіх новых падыходаў пры рэфармаванні эканомікі чакаць не даводзіцца. А калі да сказанага дадаць, што сам А. Лукашэнка ні тэарэтычна, ні практычна не быў падрыхтаваны да такой вялікай пасады, дык становіцца зразумела, чаму з рэспублікай адбываецца тое, што і павінна адбывацца пры такім узроўні кіраўніцтва.

Трагедыя беларускага прэзідэнцтва працягвалася. Не ведаючы, як вывесці краіну з крызісу, А. Лукашэнка стаў гаварыць аб дадатковых паўнамоцтвах, хаця на першую пару свайго прэзідэнцтва і заяўляў, што яму дадзены царскія правы. Гэтая заява адпавядала ісціне, бо сапраўды правоў у прэзідэнта хапала.

Але ж, як праўдзіва адзначыў італьянскі пісьменнік і грамадскі дзеяч XIX стагоддзя Карло Біні, "хто не ўмее кіраваць, той заўсёды становіцца ўзурпатарам". Яскравым падцвярджэннем гэтаму правілу з`яўляюцца дыктатары, якія не толькі не ўмеюць, але нават не ставяць перад сабою мэты займацца кіраўніцтвам эканомікай на карысць вырашэння сацыяльных праблем. Пры створаных імі рэжымах эканоміка поўнасцю падпарадкоўваецца дасягенню палітычных мэтаў, прычым, як правіла, з дапамогаю сілы. Па гэтай прычыне эканоміка дзяржаў з дыктатарскімі рэжымамі з`яўляецца звычайна мілітарызаванаю. Напрыклад, з сямі пунктаў "абавязкаў дзяржавы", якія сфармуляваў вядомы дыктатар XX стагоддзя Адольф Гітлер, няма ніводнага, які б прысвячаўся кіраўніцтву эканомікай. Затое ў ліку пералічаных "абавязкаў" дзяржавы значыцца неабходнасць "заахвочваць заняткі спортам сярод моладзі да беспрэцэдэнтнага ўзроўню падрыхтаванасці".(!)

Але эканоміка, скіраваная не на вырашэнне сацыяльных пытанняў, а нейкіх іншых мэтаў (у тым ліку і мілітарызацыю дзяржавы), з`яўляецца ненармальнай і пачварнай, а значыць і патрабуе ненармальных і пачварных метадаў кіраўніцтва. Менавіта таму ўжо праз месяц пасля прыходу да ўлады Гітлер дабіўся прыняцця "Закона аб абароне народа і рэйха". Гэтым законам па сутнасці перакрэслівалася так званая Веймарская Канстытуцыя - заканадаўчая аснова буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі ў Германіі. Закон надаў Гітлеру надзвычайныя паўнамоцтвы, чым і падвёў заканадаўчую базу пад дыктатарскі рэжым.

Вядома, што не прайшло і года з дня прэзідэнцтва, як метады кіраўніцтва Гітлера Лукашэнка стаў лічыць для сябе ўзорам. А праз два гады ён здзяйсняе дзяржаўны пераварот. Пры гэтым, як і яго кумір Гітлер, імкнецца надаць сваім антыканстытуцыйным дзеянням выгляд заканадаўчага акта. Была выбрана форма рэферэндуму, у час якога, маючы разгалінаваную сетку сваіх структур і адданыя ўзброеныя фармаванні, лёгка прымусіць народ галасаваць так, як патрэбна дыктатару, або і зусім сфальсіфікаваць вынікі галасавання. Менавіта таму той жа Гітлер правёў аж пяць рэферэндумаў і ўсе выйграў.

Гісторыя Беларусі назаўжды захавае ў сваёй памяці тыя трагічныя лістападаўскія дні 1996 года, калі з дапамогай ботаў аўтаматчыкаў і гусеніц бронетранспарцёраў, што былі ўведзены на вуліцы Менска і блакавалі будынак Цэнтрвыбаркаму, Лукашэнка растаптаў маладыя парасткі дэмакратыі, якія заканадаўча замацоўваліся Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Так званы лістападаўскі (1996г.) рэферэндум быў праведзены з мноствам парушэнняў дзеючай Канстытуцыі і заканадаўства. Таму вынікі яго не могуць быць прызнаны легітымнымі. І толькі кіраўнікі Расеі, якія самі растралялі свой вышэйшы заканадаўчы орган, а разам з тым і былую канстытуцыю краіны (і зрабілі выгляд, што нічога злачыннага пры гэтым не адбылося), "працягнулі" таксама праз

рэферэндум новую канстытуцыю з “царскімі” паўнамоцтвамі прэзідэнта, давялі большасць свайго народа да галечы, грубаю сілаю падаўляюць імкненне нацыянальных меншасцяў да незалежнасці, толькі яны дапамаглі Лукашэнку здзейсніць дзяржаўны пераварот, а сёння працягваюць падтрымліваць у Беларусі антынародны дыктатарскі рэжым.

Канцэнтрацыя ўсёй улады ў сваіх руках спатрэбілася Лукашэнку як дыктатару для здзяйснення сваёй сумасброднай мэты - стварэння нейкай “нябачнай дагэтуль дзяржавы”, стрыжнем якой, на яго думку, павінен стаць новы Саюз Беларусі і Расеі. Да гэтай мэты ён пачаў імкнуцца амаль з першыў месяцаў свайго прэзідэнцтва. Гэтай мэце сёння падпарадкавана і развіццё эканомікі, і бязмежнае павелічэнне колькасці ўзброеных фармаванняў, і так званая ідэалогія яднання славянскіх народаў.

Ужо ў першыя дні свайго прэзідэнцтва Лукашэнка груба парушыў 33 і 34 артыкулы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, першы з якіх забараняе манапалізацыю сродкаў масавай інфармацыі дзяржавы, грамадскімі аб`днаннамі або асобнымі грамадзянамі і не дапускае ўвядзенне цэнзуры; другі гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб`ядненаняў, аб палітычным, эканамічным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя. У тыя ж дні пачаў парушацца і артыкул 28, у якім гаворыцца, што кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замахаў на тайны яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў, на яго гонар і годнасць. Прэзідэнцкімі структурамі манапалізаваны амаль усе электронныя і больш за 90% агульнага тыражу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, у краіне ўведзена цэнзура, вядзенне падслухоўванне тэлефонных перагавораў, кантралюецца перапіска грамадзян. З экранаў тэлевізараў, па радыё, са старонак прэзідэнцкіх газэт і часопісаў штодзённа на жыхароў рэспублікі абрушваецца паток ілжы.

Без усялякіх на тое падстаў ужо з першых дзён свайго кіравання дзяржавай Лукашэнка пачаў абвінавачваць ні ў чым непавінных людзей, і ў першую чаргу дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, у розных злачынствах, хаця ў артыкуле 26-ым Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь падкрэсліваецца, што ніхто не можа быць прызнаны вінаватым у злачынстве, калі яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку даказана і ўстаноўлена прысудам суда, які ўступіў у законную сілу. Той, каго абвінавачваюць, не павінен даказваць сваю невінаватасць.

Пад прыкрыццём асабістай аховы было створана антыканстытуцыйнае ўзброенае фармаванне, якое і дапамагло Лукашэнку здзейсніць дзяржаўны пераварот.

Галоўным заганам пачварства (па другому яго проста нельга назваць), якое атрымалася пасля ўнясення лукашэнкаўскіх так званых дапаўненняў і змен у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь (1994г.) з`яўляецца адсутнасць там падзелу ўладаў - усе галіны ўладаў цяпер узурпіраваў прэзідэнт. Яму поўнасцю падпарадкоўваецца выканаўчая ўлада, ён па сутнасці фармуе верхнюю палату так званага Нацыянальнага Сходу, ён падабраў і членаў ніжняй палаты, ён выдае дэкрэты, якія маюць сілу законаў, ён прызначае судздз`яў, якія судзяць не на падставе законаў, прынятых абраным народам заканадаўчым органам, а

прэзідэнцкіх дэкрэтаў. Усё гэта гаворыць, па-першае, аб тым, што прагрэсіўная грамадскасць не можа назваць па іншаму як дыктатарскім, той рэжым улады, які ўстанавіў Лукашэнка пасля здзяйснення дзяржаўнага перавароту, а, па-ддругое, пры далейшым удасканаленні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ніяк не можа брацца за аснову лукашэнкаўскі варыянт, які прыдуманы ім і яго паплечнікамі на самой справе для таго, каб нeяк заканадаўча абгрунтаваць дыктатарскі рэжым.

Сёння ў Беларусі не дзейнічае ніводны артыкул Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якім прадугледжваюцца сацыяльныя гарантыі грамадзян. Напрыклад, у артыкуле 39 сказана, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці са сваімі здольнасцямі, прафесійнай падрыхтоўкай маюць права роўнага доступу да любых пасад у дзяржаўных органах. А на самой справе пры прызначэнні на дзяржаўныя пасады за аснову бярэцца адно - ступень адданасці асабіста Лукашэнку і падтрымка ягонай палітыкі. Прыкладам сказанага з`яўляецца падача заяў групай дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з просьбаю залічыць іх у так званую палату Нацыянальнага Сходу. У заяве прасіцелі павінны былі прызнаваць той варыянт Канстытуцыі, якому была гвалтоўна указам прэзідэнта нададзена заканадаўчая сіла. Скажам проста, што такога прыніжэння чалавечай годнасці Беларусь не ведала з дня падаўлення паўстання 1830 года, калі ўсіх мясцовых чыноўнікаў прымусілі даваць падпіску аб сваёй палітычнай адданасці рэжыму Мікалая I.

Дэкрэтам прэзідэнта ўведзена прымусовая праца для беспрацоўных, што катэгарычна забараняецца рабіць артыкулам 41 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Па-блюзнерску гучаць артыкулы 45 і 47, якія гарантуюць грамадзянам Рэспублікі Беларусь ”права на ахову здароўя, уключаючы бясплатнае лячэнне ў дзяржаўных установах аховы здароўя” і “права на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці”, бо за цяперашнія пенсіі можна весці толькі паўгалоднае існаванне. Дзяржава перастала гарантаваць і права на атрыманне жылля.

У Беларусі штодзённа парушаюцца правы і свабоды асобы. Да сказанага трэба дадаць, што службовыя асобы перасталі лічыць сябе абавязанымі разглядаць звароты і даваць адказы па сутнасці ў вызначаны законам тэрмін. Такімі абавязкамі грэбуе нават пракуратура Рэспублікі Беларусь, чым паказвае дрэнны прыклад для іншых.

У свой час, пасля падаўлення ў Беларусі паўстання 1863 года, душыцель свабоды ў нашым краі М. Мураўёў прызнаваўся: “Очень часто я сажаю мятежников без малейшей вины, даже подозрения нет; ну, в таком случае я всегда думаю: посидит под замком, да подолее, быть может, что-нибудь да отыщется. И что же вы думаете? Я был так счастлив, что всегда что-нибудь за сидельцем-то моим и отыскивал. Ну тогда и подай сюда!”

З той пары, калі былі сказаны гэтыя жахлівыя словы, прайшло больш за сто гадоў, але норавы і цяперашніх прыслужнікаў лукашэнкаўскага дыктатарскага рэжыму засталіся на той жа ступені цемрашальства. Сёння, як і тады, спачатку затрымоўваюць і арыштоўваюць, у тым ліку і дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, міністраў, журналістаў, а пасля шукаюць “абгрунтаванне”. І гэтым груба парушаецца артыкул 25 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, што таксама сведчыць аб дыктатарскім характары існуючага ў Беларусі рэжыму.

Падводзячы вынікі кароткага аналізу сутнасці і здарыўшайся трагедыі з

ажыццяўленнем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь я хацеў бы нагадаць адну фразу, сказаную вядомым прэзідэнтам Злучаных Штатаў Амерыкі Аўраамам Лінкольнам: “Можна абдурваць частку народа ўвесь час; можна абдурваць увесь народ некаторы час, але нельга абдурваць увесь час увесь народ”. Таму ў гэтыя перадсвяточныя дні я заклікаю кожнага жыхара Беларусі, незалежна ад яго нацыянальнасці і веравызнання, пастарацца зразумець, хто намі кіруе і што адбываецца ў краіне. І чым хутчэй мы гэта зразумеем, тым хутчэй Рэспубліка Беларусь стане дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржаваю, як таго і патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

***(“Беларуская маладзёжная”, 13-20 сакавіка1998 года)***

KAMUNIKAT.org

# ПАКУЛЬ БЕЛАРУССЮ БУДЗЕ КІРАВАЦЬ ЛУКАШЭНКА, А БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІКАЙ І КУЛЬТУРАЙ - ПАЛКОЎНІКІ, НАРОД БЕЛАРУСІ АСУДЖАНЫ НА ГАЛЕЧУ І ГІБЕННЕ

Агідна глядзець на ўсю гэтую "свістапляску", якую паднялі прэзідэнт Лукашэнка і яго каманда вакол сітуацыі з катастрафічным падзеннем беларускага рубля. Каго яны толькі не абвінавачваюць у гэтым відавочным правале сваёй палітыкі: Захад, апазіцыю, Маскву, мясцовых банкіраў, нейкіх неназваных жулікаў і… Справа дайшла да прамых абразаў людзей, што гаворыць ужо аб маральным узроўні саміх кіраўнікоў рэспублікі, а вінаваты ў "катастрофе" добра вядомы - гэта сам Лукашэнка. Тое, што рэспубліка атрымала - вынік яго некампетэнтнасці і амбіцыйнасці. Як і ўсе дыктатары, ён не прымае побач з сабою граматных, прафесійна падрыхтаваных людзей.

Узгадваю, што хутка пасля абрання мяне Старшынёю Вярхоўнага Савета я прыйшоў да Лукашэнкі і сказаў: "Аляксандр Рыгоравіч, па майму глыбокаму перакананню, галоўнае, чым мы ўсе павінны неадкладна зараз займацца, - гэта эканоміка, бо яна з`яўляецца грунтам усяго грамадскага жыцця. Гэта неабходна рабіць яшчэ і таму, што эканоміка знаходзіцца ў вельмі глыбокім крызісе". І паколькі вывад эканомікі з крызісу патрабуе калектыўнага розуму многіх вучоных, кіраўнікоў і спецыялістаў народнай гаспадаркі, я прапанаваў стварыць з гэтай мэтаю камісію. Прычым, я прапанаваў яму ўзначаліць гэтую камісію. Лічыў, што мы з М. М. Чыгіром, тагачасным прэм`ер-міністрам, маючы пэўны тэарэтычны і практычны вопыт, зможам прыняць удзел у працы гэтай камісіі на правах намеснікаў кіраўніка. Лукашэнка маю прапанову прыняў. Але ўжо праз два дні заявіў: "Не, гэтым пытаннем будзе займацца Шэйман…" Безумоўна, у гэтай сувязі міжволі на розум прыходзяць радкі вядомай кожнаму вучню байкі І. Крылова "Беда, коль пироги начнет печи сапожник, а сапоги точить пирожник". Як адбывалася на самой справе, таксама магу расказаць. Скажам, аб`яўлялась паседжанне Савета бяспекі, на якім планавалася заслухаць даклад прэм`ер-міністра аб неадкладных мерах па выводу эканомікі з крызісу. Але першым слова браў прэзідэнт, які паводзіў сябе ўзбуджана, нервова, палохаў усіх усемагчымымі пакараннямі. Пасля гэткага "ўступу" ўдзельнікі паседжання думалі ўжо не аб сур`ёзнай працы, а толькі аб тым, каб адсядзецца, прамаўчаць, не дай Бог, не наклікаць на сябе "манаршы" гнеў. І вось у гэткіх абставінах слова давалася М. Чыгіру, пасля чаго з садакладам выступаў … Шэйман(!). Як і патрэбна было чакаць, замест эканамічнага аналізу, у гэтым садакладзе быў набор штампаў з ваенна-паліцэйскага жаргону. Заканчвалась паседжанне крыкамі і пагрозамі ўсё таго ж Лукашэнкі. "Я веру толькі аднаму Шэйману", - нервова заключаў прэзідэнт. Дык чаго ж можна было чакаць далей ад такога кіраўніцтва?

Самае страшнае, што людзі, граматныя і кваліфікаваныя, у такіх абставінах дэградуюць, кажуць зусім не тое, аб чым думаюць на самой справе. Кожны гаворыць толькі тое, што ад яго хоча пачуць правадыр. І гэта наглядна было бачна з інтэрв`ю беларускаму тэлебачанню кіраўніка Нацбанка Г. Алейнікава. Проста шкада было глядзець на спадара Алейнікава - застрашаны, затузаны чалавек, які, напэўна ж, ведае сапраўдныя прычыны абвалу рубля, але перад тэлекамерай, саромеючыся, нешта незразумелае гаворыць аб ад`ездзе прэзідэнта з краіны, аб камерцыйных банках… Не выратавала!

Падобная знявага бачна, калі глядзіш інтэрв`ю і іншых чыноўнікаў, пачынаючы са Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь С. Лінга і канчаючы шараговымі работнікамі службы Дзяржакантролю. Усе яны адзін перад другім імкнуцца абяліць Лукашэнку і гатовыя “несці” з гэтай мэтаю проста любую бязглуздзіцу, забываючыся пры гэтым аб сваім гонары і годнасці.

Атмасфера страху, якая пануе сёння ў Беларусі, нагадвае трыццатыя гады. Тады, калі па тэхнічных прычынах не ўдавалася запусціць якісьці завод або шахту, усё спісвалі на здраднікаў і шукалі ворагаў народа. І садзілі, садзілі, садзілі… Нельга забываць, што “Трасцянцу” папярэднічалі “Курапаты”. Дык што ж, трэба зноў паўтарыць гэтую крывавую гісторыю? Зноў ворагі, ворагі… Акрамя аднаго Шэймана. Ці ж каму невядома, што ніхто іншы, як Лукашэнка мог даць каманду выпускаць “пустыя” грошы? Ва ўмовах жорсткага рэжыму ніхто іншы зрабіць гэта не асмеліўся б. Але тады ўзнікае пытанне - навошта яму гэта спатрэбілася? Ці ж ён, маючы не толькі гістарычную, але і эканамічную адукацыю, не ведае, што эканамічныя законы абектыўныя і з імі патрэбна лічыцца? Мяркуйце самі: за 1997 год грашовая маса ў Беларусі вырасла з 20,8 трыльёна рублёў да 42 трыльёнаў.

Застаецца толькі адно тлумачэнне гэткай эканамічнай безграматнасці: усё гэта спатрэбілася для таго, каб стварыць бачнасць дабрабыту, каб, раз`язджаючы па расейскай глыбінцы, без стомленасці хваліцца, маўляў, у нас не бывае затрымкі з выплатамі заробкаў і пенсій, эканоміка квітнее, словам, самае стабільнае становішча… Блеф і цынічная хлусня дорага абыходзяцца людзям, бо нестрыманае павышанне цэн крыкамі не спыніш, “заяц” каманды “Стоп!” не разумее. Такім чынам, гэта пакуль што кветкі, ягады яшчэ наперадзе, і “з`есці” іх народу прыйдзецца вельмі хутка, якімі б горкімі яны ні былі.

Агідна глядзець на тое, як С. Лінг просіць прысланць з Масквы настаўнікаў (патрэбна аддаць належнае высокаму прафесіяналізму расейскіх эканамістаў). Крок гэткага кшталту спадара Лінга зневажальны для беларускага народа. Няўжо ў нас няма сваіх разумных і талковых спецыялістаў?! Так, Сяргей Сцяпанавіч па складу свайго розуму больш больш статыст і прапагандыст, чым аналітык, а таму ноша кіраўніцтва эканамічнымі рэформамі яму не пад сілу. Але ж на ім свет клінам не сышоўся! У Беларусі ёсць дастаткова спецыялістаў, якія ў кароткі тэрмін могуць вывесці краіну з крызісу. Але паважаючы ўласную годнасць, яны ніколі не пойдуць да Лукашэнкі.

Страшная бяда чакае яшчэ і беларускую укультуру. Гонар нацыі - Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Радзім Гарэцкі і іншыя вядомыя ў рэспубліцы сталпы культуры - адхілены ад кіраўніцтва духоўнай сферай. Я думаю, Янка Купала і Якуб Колас перавярнуліся б у магіле, даведаўшыся, што галоўным куратарам культуры і навукі ў Беларусі стаў палкоўнік Замяталін. Гэта ж абсурд - Шэйман кіруе эканомікай, Замяталін - культурай, Посахаў сцвярджае, што, нібыта інтарэсы беларускага народа патрабуюць вяртання ў рэспубліку ядзернай зброі(!).

Хацеў бы выказаць сваё меркаванне і наконт з`явіўшыхся размоў, што у абвале рубля вінаваты толькі ўрад. Віны з Лінга і яго кабінета ніхто не здымае. Але ці ж па вялікаму рахунку справа толькі ва ўрадзе? Ва ўмовах дыктатуры практычна не мае значэнне, хто кіруе ўрадам і парламентам, гэтыя людзі мала што вырашаюць.

Таму ў нядаўна прынятай заяве дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання ўтрымліваецца патрабаванне адстаўкі не толькі ўрада, але і прэзідэнта, якія вядуць народ да галечы і вінаватыя ў разбурэнні эканомікі краіны.

***(“Народная воля”, 24 сакавіка 1998 года)***

## ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МАЛІТВА

**Выступ на мітынгу “Чарнобыльскі шлях”, 26 красавіка 1998 г.**

Завошта, Божа, так Ты пакараў
Народ наш беларускі?
Бяду з Чарнобыля наслаў
На нашы гарады і вёскі.

І без таго народ наш быў пакутнік,
Шмат праліў крыві і поту.
О, Божа! Адзіны наш заступнік!
Пазбаў нас ад Чанобыльскай брыдоты!

Войны, нацыянальны гнёт, пагарду -
Усё перанёс народ працалюбівы.
Дык няўжо і сёння ён не варты
Жыць заможна і шчасліва?

Навошта, Божа, ты дадаў
Да “Чарнобыля” і ўладу лукашыстаў?
Якая, быццам бы, удаў,
Душыць беларусаў усіх чыста.

Цябе прашу я: Божа Усявышні!
Змілуйся! Да цябе малюсь!
Пазбаў і ад “Чарнобыля” і лукашыстаў
Ты Нашу Маці - Беларусь!

# ЦЯРНІСТЫ ШЛЯХ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**Да 8-ай гадавіны з дня прыняцця**
**Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі**

Беларусы, як і іншыя народы свету, маюць правы на сваю незалежнасць і дзяржаўнасць, і яны заўсёды імкнуліся да гэтага. Ужо ў IX стагоддзі продкі беларусаў, крывічы, мелі сваю дзяржаву - Полацкае княства, якое на працягу стагодзяў захоўвала сваю незалежнасць. Вядомым у той час было і Тураўска-Пінскае княства, якое стварылі іншыя прародзічы беларусаў - дрыгавічы. Далейшая фармаванне беларускай нацыі адбывалася ў Вялікім княстве Літоўскім, першай сталіцай якога стаў Наваградак, а з 1323 года - горад Вільня. У сярэднія вякі Вялікае княства Літоўскае было адной з самых буйных і развітых дзяржаў Еўропы. Ужо ў XVI стагоддзі тут была праведзена аграрная рэформа, у выніку якой пры вызначэнні абавязкаў перад дзяржавай стала ўлічвацца не толькі колькасць, але і якасць зямлі. Развіваліся рамёствы і адносна хутка раслі гарады. Шмат чаго было зроблена ў Вялікім княстве Літоўскім і ў галіне духоўнага жыцця. Напрыклад, ужо ў 1570 годзе ў Вільні быў адкрыты калегіюм (на ангельскі лад - каледж), які праз дзевяць гадоўператварылі ў Акадэмію, адкрыўшы пры гэтым калегіюмы ў Бярэсці, Пінску, Наваградку, Полацку і іншых гарадах. Вялікі ўклад быў унесены ў распрацоўку беларускай мовы, якая з`яўлялася ў Вялікім княстве Літоўскім дзяржаўнай. Менавіта на беларускай мове былі выдадзены ў 1529, 1566, 1588 гадах Статуты Вялікага княства Літоўскага, у якіх ужо тады замацоўваліся многія дэмакратычныя формы грамадскага і палітычнага жыцця.

Выгаднае геапалітычнае становішча Беларусі прываблівала яе суседзяў, і з цягам часу яна стала “разменнай манетай” у імперскіх амбіцыях іншых дзяржаў, якія змагаліся паміж сабою за валоданне яе тэрыторыяй. Сваю дзяржаўную незалежнасць Беларусь канчаткова страціла на доўгія гады пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795г.г.). І далучэнне беларускіх зямель да Расейскай імперыі. Беларусь падзялілі на два генерал-губернатарствы, чым парушылі яе цэласнасць. У 1833 годзе быў зачынены Віленскі універсітэт як асноўная крыніца беларускасці. На рускую мову навучання перавялі гімназіі Магілёўскай і Віцебскай губерняў. У школах пашырылася выкладанне не толькі рускай мовы, але гісторыі і геаграфіі Расеі.

Для апраўдання русіфікацыі беларускага народа была сфармавана тэорыя “западно-руссизма”, якая адмаўляе існаванне беларускай нацыі навогул. Менавіта ў 30-ых гадах XIX стагоддзя тагачасны міністр адукацыі “Всероссийской империи” граф С. Увараў сфармуляваў шавіністычную дактрыну, згодна з якой апраўдвалася русіфікацыя ўсіх народаў, якія ўваходзілі ў імперыю: “Православие, самодержавие, народность”. У 1840 годзе Мікалай I забараніў нават ужыванне назваў Беларусь і Літва. У той час быў адменены і Статут Вялікага княства Літоўскага.

У выдадзеным у 1874 годзе “Русском энциклопедическом словаре” т. 4, аддзел 1, ст. 507) гаварылася, што “название Беларусь есть географический термин и не имеет особого этнографического значения, потому что ни особой народности, ни даже племени белорусского не суіществлвало..”.

Аднак беларускі народ не мог пагадзіцца з гэтым і ўвесь час вёў барацьбу за

сваю незалежнасць. Адной з яскравых старонак гэтай барацьбы з`яўляецца паўстанне 1863 года пад кіраўніцтва Кастуся Каліноўскага. Менавіта К. Каліноўскі адным з першых барацьбітоў за адраджэнне беларускай дзяржаўнасці ставіў адначасова і задачу змены сацыяльна-палітычнага ладу. Яго лозунг "Не народ для ўрада, а ўрад для народа" і сёння застаецца надзвычай актуальным.

Гаворачы аб метадах, якія прымяняліся царскім урадам для скарэння беларусаў, яго палітыцы, трэба адзначыць, што амаль пасля кожнага паўстання ўсё шляхецкае насельніцтва прымушалі падпісваць вернападданіцкія лісты. Вось і пасля паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага кожны шляхціц павінен быў падпісаць ліст наступнага зместу: "Всеавгустейший монарх! Смуты революции вовлекли многих из дворян Виленской (или Могилевской, Минской, Гродненской, Витебской) губернии к нарушению верноподданической присяги Вашему Величеству. Отвергая действие революционной партии, по причине которой от нескольких месяцев земля наша обагряется кровью по большей части напрасных жертв, чистоседечно и гласно просим тебя, Государь, считать нас верноподдаными твоими, заявляя при сем, что мы, составляя одно целое и нераздельное с Россиею, остаемся навсегда верноподдаными твоими, вверяя сулдьбу дворянства, августейший монарх, твоему неограниченному милосердию".

Як бачна з прыведзенага факта, нічога новага не было прыдумана у Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, калі дэпутатаў Вярхоўнага Савета прымушалі падпісваць такія ж вернападданіцкія лісты, а да тых, хто гэтага не зрабіў, як і ў той далёкі час, прымяняюцца рэпрэсіўныя меры.

Але ні прыніжэнні, ні канфіскацыі, ні турмы і шыбеніцы не змаглі скарыць беларускі народ. Лагічным завяршэннем яго барацьбы за адраджэнне сваёй дзяржавы стала абвяшчэнне ў 1918 годзе Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Гэтаму ў многім паспрыяла Лютаўская рэвалюцыя 1917 года ў Расейскай імперыі, у час якой быў разбураны феадальна-манархічны механізм утрымання розных народаў у адной дзяржаве. Рашэнне аб абвяшчэнні незалежнасці беларускай дзяржавы было прынята 25 сакавіка 1918 года на паседжанні Рады БНР. Гэты крок аказаў значны ўплыў на развіццё нацыянальнай свядомасці ў беларускага народа. Менавіта тады была зацверджана і дзяржаўная сімволіка БНР, якая з`яўляецца набыткам нацыі, а не палітычнага ладу, як гэта да сённяшняга дня лічаць некаторыя палітыкі. Доказам правільнасці гэтага сцвярджэння з`яўляецца той факт, што, акрамя краін, якія ўвайшлі ў якасці рэспублік у склад Савецкага Саюза, амаль ва ўсіх іншых сімволіка не мянялася на працягу стагоддзяў, хоць сацыяльна-палітычны лад і мяняўся па некалькі разоў. Ды і ў былых савецкіх рэспубліках (Расея, Украіна, Латвія, Літва і іншыя) пасля адраджэння іх дзяржаўнасці сімволікай сталі іх даўнія гербы і сцягі. Дзяржаўным гербам БНР была зацверджана "Пагоня", якая, пачынаючы з XIV стагоддзя, адыгрывала гэткую ролю ў Вялікім княстве Літоўскім. Дзяржаўным сцягам БНР стала белае палотнішча з чырвонаю гарызантальнаю паласою пасярэдзіне. Гэты сцяг з`яўляецца адным з тых, якія мелі ваяры Вялікага княства Літоўскага яшчэ ў Грунвальдскай бітве 1410 года.

Са стварэннем незалежнай, вольнай Беларускай Народнай Рэспублікі ніяк не маглі пагадзіцца бальшавікі, якія ў кастрычніку 1917 года захапілі ўладу ў Петраградзе, і ставілі сваёй задачай стварэнне сусветнага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. І 1 студзеня 1919 года ў якасці альтэрнатывы БНР у

Смаленску была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь, якая, на жаль, толькі на паперы лічылася незалежнай суверэннай дзяржавай. На самой жа справе з першых дзён яе існавання ўсе вышэйшыя кіраўнікі рэспублікі прызначаліся Масквою, а ў канцы 20-ых гадоў і наогул пачала адраджацца тэорыя расейскага месіянства. Згодна з гэтай тэорыяй, заваёва Расеяй іншых народаў стала зноў тлумачыцца як дзяржаўная неабходнасць, якая нібыта супадала з інтарэсамі саміх заваяваных народаў. Феадальна-манархічны механізм утрымання розных народаў у складзе Расейскай імперыі быў заменены ў Савецкім Саюзе камуністычна-партыйным "дэмакратычным цэнтралізмам", які па сваёй сутнасці быў толькі цэнтралізмам. Усе захады дзеля нацыянальнага адраджэння сталі лічыцца "контррэвалюцыйнай з`явай, накіраванай супраць дыктатуры пралетарыяту". Яскравым помнікам тых гадоў, калі Савецкі Саюз, кажучы словамі Леніна, стаў "турмою народаў", з`яўляюцца дзесяткі "Курапатаў", раскіданых па ўсёй былой яго тэрыторыі.
Толькі ў 1990 годзе, калі ўжо стала бачна, што створаная бальшавікамі новая імперыя - Савецкі Саюз, як і прыдуманы імі сацыялізм, - аказаліся нежыццездольнымі, рэспублікі пачалі прымаць рашэнні аб дзяржаўным суверэнітэце. Дарэчы, прыклад у гэтым паказала Расейская Федэрацыя. Беларусь прыняла Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце 27 ліпеня 1990 года.

Дзяржаўны суверэнітэт, гаварылася ў Дэкларацыі, абвяшчаецца ў імя вышэйшай мэты свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна на аснове забеспячэння правоў асобы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і міжнароднымі абавязацельствамі.

У жніўні 1991 года Дэкларацыі аб суверэнітэце была нададзена сіла закона, а сама Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята 15 сакавіка 1994 года. наша краіна з`яўляецца, згодна з Канстытуцыяй, унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, якая валодае верхавенствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку.

25 сакавіка 1918 года, 1 студзеня 1919 года, 27 ліпеня 1990 і 15 сакавіка 1994 года - гэта ўсё этапы цярністага шляху Беларусі і яе народа да незалежнасці. Кожную з гэтых дат можна ацэньваць па-рознаму, але яны належаць гісторыі Рэспублікі Беларусь, і нельга ніводную з іхануліраваць. Аднак прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка ў выніку падмены паняццяў і фальсіфікацыі вынікаў лістападаўскага (1996г.) рэферэндуму абвясціў дзяржаўным святам - Днём Рэспублікі - 3 ліпеня, дзень вызвалення горада Менска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Такім чынам былі скасаваны ўсе даты, якія абазначалі пэўныя этапы пройдзенага беларускім народам шляху да сваёй дзяржаўнай незалежнасці. Пры гэтым размытым аказаўся і сам дзень вызвалення горада Менска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, чым нанесена вялікая крыўда франтавікам, для якіх 3 ліпеня заўжды будзе святым.

За скасаваннем беларускага календара Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь (27 ліпеня) і іншых датаў (25 сакавіка, 1 студзеня, 15 сакавіка), што нагадвалі жыхарам Беларусі аб нялёгкім шляху да дзяржаўнай незалежнасці, трэба, я лічу, бачыць практычныя крокі па ліквідацыі дзяржаўнай незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Пазбаўлена статусу дзяржаўнай нацыянальная сімволіка, зноў апынулася ў апале наша родная мова. Людзям убіваюць у галовы, што Беларусь нібыта не можа жыць без Расеі.

Галоўнымі дарадчыкамі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сталі палкоўнікі расейскай арміі. Так, развіццё навукі і культуры беларускага народа аддадзена ў рукі расейскага палкоўніка У. Замяталіна. Пры гэтым я хачу падкрэсліць, што беларускай гісторыі вядомы прозвішчы не толькі С. Уварава, М. Мураўёва і У. Замяталіна. Беларускі народ заўжды будзе ўдзячны рускім па нацыянальнасці А. Герцэну, М. Дабралюбаву, М. Бакуніну, якія выказаліся за права беларусаў на сваё самавызначэнне. Назаўжды ў памяці беларусаў застануцца і тыя сыны вялікага рускага народа, якія змагаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны з нашым агульным ворагам - фашызмам. Прыклад сваёй дабрасумленнасці паказваюць у сённяшнія цяжкія часы для Беларусі рускія па нацыянальнасці дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь У. Савічаў і В. Шчукін.

Разам з ліквідацыяй усяго, што нагадвае людзям аб пражыванні іх у краіне, якая здавён мае назву Беларусь, Лукашэнка і яго акружэнне, я лічу, ставяць сваёй задачаю вяртанне да таталітарнага ладу. Менавіта таму побач з партрэтамі Лукашэнкі амаль заўжды на святкаваннях у Менску выносяцца партрэты Сталіна. Пры гэтым заўважым, што ўжо і ў Маскве побач з партрэтамі Сталіна пачалі з`яўляцца партрэты Лукашэнкі.

У рэспубліцы Беларусь пад прыкрыццём так званага лістападаўскага рэферэндуму растаптана Канстытуцыя, парушаюцца законнасць, правы і свабоды чалавека. Для барацьбы з іншадумцамі адраджаюцца метады Мураўёва і Цанавы. Дарэчы, першы з іх прызнаваўся: “Очень часто я сажаю мятежников без малейшей вины, даже подозрения нет; ну в таком случае я всегда думаю: посидит под замком, да подолее, быть может, что-нибудь да отыщется. И что же вы думаете? Я был счастлив, что всегда что-нибудь за сидельцем-то моим и отыскивалось. Ну тогда и подай сюда!”.

У Беларусі сфармавалася новая разнавіднасць дыктатарскага ладу, які народ празваў лукашызмам. На ўзбраенне ўзяты сацыяльная дэмагогія і папулізм, улады абапіраюцца на незадаволенасць становішчам, што склалася пасля пацярпеўшага крах бальшавіцкага сацыялізму і распаду Савецкага Саюза. Радзімаю лукашызму стала Беларусь, таму што менавіта тут, як ні ў адной іншай былой камуністычнай краіне, затрымалася ажыццяўленне рэфомаў па перабудове цэнтралізавана-планавай эканомікі ў рынкавую. Прыцягальным лукашызм стаў і ў іншых краінах (Расея, Украіна і гэтак далей), дзе таксама ёсць пэўныя цяжкасці з перабудовай эканомікі і адрадзіліся камуністычныя партыі ўсё на тых жа самых ленінска-сталінскіх прынцыпах.

Сёння лукашызм ужо становіцца міжнароднай плынню і прэтэндуе на стварэнне, па словах Лукашэнкі, “нябачнай дагэтуль у свеце” славянскай дзяржавы. Лукашэнкавы дарадчыкі адкрыта заяўляюць аб сваіх імкненях да валодання ядзернай зброяй. Усё гэта нясе вядомую небяспеку. Таму неабходна аб`яднацца ўсім дэмакратычным сілам , як у Беларусі, так і ў іншых краінах, каб своечасова пазбавіцца ад лукашызму як новай ракавай пухліны на целе грамадства. Беларусь павінна, як таго патрабуюць Дэкларацыя аб суверэнітэце, Канстытуцыя краіны, стаць дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай і заняць сваё пачэснае месца ў сям`і еўрапейскіх народаў.

***(“Народная воля”, 24 ліпеня 1998 года)***

# ЧОРНЫ ДЗЕНЬ

У кожнага народа, апроч рэлігійных святаў, ёсць яшчэ гады і дні, якія ўвайшлі ў яго жыццё як знамянальныя вехі. Для беларускага народа найбольш значнымі датамі гісторыі з`яўляюцца:

992 год - год узнікнення Полацкай хрысціянскай епархіі (зазначым, што ў той час яшчэ не было афіцыйнага падзелу хрысціянства на каталіцызм і праваслаўе, хаця і існавала ўжо некаторая розніца паміж абрадамі ўсходняй і заходняй яго часткі);

1253 год - год каранацыі першага караля беларуска-літоўскай дзяржавы, якая стала асновай Вялікага княства Літоўскага;

15 ліпеня 1410 года - дзень перамогі войск Вялікага княства Літоўскага (разам з войскамі Польскага каралеўства) над крыжакамі пры Грунвальдзе;

8 верасня 1514 года - дзень перамогі ваяроў Вялікага княства Літоўскага пад кіраўніцтвам Канстанціна Астрожскага над войскамі Маскоўскага князя Васіля III на рацэ Крапіўна пад Оршай;

1529, 1566, 1588г.г. - гады прыняцця Статута ў Вялікага княства Літоўскага;

25 сакавіка 1918 года - дзень абвяшэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі;

3 ліпеня 1944 года - дзень вызвалення сталіцы Беларусі горада Менска ад нямецка-фашысцкіх акупантаў;

27 ліпеня 1990 года - дзень прыняцця Вярхоўным Саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР;

15 сакавіка 1994 года - Дзень Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Рэспублікі Беларусь.

Але ёсць і шмат такіх дат, якія ўвайшлі ў жыццё народа як чорныя, прынёсшыя людзям смутак і гора. Такімі датамі для беларусаў з`яўляюцца, напрыклад:

980 год - захоп Полацку Наўгародскісм князем Уладзімірам і забойства ім Полацкага князя Рагвалода;

1067 год - год бітвы на рацэ Няміга паміж войскамі паўднёва-рускіх князёў Яраславічаў і Полацкага Усяслава Брачыслававіча;

1696 год - забарона дзяржаўнасці беларускай мовы;

1772, 17793, 1795г.г. - гады падзелаў Рэчы Паспалітай паміж Расейскай і Аўстра-Венгерскай імперыямі і Германіяй, у выніку чаго перастала існаваць Вялікае княства Літоўскае як дзяржава;

1832 год - закрыццё Віленскага універсітэту як галоўнай крыніцы беларускасці;

1840 год - забарона Мікалаем I ужывання назвы Беларусь;

18 сакавіка 1921 года - падпісанне дагавору паміж РСФСР, Украінай і Польшчай, згодна з якім заходняя частка Беларусі адышла да Польшчы;

канец 1929 - пачатак 1930 года - пачатак сталінскіх рэпрэсіяў у Беларусі супраць прадстаўнікоў так званага нацыянал-дэмакратызму;

22 чэрвеня 1941 года - пачатак Вялікай Айчыннай вайны;

26 красавіка 1986 года - дзень аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

І вось да гэтых трагічных дат у гісторыі Беларусі прыбавіўся і яшчэ адзін чорны дзень. Гэта 24 лістапада 1996 года - дзень дзяржаўнага перавароту, які здзейсніў А. Лукашэнка ў мэтах устанаўлення асабістай улады. І чым больш мы аддаляемся ад гэтага дня, тым больш яскрава відаць тое злачынства, якое ўтварыла ўлада супраць беларускага народа.

Але давайце спачатку ўзгадаем, як гэта ўсё было. Убачыўшы, што перашкодай на шляху ўстанаўлення дыктатуры ў краіне з`яўляюцца дзве іншыя галіны ўлады: заканадаўчая і судовая, - А. Лукашэнка пачаў барацьбу з Вярхоўным Саветам і Канстытуцыйным Судом ужо з першых дзён свайго прэзідэнцтва. Справа дайшла да таго, што дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання былі збіты работнікамі аховы прэзідэнта ў самой зале паседжанняў, куды яны навогул не маюць права ўваходзіць. Адначасова Лукашэнка пачаў весці агітацыю на зрыў выбараў новага складу заканадаўчага органа.

Усё гэта цяжка ўявіць чалавеку цвярозага розуму. Але ж гэта было так: нават у дзень выбараў, якія праводзіліся на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прэзідэнт дзяржавы заклікаў грамадзян не ісці галасаваць, бо, маўляў, каго б ні абралі, “усё роўна ашукае”. Па-першае, сам гэткі зварот да людзей у час правядзення выбараў з`яўляецца грубым парушэннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь, ужо не гаворачы аб тым, што не паддаецца ніякім нормам этыкі.

Любому цывілізаванаму чалавеку вядома: адной з галоўных функцый Вярхоўнага Савета і Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь з`яўляецца кантроль за дзейнасцю выканаўчых органаў, у тым ліку і прэзідэнта (каб не парушалі Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і не ашуквалі народ). І, відаць, каб бескантрольна ашукваць грамадзян сваёй краіны і кіраўнікоў міжнародных арганізацый, А. Лукашэнка і пачаў лютую барацьбу за ліквідацыю гэтых органаў і стварэнне замест іх чыста дэкаратыўных структур, яе гэта і было, напрыклад, у фашысцкай Германіі, якую Лукашэнка ў інтэрв`ю нямецкай газэце назваў узорам прэзідэнцкай рэспублікі. Зыходзячы з гэтага, можна меркаваць, што сваю ролю ён бачыць такой, якую выконваў у Германіі тых гадоў Адольф Гітлер. Тым больш, што аб гэтым ён таксама сказаў у названым інтэрв`ю.

З гэтай жа мэтай, па прыкладзе таго ж А. Гітлера, а таксама другога вядомага дыктатара І. Сталіна, партрэты якога заўжды можна бачыць на афіцыйных святочных шэсцях побач з партрэтамі А. Лукашэнкі, апошні і яго палечнікі поўнасцю манапалізавалі дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі.

А. Лукашэнка і яго падручныя спяшаліся, бо ўвосень 1996 года старшыня Кантрольнай Палаты Рэспублікі Беларусь В. Саковіч павінен быў выступіць на сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з дакладам, у якім, мяркуючы па першай яго частцы, з якой В. Саковіч ужо выступаў, былі б паказаны такія факты карупцыі ў прэзідэнцкіх структурах, што прыведзеныя дадзеныя кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Лукашэнкам аб карупцыі ва ўрадзе В. Кебіча здаваліся б дзіцячым лепетам.

Крывадушнасць і ашуканства, у чым у час выбараў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Лукашэнка спрабаваў абвінаваціць будучых дэпутатаў, сталі галоўнымі метадамі ў працы яго самога і яго саўдзельнікаў па здзяйсненню дзяржаўнага перавароту. Гэтыя ганебныя метады падману народа спатрэбіліся А. Лукашэнку, каб навесці паклёп на дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і неяк замаскіраваць ад сусветнай грамадскасці сапраўдную мэту

правядзення так званага рэферэндуму. На жаль, першае сяк-так яму тады ўдавалася: многія прастадушныя людзі верылі, што Шарэцкаму нібыта Амерыка дае мільёны долараў, што дэпутаты Вярхоўнага Савета быццам бы вырашылі плаціць сабе пенсію ў вялікіх памерах ужо з трыццаці пяці гадоў, а таксама іншай хлусні, якая лілася ў тыя дні з вуснаў самога Лукашэнкі і яго халуёў.

А вось што тычыцца падману сусветнай грамадскасці - тут у ашуканцаў не атрымалася. Вопытныя кіраўнікі дзяржаў, парламентарыі іншых краін і дыпламаты ведалі з гісторыі, як папярэднія Лукашэнку дыктатары (Мусаліні, Гітлер, Сталін) таксама часамі апраналі авечую скуру і прыкідваліся “законнікамі”, калі збіраліся здзейсніць чарговы падман народа, у тым ліку і ў час правядзення рэферэндумаў у сваіх краінах. Больш таго, Лукашэнка і яго памочнікі, спяшаючыся, рабілі ўсё так груба, што паўсюдна былі відаць канцы шматлікіх парушэнняў дзеючай Канстытуцыі і заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Сваім указам Лукашэнка незаконна адхіліў ад выканання абавязкаў старшыню Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і праведзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў. Нібы ў час вайны, будынак Цэнтрвыбаркама акружылі ўзброеныя вайскоўцы з аховы прэзідэнта, што стварыла спрыяльныя ўмовы для фальсіфікацыі вынікаў рэферэндуму. Напярэдадні 24 лістапада вайскоўцы запоўнілі галоўныя вуліцы горада, а на плошчы Незалежнасці стаялі нават БТРы. Фінансванне, друкаванне і дастаўка бюлетэняў да ўчастковых выбарчых камісій праводзіліся, зноў-такі ў парушэнне заканадаўства, Упраўленнем справамі прэзідэнта. Указам прэзідэнта вынікі рэферэндуму былі прызнаныя абавязковымі, у той час, калі на кожным бюлетэні была зроблена адзнака аб тым, што пытанне па ўнясенню ў Канстытуцыю змяненняў і дапаўненняў носіць кансультатыўны характар.

Усе пералічаныя і мноства іншых парушэнняў у час падрыхтоўкі і правядзення так званага рэферэндуму былі заактаваны і перададзены для разгляду ў пракуратуру Рэспублікі Беларусь. Але, як і трэба было чакаць, адказу на ўсё гэта не паступіла.

Вядома, што пры гэткіх умовах міжнародныя назіральнікі ад удзелу ў рэферэндуме адмовіліся. Вынікі рэферэндуму амаль усе міжнародныя арганізацыі прызналі нелегітымнымі, а “працягнутая” праз яго з парушэннямі законнасці Канстытуцыя ахарактыразаваная імі як недэмакратычная. Нелегітымгнымі з`яўляюцца і створаныя на яе падставе так званы Нацыянальны Сход, Канстытуцыйны Суд і іншыя дзяржаўныя органы, а таксама прызначаныя ў парушэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994г.) кіраўнікі.

Калі гэта ўсё аналізуеш, дык міжволі на розум прыходзіць думка: як жа трэба не паважаць законнасць і свой народ, каб ведаючы ўсё гэта, гаварыць, што Лукашэнку на рэферэндуме, маўляў, падтрымаў народ! Аб гэтым заяўляюць тыя, што з`яўляюцца саўдзельнікамі дзяржаўнага перавароту. На самой жа справе народ быў падмануты і маўчаў. А падтрымалі здзейсненае пад выглядам так званага рэферэндуму злачынства тыя, каго Лукашэнка да гэтага часу гідліва называў “быўшымі”, - гэта былыя кіраўнікі кампартыі, якія ўвесь час марылі, як “вярнуцца да таго карыта”, дзе самчна замешана. У так заванай “палаце” апынуліся і тыя, што займаюцца бізнесам, не прытрымліваючыся норм законаў, і, як відаць, баяцца адказнасці, бо пры таталітарнай сістэме, калі і няма парушэнняў, дык іх могуць сфабрыкаваць. Па гэтай прычыне туды пайшлі і некаторыя кіраўнікі

прадпрыемстваў, якіх таксама запалохалі ўсё той жа адказнасцю. Падтрымалі Лукашэнку і многія кіраўнікі Расейскай Федэрацыі, якія зараджаны бацылаю “западно-руссизма”. Якія адмаўляюць існаванне беларусаў як самастойнага народа, і мараць аб аднаўленні Савецкага Саюза з былым таталітарным ладам. Яны палічылі, што для здзяйснення іх імперскіх імкненняў у адносінах да Беларусі і вяртання да парадкаў былых часоў найбольш падыходзячым кіраўніком Беларусі можа быць Лукашэнка, якога можна выкарыстаць у сваіх мэтах шляхам абяцанняў дапамагчы яму здзейсніць сваю мару - стаць прэзідэнтам Расейскай Федэрацыі, у склад якой увайшла б і Беларусь.

З таго чорнага дня прайшло ўжо два гады. І што мы бачым!.. А вось што: замест абяцанняў спыніць крызісныя зявы і павысіць жыццёвы ўзровень насельніцтва - яшчэ большае паглыбленне крызісу і збядненне народа. Для доказу жабрацкага становішча, у якім апынулася большасць жыхароў Беларусі, не трэба прыводзіць шмат лічбаў і параўнанняў. Гэта можна ўбачыць у кожным магазіне, паглядзеўшы на цэны і прыкінуўшы, што можна купіць за заробак рабочага і калгасніка, настаўніка і медыка, ужо не кажучы аб пакупной магчымасці пенсіянераў. Але вось толькі адно параўнанне, якое красамоўна сведчыць аб тым, да якой галечы даведзены народ: кошт добрага (нешыкоўнага) вянка на магілу роўны амаль чатыром мінімальным заробкам. Пра якое паляпшэнне жыцця людзей можна гаварыць?...

Як далей могуць знаходзіцца кіраўнікі урада і ўсялякіх там “палат” на сваіх пасадах? Няўжо ім не сорамна глядзець у вочы людзям, якія неведаючы іх сапраўднага твару, у свой час ім паверылі?

У краіне растаптаныя канстытуцыйнасць, законнасць і элементарныя правы і свабоды людзей: права на сумленную працу па сваёй прафесіі і жаданню, права на атрыманне праўдзівай інфармацыі аб унутраным і міжнародным становішчы сваёй краіны, права атрымліваць адукацыю на сваёй роднай беларускай мове, свабода слова і друку і гэтак далей. У краіне не забяспечана недатыкальнасць асобы. Сёння любога могуць не толькі затрымаць за тое, што ён размаўляе на роднай беларускай мове, але і без санкцыі пракурора пасадзіць у турму і толькі пасля гэтага шукаць на яго абвінавачванні. Так здарылася нават з міністрам сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь В. Лявонавым, старшынёй Нацбанка Т. Віннікавай, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, двойчы Героем Сацыялістычнай Працы 74-гадовым В. Старавойтавым, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь А. Клімавым. Першая асоба ў краіне можа беспакарана абвінаваціць любога ў супрацоўніцтве з замежнымі спецслужбамі, як гэта было з П. Шараметам, або прыпісаць гадоў дваццаць, як гэта ён зрабіў да Б. Ельцына.

Інтарэсы беларусаў прыносяцца ў ахвяру дыктатарскім амбіцыям аднаго чалавека, мэтай якога, мяркуючы па ўсім, стала стварэнне нейкай нябачнай дагэтуль славянскай дзяржавы, дзе ён быў бы прэзідэнтам. Для дасягнення пастаўленай мэты Беларусь ператворана ў нейкі расейскі калідор, праз які ў Еўропу бясплатна ідуць з Расеі грузы; на тэрыторыі Беларусі пракладзены нафта- і газапровады; знаходзяцца расейскія ваенныя аб`екты. Прыніжаецца годнасць і самога беларускага народа: прэзідэнт яго называе малодшым братам расіян, ганьбіць яго мову. У няміласць да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь трапілі такія вядомыя ў краіне і далёка за яе межамі выдатныя беларускія пісьменнікі і паэты, як Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін і іншыя, і толькі за

тое, што яны адстойваюць гонар беларусаў як народа, які мае права на сваю незалежную дзяржаву. Затое кабінеты прэзідэнцкіх структур запоўненыя да адказу палкоўнікамі расейскай арміі. У сувязі са сказаным хочацца запытаць і ў высокіх іерархаў Рускай праваслаўнай царквы, аб чым яны думалі, калі ўзнагароджвалі чалавека, які адкрыта заявіў аб сваіх сімпатыях да гэткага праклятага мільёнамі людзей свету дыктатара, як А. Гітлер, і партрэты якога носяць побач з партрэтамі І. Сталіна, згодна з тэорыяй якога аб абвастрэнні класавай барацьбы таксма загінулі мільёны ні ў чым невінаватых людзей?

У рэспубліцы груба парушаюцца правы і свабоды меншасцяў: украінцаў, палякаў, габрэяў, татараў і іншых. Напрыклад, толькі ў апошні час урад Беларусі адмовіўся ад узятых на сябе абавязкаў і не дае згоды на будаўніцтва за кошт саміх палякаў другой польскай школы ў мікраараёне Вішнявец горада Гродна, з-за чаго дзеці вымушаны ехаць у школу, якая знаходзіцца на Дзевятоўцы - за дзесяць-пятнаццаць кіламетраў; адмоўлена ў будаўніцтве польскіх школ у гарадах Брэсце і Наваградку; забаронена стварэнне польскіх класаў у дзеючых школах у Наваградку і Лідзе. У рэспубліцы выдаюцца газэты, у якіх адкрыта абражаюцца габрэі.

Замест дэмакратычнай сацыяльнай прававой і нейтральнай дзяржавы, як таго патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, у краіне ствараецца дыктатарска-паліцэйскі парадак, дзе самымі галоўнымі асобамі становяцца не людзі творчых прафесій, як гэта робіцца ў цывілізаваных краінах, а АМАПаўцы і работнікі міліцыі, дарэчы, якіх у Беларусі ў разліку на тысячу жыхароў у чатыры разы больш, чым, скажам, у суседняй Польшчы. Калі да колькасці міліцыі дадаць вайскоўцаў, работнікаў КДБ і створаныя вайсковыя фармаванні па спецыяльных указах прэзідэнта, дык атрымліваецца, што ўсе астатнія павінны займацца толькі тым, што працаваць на тое, каб карміць, апранаць, узбройваць і забяспечваць транспартам тых, хто ахоўвае рэжым, бо для падтрымання ў краіне парадку патрэбна перш за ўсё выкананне Канстытуцыі і законаў і невялікая колькасць міліцыі, галоўнай задачай якой была б дапамога грамадзянам, іх прававое выхаванне. Ужо не хаваюцца і імкненне дыктатарскага рэжыму авалодаць ядзернай зброяй, што, па словах аднаго з тых жа расейскіх палкоўнікаў нібыта адпавядае нацыянальным інтарэсам Беларусі.

Уся гэтая авантурная палітыка рэжыму, якую стварыў Лукашэнка і яго паплечнікі пасля дзяржаўнага перавароту (24 лістапада 1996 года), прывяла да глыбокай ізаляцыі нашай краіны вядучымі дзяржавамі свету, спыненне замежных інвестыцый і нават да адмовы ўезду кіраўнікоў Рэспублікі Беларусь у многія краіны. І ў гэтым не апазіцыя вінавата, як аб тым пішуць і гавораць сам Лукашэнка і яго падручныя чыноўнікі і журналісты, а той, хто абражае кіраўнікоў і народы іншых краін, хоча навязаць ім свой парадак, спрабуе іх запалохаць, імкнецца авалодаць ядзернай зброяй.

Прайшоўшыя два гады паказалі сапраўдны твар чалавека, які завёў Рэспубліку Беларусь і яе працалюбівы і талерантны народ у тупік. І выхад з гэтага тупіка можа быць толькі адзін - адхіленне канстытуцыйным шляхам ад улады самога А. Лукашэнкі, тэрмін прэзідэнцтва якога заканчваецца летам 1999 года.

***(“Народная воля”, 24 лістапада 1998 года)***

# ЗАЯВА
# СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 13-ГА СКЛІКАННЯ

У сувязі з тым, што пасля пасяджэння Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якое адбылося 24 лістапада 1998 года, да мяне паступае многа пытанняў, у якіх людзі цікавяцца прынятымі на ім рашэннямі, лічу неабходным зрабіць наступную заяву:

Перш за ўсё хачу падзякаваць усім тым, хто не застаецца раўнадушным да той сітуацыі, якая склалася ў дзяржаве, і хто разумее, што гэта вынік здзейсненага А. Лукашэнкам і яго паплечнікамі ў лістападзе 1996 года дзяржаўнага перавароту і спробы аднавіць у Беларусі таталітарны рэжым. Пры гэтым хачу з задавальненнем падкрэсліць, што, як бачна па колькасці запытаў і з паведамленняў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з месцаў, незадаволеных рэжымам Лукашэнкі з кожным месяцам становіцца ўсё больш і больш.

Інакш і быць не можа. Прэзідэнцтва Лукашэнкі яшчэ раз падцвердзіла даўно вядомую ісціну, што чалавек, які не мае адпаведнай тэарэтычнай падрыхтоўкі і не прыдбаў станоўчага вопыту кіраўніцтва дэмакратычнымі метадамі, наогул не здольны да творчай, стваральнай працы, а тым больш да такой адказнай, як кіраўніцтва дзяржаваю. Менавіта зыходзячы з яго дзеянняў можна меркаваць, што за ўзор дзяржавы, якую ён марыць пабудаваць у Беларусі, ён узяў фашысцкую Германію, а сваю ролю як кіраўніка дзяржавы ўяўляе сабе такой, якую выконваў А. Гітлер у Германіі тых часоў. Менавіта таму яго памагатыя і выносяць яго партрэты побач з партрэтамі другога вядомага дыктатара - І. Сталіна. І калі да ўсяго гэтага дадаць яшчэ і многае іншае, дык адразу становіцца ясна, што завесці дзяржаву ён можа толькі ў вялікі тупік, дарэчы, аб чым я папярэджваў напярэдадні правядзення так званага лістападаўскага (1996г.) рэферэндуму. І вельмі добра, што гэта пачынаюць разумець усё больш і больш людзей.

Сапраўды, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў рашэнне правесці 15 студзеня і 9 лютага 1999 года свае паседжанні і прыняць на іх адпаведныя рашэнні аб падрыхтоўцы і правядзенні вясною 1999 года чарговых выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, як таго і патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Для падрыхтоўкі названых паседжанняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь абрана ў складзе членаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (С. Шарэцкага, Г. Карпенкі, М. Гіруця, С. Домаша, С. Калякіна), двух старшынь пастаянных камісій Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (Р. Пракаповіча і У. Савічава), кіраўнікоў фракцый АГП і фракцый сацыял-дэмакратаў у Вярхоўным Савеце. Адпаведна - С. Багданкевіча і М. Грыба), старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў, дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь В. Ганчара, дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь В. Шчукіна.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь спадзяецца на падтрымку сваіх рашэнняў па гэтым пытанні большасцю беларускага народа, над якім групаю асоб

на чале з А. Лукашэнка і пры дапамозе многіх расейскіх палітыкаў экстрэмісцкага кшталту праводзіцца эксперымент па аднаўленню фактычна сталінскіх парадкаў з іх чэргамі і канцлагерамі і стварэнне новай (цяпер ужо нейкай славянскай) імперыі, дзе беларусам, мяркуючы па адносінах Лукашэнкі да іх, іх культуры і мовы, будзе адведзена роля слугі, палітыка імперска-расейскага накірунку з выцякаючымі з гэтага адпаведнымі вынікамі.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь спадзяецца на падтрымку яго рашэнняў міжнароднымі аргнізацыямі, кіраўнікамі і парламентамі дзяржаў, якія ў свой час выказаліся аб нелегітымнасці так званага рэферэндуму 1996 года і працягваюць прызнаваць адзіным легітымным заканадаўчым і вышэйшым прадстаўнічым органам у Рэспубліцы Беларусь Вярхоўны Савет і на падставе гэтага падтрымліваюць сувязі з яго кіраўніцтвам і дэпутатамі.

Я веру ў беларускі працалюбівы і таленавіты народ і яго розум!

Я веру ў мудрасць і паслядоўнасць палітыкі, якую праводзяць кіраўнікі міжнародных арганізацый і цывілізаваных краін.

***(“Народная воля”, 4 снежня 1998 года)***

KAMUNIKAT.org

# КАМУ СПАТРЭБІЛАСЯ САЮЗНАЕ ГРАМАДЗЯНСТВА, АБО НА ШТО АСУДЖАЕ БЕЛАРУСКІ НАРОД А. ЛУКАШЭНКА?

Споўнілася два гады з таго чорнага дня, калі пад выглядам так званага рэферэндуму ў Рэспубліцы Беларусь быў здзейснены дзяржаўны пераварот і ў краіне ўстанавілася дыктатуры адной асобы - А. Лукашэнкі, а ўвесь тэрмін прэзідэнцтва Лукашэнкі складае ўжо больш, як чатыры гады.

Чатыры гады - гэта дастаткова, каб змяніць сітуацыю да лепшага ў краіне. Тым больш, у гэткай невялікай, як Рэспубліка Беларусь, дзе ёсць усе прыродна-эканамічныя ўмовы для стабільнага развіцця сельскай гаспадаркі і многіх неабходных прамысловых галін, жыве працалюбівы і талерантны народ. Гісторыі вядомы прыклады, калі нават за меншы прамежак часу выводзіліся з глыбокага разбуральнага крызісу і нашмат большыя па тэрыторыі і насельніцтву дзяржавы. Перш за ўсё, гэта Злучаныя Штаты Амерыкі, якія перажывалі гэткі крызіс у канцы 20-ых- напачатку 30-ых гадоў. Але прыход у 1933 годзе да ўлады ўрада Франкліна Дэлано Рузвельта і ўвядзенне ў краіне так званага “новага курса” далі магчымасць за кароткі тэрмін працаўладкаваць і забяспечыць харчаваннем мільёны людзей самых розных прафесій, ад лесарубаў да пісьменнікаў і мастакоў, і ўжо вясною 1934 года (праз паўтары гады пасля прыходу да ўлады новага ўрада) сацыяльная напружанасць пачала спадаць. Хапіла аднаго года і ўраду Леха Валенсы, які стаў прэзідэнтам Польшчы ў снежні 1990 года, каб таксама вывесці краіну з глыбокага заняпаду. Сёння Польшча ўжо рыхтуецца да ўступлення ў Еўрапейскі Саюз, куды прымаюць краіны толькі з добра развітымі рынкавымі адносінамі і стабільнаю эканомікаю. У якасці прыклада можна прывесці і Прыбалтыйскія рэспублікі, дзе таксама ўжо пераадолены разбуральныя крызісныя з`явы.

Адзначым, што кіраўнікоў пералічаных краін аб`ядноўвала нястрыманае імкненне ісці наперад. Пры гэтым арыенцірамі руху для іх былі дэмакратызацыя грамадскага жыцця, агульна прызнаныя сусветнымі арганізацыямі правы і свабоды чалавека.

Зусім іншая справа ў Рэспубліцы Беларусь. Стаўшы летам 1994 года прэзідэнтам, Аляксандр Лукашэнка адразу пачаў аглядвацца назад. Яго прываблівае панаваўшая ў Савецкім Саюзе адміністрацыйна-камандная сістэма і сама вялікая імперыя, у якой яму вельмі хочацца стаць прэзідэнтам. Я памятаю, як на пачатку 1996 года, калі пачыналася падрыхтоўка да выбараў прэзідэнта Расейскай Федэрацыі, падручныя А. Лукашэнкі падрыхтавалі палажэнне аб утварэнні Садружнасці Беларусі і Расеі, згодна якому ўжо тады меркавалася страта Беларуссю сваёй незалежнасці. А сам Лукашэнка цэлымі днямі матаўся па рэгіёнах Расеі і, як расказваў адзін з ягоных суправаджальнікаў, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, высвятляў свой рэйтынг у параўнаннні з рэйтынгам Барыса Ельцына. Менавіта тады Лукашэнка і пачаў іграць на струнах расейскага шавінізму. Ён заявіў, што “эканамічна Рэспубліка Беларусь проста не можа існаваць без расейскай сыравіны і расейскага рынку збыту”, абразіў беларускую мову, усюды, дзе толькі можна, стараўся падкрэсліць, што беларусы - гэта толькі малодшыя браты рускага народа. Усё гэта адразу ацанілі рускія

шавіністы і ўжо на першым сусмесным паседжанні беларускай і рускай групаў дэпутатаў Вярхоўнага Савета і Дзяржаўнай Думы ў Смаленску пры абмеркаванні ўсё таго ж палажэння пачалі настойваць на адзіным грамадзянстве. Гэта фактычна азначае ліквідацыю самастойнасці Рэспублікі Беларусі як дзяржавы і дае магчымасць А. Лукашэнку здзейсніць сваю патаемную мару - уключыцца ў перадвыбарчую кампанію з прэтэнзіяй на пасаду прэзідэнта Расейскай Федэрацыі, у якую, на думку Лукашэнкі, павінна ўвайсці і Беларусь. Але цвёрдая пазіцыя беларускіх дэпутатаў не дазволіла тады ўчыніць гэтае злачынств ў адносінах да беларускага народа.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што і некаторыя з атачэння Лукашэнкі зразумелі ўсю сутнасць і згубнасць задуманага для Беларусі "шляху развіцця". Яны перадалі Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь падрыхтаванае за спіною заканадаўчага органа названае палажэнне, што дало магчымасць у свой час прымусіць Лукашэнку выступіць з прамоваю на паседжанні Вярхоўнага Савета па пытанню ўтварэння Садружнасці Беларусі і Расеі, але ў прынятай пастанове ўжо былі выразна сфармуляваны прынцыпы, згодна з якімі захоўвалася самастойнасць абедзвюх дзяржаў.

Трэба нагадаць, што і Б. Ельцын, даведаўшыся аб сапраўдных імкненнях А. Лукашэнкі, заявіў аб неабходнасці захавання самастойнасці і незалежнасці Беларусі (Ельцын адлятаў тады ў Нарвегію, заява была зроблена ў аэрапорце і адразу распаўсюджана праз СМІ). Ды па-іншаму і не магло быць. Бо менавіта Ельцын першы з расейскіх дзяржаўных дзеячоў пісьмова прызнаў існаванне беларускага народа, як самастойнага этнасу і яго права на стварэнне сваёй незалежнай дзяржавы. Праўда, цяжка сцвярджаць, што ён тады, у час падпісання Белавежскіх пагадненняў, менавіта аб гэтым задумваўся. Хутчэй за ўсё, кіраваўся ўласнымі інтарэсамі і найперш хацеў пазбавіцца ад Міхаіла Гарбачова. У час падпісання Палажэння аб утварэнні Садружнасці Беларусі і Расеі, Ельцын не пажадаў перакрэсліць свой подпіс пад Белавежскімі пагадненнямі і замахвацца на самастойнасць Беларусі.

Але, нягледзячы на першую няўдачу, шапка Манамаха і зараз не дае спакою Лукашэнку. І калі Ельцын лёг на аперацыйны стол, дык наваяўлены "аб`яднальнік славян" пачаў зноў адкрыта прэтэндаваць на пасаду ў Крамлі. Зачасцілі тады ў Менск і расейскія шавіністы, прычым некаторыя з іх ужо пачалі называць Лукашэнку адным з першых і самых верагодных прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта аб`яднанай дзяржавы.

Усё гэта яшчэ больш распальвала пачуцці дыктатара, і калі ў Расеі пачалася перадвыбарчая прэзідэнцкая какмпанія, Лукашэнка ўключыўся ў яе амаль самым першым. За гэтыя гады ён пераканаўся, што ў дасягненні пастаўленай мэты яму няма канкурэнтаў. А калі расейскія палітыкі далі зразумець, што гэта не так і, больш таго, што дарога ў Крэмль яму зачынена, Лукашэнка абвінаваціў іх у тым, што яны не хочуць аб`яднання Беларусі і Расеі.

Але ўжо праз некалькі дзён Лукашэнка разам са сваімі дарадчыкамі распрацаваў новую тактыку, згодна з якой нібыта ён ужо пагаджаецца ў аб`яднанай дзяржаве быць на другіх ролях. Пры гэтым наш цяперашні прэзідэнт добра ведае, што, калі Беларусь далучыцца да Расеі, дык усе грамадзяне будуць мець у новай дзяржаве аднолькавыя правы - у тым ліку і вылучаць сваю кандыдатуру на пасаду прэзідэнта. А тое, што ён быццам бы ўжо не прэтэндуе на

ролю першай асобы ў новай дзяржаве, дык гэта проста чарговая хлусня, стаўшая для Лукашэнкі пастаянным сродкам, не аднойчы апрабаваным на падмане народа Беларусі.

Але ва ўсёй гэтай гульні абурае другое - пазіцыя ўсіх гэтых так званых кіраўнікоў рэспублікі, якія ўвесь час кляліся, што ў іх нібыта няма іншых інтарэсаў, чым інтарэсы беларускага народа. Дык як жа яны могуць патураць зарваўшамуся маньяку, які ўзорам для сябе абраў праклятага мільёнамі людзей свету А. Гітлера? Гэтае патуранне і ёсць самая натуральная здрада свайму народу. Хіба можна інакш назваць ініцыятыву зрабіць адно грамадзянства для жыхароў і Расеі, і Беларусі? Няўжо яны не ведаюць, што гэта - крок да страты незалежнасці Беларусі, за дасягненне і захаванне якой загінулі ў свой час мільёны нашых суайчыннікаў? Няўжо яны не разумеюць, што аб`яднаннне з Расеяй азначае сёння аддаць талерантны беларускі народ на з`ядзенне расейскім бандытам, якія, па словах саміх, прычым многіх, дэпутатаў Дзярждумы Расейскай Федэрацыі, рвуцца да ўлады? Хіба не ведаюць, што сённяшння Расея, калі ад яе адмежаваліся Украіна, Беларусь і Прыбалтыйскія рэспублікі, стала ўжо больш азіяцкай краінаю, чым еўрапейскай? Няўжо яны не бачаць, што ўсе тыя краіны, якія адчапіліся ад расейскага цягніка і накіраваліся ў Еўропу (гэта перш за ўсё Польшча, Чэхія, Венгрыя, Эстонія, Літва, Латвія), дасягнулі ў сваім развіцці ўжо значных поспехаў?

Пры гэтым я хачу падкрэсліць, што ніколі не выступаў і не выступаю за тое, каб адварочвацца ад Расеі. Ды не. Гэта суседка нашай краіны, там жыве вельмі прыгожы і таленавіты народ. Калі зараз яго і напаткала цяжкая доля, дык я веру - ён перажыве сённяшнія пакуты, як перажыў і ранейшыя. З народамі Расеі трэба жыць у добрых, але ж толькі суседскіх (і не больш) адносінах. А што тычыцца адносін паміж дзяржавамі, дык яны павінны быць узаемавыгаднымі пры павазе да суверэнітэта і незалежнасці кожнай - і Беларусі, і Расеі. Бясспрэчна, што жыхары дзвюх розных суседніх краін павінны мець свае грамадзянства. І тут нельга не пагадзіцца з тым абурэннем, якое выказаў у сваёй заяве грамадзянін Рэспублікі Беларусь Уладзімір Мацкевіч (заява была надрукавана ў газэце "Беларуская маладзёжная", №37). Больш таго, і сам дыктатар, і патураючыя яму расейскія шавіністы павінны ведаць, што прымусовае пазбаўленне беларусаў грамадзянства і ліквідацыя незалежнасці іх дзяржавы прывядуць (як гэта і было пасля прымусовай ліквідацыі Вялікага княства Літоўскага) да бесперанных паўстанняў, да грамадзянскай вайны. Таму ёсць падцверджанне ў падзеях і не такіх далёкіх: далучэнне заходняй часткі Беларусі да Польшчы спарадзіла несціхаючую падпольную барацьбу, у час нямецка-фашысцкай акупацыі ўзнік усенародны партызанскі рух.

Беларусы, як нацыя , маюць права жыць у суверэннай, незалежнай дзяржаве, размаўляць на сваёй беларускай мове, і, як пра тое марыў вялікі пясняр беларускага народа Я. Купала, заняць "свой пачэсны пасад між народамі". Прыемна, што людзі, асабліва моладзь, пачынаюць гэта разумець і адстойваць гэта свае права.

***("Беларуская маладзёжная", 4-11 снежня 1998 года)***

# БЕЛАРУСЬ ВАЧЫМА АПАЗІЦЫІ

Наша рэспубліка перажывае цяпер вельмі цяжкія часы. Верагодна гадоў 8-10 таму ніхто не мог падумаць, што краіна, якая стала зноў незалежнай, якая атрымала сваю дзяржаўнасць і пачала развівацца па дэмакратычнаму шляху, - будзе адкінутая назад, па сутнасці, у сярэднявечча. На жаль, гэта так. Лукашэнка сёння сканцэнтраваў у сваіх руках усю ўладу, якая толькі мажлівая: ад пажарніка да князя і караля. Сёння ён узначальвае выканаўчую ўладу, падабраў і прызначыў сваім указам гэтак званы “парламент”, прызначае ўсіх суддзяў, ад раённых да канстытуйных. Суддзі судзяць людзей не на падставе законаў, а на падставе лукашэнкаўскіх дэкрэтаў. А кішэнны “парламент” функцыянуе толькі для таго, каб падцвярджаць правільнасць таго, што чыніць яго гаспадар. Ён не мае нават заканадаўчай ініцыятывы: усе законы пішуцца ў канцылярыі прэзідэнта і па сутнасці аўтаматычна прымаюцца гэтак званым Нацыянальным Сходам. Больш за тое, Лукашэнка паводле сваёй незаконнай Канстытуцыі мае права выдаваць дэкрэты, і калі яны на працягу трох дзён не зацвярджаюцца гэтым Нацыянальным Сходам, дык прымаюць сілу закона! І склікаць гэты сход не мае права нават ягоны старшыня, а толькі прэзідэнт.

І роля Саветаў сёння - гэта ў лепшым выпадку роля дарадчых органаў пры губернатары. Саветы нічога не вырашаюць, таму што ўсе старшыні аблвыканкамаў, райвыканкамаў, гарвыканкамаў прызначаюцца самім прэзідэнтам. Саветы патрэбныя толькі для бутафорыі, як пры Мусаліні і Гітлеры існавалі гэтак званыя “саветы”, якія штосьці радзілі, калі гэта было патрэбна самім дыктатарам.

Адпаведна, як і пры кожным дыктатары, ні пра якое захаванне правоў беларускага народа і кожнага асобнага грамадзяніна казаць таксама не прыходзіцца. Прэзідэнцкая гвардыя, якая налічвае ўжо больш за 2000 чалавек, затрымлівае і саджае ў турмы кожнага без санкцыі пракурора. Не сароміюцца саджаць нават паважаных, шырока вядомых у Беларусі людзей. Сядзяць два дэпутаты Вярхоўнага Савета А. Клімаў І У. Кудзінаў. Ужо год сядзіць міністр сельскай гаспадаркі сп. Лявонаў. Амаль два гады адседзела старшыня Нацбанку спн. Віннікава. Сядзіць двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, вядомы ў свой час як перадавы старшыня, а сёння - як рэфарматар, які ператварыў свой калгас у квітнеючае акцыянернае таварыства, 74-гадовы В. Старавойтаў... Увогуле, у нас сёння затрымліваюць толькі за тое, што чалавек размаўляе па-беларуску: гэтага дастаткова, каб абвінаваціць яго ў нацыяналізме.

Беларусь, Менск, прэзідэцкая кантора сталі, па сутнасці, месцам сканцэнтравання ўсёй камуністычнай і імперскай нечысці, якая толькі ёсць у Беларусі, у Расеі, на Украіне, у Югаславіі і Прыднястроўскай Рэспубліцы. У Менск ездзяць на кансультацыі і там пасілкоўваюцца ўсялякія Бабурыны ды Ілюхіны, якія абвінавачваюць усходне-еўрапейскія краіны, у тым ліку і Літву з Польшчай, што там, маўляў, заселі амерыканскія спецслужбы, якія толькі тым і займаюцца, што палююць на нашага прэзідэнта. Туды прыязджаюць і ў захапленні з`язджаюць пракамуністычныя элементы Украіны. Лукашэнка падтрымлівае гэткага самага дыктатара Мілошавіча, і не таму, што той правы, а таму, што ён, маўляў, славянін.

Увогуле, усе размовы пра нейкую нябачную яшчэ ў Еўропе “славянскую

дзяржаву” уяўляюць сёння вялікую небяспеку для еўрапейцаў, бо гэтыя размовы маюць пад сабой практычны падмурак: дзеля правядзення ў жыццё гэтай, на першы погляд, вар`яцкай ідэі пры прэзідэнце створаная спецыяльная арганізацыя “Славянское единство”, дзе запраўляюць, у асноўным, расейскія палкоўнікі. У гэтак званую “славянскую дзяржаву” Лукашэнка марыць уключыць не толькі Украіну, але і Прыднястроўскую Рэспубліку з Югаславіяй. А каб з Прыднястроўя ў Югаславію быў “мосцік”, дык да сваёй дзяржавы ён прапануе далучыць і Румынію. У “Славянском единстве” вядуцца нават размовы пра тое, што калі раптам Заходняя Украіна не захоча далучыцца да будучай славянскай дзяржавы, дык давядзецца падзяліць Украіну папалам (гэтак, напрыклад, лічыць доктар навук С. П. Бабосаў). Дарэчы, зусім нядаўна пасланнікі Мілошавіча разам з парламентарыямі Беларусі і Расеі праводзілі сумеснае паседжанне ў Яраслаўлі. Не спраста таксама і Руская праваслаўная царква, якая заўсёды была і ёсць правадніком русіфікатарскай палітыкі, у асобе патрыярха Маскоўскага і Усея Русі Алексія II узнагародзіла Лукашэнку сваім ордэнам, як “воссоединителя славян”.

У Менску цяпер адкрыта пачынаюць патрабаваць вяртання ў Беларусь ядзернай зброі. Нядаўна Лукашэнка заявіў у Расеі, што была зробленая памылка, калі ядзерную зброю вывезлі з Беларусі. А ягоныя дарадчыкі, расейскія палкоўнікі, выдаюць такія заявы за абарону інтарэсаў РБ.

Катастрафічнае сёння эканамічнае і сацыяльнае становішча насельніцтва Рэспублікі Беларусь, якое нечуванымі тэмпамі (на 30-40 тыс. штогод) змяншаецца. Павялічваецца дзіцячая смяротнасць, бо няма нават самых неабходных лекаў, іх не купіш ні за якія грошы.Сённяшні мінімальны заробак у Беларусі - $1. У нас нядаўна памёр дэпутат Вярхоўнага Савета, дык я аддаў за вянок...чатыры мінімальныя месячныя заробкі. У нас зараз стала не тое, што толькі цяжка жыць, а і паміраць цяжка. Людзі нашыя проста перабіваюцца з вады на хлеб, бо прывыклі выжываць у самых экстрэмальных умовах за кошт бульбы са сваіх прысядзібных участкаў. Як вы бачылі, напэўна, па маскоўскім тэлебачанні, сёння ў Беларусі чэргі за 1,5% парашковым малаком, за яйкамі, маслам і цукрам, - усё, як тое было, скажам, у пяцідзесятыя гады, ці, хто помніць, у трыццатыя, у гады жорсткай сталінскай дыктатуры (дарэчы, партрэты Лукашэнкі і Сталіна цяпер выносяцца на вуліцы падчас усіх імпрэзаў, ладжаных рэжымам).

У краіне на 10 млн. насельніцтва - 130 тыс. паліцэйскіх! Для параўнання, у Польшчы на 40 млн. - 105 тыс. Апроч таго, за кошт народу ўтрымліваецца шматлікі апарат КДБ і 80-тысячная армія, а таксама прэзідэнцкая гвардыя, якая падпарадкоўваецца толькі самому “бацьку”. Астатнім нашым людзям застаецца адно: працаваць ды забяспечваць гэтую армаду ежаю і вопраткай, зброяю і транспартам.

У краіне няма ніякага рэфармавання. У нас цяпер такія дэкрэты, што калі нехта ператворыць калгас у акцыянернае таварыства, дык будзе сядзець за кратамі разам са Старавойтавым. Усё адзяржаўліваецца, нават дырэктары рынкаў назначаюцца прэзідэнтам.

Аднак народ пачынае прачынацца. Хутка ён пачне патрабаваць новых прэзідэнцкіх выбараў. І мы, безумоўна, лічым, што і сам Лукашэнка, як прэзідэнт, павінен пайсці на перавыбары ў будучым годзе. 24 лістапада Вярхоўны Савет праводзіў нараду і прыйшоў да высновы, што 9 лютага будзе праведзена сесія і будуць прызначаныя выбары прэзідэнта РБ, як таго патрабуе Канстытуцыя: 20

ліпеня 1999 года спаўняецца пяць гадоў з дня абрання Лукашэнкі, калі ён даваў прысягу на законнай Канстытуцыі, падпісанай Мечыславам Іванавічам Грыбам у 1994годзе. Іншай прысягі Лукашэнка не даваў, бо ягоная "канстытуцыя" ёсць з юрыдычнага пункту гледжання опус, варты жалю, які скіраваны толькі на тое, каб увекавечыць уладу аднаго чалавека.

У мяне часта пытаюцца, як мы маглі дапусціць да дыктатуры. Дык жа апошні рэферэндум праходзіў у такіх умовах, што ў Менску было столькі войскаў, як можа толькі іх было ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На плошчах стаялі бронетранспарцёры, а будынак Цэнтрвыбаркама быў акружаны дзвюмя сотнямі аўтаматчыкаў, і я, Старшыня Вярхоўнага Савета, доўга не мог прарвацца туды. А калі, нарэшце патрапіў, дык першы і заявіў пра дзяржаўны пераварот. Аўтаматчыкі стаялі на працягу двух тыдняў. І ў гэткіх умовах вёўся падлік галасоў. Не было ніякіх падлікаў: што Лукашэнка назваў, тое і палічылі. А Чарнамырдзін, не чакаючы тых падлікаў, прыслаў свайму сябру віншавальную тэлеграму.

Дыктатарскі рэжым я параўноўваю з ракаваю пухлінаю, якая не можа быць на месцы і ўвесь час імкнецца ўзмацняцца ды пашырацца. Дыктатара нельга перавыхаваць. Усялякія спробы розных міжнародных арганізацый перавыхаваць Лукашэнку выніку не дадуць. Гісторыя не ведае ніводнага такога прыкладу. Ракавую пухліну можна толькі выразаць з арганізму беларускага грамадства. Іншага шляху няма. І мы будзем аб`ядноўвацца дзеля гэтага. Будзем аб`ядноўваца вакол ідэі, што ў нас сапраўды акупацыйны рэжым, які трэба адхіліць ад улады. Сярод дарадчыкаў Лукашэнкі няма ніводнага беларуса: адны расейскія палкоўнікі. Сёння беларускай культурай, асветай і навукай кіруе палкоўнік расейскай арміі Замяталін. Ды і сам Лукашэнка беларускай мовай карыстаецца толькі тады, калі трэба некага зняважыць. Ён яе не ведае і ніколі не адчуваў сябе беларусам. У свой час Гітлер, аўстрыйскі грамадзянін, казаў, што лёс немцаў вырашаецца не ў Аўстрыі, а ў Нямеччыне. Гэтак і Лукашэнка адкрыта заяўляе, што лёс Беларусі вырашаецца ў Расеі. Дык які ж гэта прэзідэнт Беларусі.

***("Рунь", 10 снежня 1998 года)***

# БУДУЦЬ ВЫБАРЫ.
# БУДЗЕ ВЫБАР

**Перадапошні год XX стагоддзя можа стаць вызначальным для жыцця нашай дзяржавы. Менавіта такой думкі прытрымліваецца адзіны легітымны заканадаўчы орган Беларусі - Вярхоўны Савет, які, па прагнозам аналітыкаў, ужо на пачатку будучага года павінен прызначыць чарговыя прэзідэнцкія выбары.**

**Сёння ў нас у гасцях Старшыня ВС Сямён Шарэцкі, з якім гутарыць намеснік галоўнага рэдактара газэты "Свободные новости" Аляксандр Тамковіч.**

*Сямён Георгіевіч, апошнія рашэнні Вярхоўнага Савета не толькі ў цэнтры ўвагі грамадскасці, але, без перабольшвання, могуць стаць лёсавызначальнымі. Раскажыце, калі ласка, аб іх больш падрабязна.*

На паседжанні Вярхоўнага Савета, дзе абмяркоўвалася палітычная сітуацыя ў краіне і адносіны парламентарыяў да выбараў, было прынята рашэнне ў студзені і лютым будучага года правесці дзве сесіі. Мэта - прызначэнне даты прэзідэнцкіх выбараў і зацвярджэнне плана мерапрыемстваў, ажыццяўленне якіх дасць магчымасць правесці гэтыя выбары дэмакратычна і юрыдычна бездакорна. Гэтага патрабуе Канстытуцыя краіны. Гэта наш абавязак, і мы яго выканаем пры любых абставінах. З юрыдычнага пункту гледжання, у нас няма перашкодаў зрабіць выбары прэзідэнта рэальнымі.

Перашкодзіць можа толькі наша раздробленасць, незгаворлівасць, асабістыя амбіцыі. Патрэбна безумоўнае адзінства дэмакратычных сіл унутры краіны і моцная падтрымка сусветнай супольнасці. Мы вельмі разлічваем на бескампраміснасць у гэтым пытанні АБСЕ, Савета Еўропы, кіраўнікоў і парламентаў суседніх дзяржаў.

Еўропа, не прызнаўшая вынікаў лістападаўскага (1996 г.) рэферэндума павінна быць паслядоўнай. Калі дзейнічае Канстытуцыя 1994 года, гэта азначае, прэзідэнцкія выбары павінны адбыцца не пазней вясны 1999 года. Бо 20 ліпеня будучага года тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А. Лукашэнкі заканчваецца. Ужо на наступны дзень міліцыя мае права не прапусціць яго без пропуску не толькі ў рэзідэнцыю на К. Маркса, 38, але нават у вядомыя Дразды.

Карыстаючыся выпадкам, хачу звярнуцца да тых, хто лічыць сябе сумленнікам прыхільнікам дэмакратычных каштоўнасцяў. Любая спроба ўнесці разлад у законныя дзеянні ВС - прамая дапамога таталітарнаму рэжыму, садзейнічанне беззаконню.

Да слова, некаторыя нашы так званыя дэмакраты, на жаль, больш прыстасаваліся змагацца адзін з адным, чым з рэжымам. Хопіць мышынай валтузні, досыць дробных інтрыжак, агідна глядзець на тое, як некаторыя "правадыры нацыі" дзеля небескарысных амбіцый гатовыя забыцца аб інтарэсах уласнай радзімы.

Сёння у нас ёсць шанец змяніць сітуацыю. Унікальны шанец. Эканамічнае

становішча настолькі беспрасветнае, што самі людзі гатовы патрабаваць выбараў. З адной з перспектыўных краін Еўропы Беларусь ператварылася ў дрымучае эканамічнае захалусце. Краіна загнана ў тупік міжнароднай ізаляцыі.

Народ стогне. Ён хоча перамен і зразумее нашы дзеянні.
Вярхоўны Савет - законна абраны орган заканадаўчай улады. Намі законна абраны Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Віктар Ганчар, які абавязаны наладзіць работу ЦВК. У замен тых, хто змаладушнічаў, у ЦВК павінны быць абраны новыя людзі. Спадзяюся, Цэнтрвыбаркам зноў наладзіць сваю актыўную працу ўжо ў відавочнай будучыні.

*Наколькі мне вядома, Віктар Ганчар сам быў гатовы прэтэндаваць на прэзідэнцкае крэсла?*

Гэткае пытанне Віктару Іосіфавічу задаваў Станіслаў Багданкевіч. Ганчар знайшоў у сабе мужнасць, пераступіўшы амбіцыі, адмовіўся ад удзелу ў прэзідэнцкіх выбарах. Ён запэўніў, што ў інтарэсах дзяржавы будзе сумленна, скурпулёзна, прынцыпова выконваць абавязкі старшыні Цэнтрвыбаркама. Крок, годны пераймання.

Цэнтральная выбарчая камісія будзе сфармавана ў строгай адпаведнасці з існуючым заканадаўствам.

*Ці ўзгоднены Вашыя падыходы з экс-спікерамі Вярхоўнага Савета Мечыславам Грыбам і Станіславам Шушкевічам?*

Так. Яны абодва згодны з тымі высновамі і ацэнкамі, якія я толькі што агучыў. Па-іншаму і быць не магло. Мечыслаў Іванавіч і Станіслаў Станіслававіч - людзі дзяржаўнага ўзроўню мыслення. Яны, як ніхто іншы, разумеюць ступень адказнасці Вярхоўнага Савета ў складаўшайся сітуацыі. Шушкевіч, дарэчы, жартам, сказаў мне гэткую фразу: Калі вы не аб`явіце выбары, прыйдзецца канстатаваць, што вы вырашылі стаць прэзідэнтам…

*А гэта дакладна жарт?…*

На сто працэнтаў. Я ні пры якіх абставінах не буду прэтэндаваць на пасаду прэзідэнта. Перш за ўсё таму, што вельмі добра разумею ступень адказнасці, ускладзенай на мяне ў арганізацыі правядзення выбараў.

Больш таго, калі б мае асабістыя амбіцыі ўзялі верх над здаровым розумам, гэта было б не толькі глупствам, але і здрадаю. Лепшы падарунак рэжыму цяжка прыдумаць. “Рэзанатары” б слюнямі ад захаплення захлынуліся, расказваючы аб тым, што Шарэцкі абвясціў выбары, каб захапіць уладу.

Я дастаткова дакладна ўяўляю сваё месца ў грамадскім жыцці краіны і перш за ўсё павінен выконваць свае функцыянальныя абавязкі. А амбіцыі - справа трэцяга дзесятка.

*І тым не менш. Калі не персаніфіцыраваць, якімі якасцямі павінен, на Ваш погляд, валодаць кандыдат у прэзідэнты краіны?*

Тое, што ў 1994 годзе прэзідэнтам краіны быў абраны Лукашэнка, - прыкрае спалучэнне абставін. Выпадковасць. Нашаму народу зусім не ўласціва цяга да таталітарызму. У беларусаў еўрапейскі склад розуму, для якога дыктатура родная ракавай пухліне. Двойчы на працягу кароткага гістарычнага перыяду яна паўтарацца не можа.

Беларускі менталітэт патрабуе на галоўную пасаду дзяржавы чалавека ўзважлівага, “памяркоўнага”, адданага інтарэсам народа, працалюбівага, талерантнага. Народ ужо абпаліўся на дэмагогіі і пустых абяцаннях.

Важна, каб будучы кандыдат гатовы быў адмовіцца ад той крытычнай масы ўлады, якую ўзваліў на сябе Лукашэнка. Вярнуць людзям украдзеныя дыктатурай дэмакратычныя каштоўнасці.

Далей. Рэальныя шансы перамагчы, на мой погляд, менавіта ў тых кандыдатаў, якія не звязаны з партыйнай прыналежнасцю. Кандыдат павінен быць падтрыманы партыямі, а для гэтага, на мой погляд, ён не павінен быць ні ў воднай з іх.

Будучы прэзідэнт абавязаны быць тым чалавекам, якога адэкватна ўспрымае і Захад, і Усход, і Масква, і Вашынгтон. Гэта архіважна для эканомікі. Нам гістарычна наканавана быць побач з Расеяй, аднак сяброўства з ёю не можа ўшчамляць дзяржаўных інтарэсаў Беларусі. Наша краіна павінна быць суверэннай, а яе прэзідэнт - жорсткім прыхільнікам нацыянальнага адраджэння і незалежнасці.

Па майму глыбокаму перакананню, “праходным” кандыдатам можа лічыцца толькі той, хто ўспрымаецца не толькі ў сталіцы, але і ў правінцыі. На каго гатовы паставіць кіраўнікі сярэдняга і ніжэйшага звяна, каго яны добра ведаюць.

*Ёсць небяспека, што правячая наменклатура спалохаецца любых выбараў, бо ў выпадку замены правадныроў нічога добрага яе не чакае.*

Затое, што адбылося ў краіне, павінны адказваць непасрэдныя вінаватыя. Іх, на мой погляд, не больш дзесятка. Астатнім трывожыцца няма чаго. Хто б ні прыйшоў пасля Лукашэнкі, ён не дапусціць масавага пераследу, бо гэта заўжды хаос і неразберыха. Граматныя, разумныя, кваліфікаваныя кіраўнікі без працы не застануцца. Хвалявацца патрэбна толькі тым, хто раскрадае краіну, штурхае яе ў бездань галечы.

Ходзяць чуткі, што замест выбараў улада рыхтуе чарговы рэферэндум…

Гэта не вырашае праблему. Можна правесці дзесяць рэферэндумаў, аднак іх вынікі не азначаюць аўтаматычнага працягу паўнамоцтваў. Выбары ёсць выбары. Лукашэнка свае пяць гадоў амаль выкарыстаў. У яго ёсць шанец прэтэндаваць яшчэ на адну пяцігодку. Аднак гэта павінны вырашаць не “спецыялісты” па рэферэндумах, якія агучваюць любыя “пераможныя” лічбы, а народ. Вырашаць шляхам прамога галасавання, якое пройдзе пад жорсткім кантролем дзесяткаў тысяч наглядальнікаў. Вельмі сумняваюся, што ў сённяшняга кіраўніка дзяржавы ёсць шанец перамагчы сумленна…

*Падводзячы вынікі, якімі вы бачыце прыярытэты дзейнасці дэмакратычных сіл Беларусі?*

Перш за ўсё я хацеў бы заклікаць усіх, каму не ўсё роўны лёс дзяржавы, да мараторыя на любыя ўзаемныя абвінавачванні, крытыку, калі хочаце, разборкі. Мы

здольны перамагчы, толькі ў адзіным шэрагу. Колькі можна біць па сваіх! Хопіць раздраям умацоўваць дыктатурам!

Дазвольце выкарыстаць старонкі вашага выдання і для звароту для скептыкаў. Як Старшыня Вярхоўнага Савета адназначна заяўляю: Будуць выбары - і будзе выбар. Калі не хочаце памагаць, дык хоць не перашкаджайце.

Буду ўдзячны, калі мае падыходы будуць з разуменнем успрынятыя журналістамі і палітолагамі. Устрымайцеся на час ад пошуку “гарачых” сенсацый. Давайце разам зробім галоўную сенсацыю - вернем краіну да дэмакратыі.

*Дзякуй за інтэрв`ю, жадаем поспехаў.*

***(“Свободные новости”, 18-25 снежня 1998 года)***

KAMUNIKAT.org

# НАВАГОДНІ ЗВАРОТ ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Паважаныя суайчыннікі!

Уваходзіць у гісторыю 1998 год. На жаль, ён быў нялёгкім для беларускага народа. Рэспубліка яшчэ больш глыбока пагрузілася ў крызіс, які ахапіў усе бакі нашага жыцця: сацыяльна-эканамічны, палітычны і маральны. Працягвае разбурацца вытворчасць, асабліва сельская гаспадарка, у людзей значна скараціліся рэальныя заробкі і пенсіі. Пагоршылася становішча з магчымасцю набыць лекі, а тым больш скарыстацца санаторна-курортным лячэннем. І як вынік - насельніцтва Рэспублікі Беларусь яшчэ больш збяднела, смяротнасць людзей заставалася высокай, што прывяло да далейшага змяншэння колькасці жыхароў краіны.

Для беларускага грамадства 1998 год быў годам далейшага ўціску на беларускую культуру і мову, паглыбленне інфармацыйнай ізаляцыі, нагнятанне маральнай напружанасці, новых рэпрэсій супраць іншадумства, павелічэнне колькасці выпадкаў парушэння правоў і свабод чалавека.

У прайшоўшым годзе лукашэнкаўскі рэжым больш набыў рысаў ваенна-акупацыйнага рэжыму ў адносінах да беларускага народа. Замест канстытуцыйных дзяржаўных органаў усім жыццём краіны пачаў кіраваць штаб, што па сутнасці азначае ўвядзенне ў краіне мяккага варыянту надзвычайнага становішча, які ў любы момант можа перайсці ў жорсткі.

Створаны Лукашэнкам рэжым стварыў умовы для падтрымкі скампраментаваўшай сябе былой намеклатуры, якая ў сваіх карысных мэтах сама аказвае паслугі гэтаму антынароднаму амаральнаму рэжыму.

Прайшоўшы год паказаў, што Лукашэнка і яго паплечнікі не хаваюць ужо сваіх намераў атрымаць у свае рукі ядзерную зброю і шукаюць для гэтага шляхі праз аб`яднанне Беларусі і Расеі ў адну дзяржаву на чале з Лукашэнкам.

Усё гэта, з аднаго боку, сведчыць аб тым, што створаны Лукашэнкам дыктатарскі рэжым не бачыць выйсця з таго тупіка, у які ён завёў Беларусь і яе народ.

Ды па апошніх падзеях бачна, што самога Лукашэнку па-ранейшаму больш цікавіць пасада прэзідэнта Расейскай Федэрацыі, да якой ён хоча дзеля дасягнення сваіх мэтаў далучыць і Беларусь, чым лёс беларускага народа.

А з другога боку, падзеі 1998 года больш выразна паказалі і тую небяспеку, якую нясе ў сабе гэты рэжым для суседніх і больш далёкіх краін.

У той жа час з`явіўся рэальны шанс пазбавіцца канстытуцыйным шляхам ад гэтага варожага дыктатарскага рэжыму, які стварыў у Беларусі Лукашэнка. Справа ў тым, што тэрмін яго прэзідэнцтва заканчваецца 20 ліпеня 1999 года. І таму абраны народам і прызнаны міжнароднай супольнасцю (за выключэннем некаторых расейскіх палітыкаў) адзіным легітымным вышэйшым прадстаўнічым і заканадаўчым органам у нашай краіне Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ужо на пачатку будучага года прызначыць выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не пазней 20 мая, як таго і патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь спадзяецца на падтрымку сваіх рашэнняў большасцю беларускага народа і міжнароднымі арганізацыямі, кіраўнікамі і

парламентамі дэмакратычных краін свету. Трэба памятаць, што дыктатарскі рэжым можна перамагчы толькі аб`яднанымі намаганнямі самога беларускага народа, у якога для гэтага павінна хапіць сіл і мужнасці, і міжнароднай супольнасці, якая павінна адчуць небяспеку для ўсяго свету і зрабіць адпаведныя крокі, каб пазбавіцца ад рэжыму.

Веру, што гэта так і будзе. Новы 1999 год павінен стаць для Беларусі годам прэзідэнцкіх выбараў і пачаткам сацыяльна-эканамічных рэформ на карысць свайго народа, устанаўлення палітычнай стабілізацыі і аздараўлення маральнага клімату грамадства, карэнных змен у знешняй палітыцы і наладжвання дружалюбных і ўзаемавыгадных адносін з усімі краінамі. Незалежная Беларусь павінна стаць утульным домам для ўсіх яе жыхароў, якіх бы нацыянальнасцяў і веравызнання яны не былі.

Шаноўныя суайчыннікі!

Віншую вас з Новым 1999 годам! Жадаю кожнай сям`і Рэспублікі Беларусь моцнага здароўя, чалавечага шчасця і дабрабыту. Няхай у Новым годзе здзейсняцца ўсе Вашы надзеі і мары!

***(“Народная воля”, 30 снежня 1998 года)***

KAMUNIKAT.org

# АДКРЫТЫ ЛІСТ

Яго Шаноўнасці Прэзідэнту Расейскай Федэрацыі Ельцыну Б.М.

Паважаны Барыс Мікалаевіч!

Мы звяртаемся да Вас як да Прэзідэнта і Чалавека, чые заслугі ў справе ўмацавання правоў чалавека, дэмакратыі і вырашэння многіх нацыяльных пытанняў на постсавецкай прасторы выклікаюць пачуцці шчырай удзячнасці.

Аднак, у складанай сталінскай спадчыне цяжка пазбегнуць памылак і ўпушчэнняў, і, на жаль, нават Вы - Прэзідэнт Расеі - не змаглі ўстаяць перад бальшавіцкай напорыстасцю і шаманскімі заклінаннямі звычайнага дырэктара саўгаса, стаўшага па здзеку лёсу беларускім прэзідэнтам.

У гістарычны дзень 8 снежня 1991 года Вы паставілі свой подпіс пад Белавежскімі пагадненнямі, якія паклалі канец імперскім дамаганням Расеі на Украіну і Беларусь і абазначылі новую, неімперскую веху ва ўзаемаадносінах нашых народаў. Гэты акт быў адразу ж ратыфікаваны парламентам Расеі і неадкладна атрымаў усеагульнае міжнароднае прызнанне.

Нельга не разумець, што любыя змены дзяржаўнага статусу Рэспублікі Беларусь, якія спрабуе ажыццявіць канчаткова збанкрутаваўшы рэжым Лукашэнкі, не можа лічыцца легітымным, бо сам гэты рэжым перастаў быць законным пасля лістападаўскага дзяржаўнага перавароту 1996 года, здзейсненага пры падтрымцы Чарнамырдзіна, Строева і Селязнёва. Плануемыя змены дзяржаўнага статуса Рэспублікі Беларусь супярэчаць дзеючай Канстытуцыі 1994 года, і мы - беларусы - будзем разглядаць яго як акупацыю Беларусі Расеяй. Спадзяемся, што і рэакцыя міжнароднага супольніцтва будзе адэкватнай дзеянням Расеі.

Акупаваўшы Беларусь, Вы паступіце так, як паступіў Сталін з Літвою, Латвіяй і Эстоніяй, і пасееце ў Беларусі зерне варожасці да народу, які мае ўсе падставы працягваць заставацца дружалюбным, а сам віртуальны “Саюз” паскорыць ланцуговую рэакцыю ў расейскіх рэгіёнах па змене іх дзяржаўнага статусу. Аб гэтым ужо заяўлялі прэзідэнты Татарстана і Інгушэціі. І наўрад ці пасля Чачні ў каго-небудзь з расіян захавалася жаданне адстойваць “канстытуцыйны парадак” ў пакуль яшчэ суб`ектах Расейскай Федэрацыі.

Мы спадзяемся, што Вы, як Чалавек, чые заслугі ў справе пераадолення нашымі народамі наступстваў камуністычнага таталітарызму агульна вядомыя, не хочаце рызыкаваць адзінствам такога велізарнай геапалітычнай прасторы і не дазволіце каму б то ні было ставіць пад пагрозу будучыню Расеі.

Дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання:

**Сямён Шарэцкі**, Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з 1996 года;

**Мечыслаў Грыб**, Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з 1994 па 1996 гады;

**Станіслаў Шушкевіч**, Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з 1991 па 1994 гады.

***(“Народная воля”, 5 студзеня 1999 года)***

# …КАЛІ СУМЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА ПАСАДЖАНА Ў КЛЕТКУ

Некалькі дзён назад чалавецтва сустрэла Новы 1999 год, перадапошні ход зыходзячага стагоддзя і другога тысячагоддзя новай эры. Як прынята ў навагоднюю ноч, у час сямейных урачыстасцяў людзі падымалі келіхі за зыходзячы і іх звонам сустракалі наступленне Новага года.

Аднак у многіх беларускіх сем`ях у гэтую ноч вяселля было мала. Хутчэй, наадварот. У кожнага сумленнага беларуса не раз да горла падступаў камяк слёз і крыўды. Крыўды за сваю гэткую цудоўную і ў той жа час шматпакутную Радзіму, за яе, мабыць, самы працалюбівы ў свеце народ, які, нібы птушка ў клетцы, пакутуе ва ўмовах вельмі жорсткага рэжыму.

У разважлівую галаву не можа прыйсці нават у дурным сне тое, што сёння творыцца ў Беларусі. У пераднавагоднія дні ў металічную клетку для здзяйснення над ім суда зняволены Чалавек, чыё імя, падобнае на імя яго папярэдніка Кірылы Пракопавіча Арлоўскага, яшчэ пры жыцці стала легендарным. Гэта - ветэран вайны і працы, абраны некалькі разоў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і БССР, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў.

Васілю Канстанцінавічу зараз 75 гадоў. Яшчэ юнаком ён, як і мільёны іншых нашых суайчыннікаў, узяў у рукі зброю, каб, рызыкуючы сваім уласным жыццём, наблізіць Дзень Перамогі над нябачаным да таго часу дыктатарскім (фашысцкім) рэжымам. У мірныя гады ўсё сваё жыццё Васіль Канстанцінавіч аддаў самай неабходнай і благароднай справе - Зямлі і Хлебу.

Такіх людзей у Беларусі толькі трое. Акрамя Васіля Канстанцінавіча - Ралько Уладзімір Антонавіч і Бядуля Уладзімір Ляонцевіч. Іх прозвішчы ведае (у рэшце рэшт, абавязаны ведаць) кожны вучань. На іх прыкладзе выхоўваўся цэлы шэраг больш маладых кіраўнікоў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

Тое, што яны зрабілі для Беларусі, не падлягае ацэнцы. Іх гаспадаркамі захапляліся самыя вядомыя фермеры Еўропы і Амерыкі.

Уладзіміру Антонавічу Ралько і Уладзіміру Лявонцевічу Бядулю, як і патрэбна Двойчы Героям Сацыялістычнай Працы, пры жыцці усталяваны бюсты, Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў праявіў сціпласць і ад такой пашаны адмовіўся. Ён, зразумела, не думаў, што сэканомлены на гэтым метал зараз спатрэбіцца для клеткі, у якую ён пасаджаны.

Ён - вядомы Чалавек ў свеце, які з`яўляецца, як і яго цёзка Васіль Уладзіміравіч Быкаў (таксама ганімы рэжымам), годнасцю і сумленнем нацыі.

Той, хто хоць адзін раз пабыў у "Рассвете" (якая ўдалая назва!), ніколі не зможа паверыць, што Чалавек, пад кіраўніцтвам якога створана гэтая ўнікальная гаспадарка, з`яўляецца крымінальным злачынцам. Можна паверыць, што ён, як і любы зямны чалавек, мог недзе памыляцца і нават дапусціць нейкія хібы, але ён не злачынец.

Ды і што абазначаюць яго памылкі ў параўнанні са зробленным за гэтыя гады?! І гэта разумеюць "рассветаўцы", каля пяцісот з якіх ужо звярнуліся з просьбай вярнуць на свабоду іх старшыню. Яны разумеюць, што пры Васілю

Канстанцінавічу Старавойтаву яны сапраўды адчувалі сябе членамі калектыву, да кіраўніцтва якога маглі звярнуцца і ў часы радасці, і ў час бяды, і заўсёды знаходзілі разуменне.

А вось што будзе з "Рассветом" зараз? Ці не ўсталюецца на гэтай праслаўленай Зямлі на доўгія гады "палярная ноч"? Ці разумеюць гэта тыя, хто асмеліўся ўлезці ў жыццё гэтага зладжанага калектыву? Гэта ж не дазвалялі сабе ні К. Мазураў, ні П. Машэраў, ні Т. Кісялёў, ні М. Слюнькоў. У часы К. Арлоўскага "Рассвету" было дазволена смела выкарыстоўваць індывідуальныя метады кіраўніцтва. Пазней, ужо пры В. Старавойтаве, "Рассвету" - аднаму з іх калгасаў у вобласці - было дазволена не ўдзельнічаць у эксперыменце, навязаным магілеўчанам М. Гарбачовым, былым тады Сакратаром ЦК КПСС па сельскай гаспадарцы. І ад гэтага "Рассвет" станавіўся толькі больш яркім і прыкметным, асабліва на фоне той шэрасці, якая вельмі лёгка, па любому закліку любога начальніка, выстрайвалась і працягвае выстрайвацца ў шарэнгу.

У гэтым плане "Рассвету" пашанцавала: і Кірыл Пракопавіч Арлоўскі, і Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў - гэта асобы, са сваім разуменнем і сваім, уласцівым усім вялікім людзям, гонарам. У Васіля Канстанцінавіча нават у клетцы ўсё той жа арліны горды позірк. Менавіта на гэткіх людзях трымаецца Зямля. Перад імі сумленныя людзі схіляюць калені. Дай Бог Вам, Васіль Канстанцінавіч, заставацца такім жа мужным і непаўторным! Гэта маё Вам, паважаны мой Чалавек, навагодняе пажаданне.

* * *

Ва ўсёй гэтай непрыгожай гісторыі здзекаў над Васілём Канстанцінавічам Старавойтавым здзіўляе маўчанне былых Першых і не першых сакратароў ЦК кампартыі Беларусі, старшынь Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Старшынь Савета Міністраў БССР. Я маю на ўвазе таварышаў Сакалова, Малафеева, Дземянцея, Кебіча, Палякова, Аксёнава, Камая і некаторых іншых. Няўжо вы і сапраўды верыце, што Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў - злачынец? Або вы двудушнікі, калі вучылі нас быць цвёрдымі ў барацьбе за правую справу? У дадзеным ж выпадку гаворка ідзе аб лёсе Чалавека, якога вы прадстаўлялі да самых высокіх узнагарод, ставілі нам у прыклад. Я хацеў бы звярнуцца і да палітыкаў Расейскай Федэрацыі: няўжо вы не бачыце таго беззаконня, якое творыцца ў саюзнай з Расеяй дзяржаве? Ці Беларусь вас цікавіць толькі як калідор у Еўропу, аб чым, дарэчы, часта гаворыцца ў расейскіх тэлевізійных перадачах? Няўжо вы не чуеце заклікаючага аб дапамозе стогну брацкага вам народа, над якім кіраўнікі вашай дзяржавы В. Чарнамырдзін, Я. Строеў і Г. Селязнёў дапамаглі А. Лукашэнку здзейсніць насілле і які сёння пакутуе ў абцугах дыктатарскага рэжыму?

Пройдуць гады... Гісторыя паставіць усё і ўсіх на месца. Яшчэ на больш высокую і пачэсную прыступку ў ёй падымецца імя Васіля Канстанцінавіча Старавойтава. А імёны тых, хто сёння акунуў беларускі народ у цемру і наканаваў яму пакуты, пасадзіў у клетку і ўчыніў судзілішча над лепшымі яго сынамі, будуць праклятыя людзьмі і апынуцца на сметніку гісторыі. Кожнаму свайго не пазбегнуць!

***("Народная воля", 12 студзеня 1999 года)***

# ЗВАРОТ

**да дзяржаўных служачых, работнікаў праваахоўных органаў і суддзяў Рэспублікі Беларусь!**

Паважаныя панове!

Вам, як нікому іншаму, вядома, што А. Лукашэнка быў абраны прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на пяць гадоў. Тэрмін яго прэзідэнцтва заканчваецца 20 ліпеня 1999 года. І нельга прамыя тайныя выбары замяніць нейкім рэферэндумам, тым больш што ён быў праведзены з вялікімі парушэннямі Канстытуцыі і заканадаўства Рэспублікі Беларусь і яго вынікі не прызнаныя Еўрасаюзам, АБСЕ і іншымі прадстаўнікамі міжнароднай супольнасці.

У сувязі са сказаным і згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прызначыў чарговыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 16 мая 1999 года. Для арганізацыі і праведзення прэзідэнцкіх чарговых выбараў створаны Цэнтральная і ва ўсіх абласцях і раёнах рэспублікі тэрытарыяльныя камісіі. Ужо зарэгістраваны і ініцыятыўныя групы кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Зянона Пазьняка і Міхаіла Чыгіра.

Аднак, як сведчаць падзеі апошніх дзён, з боку створанага Лукашэнкам рэжыму прымаюцца намаганні на зрыў названых выбараў. Пры гэтым вераломства рэжыму перайшло ўсе межы. Сёння ў турме знаходзяцца старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Віктар Ганчар і яе члены: Барыс Гюнтэр, Анатоль Гурыновіч. Многія аштрафаваны на вялізныя сумы - ад 15 да 30 мільёнаў рублёў. Робіцца ўціск на членаў тэрытарыяльных камісій і незалежныя сродкі масавай інфармацыі.

Пералічаныя дзеянні па зрыву прэзідэнцкіх выбараў, павелічэнне колькасці парушэнняў іншых правоў чалавека, заявы А. Лукашэнкі аб неабходнасці вяртання ў рэспубліку ядзернай зброі нельга кваліфікаваць інакш як агонію рэжыму, які давёў эканоміку краіны да разрухі, а яе жыхароў - да небячнага з ваенных часоў збяднення.

Гістарычны вопыт сведчыць, што гэткія (таталітарныя) рэжымы абавязкова знікаюць - раней ці пазней - як нежыццяздольныя. Менавіта гэта чакае і рэжым, створаны Лукашэнкам. І мяне, як Старшыню Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і чалавека з вялікім жыццёвым вопытам, вельмі трывожыць і заклапочвае тое, чаму гэтага не разумеюць і ўцягваюцца ў грубае парушэнне заканадаўства, у прыватнасці, зрыў прызначаных Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь прэзідэнцкіх выбараў многія дзяржаўныя служачыя, работнікі праваахоўных органаў і нават суддзі, для якіх выкананне закона павінна быць святой справай. Няўжо вы думаеце, што за тое злачынства, якое вы робіце сёння супраць свайго народа дзеля сваіх карысных мэтаў вам не прыйдзецца адказваць?

Няўжо вас ніяк не вучыць суд над дамачаўскім памагатам гітлераўскага рэжыму? Той не мог схавацца ад пакарання за здзейсненыя злачынствы ў гады Вялікай Айчыннай вайны нават у далёкай ад Беларусі Англіі і атрымаў сваё праз больш як пяцьдзесят гадоў. Памятайце, не будзе тэрміну даўнасці і ў адносінах да вашых злачынстваў.

А калі хто з вас сам сумленны чалавек і трапіў на службу дыктатарскаму рэжыму па нейкім недаразуменні, дык тым больш, - навошта вам падтрымліваць

зараз і адказваць у далейшым за таго, хто антыканстытуцыйным шляхам узурпіраваў уладу і не можа з ёю аніяк растацца?

Набярыцеся мужнасці і скіньце з сябе цяжар страху! Вы адчуеце палёгку на душы і з надзеяй стаnенеце глядзець у будучыню.

Панове! Падумайце не толькі аб сваім лёсе, але і аб лёсе вашых дзяцей і ўнукаў. Не кладзіце на іх пляму ганьбы за ваш саўдзел у чорных справах дыктатарскага рэжыму. Задумайцеся над тым, што яны скажуць вам, калі гэты антынародны рэжым апынецца на сметніку гісторыі і наша краіна стане вольнай дэмакратычнай прававой дзяржаваю, як таго і патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь!

А сведчаннем таго, што гэта будзе, і ў хуткім часе, з`яўляецца ахапіўшы вас страх перад будучыняй. А галоўнае - дзеянні па вяртанні на канстытуцыйны шлях развіцця Рэспублікі Беларусь тых, каго вы сёння спрабуеце запалохаць. Дарэчы, больш зрабіць вы ўжо нічога не можаце. Ваш час заканчваецца 20 ліпеня 1999 года.

Адумайцеся і спыніцеся, пакуль не позна!

***(“Народная воля”, 5 сакавіка 1999 года)***

# ПАТРАБАВАННІ КАНСТЫТУЦЫІ ПАВІННЫ ВЫКОНВАЦЦА БЕЗДАКОРНА

**(да пятай гадавіны з дня прыняцця Асноўнага Закону Краіны)**

15 сакавіка 1999 года спаўняецца пяць гадоў з дня прыняцця Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 12-га склікання Канстытуцыі - Асноўнага закону Рэспублікі Беларусь. Прымаючы Канстытуцыю, дэпутаты падкрэслілі, што робяць гэта ад імя народа Беларусі, зыходзячы з адказнасці за цяперашні стан і будучыню Беларусі, а таксама ўсведамляючы сябе паўнапраўным суб`ектам сусветнай супольнасці і падцвярджаючы сваю прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцяў, грунтуючыся на сваім неад`емным праве на самавызначэнне, абапіраючыся на шматвекавую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці, імкнучыся зацвердзіць правы і свабоды кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і жадаючы забяспечыць грамадзянскую згоду, непахісныя асновы народаўладдзя і прававой дзяржавы. Сапраўды, кожны артыкул Канстытуцыі ў той ці іншай ступені падцвярджае пералічаныя ў сваёй прэамбуле прынцыпы.

Не прайшло двух з паловай гадоў з дня набыцця Канстытуцыяй сваёй прававой моцы, як абраны паводле яе прэзідэнт А. Лукашэнка - колішні дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі 12-га склікання і сябра канстытуцыйнай камісіі - пачаў рыхтаваць па сутнасці новы Асноўны Закон рэспублікі, якому надаў моцы ў лістападзе 1996 года праз антызаконныя метады. Гэтым самым ён груба парушыў артыкул 3 дзейснай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у якім гаворыцца: “Любыя дзеянні, што скіраваныя на авалоданне дзяржаўнай уладаю гвалтоўнымі метадамі, а таксама праз іншага кшталту парушэнні законаў Рэспублікі Беларусь караюцца паводле закону”.

Паўстае пытанне: чым незадавальняла А. Лукашэнку Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, што надавала яму як прэзідэнту паводле ягоных жа слоў, “царскія” правы. Справа ў тым, што паводле сваёй сутнасці Лукашэнка належыць да тыпу аўтарытарных кіраўнікоў. Гэтае падцвердзілі яго словы пра Адольфа Гітлера. Да таго самага тыпу належаў Іосіф Сталін, а таксама прэзідэнт Ірака Садам Хусэйн.

Гэткія людзі, як сведчаць працяглыя доследы псіхолагаў, паводле свайго біялагічнага прызначэння, створаныя для барацьбы. У іх паводзінах шмат непрадказальнага. Яны не пазбягаюць свайго шансу падначаліць сваёй волі іншых. Гэтыя людзі не толькі актыўныя, але і агрэсіўныя, яны заўжды падазраюць астатніх. Ім уласцівая прага помсты і зайздрасць, раздражнёнасць і нават лютасць. Як піша адзін са стваральнікаў навукі пра памежныя станы, Пётр Аннушкін, гэтыя людзі “заўжды патрабуюць пакоры і падначалення сабе і, нааадварот, самі нават не збіраюцца цярпець катэгарычнага тону ад іншых...”. Яны звычайна не вылучаюцца высокай ступенню духоўнага развіцця, абыякавыя да іншых людзей, нават блізкіх да сябе. “Пачуццё, сімпатыі і спачуванні, здольнасці зразумець чужое гора , - як заўважае той самы Аннушкін, - для іх незразумелыя”. Што да А. Лукашэнкі, дык пад ягонай апекай створана цэлая імперыя (Кіраўніцтва справамі прэзідэнта), што, калі меркаваць паводле дакладу старшыні Кантрольнай палаты Васіля Саковіча на сесіі Вярхоўнага Савета, у карупцыі дасягнула гэткага абсягу,

чаго ураду В. Кебіча, які крытыкаваў А. Лукашэнка, не магло прысніцца. Больш за тое, амаль усе тыя карупцыянеры і мафіёзі, якіх А. Лукашэнка абяцаў пакараць, апынуліся ў ягоных структурах.

Заўважу, лідары аўтарытарнага тыпу з эпілептоіднай псіхічнай канстытуцыяй вельмі цяжка разумеюць і згаджаюцца з тым, што нехта з падначаленых можа мець уласныя думкі і можа бараніць свае правы, а тым больш патрабаваць ад тых, хто стаіць вышэй, выканання сваіх абавязкаў. Таму створаныя такімі лідэрамі рэжымы, звычайна носяць таталітарны характар, і пры нагодзе яны проста пазбаўляюцца ад іншадумцаў, асабліва калі тыя з імі спаборнічаюць. Яскравым прыкладам могуць быць Гітлер і Сталін. Апошні не пашкадаваў нават блізкага і вернага яму сябра Мікалая Бухарына, які не толькі дапамагаў Сталіну пазбаўляцца адзіных супернікаў (Льва Троцкага і Рыгора Зіноўева), але пасля смерці жонкі Сталіна (Надзеі Алілуевай) аддаў таму і сваю кватэру. Каб Сталін не памёр, дык напаткала б доля Бухарына ягонага другога адданага сябра - Вячаслава Молатава, жонка якога ўжо сядзела ў вязніцы.

А цяпер вернемся да нашай рэчаіснасці. Ад першых дзён свайго прэзідэнцтва А. Лукашэнка зманапалізаваў тэлебачанне і радыё, а таксама больш за 90 працэнтаў тыражоў газэт і часопісаў, гэтым самым груба парушыў артыкул 33 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. А надалей зрабіў уціск на ўсіх, у кім бачыў сваіх праціўнікаў. Першай ахвярай сталіся дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання, ягоныя колішнія калегі, якія не згаджаліся з ім наконт абранага шляху развіцця краіны. Створаны А. Лукашэнкам дыктатарскі рэжым пайшоў у дачыненні да дэпутатаў нават на гвалт (памятаеце, як збілі “людзі ў масках” у зале паседжанняў). Пасля арыштавалі міністра аграрна-прамысловага комплексу Васіля Лявонава, якога сам А. Лукашэнка некалі называў “у якасці былога першага сакратара Магілёўскага абкама КПБ) сваім настаўнікам. У вязніцы знаходзяцца дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання Уладзімір Кудзінаў і Андрэй Клімаў, гэтым самым парушаны артыкул 93 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, бо іх арышт праводзіўся без згоды парламента. Да таго ж дэпутат Клімаў, як, дарэчы, і Лявонаў, знаходзіцца ў вязніцы ўжо болей за год без суда.

Гэтыя факты сведчаць, што створаны А. Лукашэнкам рэжым не толькі грэбуе агульначалавечымі каштоўнасцямі і не бароніць правоў і свабод грамадзян сваёй краіны, як таго патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, але ёсць па сутнасці амаральным у поўным сэнсе гэтага слова ды пярэчыць шматвекавой гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці, якая яшчэ ад часу стварэння першага Статута Вялікага княства Літоўскага ў 1529 годзе вылучалася прынцыпамі дэмакратычнага кіравання. “Пахвальнае тое, што маральна”, - сцвярджаў адзін з выбітных беларускіх правазнаўцаў XVI стагоддзя Андрэй Волан.

Палітычная барацьба за ўладу у найпрасцейшым сэнсе для людзей з аўтарытарным тыпам палітычных паводзін - адна з найвялікшых спакус. Да таго ж для іх галоўнае - магчымасць валодаць уладай, а не ідэя. Лічу, што менавіта гэтая рыса і штурхнула Лукашэнку ўжо праз некалькі месяцаў прэзідэнцтва на падрыхтоўку, а пасля і здзяйсненне дзяржаўнага перавароту і фактычны захоп выканаўчай, заканадаўчай і судовай улады ў свае рукі. Да таго ж, як сведчыць гістарычны досвед, кіраўнікі такога кшталту палітычных паводзін не задавальняюцца толькі ўмацаваннем сваёй улады ў адной краіне. Яны заўжды

імкнуцца, у тым ліку з дамапогай сілы, распаўсюдзіць свае ўплывы на суседнія абшары. Падцвярджэнне сказанаму - паводзіны ў гэтым кірунку рэжымаў Гітлера, Сталіна і Хусэйна. Мяркую, не будзе выключэннем і рэжым А. Лукашэнкі, які робіць захады на авалоданне пасадай кіраўніка нейкай міфічнай "славянскай" дзяржавы, пачаткам стварэння якой ён лічыць Саюз Беларусі з Расеяй. Часам ён кажа пра патрэбу вяртання ў Беларусь ядзернай зброі.

Гісторыя вучыць, што пазбавіцца ад таталітарных рэжымаў мірным шляхам не гэтак проста. І калі нашая краіна мае магчымасць аднавіць дэмакратыю менавіта мірным шляхам, будзе злачынствам не скарыстацца з гэтай нагоды. Менавіта таму дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання ў звязку з заканчэннем 20 ліпеня 1999 года тэрміну прэзідэнцтва А. Лукашэнкі, прызначылі чарговыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 16 мая 1999 года. Былі створаны Цэнтральная і тэрытарыяльныя (абласныя і раённыя) выбарчыя камісіі, якія пачалі практычную арганізацыю выбараў. Актыўна ідзе збор подпісаў за кандыдатаў у прэзідэнты Зянона Пазьняка і Міхаіла Чыгіра.

Тым, хто чыніць перашкоды ў арганізацыі і правядзенні прэзідэнцкіх выбараў, я яшчэ раз нагадваю, што яны не толькі бяруць на сваю душу вялікі грэх перад сваім народам і чалавецтвам, але груба парушаюць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, за што не будзе тэрміну даўніны ў адказнасці за здзейсненыя злачынствы. Патрабаванні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь павінны выконвацца бездакорна.

***("Народная воля", 15 сакавіка 1999 года)***

# ВЯСНА НАДЗЕЙ І ТРЫВОГ

**Да 81-й гадавіны абвяшчэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі**

Вясна - гэта пара абуджэння прыроды. Таму з яе прыходам людзі заўжды звязвалі свае надзеі на лепшы лёс. Веснавое сонца і цяпло робяць жыццё больш святлейшым і цяплейшым. А для беларусаў вясна - гэта яшчэ і пара нацынальнага адраджэння. Так здарылася, што менавіта вясною пачыналіся паўстанні пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі (24 сакавіка 1794г.) і Васіля Вашчылы (май 1940г.).

Першая спроба адраджэння беларускай дзяржаўнасці таксама адбылася вясной (1918 год). Але трэба адзначыць, што шлях да гэтага быў вельмі складаным, хаця барацьба беларусаў за сваю годнасць і незалежнасць не спынялася на працягу ўсяго перыяду ўваходжання ў склад Расейскай імперыі, аб чым гавораць і пералічаныя паўстанні. Нягледзячы на спробу ранейшай паланізацыі, а пачынаючы з вядомых у гісторыі трох падзелаў Рэчы Паспалітай і гвалтоўную русіфікацыю, беларусы імкнуліся захаваць сваю культуру і мову. Паказальным у гэтым з`яўляецца той факт, што менавіта на беларускай мове вітаў вядомы паэт Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч) еўрапейскую рэвалюцыю 1848 года, якая, на яго думку, рабіла “вольных людзей і мужыкоў”. У гэты час пачынае развівацца і творчасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, для якога беларуская мова стала асноўнай. У 1846 годзе ў Вільні на беларускай мове была надрукавана яго камедыя “Ідылія”, да якой другі выбітны сын беларускай зямлі Станіслаў Манюшка - напісаў музыку.

Вялікім штуршком, які ўзняў цэлую хвалю адраджэнскага руху за беларускасць, стала паўстанне 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, якое свайго эпагею дасягнула, дарэчы, таксама вясною (красавік-май). І тут перш за ўсё трэба назваць творчую дзейнасць Францішка Багушэвіча (Мацея Бурачка), Янкі Лычыны (Неслухоўскага), Элаізы Пашкевіч (Цёткі), акадэміка Яўхіма Карскага, які навукова абгрунтаваў самастойнасць беларускай мовы як адной са старэйшых усходне-славянскіх моў. Пры гэтым трэба аддаць належнае і многім польскім (а дакладней - апалячаным) беларусам, а таксама расейскім навукоўцакм, якія не толькі цікавіліся беларускім пытаннем, але сталі збіраць і выдаваць цэлыя тамы беларускіх народных песень, казак, загадак і прыказак, апісваць беларускія народныя абрады і звычаі. У маскоўскай славянафільскай літаратурна-палітычнай газэце “Дзень” (1861-1865г.г.) знайшоўся нават сказ аб тым, што “Мы вінаватыя перад вамі (беларусамі). Мы, расейскае грамадзянства, як бы забыліся аб існаванні Беларусі”. Беларускія патрыёты пачалі браць актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху. У 1884 годзе пачаў выходзіць нават нелегальны народавольскі часопіс “Гоман”, які працягваў змаганне за палітычную і эканамічную самастойнасць Беларусі ў агульнай Расейскай Федэрацыі.

На новы, больш высокі ўзровень падняўся нацыянальна-вызваленчы рух у Беларусі на пачатку 20-га стагоддзя. У 1902 годзе ўзнікае Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, якая пазней была ператворана ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду - першую на тэрыторыі Беларусі нацыянальна-

дэмакратычную партыю сацыялістычнага накірунку. Стваральнікамі і кіраўнікамі яе былі браты Луцкевічы, К. Каставіцкі (Карусь Каганец), В. Іваноўскі, А. Уласаў, Ф. Умястоўскі, А. Пашкевіч (Цётка) і іншыя. У 1905 годзе ў Менску быў скліканы Беларускі Сялянскі з`езд, які пастанавіў стварыць Беларускі Сялянскі Саюз і таксама выказаўся за аўтаномію для Беларусі. А ў 1906 годзе стала выходзіць першая легальная газэта "Наша Доля", а пасля яе разгрому - "Наша Ніва", на старонках якой першыя свае крокі ў літаратуры рабілі Максім Багдановіч, Янка Купала, Максім Гарэцкі, Алесь Гарун, Якуб Колас, Канстанцыя Буйло, Язэп Лёсік і іншыя.

Такім чынам, беларускае грамадства ніколі не развітвалася з марай адраджэння сваёй дзяржаўнасці як вышэйшай ступені нацыянальнай незалежнасці. Больш таго, яно расло і спела да новых крокаў у гэтым накірунку. І калі ў канцы лютага 1917 года ў Расеі адбылася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, беларусы адразу адчулі подых надыходзчых веснавых бурлівых грамадска-палітычных падзей. Ва ўсіх цэнтрах Расеі пачалі ўзнікаць беларускія арганізацыі. Ужо 15 сакавіка 1917 года ў Петраградзе з`вілася дэкларацыя беларусаў, у якой гаварылася, што Расея павінна быць рэарганізавана на асновах федэральнай дзяржавы, а 25 сакавіка з`езд Беларускай Сацыялістычнай Грамады, які адбыўся ў Менску, выказаўся за аўтаномію Беларусі. 25-26, 27 сакавіка 1917 года ў тым жа Менску (тады менавіта так ён называўся) прайшоў з`езд прадстаўнікоў усіх беларускіх арганізацый, на якім таксама было пастаноўлена, каб Беларусь была аўтаномнай рэспублікай. Шырокай аўтаноміяй для Беларусі і ўвядзенне беларускай мовы ў святынях патрабаваў з`езд Беларускага каталіцкага духавенства, які праходзіў 24-25 мая 1917 года ў Менску. У маі таго ж года пачалі закладвацца і першыя гурткі беларусаў-вайскоўцаў.

Ажыўленне беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, якое пачалося вясной, працягвалася ўвесь 1917 год і скончылася скліканнем у снежні Усебеларускага з`езду - Кангрэса Вялікай Беларускай Рады, удзел у якім збіраліся прымаць і бальшавікі, але спазніліся. На кангрэсе прысутнічалі 1872 дэлегаты, якія па вырашэнню нацыянальнага пытання падзяліліся на дзве групы: незалежнікаў і русафілаў. Першыя стаялі за адраджэнне беларускай дзяржаўнасці, другія - за больш цесную лучнасць Беларусі з Расеяй.

І вось тут ва ўсёй моцы праявілася здрадніцкая дзейнасць бальшавікоў, якія мелі ўжо ў сваіх руках уладу. Убачыўшы, што большасць дэлегатаў з`езда прытрымліваецца дзяржаўніцкіх поглядаў, яны абставілі будынак Гарадскога тэатра, дзе праходзіў з`езд, войскамі і кулямётамі і сілаю разагналі яго. Але, нягледзячы на абурэнне ў зале, аднаму з сакратароў з`езда Тамашу Грыбу ўсё ж такі ўдалося зачытаць рэзалюцыі, якая была падцверджана дэлегатамі і абвяшчала Беларусь рэспублікай.

Пасля разгрому Кангрэса ягоныя дэлегаты сабраліся ў чыгуначным дэпо і перадалі Радзе з`езда паўнамоцтвы на далейшае змаганне за беларускую дзяржаву. І калі пасля наступлення нямецкіх войскаў 19 лютага 1918 года бальшавікі пакінулі Менск, уладу ў горадзе і акрузе ўзяў у свае рукі Выканаўчы Камітэт Усебеларускага з`езда-кангрэса, які 21 лютага абвясціў сябе найвышэйшай уладай на Беларусі і звярнуўся з Першай Устаўною Граматай" Да народаў Беларусі". У ёй, у прыватнасці, гаварылася: "Родная старонка наша апынулася ў новым цяжкім стане. Дзе цяпер улада, што была тут, няведама, мы стаімо перад

тым, што наш край можа быць заняты нямецкімі войскамі. Мы павінны ўзяць свой лёс ва ўласныя рукі. Беларускі народ павінен здзейсніць свае правы на поўнае самавызначэнне, а нацыянальныя меншасці на нацыянальна-персанальную аўтаномію. Прававы нацыі павінны знайсці сваё здзяйсненне шляхам склікання на дэмакратычных асновах "Устаноўчага Сойму". Выканаўчы камітэт Рады папоўніўся прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасцяў і, здзяйсняючы мэты з`езда, абвясціў сябе часовай народнай уладай на Беларусі. Абарону і далейшае зацвярджэнне заваёў рэавалюцыі было даручана выконваць Народнаму Сакратарыяту Беларусі, які і стаў першым беларускім урадам. Да прыходу ў Менск немцаў (25 лютага) Беларускі урад быў адзінай уладай у горадзе.

На пачатку вясны (9 сакавіка) 1918 года Беларускі Урад прыняў Другую Устаўную Грамату, у якой гаварылася, што "Беларусь у рубяжах рассялення і лічэбнай перавагі беларускага народа абвяшчаецца Народнаю Рэспублікай". У Грамаце зацвярджаліся правы і вольнасці гарамадзян і народаў абвешчанай дзяржавы - БНР. А 19 сакавіка Рада Усебеларускага з`езда яшчэ раз папоўнілася - ужо прадстаўнікамі гарадоў і земстваў, і на сваім паседжанні Выканаўчы камітэт Рады з`езда перайменавала ў Раду Беларускай Народнай Рэспублікі, якая ўжо на сваім паседжанні ўноч з 24 на 25 сакавіка прыняла III Устаўную Грамату. Названай граматай Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася "Незалежнай і вольнай дзяржаваю". Далей у грамаце асуджалася дзейнасць бальшавіцкага ("чужога") ураду Расейскай Федэрацыі, які падпісаў і за Беларусь трактат у Бярэсці, што "забівае на смерць беларускі народ, дзелячы зямлю яго на часткі". II Устаўная Грамата падцвердзіла ўсе правы і вольнасці, якія абвяшчала Устаўная Гармата ад 9 сакавіка 1918 года. А ў канцы III Устаўной Граматы выказвалася надзея на тое, што "усе любячыя волю народы дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры здзейсніць яго палітычна-дзяржаўныя ідэалы".

* * *

З тых часоў прайшоў 81 год, За гэты час на долю беларускага народа выпалі вялікія выпрабаванні: сталініская дыктатура і ліхалецце Вялікай Айчыннай вайны, пасляваенная разруха. Адчуўшы ў першай палове 90-ых гадоў прывабнасць свабоды, беларускі народ зноў трапіў у ціскі дыктатуры, устаноўленай на гэты раз прэзідэнтам А. Лукашэнкам, якая давяла народ да галечы і бяспраўя. Але, на вялікае шчасце, прыйшла зноў вясна спадзяванняў - вясна 1999 года. Дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання, як таго і патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прызначылі чарговыя выбары прэзідэнта на 16 мая 1999 года, падрыхтоўка да якіх, нягледзячы на вялікі ўціск з боку выканаўчых улад, ідзе сёння поўным ходам. І ніхто не можа пазбавіць беларускі народ яго канстытуцыйнага права абіраць кожныя пяць гадоў кіраўніка сваёй дзяржавы. Будзем спадзявацца, што і сам беларускі народ знойдзе ў сабе сілы і прыкладзе ўсе намаганні, каб узяць актыўны ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах і тым самым здзейсніць ідэалы незалежнасці і дэмакратыі, абвешчаныя вясною 1918 года. Як і тады, мы таксама спадзяемся на дапамогу прагрэсіўных дэмакратычных сіл міжнароднай супольнасці і таксама на тое, што на гэты раз гэтая дапамога будзе аказана беларускаму народу ў цяжкі і адказны для яго час.

***("Народная воля", 25 сакавіка 1999 года)***

# АЛЬТЭРНАТЫВА ПРЭЗІДЭНЦКІМ ВЫБАРАМ –
# – ГЭТА ДАЛЕЙШАЯ ГАЛЕЧА, БЯСПРАЎЕ
# І МІЖНАРОДНАЯ ІЗАЛЯЦЫЯ БЕЛАРУСІ

**Тэма прэзідэнцкіх выбараў, якія дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання прызначылі на 16 мая бягучага года, безумоўна, хвалюе ўсіх жыхароў Беларусі. Гэтае хваляванне і дае падставу для гутаркі са Старшынёй легітымнага беларускага парламента Сямёнам Шарэцкім.**

*Сямён Георгіевіч, як вы ацэньваеце тую сітуацыю, што склалася зараз у краіне вакол прэзідэнцкіх выбараў?*

Хачу адразу адзначыць, што вельмі шмат чаго ўжо зроблена. Створаны ўсе 180 тэрытарыяльных (абласных і раённых) выбарчых камісій, якія правялі значную работу. Утвораны дзве ініцыятыўныя групы кандыдатаў у прэзідэнты, яны сабралі неабходную колькасць подпісаў, што дазволіла Цэнтрвыбаркаму зарэгістраваць двух - Зянона Пазьняка і Міхаіла Чыгіра - прэтэндэнтаў на пасаду кіраўніка дзяржавы.

*А што трэба рабіць зараз?*

Па-першае, скажу, што Цэнтрвыбаркам і тэрытарыяльныя камісіі цяпер удакладняюць склад участковых камісій. А што тычыцца груп падтрымкі кандыдатаў у прэзідэнты, дык ім, на мой погляд, патрэбна ўзмацніць агітацыю за сваіх кандыдатаў. Зразумела, кожны разумее, што весці такую агітацыю зараз надзвычай цяжка. Адзін кандыдат у прэзідэнты знаходзіцца ў турме, другі - за мяжою. І тут я, як Старшыня Вярхоўнага Савета, хацеў бы падкрэсліць, што праваахоўнымі органамі здзейснена яшчэ адно злачынства - без дазволу Цэнтрвыбаркама яны не мелі права арыштаваць кандыдата ў прэзідэнты Міхаіла Чыгіра.

Я хачу сказаць і пра другога кандыдата. Яму павінна быць прадастаўлена магчымасць вярнуцца з-за мяжы і весці агітацыю. Але нават калі самі прэтэндэнты не змогуць гэтага зрабіць, агітацыяй будуць займацца іх ініцыятыўныя групы.

*Сямён Георгіевіч, а ці ёсць альтэрнатыва выбарам кіраўніка беларускай дзяржавы?*

Калі зыходзіць з юрыдычнага пункту гледжання, дык альтэрнатывы выбарам няма. Пра гэта кажуць і Канстытуцыя, і іншыя законы нашай краіны. Ды і людзі выбіралі Лукашэнку на пяць гадоў. Тэрмін яго прэзідэнцтва скончыцца 20 ліпеня. І пасля гэтага Лукашэнка не можа лічыцца дэмакратычна абраным прэзідэнтам. Пра што ўжо, дарэчы, заявілі і прадстаўнікі Дзярждэпартамента Злучаных Штатаў.

Трэба падкрэсліць, што за пяць гадоў Лукашэнка так і не змог выканаць ніводнагга свайго абяцання. Заводы і фабрыкі як не працавалі на поўную

магутнасць, так не працуюць і цяпер. Сельская гаспадарка як пачала развальвацца, дык і развальваеццца і далей. Інфляцыя значна ўзрасла. Лукашэнка абяцаў людзям, што яны будуць жыць багата, а яны на самой справе апынуліся ў галечы.

Пра тое, што гэта так, сведчыць мноства прыкладаў. За мінімальны заробак сёння можна купіць адзін кілаграм кількі. Калі ж, не дай Бог, спатрэбяцца лекі… За но-шпу, напрыклад, трэба выкласці ўжо аж чатыры мінімальных заробкі - два мільёны рублёў. Больш таго, калі раней у краіне быў нейкі парадак, дык пасля так званага лістападаўскага рэферэндуму 1996 года ўстанавілася беззаконне. Ніякія законы не дзейнічаюць, ды іх і няма каму прымаць. Пaглядзіце: на кожным вуглу стаяць міліцыянеры, але гэта не дапамагае, бо парадак залежыць не ад колькасці міліцыянтаў, пракурораў, суддзяў, а ад сацыяльна-эканамічнага становішча і выканання законаў. А таму альтэрнатывай выбарам могуць быць толькі яшчэ большыя галеча, бясправ'е і міжнародная ізаляцыя краіны.

*Але ж афіцыйныя асобы сцвярджаюць, што народ падтрымлівае Лукашэнку…*

Гэта хлусня. Сёння з задавальненнем можна адзначыць, што людзі Беларусі, нягледзячы на ілжывую прапаганду прэзідэнцкіх структур, добра разумеюць сапраўднае становішча спраў. Не звяртаючы ўвагі на мацнейшы ціск улад, больш як 300 тыссяч чалавек паставілі свае подпісы за аднаго ці другога кандыдата ў прэзідэнты. А гэта значыць, што яны адкрыта патрабуюць правядзення выбараў кіраўніка дзяржавы. Зразумела, такіх людзей у шмат разоў больш, чым 300 тысяч. Проста сёння многія баяцца адкрыта паставіць свой подпіс. Але калі справа дойдзе да тайнага галасавання, супраць Лукашэнкі выступяць мільёны жыхароў Беларусі. Цяперашняя выбарчая кампанія паказала, што тыя завярэнні ўсялякіх “спецыялістаў”, якія кормяцца з дзяржаўнага бюджэту, што народ нібыта падтрымлівае прэзідэнта, - няпраўда. На самай справе людзі патрабуюць выбараў. Пра гэта, дарэчы, гавораць і сацыяльныя даследаванні.

*Сямён Георгіевіч, а як, на Вашу думку, адчувае сябе зараз прэзідэнт?*

Апошнія ягоныя выступленні, якія паказваліся па тэлебачанню, даюць падставу сцвярджаць, што Лукашэнка знаходзіцца ў адчаі. І гэта яшчэ раз падцвярджае агульную ўпэўненасць: выправіць становішча ў краіне ён не можа, а ўладу згубіць баіцца. Адсюль і адчай, і злосць на ўсіх, і страх перад будучыняй.

*Гутарку правёў Уладзімір Глод.*

***(“Народная воля”, 15 красавіка 1999 года)***

# КУДЫ ЁН НАС ЦЯГНЕ?...

**Рашэнне Расейскай Дзяржддумы аб далучэнні Югаславіі да Саюза Беларусі і Расеі хаця і не мае абавязковага прымянення, тым не менш указвае на палітычны настрой дэпутатаў ніжняй палаты Расейскага парламента.**

**Што па гэтаму поваду думае кіраўнік Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання Сямён Шарэцкі? З гэткім пытаннем да яго і звярнуўся журналіст Уладзімір Глод.**

**Вось што адказаў спікер:**

Мне здаецца, што ў гэтай сітуацыі як ніколі да месца будзе вядомая прымаўка: “Паспяшыш - людзей насмяшыш”. Безумоўна, перш чым прымаць падобнае гістарычнае рашэнне, патрэбна было пралічыць усе варыянты наступстваў такога кроку. Тут без меркаванняў і ацэнак экспертаў, кансультантаў, дарадчыкаў не абысціся. Тым больш, што ўсім памятны прэцэдэнт 1914 года, калі тая ж Сербія ўцягнула ў вайну Расею, якая, як цяпер сцвярджаюць гісторыкі, і не хацела, і не была гатова да ваенных дзеянняў.

Калі ж паглядзець на прапануемы саюз з блокавага пункту гледжання, дык тым, хто ва ўсю лае НАТА, ня грэх было б узяць прыклад з альянса, статут якога забараняе прымаць у свае шэрагі новых членаў з ліку краін, у якіх не ўрэгуляваны памежныя пытанні і ў якіх ёсць сур`ёзныя ўнутраныя праблемы. Не ўяўляю, як можна пашыраць саюз за кошт краіны, у якой існуе дыктатарскі рэжым прэзідэнта Мілошавіча, і ў якой праходзяць этнічныя чысткі. Тут бы і задумацца - ці не гаворыць падобны крок Дзярждумы аб непаўнавартаснасці Саюза Беларусі і Расеі. Бо расіяне таксама церпяць штодзённыя парушэнні правоў чалавека, парушэнні канстытуйцыйных прынцыпаў, манапалізацыю сродкаў масавай інфармацыі ў частцы Саюза, якая носіць назву Беларусь. У мяне ўзнікае пытанне: ці на тыя мэты скіраваны беларуска-расейскі Саюз, аб якіх было заяўлена пры яго стварэнні?

Калі паглядзець з чыста чалавечага пункту гледжання, дык тут вельмі патрэбна задумацца - ці патрэбна Беларусі ўцягвацца ў яшчэ адну вайну? Няўжо яе гісторыя - няспынная барацьба за выжыванне як нацыі - не навучыла таму, што яна павінна дзейнічаць вельмі ўзважліва і вельмі асцярожна пры прыняцці кардынальных рашэнняў. Я мяркую, што калі нехта з беларускіх палітыкаў ці якаясьці беларуская арганізацыя будзе ратаваць за саюз з Югаславіяй, дык гэта, безумоўна, стане безадказным крокам перад народам. Па значнасці яго можна будзе параўнаць з афганскай вайною, дзе беларусаў у адносінах да агульнай колькасці насельніцтва былога СССР загінула больш за ўсіх.

Будучыня Беларусі павінна быць гэткай, якой яе вызначыла Канстытуцыя. Рэспубліка Беларусь абавязана быць дэмакратычнай сацыяльнай прававой і нейтральнай дзяржавай. Гэтага патрабуе і наша

шматвяковая гісторыя і геапалітычнае размяшчэнне Беларусі ў цэнтры Еўропы. Нельга дапускаць, каб па прыкладу Югаславіі, якая стала ачагом ужо не толькі нервовасці, але і вайны, пайшла і наша краіна. Дзіўна, што гэтага не разумее кіраўнік дзяржавы. Простыя людзі, як неаднаразова мне прыходзілася чуць у апошнія дні, абсалютна не падтрымліваюць яго імкненні да Саюзу з ваюючай Югаславіяй. Яны ўсе пытаюць: “Куды ён нас цягне?”. Я ж толькі дадаю, што ў палітыцы Аляксандра Лукашэнкі ў балканскім пытанні больш двудушша і самаўсхвалення, чым здаровага сэнсу.

***(“Народная воля”, 23 красавіка 1999 года)***

KAMUNIKAT.org

# ЦЯРПЕННЕ ЛЮДЗЕЙ СКОНЧЫЛАСЯ

**Надзвычай высокая актыўнасць выбаршчыкаў, якія прымаюць удзел у аб`яўленых дэпутамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання прэзідэнцкіх выбарах, па добраму здзіўляе. А што думае з гэтай нагоды Старшыня Вярхоўнага Савета Сямён Шарэцкі? Менавіта з гэтага пытання і пачалася нашая гутарка.**

Я доўга разважаў над гэтай праблемай. І ведаеце, прыйшоў да высновы - усё, што адбываецца зараз у нашай Беларусі, гэта заканамерная з`ява. Пяць год сам прэзідэнт, блізкія да яго асобы, халуйскія фодкі масавай інфармацыі ўдоўблівалі ў галовы людзей, што быццам усе падтрымліваюць Аляксандра Лукашэнку. Але ж гэта не так. Прычыны вытокаў недаверу да першага прэзідэнта былі бачны яшчэ летам 1994 года. Так, тады за Лукашэнку галасавала шмат выбаршчыкаў. Але ж не будзем забывацца, што звычайная колькасць з іх у другім туры выбараў аддала свае галасы за яго толькі таму, што лічыла, быццам Лукашэнка - гэта лепш, чым Кебіч. Вельмі хутка гэтыя людзі ўбачылі сваю памылку.

Далей. Шмат хто з даверлівых беларусаў спачатку сапраўды верыў у тое, што Лукашэнка здольны кіраваць краінай. Проста яму перашкаджаюць. Але пасля таго, як усе, хто "перашкаджаў", напрыклад, Шушкевіч і Грыб, Багданкевіч і Карпенка і шмат яшчэ хто, былі адхілены ад улады, людзі пачалі паступова разумець - прычына ў самім прэзідэнце. Ён узяўся за справу, якая яму не па сіле...

*А як вы думаеце, чаму так доўга да жыхароў нашай краіны не даходзіла разуменне сутнасці Лукашэнкі як чалавека, нездольнага кіраваць краінай?*

Давайце зноў вернемся ў 1994 год. Першапачаткова Лукашэнка ўсе свае хібы і недахопы спісваў на тое, што яму засталася ад Кебіча вельмі дрэнная спадчына. А паколькі аб`ектыўнага аналізу спраў прэзідэнт не дазваляў рабіць, насельніцтва верыла ў гэтую байку. Потым, як мы ўжо ўзгадвалі, з`явілася беларуская інтэрпрэтацыя вядомага выразу - цар добры, баяры дрэнныя. Спатрэбіўся пэўны час, каб людзі пераканаліся, што справа не ў гэтым.

*І ўсё ж, адносіны да Лукашэнкі два-тры гады таму шмат у каго былі іншыя, чым цяпер.*

Нават не два-тры гады. А два-тры месяцы таму. Адбылося тое, што ў рэшце рэшт павінна было адбыцца. Цярпенне людзей скончылася. Ды і ці можа быць інакш, калі цэны ўвесь час растуць? Вы ж паглядзіце - яны павялічваюцца кожны дзень. Як зараз, скажам, жыць пернсіянеру, калі яго пенсіі ў лепшым выпадку хапае на палову месяца?

Я не перастаю здзіўляцца - ну як можна давесці працавітую Беларусь да таго стану, што ў маі ў крамах прадаецца аднапрацэнтнае малако?! Людзі ж не дурні, І ў рэшце рэшт, нават тыя, хто верыў Лукашэнку, зразумелі, што іх падманваюць.

*І яны пра гэта, дарэчы, пачалі казаць адкрыта.*

Так, калі я сустракаюся з людзьмі, дык яны гавораць толькі пра тое, што нельга ўсю краіну трымаць у дурнях і спадзявацца, што людское цярпенне будзе бясконцым. І калі раней многія яшчэ не вызначаліся, ісці ім на выбары альбо не, дык у апошні час яны шукаюць скрынку, куды можна апусціць свой бюлетэнь. Ніхто іх не прымушае гэтага рабіць, ніхто не возіць цэлымі вёскамі на выбарчыя ўчасткі, як гэта было падчас так званага лістападаўскага рэферэндуму 1996 года, ніхто не вабіць сырам альбо яйкамі, як гэта было на выбарах у мясцовыя Саветы, а вынікі ёсць.

*Цікава, як будуць адчуваць сябе пасля 16 мая тыя, хто неаднаразова сцвярджаў, што з гэтых выбараў нічога не атрымаецца, што ў кандыдатаў у прэзідэнты няма падтрымкі ў народзе?*

Што ж, ім не прывыкаць хлусіць. Я хачу ўзгадаць толькі аднаго такога - спікера Расейскай Дзярдумы Генадзя Селязнёва. Ён казаў, што апазіцыю на Беларусі падтрымлівае ў лепшым выпадку 12 тысяч чалавек. Выбарчая кампанія сведчыць, што гэтая лічба заніжаная ім у сотні разоў. Навошта ён так рабіў? Думаю, што такім чынам ён засведчыў, хто ў яго ў Беларусі сябра.

*Сямён Георгіевіч, што будзе рабіць Вярхоўны Савет пасля 16 мая?*

Тое ж самае, што легітымны Вярхоўны Савет рабіў і раней - прынцыпова прытрымлівацца Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года.

*Гутарку вёў Уладзімір Глод.*

***(“Народная воля”, 13 мая 1999 года)***

## ЛІСТ У ТУРМУ

**24 мая 1999 года**

Паважаны Міхаіл Мікалаевіч!

Звяртаючыся да Вас у дзень Вашага нараджэння, хачу павіншаваць Вас з гэтым знамянальным днём у Вашым жыцці і пажадаць Вам, дарагі Міхаіл Мікалаевіч, моцнага здароўя і вытрымкі.

На жаль, дзень свайго нараджэння ў гэтым годзе Вы сустракаеце ў турме. Але ведайце, што сцены яе не могуць разлучыць Вас як з Вашымі роднымі і блізкімі сябрамі, так і з Вашымі, і гэта сёння ўжо можна сказаць без перабольшвання, многімі сотнямі тысяч прыхільнікаў, якіх Вы набылі сваёй чалавечнасцю і мужнасцю.

Ваша самаахвярнасць у імя свабоды і незалежнасці Радзімы паставіла Вашае імя ў адзін шэраг з імёнамі выбітных сыноў беларускага народа.

Усе мы, Вашы паплечнікі і аднадумцы, верым, што прыйдзе час і Ваш пастулак, як і намаганне другіх змагароў за выратаванне Беларусі ад ненавіснай дыктатуры, дадуць свой плён. Наша родная Беларусь вернецца на цывілізаваны шлях свайго развіцця, над ёю зноў засвеціць сонца свабоды і дэмакратыі, такое ж яркае і ласкавае, якім яно бывае толькі ў канцы траўня- месяца, калі і адназначаецца Ваш дзень нараджэння.

Моцна-моцна абдымаю.

***(“Народная воля”, 25 мая 1999 года)***

# ДЫК ХТО Ж АКАЗАЎСЯ ПРАВЫМ?

**На інтэрв`ю для "Народнай волі" Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Сямён Шарэцкі прыехаў адразу пасля сустрэчы з прадстаўнікамі міністэрства замежных спраў Галандыі. І адразу падзяліўся першымі ўражаннямі - маўляў, галандцы выказалі прапанову, што з дапамогай перамоў можна было выйсці з таго тупіка, у якім апынулася Беларусь.**

*І што ж Вы ім адказалі?*

Распавядаў пра жыццё. Атрымаў на днях пенсію. Назваў ім суму. Ад чытачоў таксама няма сакрэтаў - пенсія Старшыні Вярхоўнага Савета за апошні месяц склала 3192 тыс. рублёў. Нават мая мама, якой цяпер амаль ужо 90 гадоў і якая, зразумела, ніколі не займала высокіх пасадаў, атрымала 4 мільёны. Справа ў тым, што прэзідэнт Лукашэнка сваім асабістым распараджэннем забараніў індэксаваць мне пенсію. Як яна была 3 мільёны, так і застаецца па сённяшні дзень. І не ў мяне аднаго. Гэткая ж гісторыя адбываецца і з экс-спікерам Шушкевічам. Цяпер у мяне разбалелася рука, урачы прыпісалі націранне. Маёй пенсіі хапае на мазь, якая расходуецца за два тыдні. А трэба ж за нешта жыць, плаціць за кватэру... І я, не адзін гэткі. Вельмі многія жыхары Беларусі цяпер знаходзяцца ў вельмі цяжкім фінансавым становішчы.

Або другі прыклад. Мой бацька загінуў на фронце, змагаючыся з фашыстамі. А прэзідэнт Лукашэнка, памятаеце, усхваляў Гітлера.

Я прывёў сваім субяседнікам і прыклад, звязаны непасрэдна з галандыяй. Калісьці мы супернічалі з гэтай краінай па вытворчасці сельгаспрадуктаў. Цяпер жа ў разгар пашавага сезону п`ём галоўным чынам аднапрацэнтнае малако. Хто давёў краіну да такога жыцця? І з гэтым чалавекам прапануюць садзіцца за стол перамоў?!

*Сямён Георгіевіч, а гэткі вопыт ужо быў. У1997 годзе пад эгідай еўрапейскіх структар праходзілі перамовы прадстаўнікоў Вярхоўнага Савета з прадстаўнікамі Адміністрацыі прэзідэнта.*

Так, такая спроба прадпрымалася. Тады нашу дэлегацыю ўзначальваў цяпер пакойны Генадзь Карпенка, з боку прэзідэнта нібыта старшынстваваў колішні міністр замежных спраў Іван Антановіч. Ну і што? Нічога з гэтых перамоў не выйшла. Прычым міжнародныя эксперты аданазначна вызначылі вінаватых у зрыве гэтага "круглага стала" - прэзідэнцкі бок. Дарэчы, калі памятаеце, пасля Лукашэнка казаў, што Антановіч навогул не валодаў ніякімі паўнамоцтвамі. Дык што, нам цяпер зноў паўтараць гісторыю двухгадовай даўнасці?

*Выходзіць, апазіцыя не пойдзе на перамовы?*

Не, чаму ж? Мы згодны сесці за "круглы стол", але пры адной папярэдняй

умове: прэзідэнт павінен выпусціць з турмаў палітычных зняволеных, даць магчымасць апазіцыі карыстацца дзяржаўнымі СМІ, прыпыніць парушаць правы чалавека. Калі Лукашэнка гэта зробіць, дык ён пакажа сваю гатоўнасць да дыялогу. Калі з яго боку падобных крокаў не будзе, дык няма чаго і плот гарадзіць. Скажам, старшыня Кансультатыўна-Наглядальнай Групы АБСЕ ў Менску спадар Вік таксама прапанаваў нам сесці за стол перамоваў, а гэтага самога спадара Віка, вядомага міжнароднага дыпламата, рэжым не пускае для размовы з Міхаілам Чыгіром. Дык якія ж могуць быць пермовы?!

*А ўрок перамоваў з кіраўнікамі Расеі ў лістападзе 96-га?*

Ужо тады мы ў душы здагадваліся, з кім маем справу. Але і я, і яшчэ тры дэпутаты, прымаўшыя ўдзел у перамовах з Чарнамырдзіным, Строевым і Селязнёвым, меркавалі, што любы мір лепш, чым вайна. На жаль, тая злапамятная ноч паказала ўсю крывадушнасць Лукашэнкі. Ён ашукаў і нас, і прадстаўнікоў Расеі. Дзіўна, але, падобна, што той урок стаў бескарысным для масквічоў. Яны яго (Лукашэнку) не толькі падтрымалі ў час дзяржаўнага перавароту 1996 года, але і цяпер, відавочна, ускладвалі нейкія надзеі, у тым ліку і пры вырашэнні крызісу на Балканах. З іх згоды Лукашэнка падключыўся да перамоў па Югаславіі. І што ў выніку? Ён не прынёс карысці ні Маскве, ні Бялграду, ды і асабіста Мілошавічу.

*Сямён Георгіевіч, а як вы расцэньваеце апошнія заявы Лукашэнкі аб тым, што патрэбна выпраўляць дапушчаны раней “дзікі крэн на Усход” і паварочвацца тварам да Захаду?*

Гэтай заявай Аляксандр Лукашэнка поўнасцю стаў на бок апазіцыі. Гэта ж мы гаварылі аб тым, што арыентырам для развіцця Беларусі павінна быць цывілізаваная Еўропа. Прычым, і гэта мы ўвесь час падкрэслівалі, не на шкоду нашым добрым адносінам з Расеяй. Хачу ўзгадаць, што я ў свой час падпісаў дакументы аб стварэнні супольнасці з Расеяй. І ў гэтым не раскайваюся па сённяшні дзень, бо ў тых дакументах было дакладна абазначана - развіццё эканамічнай інтэграцыі. І ў той жа час было дакладна запісана - пры захаванні незалежнасці абедзвюх дзяржаў. Дарэчы тады Лукашэнка абвінавачваў апазіцыю і казаў, што яна выступае супраць Расеі, што ёй чужое ўсё рускае. Тады, як і заўсёды, ён проста ілгаў. Цяпер Лукашэнка гаворыць, што ён ужо пойдзе на Захад, але ж ён зноў усё падае ў пачварным выглядзе - супрацьпастаўляе Расею і Захад. Апазіцыя ж заўсёды гаварыла, што мы павінны развіваць сяброўскія адносіны з блізкімі і далёкімі суседзямі. Мы хочам жыць у сяброўстве з Расеяй, але разам з тым быць у гэткім жа сяброўстве і з літоўцамі, і з украінцамі, і з палякамі, і з многімі іншымі краінамі.

*Сямён Георгіевіч, усіх хвалюе, што будзе пасля 20 ліпеня, калі скончыцца пяцігадовы тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта Лукашэнкі?*

Мы таксама турбуемся аб гэтым, як можа паступіць гэты непрадказальны чалавек. Таму на апошнім паседжанні Прэзідыума Вярхоўнага Савета мы

прызначылі на 21 ліпеня паседжанне Вярхоўнага Савета Рэспублііеі Беларусь 13-га склікання. Адкрыта кажучы, хочацца спадзявацца, што Лукашэнка зменіць сваю пазіцыю, як ён гэта рабіў у адносінах да міжнароднай палітыкі, і сам 21 ліпеня аб`явіць аб адмове ад паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы. Менавіта да такога кроку мы і заклікалі яго ў звароце Вярхоўнага Савета. Можа, Лукашэнка ў рэшце рэшт зразумее, што ўтрымліваць уладу сілай немагчыма.

Сесію мы прызначылі на 21 ліпеня яшчэ па адной прычыне. Нам патрэбна ўзяць тое, што належыць па праву і закону (Канстытуцыі) - уладу ў краіне.

*Але Лукашэнка ўсё спасылаецца на вынікі так званага лістападаўскага, 1996 года, рэферэндума, па якому яго паўнамоцтвы нібыта працягнуты да 2001 года.*

Аб якім рэферэндуме вы кажаце? Яго ж не было. Пад выглядам рэферэндума адбыўся, па сутнасці, дзяржаўны пераварот. З дапамогай стаячых на плошчах бронетранспарцёраў, узброеных аўтаматчыкаў, якія блакавалі будынак, дзе знаходзілася Цэнтральная выбарчая камісія, і масы іншых непрыглядных сродкаў былі створаны ўсе ўмовы для фальсіфікацыі вынікаў рэферэндума. Усё гэта ўступала ў супярэчнасць з канстытуцыйнымі і заканадаўчымі нарматывамі. Больш таго, хтосьці з лукашэнкаўцаў сцвярджае, што Вярхоўны Савет нібыта самараспусціўся. Усё гэта грубая хлусня. Дастаткова сказаць, што на тым паседжанні прысутнічала ўсяго 103 дэпутаты, а правам самароспуску параламенту валодалі як мінімум 133 дэпутаты. Вёў тое паседжанне Юрый Малумаў, які не меў на тое паўнамоцтваў і наогул у той дзень знаходзіўся дома, бо хварэў. Парушэнняў тады была маса, таму міжнародныя арганізацыі і многія краіны, за выключэннем Расеі, некалькі разоў заявілі аб нелегітымнасці таго рэферэндуму.

*Сямён Георгіевіч, як вы мяркуеце, што цяпер рабіць тым людзям, якія актыўна падтрымлівалі Лукашэнку ў яго “дзікім крэне на Усход”?*

Я таксама хацеў бы запытаць у былых кіраўнікоў Беларусі Малафеева, Кебіча, Камая і іншых: у якім жа становішчы вы цяпер апынуліся? Вы ўвесь час агітавалі і падтрымлівалі Лукашэнку ў яго імкненні аб`ядняцца з Расеяй. А цяпер выходзіць, што гэта была неправільная арыентацыя. Ці вы паступалі ў адносінах да Лукашэнкі таксама, як паступалі ў адносінах да ўбогага Чарненкі, да разбуральніка СССР Гарбачова? Усхвалялі і ішлі туды, куды вялі названыя “правадыры”? Праўда, пасля вы ад гэтых “правадыроў” дружна адмовіліся. Калі ж вы пачняце адмаўляцца ад Лукашэнкі?

*Сямён Георгіевіч, усе бачаць, што Лукашэнка вельмі спяшаецца з інтэграцыяй. Чаму гэта?*

За гэты час Лукашэнка сапраўды набыў вялікі вопыт палітычнай дзейнасці. Ён добра разумее, што 20 ліпеня яго легітымнаць заканчваецца. І праз саюз з Расеяй ён проста хоча працягнуць свае паўнамоцтвы. А некаторыя расейскія палітыкі клюнулі на гэтую вудачку. І хацелі тым жа крокам прадоўжыць прэзідэнцтва Ельцына.

*А як Вам рэакцыя Ельцына?*

Нармальная. Я мяркую, што Лукашэнка, шантажуючы Крэмль, чакаў нейкіх рэзкіх выказванняў з боку прэзідэнта Расеі. Аднак той заняў вельмі спакойную і ўзважаную пазіцыю - патрэбна развіваць эканамічныя сувязі. Ну хто ж супраць гэтага? Спадабалася мне і рэакцыя прэм`ера Сцяпашына, які толькі выказаўся за паляпшэнне адносін Беларусі з Захадам. Так яно і павінна быць: Беларусь і Расея сустрэнуцца ў агульным еўрапейскім доме, застаючыся суверэннымі дзяржавамі.

Я мяркую, што расіяне, безумоўна, не спяшаюцца з падпісаннем прапануемых Лукашэнкам дакументаў па сваіх тактычных меркаваннях. Пачынаючы з 21 ліпеня, умовы інтэграцыі двух дзяржаў будзе дыктаваць толькі адзін бок - расейскі. Калі ж Лукашэнка будзе зноў кіпяціцца, паспрабуе працягнуць свае фармулёўкі, дык з Крамля ў любы момант могуць запытаць: а хто такі гэты Лукашэнка? Былы прэзідэнт Беларусі. Мы з ім ніякіх спраў весці не хочам. І гэта было б правільна. Бо пасля заканчэння тэрміну прэзідэнцтва Лукашэнкі яго подпіс на актах дзяржаўнай важнасці будзе несапраўдным. І я не здзіўлюся, калі хутка лозунг інтэграцыі можа быць, напрыклад, гэткім: “За інтэграцыі Беларусі і Расеі, але без Лукашэнкі”. Такім чынам, Масква, вытрымліваючы паўзу, звязала Лукашэнку па руках і нагах. Адгэтуль і яго нястрыманасць і хістанне, і іншыя нелагічныя пастукі.

*А можа, Лукашэнка ідзе на Захад для таго, каб там атрымаць грошы?*

Тады я хачу папярэдзіць, што відавочна гэта марныя спробы. Узгадаю, што ён пастаянна гаворыць: “Апазіцыя ў Беларусі фінансуецца Захадам. Дарэчы, узгадаю, што ў свой час мне таксама прыпісвалі 32 мільёны долараў, якія нібыта прапанавалі кіраўніку Вярхоўнага Савета ў Амерыцы. У мяне да гэтага часу захоўваецца экспертнае заключэнне КДБ Беларусі. У ім гаворыцца, што падкінуты ліст быў спачатку напісаны на рускай мове, а пасля перакладаўся на ангельскую і ў гэткім выглядзе быў пасланы на мой адрас нібыта з ЗША. Без рэформ ніякіх грошай з Захаду Лукашэнка не атрымае. Як не атрымае іх і апазіцыя.

*Такім чынам, як бы Вы сфармулявалі вынік нашай размовы?*

Давайце паспрабуем уклясціся ў адзін сказ. Калісьці Іван Сусанін з Кастрамы завёў у балота ворагаў, а наш шклоўскі “Лжэдзмітрый” завёў у тупік і пакрыў ганьбай тых, хто яго натхняў і акружаў. З кожным днём усё больш відавочна, што гісторыя паўтараецца, але на новым вітку і з другім “лжэправадыром”.

*Гутарыў Уладзімір Глод.*
***(“Народная воля”, 9 ліпеня 1999 года)***

# ВЕРУ, ШТО БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ СВАБОДНАЙ

**Баючыся за сваю бяспеку, Беларусь пакінуў і прыехаў у Літву адзін з лідэраў беларускай апазіцыі, старшыня гвалтоўна разагнанана тры гады назад Вярхоўнага Савета Беларусі Сямён Шарэцкі.**

**Гэтая вестка літоўскіх палітыкаў застала ўрасплох - прадстаўнікі інстытутаў, фармуючых курс знешняй палітыкі, у нядзелю скептычна ацэньвалі такі зварот і ўсумніліся, ці сапраўды С. Шарэцкі знаходзіцца ў Літве. У нядзелю “Рэспубліцы” ўдалося сустрэцца з лідэрам беларускай апазіцыі і атрымаць эксклюзіўнае інтэрв`ю.**

*Паўнамоцтвы А. Лукашэнкі скончыліся 20 ліпеня. Ці намераны Вы як кіраўнік парламента прыняць уладу ў Беларусі?*

Паседжанне ВС Беларусі адбылося 21 ліпеня менавіта таму, што ў прэзідэнта ўладу павінен прыняць я, паколькі з`яўляюся Старшынёю Вярхоўнага Савета.

Такім чынам, сабраўшыся, Вярхоўны Савет зафіксаваў заканчэнне тэрміну паўнамоцтваў А. Лукашэнкі і аб`явіў перапынак у паседжанні. Паколькі ўзнікла пагроза майго арышту, я быў вымушаны выехаць за межы краіны. Я працягваю працаваць як Старшыня Вярхоўнага Савета.

За Лукашэнку народ галасаваў, выбраўшы яго на пяць гадоў, і ніякія рэферэндумы, тым больш незаконныя, не могуць замяніць прамых, тайных выбараў. Рэферэндум 1996 года, на які ён спасылаецца, быў суцэльным парушэннем Канстытуцыі і законаў. Народ не змог свабодна выразіць думку, калі на вуліцах стаялі браневікі, аўтаматчыкі акружылі будынак Цэнтральнай выбарчай камісіі.

*Як вы расцэньваеце заяву ЗША і Еўрапейскага Саюза, якія тычацца заканчэнне тэрміну паўнамоцтваў А. Лукашэнкі?*

Пазітыўна. Безумоўна, кожны ацэньвае па-свойму з улікам абставін. Тое, што тэрмін прабывання А. Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта скончыўся, не азначае, што ўсе дзяржавы павінны парваць сувязі з Беларуссю. Усё ж А. Лукашэнка і дзяржава - гэта не адно і тое ж. Правільна паступілі ЗША - зафіксавалі факт заканчэння прэзідэнцкага тэрміну і падкрэслілі, што пасля 20 ліпеня ён ужо не можа называцца дэмакратычна абраным прэзідэнтам.

*Ці можа здарыцца, што ў Літве Вы, як часовы прэзідэнт, прыступіце да фармавання ўрада Беларусі ў эміграцыі?*

Я не ведаю, што можа здарыцца. Пакуль мы абвясцілі толькі зварот да свайго народа і грамадзяніна А, Лукашэнкі. Мы гаворым: “Давайце пазбегнем канфрантацыі. Будзем дзейнічаць па Канстытуцыі, пачнем перамовы і ацэнім склаўшаеся становішча”.

А. Лукашэнку мы гаворым: “Хочаце быць прэзідэнтам, удзельнічайце ў новых выбарах, якія як Старшыня ВС павінен буду аб`явіць”. Аднак ён баіцца, што народ яго не падтрымае, інакш ён бы ўчыніў выбары. Размовы аб тым, што А. Лукашэнку падтрымлівае большасць насельніцтва рэспублікі - балбатня. Калі б гэта было так, ён пайшоў бы на выбары і, як ён любіць гаварыць, “даў бы ў морду апазіцыі”. Але рукі кароткія - народ не падтрымлівае.

*Тады чаму ў Беларусі не ўчыняюцца масавыя мітынгі супраць А. Лукашэнкі, як у Югаславіі супраць С. Мілошавіча?*

А вы не думаеце аб тым, што ў часы фашызму ў Германіі не было буйных мітынгаў супраць А. Гітлера? У саракавых гадах не было мітынгаў у Літве супраць дыктатуры Сталіна.

Уся бяда ў тым, што дыктатары бяруць пад кантроль уласнасць і пазбаўляюць людзей, не падтрымліваючых дыктатуру, сродкаў існавання. Тое самае і ў Беларусі. Чаму А. Лукашэнка вярнуўся да казарменнага сацыялізму? Для таго, каб усё кантраляваць. Усім, у каго ёсць свае аўтазаправачныя станцыі ці кавярні, ён сказаў, што можа адбраць гэтую ўласнасць. Здзяйсняецца абсалютнае свавольства ў эканоміцы, таму ўсіх палітычна незгодных можна хутка пакінуць без сродкаў існавання.

Акрамя таго, указам прэзідэнта ў Беларусі створана спецыяльнае падраздзяленне, якое можа ўварвацца ў любое памяшканне, кватэру, арыштаваць любога чалавека, пасадзіць яго ў турму і толькі пасля шукаць доказаў.

Людзі, безумоўна, хвалююцца, выказваюць незадавальненне, але на адкрыты пратэст рашаюцца не ўсе. Мяркую, што гэта толькі пытанне часу.

*Якім чынам Вас пераследавалі беларускія ўлады?*

Патэлефанавалі з дастаткова інфармаваных структур і паведамілі, што аддадзены загад аб маім арышце.

Цяпер я з`уляюся чалавекам, які па Канстытуцыі займае прэзідэнцкую пасаду, і калі недзе дзець мяне, не будзе канкурэнта.

*Ці прыходзілася Вам хавацца, жывучы ў Беларусі?*

Не магу сказаць, што я неяк асабліва хаваўся. Аднак А. Лукашэнка не мог нічога крымінаваць мне ў віну і арыштаваць. Не было нават прыдумана прычын, што нібыта ўдзельнічаў хоць у нейкай камерцыйнай дзейнасці. Ніколі гэтым не займаўся. Акрамя таго, у Беларусі ёсць Група АБСЕ, сваю думку выказваюць міжнародныя арганізацыі, іншыя дзяржавы, у тым ліку і Літва. Гэта было маім шчытом.

*Ці могуць у Літву пераехаць і іншыя дзеячы беларускай апазіцыі?*

Паглядзім, як складзецца становішча ў Беларусі. У нас ёсць усяго адзін план - адхіліць ад улады дыктатуру і вярнуць дэмакратыю. Мы, як і Літва, з`ўляемся

еўрапейскай дзяржавай і таксама хочам заняць сваю кватэру ў агульнаеўрапейскім доме. Не хочам ісці ні ў якую Расею. Калі гэтага хоча А. Лукашэнка, дык няхай збірае манаткі і адпраўляецца.

*Ці былі ў Вас цяжкасці з ад`ездам з Беларусі або прыездам у Літву?*

Я вольны чалавек і свабодна пакінуў Беларусь.

*Чаму Вы выбралі Літву?*

Літва блізка. Акрамя таго, тут ёсць беларускае апірышча.

*Ці будзеце вы прасіць палітычнага прытулку?*

Няўжо тое, аб чым я паведаміў, наводзіць на думку, што я маю намер прасіць палітычнага прытулку? Гэта правакацыя, прыдуманая ў апартаментах А. Лукашэнкі. Навошта думаць, што становішча ў Беларусі стане яшчэ горшым? Мы будзем імкнуцца, каб яно паляпшалася. Калі, не дай Бог, там становішча пагоршыцца, тады і гэтае пытанне будзем абмяркоўваць.

*З кім з кіраўнікоў Літвы Вы маеце намер сустрэцца? Магчыма, ужо спаткаліся?*

Пакуль ні з кім. Не ведаю, з кім сустрэнуся заўтра ці паслязаўтра. Я не з`яўляюся ні бежанцам, ні праследуемым за нейкую камерцыйную ці іншую дзейнасць. Я выехаў як Старшыня ВС Беларусі. Наш ВС мае сувязі з Сеймам Літвы, мы прыязджалі з афіцыйным візітам, я раней сутракаўся са Старшынёй Парламента В. Ландзбергісам.

*Які настрой у людзей у Беларусі?*

Людзі рашуча настроены пазбавіцца ад рэжыму. Думаць аб гэтым народ прымушае эканамічнае і палітычнае становішча. У краіне няма свабоды слова, парушаюцца правы чалавека, могуць пабіць дубінкамі толькі за тое, што ты размаўляеш па-беларуску. Калі атрымліваеш такую пенсію ці заробак, на якую немагчыма пражыць, трэба ж штосьці рабіць.

*А. Лукашэнка заяўляў, што ён гатовы пачаць перамовы з канструктыўнай беларускай апазіцыяй.*

Цікава, якую апазіцыю ён лічыць канструктыўнай? Ён калісьці гаварыў аб нас, што яму лепшай апазіцыі і не патрэбна, што ён гатовы нават плаціць нам. годзе. Пасля А, Лукашэнка заявіў, што не ўпаўнаважваў сваю дэлегацыю на перамовы. Ён ужо ў першы год свайго праўлення ў якасці ўзорнай дзяржавы назваў гітлераўскую Германію.

*Як Вы прагназуеце становішча ў Беларусі?*

Веру, што гісторыя развіваецца разумна, што Беларусь будзе свабоднай, дэмакратычнай. Вернецца ў Еўропу як яе дастойны член. Нам патрэбна ўвесь час глядзець на Захад, а не на Усход.

*Ці верыце Вы ў заяву А. Лукашэнкі, што ён павернецца на Захад і будзе паляпшаць адносіны з ім?*

Ён заяўляў аб гэтым не для таго, каб павярнуцца на Захад, а каб шантажаваць расейскіх палітыкаў і дамагчыся хутчэйшага аб`днання Расеі І Беларусі ўадну дзяржаву. Гэта самы натуральны шантаж.
Ямуна Захадзе няма чаго рабіць, там няма Гітлера.

*Ці можа Ваш прыезд у Літву пашкодзіць адносінам паміж Літвою і Беларуссю?*

Мне б не хацелася, каб такое адбылося. Я прыехаў без якой бы то ні было дамовы, не прашу аб якойсьці асаблівай падтрымцы і не маю намеру прадпрымаць нечага гэткага, што магло б пагоршыць адносіны паміж нашымі краінамі.

Я ўдзячны кіраўнікам Літвы за тое, што гэта дэмакратычная краіна і сюды можа прыехаць любы свабодны чалавек. Удзячны за тое, што Літва заўжды падтрымлівае дэпутатаў ВС на міжнародных форумах як адзіных законных прадстаўнікоў заканадаўчай улады Беларусі.

*Гутарыў Раландас Агінтас.*

***(“Республика”, 27 ліпеня 1999 года)***

KAMUNIKAT.org

# Я ЦЭЛЫ МЕСЯЦ МАЎЧУ

*Сёння шмат кажуць пра тое, што 21 жніўня вы падпішаце указ аб перайманні паўнамоцтваў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь...*

Справа не ў 21-м жніўня. Справа не ў тым, гатовы я ці не гатовы. Мяне да гэтага абавязковае Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. І я проста мушу зрабіць гэта. Будзе гэта 21-га ці 17-га ці 15-га... Справа не ў гэтым. Справа ў тым, што міжнародныя арганізацыі, у першую чаргу АБСЕ, спрабуюць дапамагчы нам і быламу прэзідэнту вырашыць усе гэтыя пытанні мірным канстытуцыйным шляхам. Самая галоўная праблема сёння - у неканстытуцыйнасці ўсёй цяперашняй улады. Застаўся толькі Вярхоўны Савет, абраны народам, адзіны канстытуцыйны і заканадаўчы орган. І паколькі яны (АБСЕ) спрабуюць наладзіць перамоўны працэс (я не ведаю, наколькі гэта плённа і наколькі яны самі ў гэта вераць), дык мы ім пакуль верым. І нам было б няслушна заяўляць адразу 21 ліпеня, калі скончыліся законныя паўнамоцтвы Лукашэнкі, што я ўжо ўсё, замяшчаю прэзідэнта. Гэта было б нетактычна і няправільна. Любы мір лепш за вайну. Трэба неяк паспрабаваць адхіліць Лукашэнку мірна. Можа, як гаворыцца, у чалавека знойдзецца розум... І ягонае атачэнне гэта разумее. Зразумелі ж яны, што нельга гэтак гнаць, як яны гналі ў Расею. Гэта ім дапамог зразумець і Ельцын, пакуль Лукашэнка ўсё марыў (а мабыць і цяпер яшчэ марыць), што ён будзе ў Крамлі, Ельцын сказаў, што ў Крамлі павінен быць Пуцін. Дарэчы, быў жа Рас-пуцін, а гэты выходзіць Два-Пуцін... Гэта ж манархічны падыход да вырашэння спраў... Лукашэнка кажа, у сваю чаргу, - буду два гады, а то і сем гадоў. Усё спасылаецца на той рэферэндум. Я думаю, што здаровы чалавек на гэта спасылацца не павінен. Той рэферэндум праводзіўся з дапамогаю бронетранспарцёраў, АМОНу. Бюлетэні можна было браць кучамі, яны не ўлічваліся, таму і прайграць гэткі “рэферэндум” было б немагчыма.

*Выходзіць, дата, да якой “прывязваліся” журналісты - няпэўная...*

Я не хачу казаць, пэўная ці няпэўная. У палітыцы гэтак не робяць. Вядома, часам трэба і спяшацца. Але тут трэба ўзгадняць. Мы тут толькі што размаўлялі і са спадаром Шушкевічам, і са спадаром Цярэнем, намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета. Прыязджаў Вік, старшыня Кансультатыўнай Групы АБСЕ. І праз колькі дзён, 21 жніўня, мы зноў будзем збірацца разам з ім для ўзгадненняў. Мабыць, менавіта гэта і дало падставу журналістам гаварыць пра гэтую дату...

*Але калі Вы ўсё ж прымеце на сябе абавязкі прэзідэнта, Ваш статус адпаведна зменіцца. Як гэта паўплывае на перамоўны працэс?*

Так, але нельга ж, скажам, пяць гадоў чакаць! Партыі дэлегавалі свае правы Вярхоўнаму Савету. Партыі гатовыя, Вярхоўны Савет гатовы... Дык і Лукашэнка павінен быць гатовы. Так? А з Лукашэнкам ніяк не можа ісці гаворкі як з законным прэзідэнтам. Мы яго заклікалі да перамоваў, калі ён быў законным прэзідэнтам, але... Мы заклікалі, заклікалі... Ну, а сёння тэрмін ягоны скончыўся. Кім бы ён сябе

не лічыў, ад гэтага ён не будзе законным. Праўда, цяпер бачыў, расейскае тэлебачанне зноў пачало яго называць: “Прэзідэнт Беларусі”. Ну дык за грошы чаго толькі не зробіш…

*У выпадку, калі Вы будзеце выконваць абавязкі прэзідэнта, перад Вамі паўстане задача сфармаваць уладныя структуры. Хто іх будзе ўзначальваць? Найперш, натуральна, гаворка пра прэм`ер-міністра.*

Я не хацеў бы варажыць на кававай гушчы. Гэта мая прэрэгатыва. Я па-просту назаву чалавека і ўсё! Калі прыйдзе той час. Ну, а журналісты маюць права прагназаваць. Хай сабе падумаюць. Можа і мне дапамогуць асобаў назваць. А таму, па-першае: я пакуль нікога не называў. Усіх, з кім я сустракаўся, журналісты ўжо прызначаюць на розныя пасады… Гэта няпраўда. Палітыкі маглі б таксама ўстрымацца, бо гэта некарэктна. Называлі і Лашкевіча, і Домаша, і Шлындзікава, і яшчэ каго. Гэта пакуль домыслы.

*Ці прывёз спадар Вік Вам свежыя ідэі, новыя перамовы?*

Я спадару Віку казаў - глядзіце, ідзе час, і мы чакаем ад Лукашэнкі нейкіх крокаў насустрач. І вось ягоныя крокі: Чыгіру працягнулі тэрмін зняволення без суду, над Клімавым пачалося бессаромнае, ганебнае судзілішча, Шчукіна пасадзілі ў турму, дзеля пошуку Захаранкі ніхто нават мезенцам не паварушыў… Сродкі масавай інфармацыі як былі манапалізаваныя, так і засталіся, як выкарыстоўваліся для хлусні і брутальнай прапаганды, гэтак і выкарыстоўваюцца… Ну чаго яшчэ? Якія крокі далей? Дзе добрая воля? Апазіцыя пайшла насустрач. Партыі, Вярхоўны Савет падпісалі пагадненне. Вы бачыце? Я маўчу. Цэлы месяц маўчу! Дзеля таго, каб не перашкаджаць нашаму перагаворнаму працэсу. Я ж толькі сёння Вам кажу супраць Лукашэнкі, аб ягоных кроках…

*Але ж ён прызначыў “групу для перамоваў з грамадскасцю”.*

Ну дык вось хай і перамаўляюцца з грамадскасцю. Ён жа і так кожны дзень прамаўляе да грамадскасці па тэлебачанню. І гаворыць ужо ўсё, што ён хоча. Як кажуць, што сліна нясе ды язык верне. Я не тое, што ”не паважаю” гэтую “групу”. Але ж ёсць Вярхоўны Савет, якому ўсе партыі даручылі прадстаўніцтва ад апазіцыі. А ён з кім будзе гаварыць? Калі ён нам Сазонава, ну дык і мы такога прызначым. І што? Не магу ж я ці, скажам, Ганчар, гаварыць на гэткім узроўні. Заўтра Лукашэнка скажа, што ён таго Сазонава не ўпаўнаважваў, як у свой час сказаў пра Антановіча. Ну дык Антановіч быў міністрам замежных спраў! А гэты хто?

*Мы паведамлялі сваім чытачам пра Вашыя сустрэчы з рознымі кіраўнікамі ў Літве…*

Усе ўсё ведаюць!… Я нідзе, напрыклад, не казаў пра сваю сустрэчу з Адамкусам. З маіх вуснаў такога не выходзіла… Я называў публічна толькі

спадара Ландзбергіса. Астатняе - гэта мае справы. Я шмат у Вільні з кім сустракаюся, з дыпламатамі, дэпутатамі Сейма і гэтак далей. Але я пра гэта нікому не кажу. Гэта пакуль нетактычна. Недыпламатычна... У мяне неўзабаве будуць афіцыйныя сустрэчы з урадоўцамі Польшчы і Латвіі. Але ж я не магу ўсё расказваць. Я сустракаюся з усімі, каго тычыцца справа Беларусі. Найперш я сустракаюся з дыпламатамі ЗША і Брытаніі, каб нагадаць, што ў свой час прэзідэнт ЗША і прэм`ер Брытаніі падпісалі дамову аб тым, што пасля вывадуядзернай зброі з Беларусі нам будзе гарантаваная незалежнасць. І Расея гэтую дамову падпісала! Вось я і сустрэўся з дыпламатамі гэтых краінаў упершую чаргу і спытаў: “Як наконт тыхпадпісанняў і абавязацельстваў?”. А пра астатняе я не кажу.

*Ці маеце вы саюзнікаў у Расеі?*

Мы добра падтрымліваем сувязі з “Правым делом”, з якім у нас падпісаныя дамовы. Кантактуем з гэткімі палітыкамі як Чубайс, Гайдар, Нямцоў, Фёдараў, Козыраў, Хакамада...

*Як пройдзе гэты Ваш працоўны тыдзень?*

Буду далей займацца перамовамі. Я толькі што вярнуўся з Беластоку, з Польшчы, дзе вёў гутаркі ў рэдакцыі газэты “Ніва”. Вёў перамовы з кіраўніцтвам Беластоцкага ваяводства, бо зараз прынята рашэнне пра адкрыццё там беларускай радыёстанцыі. Трэба ва ўсім гэтым удзельнічаць актыўна. Рыхтуюся да наступных візітаў у Польшчу і Латвію. Буду весці перамовы і сутракацца з прадстаўнікамі ўсіх партыяў і з калегамі з Вярхоўнага Савету. Палітыка - нармальны працэс дзеля таго, каб астатнія людзі, якія ёю не займаюцца, маглі спакойна працаваць і зарабляць...Камусьці не падабаецца, скажам, Ганчар. Альбо, кажуць, трэба гаварыць з Вячоркам, а не з Пазьняком. Я кажу - трэба размаўляць і з Вячоркам і з Пазьняком. І са Статкевічам. У мяне абавязак гэткі. Што да непаразуменняў, сымпатыяў ці антыпатыяў, дык я вам скажу - у палітыцы гэта ж не ў сям`і ці ў сяброўстве. Не падабаецца чалавек - не пі з ім гарэлкі. Не падабаецца жанчына - не бяры ў жонкі ды не кладзіцеся з ёю спаць. А тут жа гэтага ўсяго не трэба. Тут трэба вырашаць пытанне. Першае: захаваць незалежнасць Беларусі як самастойнага суб`екта міжнароднага права. Другое: трэба вярнуць краіну на дэмакратычны шлях развіцця, а дзеля гэтага трэба адхіліць сённяшні незаконны рэжым ад улады.

*Гутарыў Сяргей Харэўскі*

***(“Наша ніва”, 16 жніўня 1999 года)***

# ЗВАРОТ

**да ўрада і грамадзян Рэспублікі Беларусь, міжнароднай супольнасці**

Паважаныя члены ўрада Рэспублікі Беларусь!

20 ліпеня 1999 года скончыўся тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. У сувязі гэтым Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, як таго і патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прызначыў у свой час чарговыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія адбыліся 16 мая 1999 года.

Аднак А. Лукашэнка не толькі не скарыстаўся магчымасцю, каб прыняць удзел у выбарах і пераабрацца на новы тэрмін прэзідэнцтва (калі б гэтага пажадалі выбаршчыкі), але фактычна заблакаваў правядзенне ўказаных выбараў і з дапамогай злачынных метадаў (перамяшчэнне ў турму і недазвол вяртання на радзіму) не даў магчымасці правесці перадвыбарчую кампанію іншым кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь (Міхаілу Мікалаевічу Чыгіру і Зянону Станіслававічу Пазьняку).

Час ішоў… 15 ліпеня 1999 года Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь звярнуўся да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі і выказаў неабходнасць і сваю гатоўнасць неадкладна пачаць перамовы паміж прэзідэнтам і Вярхоўным Саветам аб парадку пераадолення канстытуцыйнага крызісу. На жаль, адказу ад прэзідэнта не паступіла.

21 ліпеня 1999 года Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь зноў сабраўся на сваё паседжанне і прыняў Зварот да беларускага народа і міжнароднай супольнасці, у якім апроч іншых канкрэтных патрабаванняў выказаў свае станоўчыя адносіны да прапаноў і ініцыятыў цяпер ужо міжнародных арганізацый аб пачатку перамоўнага працэса ў Беларусі з мэтай правядзення свабодных, справядлівых прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і прынцыпамі.

З таго часу прайшло ўжо больш за месяц. Але і на гэты раз замест крокаў добрай волі, без чаго немагчымы канструктыўныя перамовы, з боку Лукашэнкі зроблены новыя злачынствы супраць прадстаўнікоў апазіцыі: яшчэ на два месяцы працягнуты тэрмін знаходжання ў турме Міхаіла Чыгіра, пачаўся бессаромны судовы працэс над дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Андрэем Клімавым, якога, дарэчы, арыштавалі з парушэннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь, быў пасаджаны за краты дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Валерый Шчукін, не прадпрымаецца ніякіх канкрэтных захадаў да пошуку зніклых пры невядомых абставінах былой старшыні Нацыянальнага банку Тамары Віннікавай і экс-міністра унутраных спраў Юрыя Захаранкі і гэтак далей. Захоўваецца манаполія прэзідэнцкіх структур на дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, якія выкарыстоўваюцца для хлусні і новых паклёпаў на лідэраў апазіцыі.

Усё гэта ставіць пад сумненне шчырасць намераў А. Лукашэнкі і створанага ім рэжыму сапраўды ісці на канструктыўныя перамовы з Вярхоўным Саветам і іншымі прадстаўнікамі апазіцыі гэтаму рэжыму. Лукашэнка і яго паплечнікі, хутчэй за ўсё, імкнуцца выкарыстаць перамовы толькі дзеля адной мэты - легітымізаваць дзяржаўны пераварот 1996 года і А. Лукашэнка працягвае свае намаганні па аб`яднанні Рэспублікі Беларусь і Расейскай Федэрацыі ў адну дзяржаву, прэзідэнтам якой ён усё яшчэ марыць стаць.

Усвядоміўшы гэта і сваю асабістую адказнасць за лёс Радзімы, я, як Старшыня

Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (а апошні застаўся цяпер адзіным у краіне законна абраным народам дзяржаўным органам, які адказвае за захаванне прынцыпаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), зрабіў заяву аб тым, што пасля 20 ліпеня 1999 года ўсе падпісаныя А. Лукашэнкам дзяржаўныя дзелавыя паперы не маюць сілы.

Адначасова хачу звярнуцца да ўсіх членаў урада Рэспублікі Беларусь і кожнага асабіста - адумайцеся, пакуль не позна! З 21 ліпеня 1999 года ўсе дзяржаўныя дзеячы, пачынаючы са старшыні Савета Міністраў, кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта і канчаючы больш нізкімі чыноўнікамі, сталі такімі ж нелегітымнымі, як і сам Лукашэнка як прэзідэнт, які прызначыў іх на пасады.

Разам з тым я звяртаюся асабіста да тых, хто зразумеў і адчуў усю адказнасць перад сваім народам і Радзімай, і хацеў бы ўдзельнічаць ва ўмацаванні незалежнай дэмакратычнай Беларусі, перабудове яе эканомікі і грамадскага жыцця на новы лад: калі ласка, і я, і кіраўніцтва Вярхоўнага Савета гатовы весці з вамі перамовы на гэты конт.

Я яшчэ раз заклікаю работнікаў пракуратуры, судоў, сілавых ведамстваў устрымацца ад выканання антыканстытуцыйных, злачынных загадаў цяпер ужо антызаконных выканаўчых уладаў, ад прымянення сілы да тых, хто ў адпаведнасці з законамі будзе ўстанаўліваць у краіне канстытуцыйны парадак і вяртаць яе на дэмакратычны шлях, па якім яна развівалася да дзяржаўнага перавароту, здзейсненага Лукашэнкам і яго паплечнікамі ў лістападзе 1996 года.

Я звяртаюся таксама да рабочых, сялян, інтэлігенцыі, усіх грамадзян Беларусі, прадстаўнікоў палітычных і грамадскіх арганізацый, рэлігійных канфесій з заклікам аб`яднаць свае намаганні і зрабіць усё дзеля таго, каб Рэспубліка Беларусь стала для ўсіх нас незалежным, родным і багатым домам і заняла ў еўрапейскай сям`і дзяржаў сваё пачэснае месца!

Кожны грамадзянін дзяржавы павінен мець права працаваць і зарабляць столькі, каб ён сам і яго сям`я маглі жыць у дастатку.

Кожны пенсіянер мае права на забяспечаную старасць.

Кожны малады чалавек павінен з дапамогай дзяржавы атрымаць абраную ім самім спецыяльнасць.

Кожная маладая сям`я павінна мець права атрымліваць ільготны крэдыт на пабудову жылля і набыццё маёмасці ў прыватную ўласнасць.

Дзяржава абавязана забяспечыць кожнаму грамадзяніну, незалежна ад яго нацыянальнасці і веравызнання, умовы для яго мірнай стваральнай працы, развіцця асобы, абарону яго правоў і свабод, а таксама яго ўласнасці.

Я звяртаюся і да кіраўнікоў міжнародных арганізацый, усіх дэмакратычных дзяржаў, іх парламентаў і урадаў з заклікам зрабіць усё ад іх залежнае, каб прыпыніць развіццё ў самым цэнтры Еўропы новага дыктатарскага рэжыму (лукашызму), які паставіў сваёй мэтай аднаўленне савецкай імперыі з яе парадкамі казарменнага сацыялізму.

Удзячны беларускі народ адкажа на гэта сваім актыўным удзелам у пабудове на дэмакратычных пачатках нашага агульнага еўрапейскага дому.

Няхай жыве Незалежная, Вольная, Дэмакратычныя Беларусь!

***(“Народная воля”, 25 жніўня 1999 года)***

# ЗАЯВА
# СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА
# РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

20 ліпеня 1999 года скончыўся тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. Аднак, працягваючы незаконна ўтрымліваць уладу, ён і далей прадпрымае свае намаганні на аб`яднанне Рэспублікі Беларусь з Расейскай Федэрацыяй у адну дзяржаву, прэзідэнтам якой ён усё яшчэ марыць стаць. З другога боку, і некаторыя расейскія палітыкі пачалі заяўляць аб тым, што ў іх у Беларусі ёсць нейкія стратэгічныя інтарэсы, не пытаючыся пры гэтым у беларускага народа аб яго стратэгічных інтарэсах.

У сувязі з гэтым хачу заявіць аб тым, што ўсе, падпісаныя пасля 20 ліпеня 1999 года А. Лукашэнкам дакументы, накіраваную на страту Беларуссю суверэнітэта і незалежнасці, як, дарэчы, і іншыя дзяржаўныя дзелавыя паперы, не маюць ніякай сілы.

***(“Народная воля”, 25 жніўня 1999 года)***

# ЗВАРОТ
## да народа Беларусі, усіх беларусаў свету, парламентаў і ўрадаў дэмакратычных краін

20 ліпеня 1999 года скончыўся тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі, нелегітымнымі сталі і ўсе прызначаныя ім структуры. З гэтай нагоды, згодна са 105 артыкулам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, да прынясення прысягі новаабраным прэзідэнтам паўнамоцтвы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь перайшлі да Старшыні Вярхоўнага Савета Сямёна Шарэцкага, абавязкі Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь - да першага насмесніка Старшыні Вярхоўнага Савета Віктара Ганчара. У бліжэйшыя дні павінен быць сфармаваны і новы ўрад. Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, павінны адбыцца выбары прэзідэнта.

Але А. Лукашэнка і створаны ім рэжым, выкарыстоўваючы антыканстытуцыйныя метады, працягваюць утрымліваць уладу. Больш за тое, яны і далей прадпрымаюць свае намаганні па аб`яднанню Беларусі з Расеяй у адну дзяржаву, прэзідэнтам якой марыць стаць А. Лукашэнка. На жаль, ва ўсім гэтым іх падтрымліваюць шматлікія расейскія палітыкі, якія таксама жадаюць аднаўлення імперыі.

Мы звяртаемся да народа Рэспублікі Беларусь і ўсіх беларусаў свету з заклікам спрыяць станаўленню ў Беларусі канстытуцыйнай улады, усталяванню незалежнай дэмакратычнай прававой дзяржавы.

Мы звяртаемся да парламентаў і ўрадаў дэмакратычных дзяржаў з заклікам не прызнаваць узурпатара і створаныя ім у Беларусі антыканстытуцыйныя структуры, спрыяць імкненню беларускага народа да незалежнасці, падтрымаць права беларусаў вызначаць свой лёс праз дэмакратычна абраную ўладу.

**Івонка Сурвіла,** Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі;
**Станіслаў Шушкевіч,** першы Старшыня Вярхоўнага Савета незалежнай Рэспублікі Беларусь;
**Мечыслаў Грыб,** Старшыня Вярхоўнагга Савета Рэспублікі Беларусь, падпісант Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;
**Радзім Гарэцкі,** Прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына"

***("Народная воля", 8 верасня 1999 года)***

# ЯКІ ГІСТАРЫЧНЫ ШАНС РЫХТУЮЦЬ БЕЛАРУСІ РАСЕЙСКІЯ ВІЗІЦЁРЫ?

8 верасня 1514 года… Дата, якая назаўжды ўвайшла ў гісторыю Беларусі як Дзень вайсковай славы. Менавіта ў гэты дзень пад Оршай, на рацэ Крапіўна, войскі Вялікага княства Літоўскага пад началам Канстанціна Астрожскага ўшчэнт разбілі войскі Маскоўскага княства, якія ўварваліся на тэрыторыю Беларусі і па колькасці перавышалі ў некалькі разоў вялікажацкія войскі. Гэта была сапраўды гістарычная перамога, якая паказала гатоўнасць і ўменне нашых продкаў пастаяць за сваю незалежнасць, узвысіла аўтарэтэт Вялікага княства Літоўскага ў Еўропе.

З таго дня прайшлі стагоддзі… Зусім іншым стаў свет. З мапы зніклі створаныя ў сярэднявеччы і больш позныя часы імперыі. Распаўся і Савецкі Саюз як спадкаемца Расейскай імперыі, да якой у выніку падзелу Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795г.г) гвалтоўна была далучана і Беларусь. У Еўропе склалася новая супольнасць дзяржаў - Еўрасаюз, мэтай якога - стварыць умовы для ўзаемавыгаднай інтэграцыі эканомік, шырокага абмену дасягененнямі навукі і культуры, свабоднага перамяшчэння людзей па яго тэрыторыі. І ўсё гэта робіцца пры захаванні дзяржаўнагга суверэнітэту ўваходзячых у саюз краін. Таму сёння дэмакратычныя краіны Еўропы мараць аб тым, каб стаць сябрамі названага саюза.

І цяжка ўявіць, што ў гэты час яшчэ ёсць палітыкі, якія ў падыходах да інтэграцыі краін засталіся на ўзроўні сярэдневечча. Для іх па-ранейшаму галоўным з`яўляецца аб`яднанне краін у адну дзяржаву, што, як паказала сусветная практыка, вядзе да грэбавання інтарэсамі малых народаў. Тытульная нацыя, мова і культура якой у такой дзяржаве з`яўляюцца дамінуючай, пачынае падаўляць правы і свабоды іншых народаў. Таму вельмі незразумелым з`яўляецца гістарычны шанс для беларускага народа, які яму пачаў прапаноўваць новы памагаты Лукашэнкі па аб`яднанні Беларусі і Расеі - Уладзімір Пуцін. Дарэчы, свой прыезд у нашу краіну новы кіраўнік урада Расейскай Федэрацыі прымяркаваў менавіта да 8 верасня, як бы падкрэсліўшы тым самым, што ён прапануе беларускаму народу ўсё той жа гістарычны шанс, які прапаноўвалі беларусам і ў 1514 годзе, імкнучыся далучыць беларускія землі да Маскоўскага княства.

У. Пуцін будзе весці перамовы аб аб`яднанні Беларусі і Расеі з чалавекам, у якога няма на гэта юрыдычных правоў. Тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А. Лукашэнкі скончыўся 20 ліпеня 1999 года, але дзеля дасягнення сваіх шавіністычных амбіцый высокі расейскі чыноўнік на гэта гатовы закрыць вочы. Не здзіўляла ж ягоных папярэднікаў, калі яны з дапамогай сілы ў Чачні правялі штучныя “выбары” і займелі свайго “прэзідэнта”, закрыўшы пры гэтым вочы на тое, што чачэнскі народ працягваў змаганне за незалежнасць сваёй краіны. Выходзіць, і У. Пуціна не здзіўляе той факт, што так званы рэферэндум 1996 года ў Беларусі праводзіўся пры дапамозе бронетранспарцёраў, аўтаматчыкаў, якія блакавалі будынак Цэнтрвыбаркаму, і іншых недазволеных прыёмаў. Дэмакратычны свет не прызнае легітымнымі такія метады і атрыманыя пры іх дапамозе вынікі галасавання, а многія расейскія палітыкі, патрабуючы правядзення ў сваёй краіне “честных и справедливых выборов”, лічаць насілле над народам, якое адбылося ў лістападзе 1996 года ў Беларусі, рэферэндумам. Такі падыход да метадаў

правядзення выбараў у Чачні і рэферэндуму ў Беларусі шмат чаго гаворыць аб той гістарычнай перспектыве, якая чакае, ў дадзеным выпадку, беларускі народ, калі, не дай Бог, будуць здзейснены цемрашальныя планы А. Лукашэнкі і яго расейскіх аднадумцаў.

Але ў Беларусі сапраўды сёння ёсць гістарычны шанс. Шанс - не ўвайсці ў склад Расеі ў якасці "Северо-Западного края" (гэты шанс беларускі народ ужо зведаў), а застацца незалежнай краінай. Ды і навогул, куды ісці? З кім аб`ядноўвацца? З той краінай, якая сёння сама распадаецца, дзе бесперапынна ідзе вайна і льецца кроў?

Беларусь павінна вярнуцца на дэмакратычны шлях развіцця і стаць паўнапраўным сябрам еўрапейскай сям`і дзяржаў. Для гэтага толькі трэба ўсвядоміць беларусам даброты такога гістарычнага шансу, які для многіх еўрапейскіх краін стаў ужо рэальнасцю.

***("Народная воля", 8 верасня 1999 года)***

KAMUNIKAT.org

## ПРА:
### Лукашэнку, ягоных падтрымаўцаў і прэзідэнцкія паўнамоцтвы

Уся справа ў тым, што гэты чалавек, наогул, не адчувае сябе ні расіянінам, ні беларусам, - нікім. Ён дыктатар, і ўсё гэтым сказана. А дыктатар заўжды ёсць хворы чалавек, у якога няма ніякай лініі, няма ніякіх абгрунтаваных імкненняў: яны сёння адны, заўтра іншыя.

На Захадзе перабольшваюцца ўплыў Лукашэнкі ў самой Беларусі. Ён трымаецца на штыках і матэрыяльнай дапамозе з Расеі. Няпраўда, што Лукашэнку падтрымлівае большасць беларускага насельніцтва. Інакш ён пайшоў бы на выбары, а ён іх баіцца. Ці задумваліся вы над тым, што на чале міністэрства замежных спраў РБ стаіць палкоўнік ФСБ Расеі Урал Латыпаў? Як вы думаеце, чаму Лукашэнка паставіў на гэтую пасаду расейскага палкоўніка, а не беларуса? Таму што беларуса ён бы ўжо не знайшоў для сваёй службы. У Савеце Міністраў беларускай навукай і культурай камандуе палкоўнік расейскай арміі Замяталін, які мае знакамітую ў КДБ прафесію: “правакатар па палітычных пытаннях” - гэта афіцыйная назва. Міністрам унутраных спраў РБ пастаўлены генерал расейскай арміі Сівакоў, міністрам абароны - генерал Расеі Чумакоў… Дык пра якую падтрымку беларускага народа можна казаць? Лукашэнка ж баіцца беларускага народу, акружае сябе расейцамі. Больш таго, нават у СНД інтарэсы Беларусі прадстаўляе палкоўнік расейскай арміі Посахаў. Гэта ж ідзе непрыхаваная анэксія Беларусі. Як бачыце, на Беларусі цяпер пануе акупацыйны расейскі рэжым, ад якога апазіцыйныя сілы і хочуць пазбавіцца. Без гэтага Беларусь ніколі не стане дэмакратычнай дзяржавай.

Сёння, вы толькі падумайце, апазіцыйнымі ў стаўленні да Лукашэнкі партыямі з`яўляюцца практычна ўсе беларускія партыі, якія не створаныя ягонымі структурамі ды не ўтрымліваюцца на іхнія сродкі. І БНФ, і кампартыя , - усе ў адным шэрагу ў змаганні з рэжымам за незалежнасць Беларусі. Безумоўна, у апазіцыйных партыях ёсць разыходжанні наконт будучага ладу Беларусі, але сёння яны ўсе адзіныя ў тым, што Беларусь павінна стаць незалежнай дэмакратычнай, пазбаўленай дыктатарскага рэжыму.

Я паводле Канстытуцыі 1994 года з`яўляюся Старшынёй Вярхоўнага Савета РБ. Паводле той самай Канстытуцыі, з 21 ліпеня, калі закончыўся тэрмін прэзідэнцтва спадара Лукашэнкі, паўнамоцтвы прэзідэнта Беларусі перайшлі да мяне. Гэта 105 артыкул Канстытуцыі РБ. Лукашэнка выбіраўся на пяць гадоў, 20 ліпеня 1994 года ён прымаў прысягу і вось таму тэрмін ягонага прэзідэнцтва скончыўся. У выпадку, калі ўтвараецца вакансія пасады прэзідэнта, ягоныя паўнамоцтвы пераходзяць да Старшыні ВС. Я не станаўлюся прэзідэнтам, але паўнамоцтвы прэзідэнта пераходзяць да мяне. І гэта да прынясення прысягі нанова абраным прэзідэнтам.

### Падпісанне Звароту, ягонае значэнне

Гэты дакумент падпісаны таму, што згодна Канстытцыі 1994 года прэзідэнт Лукашэнка стаў нелегітымным і нелегітымнымі сталі ўсе ягоныя структуры. Таму натуральна, што і спн. Івонка Сурвіла, і сп. Радзім Гарэцкі, і сп. Станіслаў Шушкевіч сабраліся ў Вільні і падпісалі Зварот, у якім зафіксавалі гэты факт. У Менску

Зварот падпісаў і сп. Грыб. У Звароце зафіксавана таксама, што прэзідэнцкія паўнамоцтвы часова пераходзяць да мяне, а паўнамоцтвы Старшыні ВС да майго першага намесніка Віктара Ганчара. Больш таго, мы звярнуліся да беларускай і сусветнай грамадскасці, да урадаў і парламентаў дэмакратычных дзяржаў, каб яны спрыялі ўстанаўленню ў Беларусі дэмакратычнай, незалежнай, прававой дзяржавы, як гэта і патрабуе Канстытуцыя РБ. Падпісанты гэтага дакументу зафіксавалі тое, што яны прытрымліваюцца канстытуцыйных нормаў і патрабаванняў, і паставілі свае подпісы з нагоды гэтага. Лукашэнка цяпер мае справу з апазіцыяй не толькі ў Беларусі: падпісаны дакумент сведчыць пра тое, што ўсе беларусы свету, дзе б яны ні жылі, сёння ў апазіцыі рэжыму, які стварыў Лукашэнка, - як да нелегітымнага, неканстытуцыйнага, як да антынароднага, нарэшце.

**Магчымыя перамовы з Лукашэнкам і фармаванне новага ўраду**

Мы некалькі разоў звярнуліся спачатку да прэзідэнта Лукашэнкі, а затым да грамадзяніна Лукашэнкі (пасля 20 ліпеня), каб сесці за стол перамоваў і мірным шляхам вырашыць канфлікт выканаўчай улады, каб вывесці рэспубліку з таго тупіка, куды яе завёў грамадзянін Лукашэнка. Сапраўды, з заканчэннем прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі скончыўся тэрмін паўнамоцтваў ураду, ім назначанага. Пакуль што, аднак, ніякіх перамоваў няма. Ёсць толькі адныя размовы пра перамовы. Лукашэнка не ідзе на перамовы. Ён хоча, каб яго спачатку прызналі, як прэзідэнта, а потым ён будзе размаўляць. Але пра што тады можна гаварыць? Узурпатар хоча, каб яго прызналі законным прэзідэнтам! Ён быў ім, у яго быў час, а зараз з ім могуць размаўляць, як толькі з грамадзянінам Лукашэнкам, які незаконна знаходзіцца пры ўладзе. Мы гатовыя размаўляць з ім, як увайсці ў канстытуцыйнае поле, а не як парушаць Канстытуцыю

У бліжэйшы час будзе сфармаваны новы ўрад (работа фармавання ўраду ўжо распачатая), будуць прызначаныя новыя выбары. Зразумела, Лукашэнка таксама мае права ўдзельнічаць у гэтых выбарах, ён жа вельмі шмат гаворыць, што яго нібыта падтрымлівае беларускі народ. Чаму ж ён ухіляецца ад выбараў? Бо Вярхоўны Савет ужо прызначаў выбары, і Лукашэнка замест таго, каб пайсці на іх і на законных падставах перавыбрацца, - выбары гэтыя заблакаваў, сарваў і сваёй кандыдатуры не высунуў. Відавочна, не перакананы ў тым, што яго народ зноў абярэ прэзідэнтам. Бо пяці гадоў было цалкам дастаткова, каб паглядзець на ягоныя здольнасці і ўчынкі.

**Становішча ў Беларусі**

Я думаю, што ня можа так быць доўга, каб беларускі народ сам у сябе ў хаце сваю беларускую мову абараняў праз Таварыства беларускай мовы. Не распаўсюджваў, не развіваў, а абараняў! Сёння сапраўды становішча жахлівае. У Менску няма ніводнай не толькі вышэйшай, але і і сярэдняй навучальнай установы, якая б працавала на беларускай мове.

Сёння ў Беларусі, сорамна казаць, за 1,5% малаком трэба стаяць у чарзе. І гэта тая самая Беларусь, якая не так даўно вывозіла і малако, і мяса. Сёння за месячную заработную плату ў Беларусі можна купіць 2,5-3 кг каўбасы. Вось да чаго

даведзеная краіна.

У Беларусі пануе поўнае бяспраўе. Указам прэзідэнта (былога ўжо цяпер) створаная адмысловае антыканстытуцыйнае ваеннае падраздзяленне з правам “Врываться в любое помещение” - гэта адтуль я ўзяў гэтыя словы. Урывацца ў любое памяшканне, у кожную кватэру, праводзіцьператрус, затрымліваць кожнага, саджаць за краты, а ўжо потым высвятляць, за што… І такіх людзей ужо сядзіць нямала, у тым ліку і былы прэм`ер-міністр сп. Чыгір, былы міністр сельскай гаспадаркі сп. Лявонаў, сядзяць два дэпутаты ВС Клімаў і Кудзінаў. Перыядычна, калі праводзяцца дэманстрацыі, арыштоўваюцца дзесяткі людзей. Часта людзей збіваюць толькі праз тое, што яны размаўляюць па-беларуску. Вось да чаго даведзеная рэспубліка грамадзянінам Лукашэнкам і вось чаму ён ухіляецца ад выбараў, працягваючы ўтрымліваць уладу. Па сутнасці, ён яе ўзурпаваў.

Цяжка меркаваць, якім будзе далейшы ход падзеяў у Беларусі. Бо ёсць другі бок, які з дапамогай некаторых расейскіх палітыкаў працягвае ўтрымліваць уладу. Таму ён залежыць ад таго, як сябе далей павядзе Расея, як павядзе далей Лукашэнка, на колькі хутка беларусы зразумеюць, што трэба выйсці ўсім на барацьбу супраць правячага рэжыму.

**Аб`яднанне з Расеяй**

Нядаўна я падпісаў заяву, у якой патлумачыў, што ўсе падпісаныя пасля 20 ліпеня Лукашэнкам дзяржаўныя дакументы неправамоцныя. Гэта асабліва важна таму, што Лукашэнка не толькі працягвае сілай утрымліваць выканаўчую ўладу, але і працягвае сваю гульню з гэтак званым ”аб`яднаннем Беларусі з Расеяй”, дзеля таго, каб потым стаць прэзідэнтам вялікай дзяржавы. Усё гэта можна было б прыняць як жарт, маўляў, як гэта Лукашэнка можа стаць прэзідэнтам Расеі, - калі б у самой Расеі не было сілаў, якія зацікаўлены ў тым “аб`яднанні”. Такімі сіламі, па-першае, з`яўляецца ўся камуністычная партыя Расеі. На такім самым пункце гледжання, гэта значыць - шавіністычным, стаіць Бабурын і ягоны рух, шавіністамі паводле мыслення з`яўляюцца Прымакоў і Лужкоў. І таму не да жартаў. Справа ў тым, што Лукашэнка ёсць дыктатар згодна сваёй натуры. Ён адкрыта заяўляе пра тое, што ягоная задача адрадзіць былую савецкую імперыю, прычым, што самае страшнае, з тымі самымі казарменнымі парадкамі, якія існавалі ў СССР у 30-ыя ды 50-гады. Калі да гэтага дадаць, што Лукашэнка паводле сваёй натуры належыць да тыпу гэтак званых “эліптоідных кіраўнікоў”, хворых людзей (да іх належалі Гітлер, Сталін, Мусаліні і належыць Садам Хусэйн ды Мілошавіч), дык гэта робіцца двойчы небяспечным. Бо ў Расеі, як мы ведаем, назапашана вельмі шмат ракетаў, ядзернай зброі. Заўважце, што Лукашэнка адзіны кіраўнік дзяржавы, які ездзіў да Мілошавіча дзеля таго, каб яго падтрымаць. Уявіце сабе, што магло б быць, калі б на момант балканскай вайны Лукашэнка ўжо распараджаўся ядзерным арсеналам Расеі. Наўрад ці ён паехаў бы да Мілошавіча з пустымі рукамі. Ён жа і амерыканскія шары збіў ні за панюх табакі.

**Літоўска-беларускія дачыненні**

Калі паглядзець на нашую гісторыю, дык мала можна знайсці, дзе вось такія суседнія народы, якія б ніколі не ваявалі паміж сабою, і надта моцна не спрачаліся.

А вось тое, што яны жылі ў адной дзяржаве, знаходзілі ўзаемапаразуменне, нас сёння абавязвае, і літоўскіх прадстаўнікоў таксама, працягваць жыць у такім сяброўстве.

Мы ніколі не лічылі нашую мяжу нейкай непраходнай. Яна заўжды была ўмоўнай. Доўгі час нашыя народы жылі ў адной дзяржаве. Я ўдзячны парламентарыям Літвы, якія заўсёды нас падтрымлівалі на ўсіх міжнародных форумах, як прадстаўнікоў адзінага праўнага і заканадаўчага органу Беларусі.

Я думаю, што для літоўцаў таксама патрэбна Беларусь дэмакратычная, і ўсё тое, што Літва зробіць для беларусаў Літвы, дапаможа і нам, беларусам у Беларусі, якія сёння перажываюць дыктатуру, змагацца з гэтай дыктатурай, усталяваць дэмакратычны лад. Мы таксама хочам адчуваць сябе ў адзінай еўрапейскай сям`і.

Літоўскія кіраўнікі, слава Богу, разумеюць, што будзе, калі ўсе думкі, якімі жыве Лукашэнка, здзейсняцца. Гэта азначае, што заўтра расейскія ракеты з ядзернымі боегалоўкамі апынуцца ў Ашмянах, у 50 км ад Вільні, і на Бузе - у 150 км ад Варшавы. А Польшча ўжо ў НАТА. І Літва туды імкнецца. Гэта ж якая пагроза вайны. Тым больш, што ў адрозненні ад кіраўнікоў НАТА, з усходняга боку на чале ваеннай машыны будзе стаяць такі цемрашал, як Лукашэнка.

## Міжнародную падтрымку Беларусі

Без падтрымкі міжнародных арганізацыяў, заходніх дэмакратыяў, наша апазіцыя не магла б так эфектыўна весці барацьбу за незалежную Беларусь, усталяванне дэмакратычнага ладу ў ёй. Адразу ж пасля дзяржаўнага перавароту, які здзейсніў Лукашэнка са сваім акружэннем пад выглядам так званага "рэферэндуму", наша заява пра незаконнасць гэтага рэферэндуму была падтрыманая шмат якімі арганізацыямі і большасцю краінаў. Можна сказаць, усімі краінамі Еўропы, апрача асобных палітыкаў Расеі. Бо і ў самой Расеі мы маем падтрымку, напрыклад, нас падтрымлівае "Правое дело".

Дзеля таго, каб з Беларуссю не атрымалася такая самая трагедыя, як з Югаславіяй, трэба апярэдзіць развіццё Лукашэнкі, як дыктатара. А зрабіць гэта вельмі проста. Як у свой час Мілошавіч без падтрымкі Расеі не мог бы развіцца ў гэткага дыктатара, які прынёс столькі бедаў не толькі на Балканах, а і ўсяму свету , - гэтак і Лукашэнка не можа існаваць як кіраўнік Беларусі нават два месяцы без падтрымкі Расеі. Я, калі размаўляю з заходнімі дыпламатамі, заўжды стаўлю пытанне: "Навошта трэба было глядзець праз пальцы на той факт, што Расея ўскормлівае Мілошавіча, а затым бамбіць Югаславію, замест таго, каб у свой час спыніць дыктатара ад зладзействаў?". Чаму гэты трагічны факт не стаўся ўрокам для заходніх дэмакратыяў, якія цяпер праз пальцы глядзяць на тое, што творыцца ў Беларусі? Чаму яны даюць грошы Расеі, нягледзячы на тое, што Расея гэтымі грашыма (амерыканскімі, нямецкімі, французкімі) ўскормлівае Лукашэнку? Неабходна, каб заходняя дапамога Расеі ўвязвалася з тым, што яна не будзе дапамагаць дыктатарскаму рэжыму ў Беларусі. У дачыненні Мілошавіча гэта зрабілі толькі пасля таго, як бомбамі разбурылі ўсю эканоміку Югаславіі, калі загінулі столькі людзей. Былы расейскі прэм`ер Сцяпашын змушаны быў сказаць у Парыжы, дзе вырашалася пытанне скасавання расейскіх пазыкаў, што ён і ягоны ўрад не будуць падтрымліваць Мілошавіча. А чаму б ужо цяпер, фінансуючы

Расею, не паставіць пытанне аб тым, што яна не будзе падтрымліваць Лукашэнку? Тым больш, што з нядаўняга часу Лукашэнка ў адрозненне ад Мілошавіча не мае законных паўнамоцтваў. Я часамі са слязамі на вачах пытаюся ў заходніх дыпламатаў: "Няўжо вам спадабалася бамбіць чужыя краіны?". Мы зацікаўленыя, каб Беларусь мірным шляхам вярнулася ў канстытуцыйнае поле і абяцаем стаць актыўнымі будаўнікамі дэмакратычнага дому. І тут трэба мець на ўвазе, што Беларусь не на Балканскім паўвостраве, яна знаходзіцца ў самым геаметрычным цэнтры Еўропы. Калі, не дай Бог, нашая бяда стане бядою Еўропы, дык цяжка ўявіць, што будзе.

Мы маем падтрымку з Еўропы, але гэтая падтрымка нашмат меншая, чым падтрымка Лукашэнкі Расеяй. Таму нашай апазіцыі даводзіцца змагацца не толькі з Лукашэнкам, але і з расейскімі шавіністамі, якія яму дапамагаюць. На мой погляд, заходнія краіны проста недаацэньваюць небяспекі, якая можа быць з боку Расеі, калі на чале яе стане такі неўраўнаважаны чалавек, як Лукашэнка.

*Падрыхтаваў Алег Мінкін*

***("Рунь", 9 верасня 1999 года)***

KAMUNIKAT.org

# ПРАДСТАЎЛЕННЕ

**Па ўзгадненню кандыдатуры Міхаіла Мікалаевіча Чыгіра на пасаду Прэм`ер-міністра Рэспублікі Беларусь**

**Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь**

Паважаныя калегі!

20 ліпеня 1999 года скончыўся тэрмін паўнамоцтваў Прэзідэнта РБ А. Лукашэнкі разам з такім жа нелегітымным, як і сам Лукашэнка як прэзідэнт, сталі і ўсе члены ўраду, пачынаючы ад прэм`ер-міністра С. Лінга і сканчаючы ўсімі іншымі, якіх прызначыў на пасады былы прэзідэнт.

У сувязі з гэтым і згодна са 107 артыкулам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь як Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, да якога са сканчэннем тэрміна паўнамоцтваў былога прэзідэнта і стварэннем з гэтай нагоды вакансіі пасады прэзідэнта, згодна са 105 артыкулам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, паўнамоцтвы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да прынясення прысягі новаабраным прэзідэнтам перайшлі, прапаную да ўзгаднення на пасаду Прэм`ер-міністра Рэспублікі Беларусь кандыдатуру Міхаіла Мікалаевіча Чыгіра.

Міхаіл Мікалаевіч Чыгір нарадзіўся 24 мая 1948 года ў вёсцы Вусава Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сям`і селяніна. Беларус. Беспартыйны. Адукацыя вышэйшая - скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава (1970г.) і спецыяльны факультэт па міжнародных эканамічных адносінах пры Маскоўскім фінансавым інстытуце (1982г.).

Працоўную дзейнасць пачаў эканамістам Салігорскага аддзялення Дзяржбанку СССР Мінскай вобласці.

Далей працаваў начальнікам крэдытнага аддзела Бярэзінскага аддзялення Дзяржбанку СССР. Служыў у Савецкай Арміі (11.1972-11.1973г.г.), пасля чаго працаваў упраўляючым Клецкім аддзяленнем Дзяржбанку СССР. Пасля заканчэння спецфакультэту стаў працаваць упраўляючым Маскоўскім аддзяленнем Дзяржбанку СССР г. Мінска.

У наступных гадах (01.1983-07.1984г.г.) працаваў інструктарам аддзелу гандлю і бытавога абслугоўвання Мінскага абкама КПБ, інструктарам аддзелу ЦК КПБ, упраўляючым гарканторы Дзяржбанку СССР, першым намеснікам старшыні Аграбанку і старшынёю Аграбанку Рэспублікі Беларусь.

З 07.1994 па 11.1996 гады - Прэм`ер-міністр Рэспублікі Беларусь, з пасады якога якога сыйшоў па заяве, выказаўшы ў ёй сваю нязгоду з праводзімым у лістападзе 1996 года так званага рэферэндуму па ўнясенню А. Лукашэнкам змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

З 04.1998г. па 03.1999г. быў кіраўніком прадстаўніцтва Еўрапейскага канцэрна “СЕА” ў Расеі.

На майскіх (1999г.) выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія прызначаліся Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь вылучаўся кандыдатам у прэзідэнты.

Жанаты, мае дваіх сыноў.

Лічу, што прафесійная падрыхтоўка і вопыт работы М. Чыгіра даюць усе падставы спадзявацца, што з пасадай Прэм`ер-міністра РБ у гэты адказны час ён паспяхова справіцца.

Хацеў бы, каб пры абмеркаванні кандыдатуры Міхаіла Чыгіра на пасаду Прэм`ер-міністра Рэспублікі Беларусь былі ўлічаны і яго маральна-этычныя якасці. Міхаіл Мікалаевіч адкрыта кінуў выклік прэзідэнту і яго паплечнікам, якія ў лістападзе 1996 года здзейснілі дзяржаўны пераварот, а калі на пачатку 1999г. Вярхоўны Савет прызначыў РБ прызначыў чарговыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ён праявіў мужнасць і вылучыў сябе кандыдатам, за што заплаціў пазбаўленнем волі. Але, як бачна з яго адкрытага ліста гр. Лукашэнку, ён і ў турме не страціў надзеі і гатовы зрабіць усё ад яго залежнае па вяртанню Рэспублікі Беларусь на дэмакратычны шлях развіцця.

Такім чынам, прызначэнне Міхаіла Мікалаевіча Чыгіра на пасаду Прэм`ер-міністра РБ будзе правільным і з боку дзяржаўных інтарэсаў, і з маральна-этычнага боку.

Паважаныя дэпутаты Вярхоўнага Савета РБ!

На жаль, па вядомых вам абставінах я не магу сам агучыць гэтае Прадстаўленне на сесіі Вярхоўнага Савета. Таму я даручаю гэта зрабіць першаму намесніку Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Віктару Юсіфавічу Ганчару, да якога, згодна з тым жа 105 артыкулам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, перайшлі на гэты перыяд абавязкі Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Спадзяюся на вашае паразуменне і падтрымку на пасаду Прэм`ер-міністра Рэспублікі Беларусь кандыдатуры Міхаіла Мікалаевіча Чыгіра.

Старшыня Вярхоўнага Савета
Рэспублікі Беларусь
С. Шарэцкі

**Перад тым, як дадзенае Прадстаўленне было даслана Прэзідыуму Вярхоўнага Савета для прыняцця рашэння і вынясення яго на сесію Вярхоўнагаа Савета, папярэдне яно было ўзгоднена праз жонку з самім Міхаілам Чыгіром, які ў гэты час знаходзіўся ў турме. Міхаіл Мікалаевіч у той час даў сваю згоду на прыняцце станоўчага рашэння.**

**Аднак, праз некалькі дзён ён пераасэнсаваў сваё рашэнне, аб чым пісьмова, зноў-такі праз жонку, паведаміў членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Старшыні Вярхоўнага Савета асабіста. Таму ніякага рашэння па дадзенаму Прадстаўленню прынята не было.**

**Пытанне аб прызначэнні Часовага ўраду павісла ў паветры.**

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА І ПРАВЫ НАРОДУ

Правы і свабоды чалавека - гэта, паводле трапнага выразу польскага правазнаўцы Марэка Навіцкага, шчыт, які прыкрывае чалавека ад замахаў з боку дзяржавы. Яны абараняюць людзей ад знявагі іх чалавечай годнасці з боку дзяржаўнай улады, патэнцыйна найбольшага парушальніка правоў і свабодаў. Улады схільныя парушаць правы людзей, бо гэтак ім лягчэй кіраваць. Прыкладам у гэтым, на жаль, з`яўляецца Рэспубліка Беларусь, дзе груба парушаюцца амаль усе правы і свабоды чалавека: свабода слова і дэманстрацыяў, недатыкальнасць асобы і яе маёмасці, свабода атрымліваць адукацыю на роднай мове, свабода прадпрымальніцтва і гэтак далей.

Больш за тое, у краінах з таталітарнымі рэжымамі ўлады амаль заўжды імкнуцца выхаваць усіх людзей згодна з раней прыдуманым эталонам, ня лічачыся са здольнасцямі і схільнасцямі апошніх. Справа даходзіць да таго, што дыктараскія рэжымы хочуць, каб усе нават апранутыя былі ў аднолькавую вопратку.

Але гаворачы пра значэнне правоў і свабод чалавека для абароны чалавечай годнасці людзей, трэба падкрэсліць, што гэта тычыцца не толькі краінаў з таталітарнымі рэжымамі, але і так званых дэмакратычных, дзе большасць насельніцтва можа выказаць сваю волю з дапамогаю свабодных і справядлівых выбараў. Гэткая неабходнасць абумоўленая тут тым, што ўлада большасці таксама можа быць неапраўдана жорсткай у адносінахда пэўных асобаў. Менавіта большасць афінян вынесла смяротны прысуд Сакрату. Адурманеная савецкай прапагандай большасць сяброў такой, на першы погляд, дэмакратычнай арганізацыі як АН СССР, асуджала праваабарончую дзейнасць Андрэя Сахарава і патрабавала пазбаўлення яго Нобелеўскай прэміі. Усё гэта гаворыць аб тым, што неабежаваная ўлада, у тым ліку і большасці, з`яўляецца пагрозай для асобных людзей. І таму сапраўдная дэмакратыя патрабуе менавіта абмежавання ўлады і большасці, калі тычыцца справы чалавечай годнасці.

Разглядаючы развіццё канцэпцыі свабоды чалавека ў Еўропе, трэба падкрэсліць, што забеспячэнне свабоды было звязана галоўным чынам з надзеямі на дзяржаву, якая, маўляў, і павінна даць шчасце кожнаму. Менавіта кіруючыся гэтым прынцыпам, высунуў свой лозунг і Кастусь Каліноўскі: “Не народ для ўраду, а ўрад для народу”. І самае дзіўнае, што ў Еўропе потым з`явіліся кіраўнікі дзяржаў і нават урады, якія верылі, што яны сапраўды ведаюць, як ашчаслівіць сваіх падапечных. Як правіла, гэткія ўладары раней ці пазней станавіліся дыктатармі. Прыкладам зноў-такі можа быць рэжым Лукашэнкі, які абяцаў у час выбарчай кампаніі ашчасліваць усіх, а пасля таго, як быў абраны прэзідэнтам, стаў дыктатарам.

І зусім па-іншаму глядзяць на свабоду ў ЗША. Тут заўжды лічылі, што роля дзяржавы заключаеецца толькі ў абароне людзей і іх маёмасці, а ў астатнім яна не павінна перашкаджаць кожнаму ствараць для сябе шчасце. Гэткія розныя падыходы да ролі дзяржавы Марэк Навіцкі тлумачыць тым, што да пачатку стварэння прававых сістэм у Еўропе ўжо не было свабодных зямель і людзі працавалі галоўным чынам на чужых землях, а таму і шукалі ў дзяржаве абарону ад усіх. У ЗША, наадварот, дзяржава не павінна была перашкаджваць асвойваць

новыя землі, а значыць і ствараць людзям самім для сябе шчасце.

Хаця аб правах чалавека і трэба гаварыць у рэчышчы правоў саміх асоб, але паколькі апошнія абавязкова належаць да нейкіх грамадскіх групаў, дык без надання правоў і свабод гэтым групам нельга выканаць патрабаванні названых вышэй дакументаў і ў адносінах правоў і свабод самога чалавека. І гэта перш за ўсё тычыцца нацыяў, бо безнацыянальных людзей не бывае. Кожны лічыць сябе прыналежным да якойсьці нацыі, і калі ён сумленны, дык і ганарыцца тым. Менавіта на гэтай падстве вядомы нямецкі філосаф Артур Шапенгаўэр лічыў, што самы распаўсюджаны від гонару - нацыянальны гонар.

Без нацыянальнага гонару народ ператвараецца ў натоўп людзей з рабскай псіхалогіяй, якія заўжды будуць імкнуцца падпарадкаваць сабе іншыя дзяржавы. І калі гэта здарыцца, дык аб правах і свабодах прадстаўнікоў залежнай нацыі можна гаварыць толькі ў тэарэтычным плане. На практыцы ж, каб трымаць у залежнасці іншыя нацыі, пануючая нацыя ў дзяржаве ніколі не даволіць прадстаўнікам першых залежных нацыяў мець роўныя правы з правамі сваіх прадстаўнікоў. Больш за тое, тытульныя нацыі амаль заўжды імкнуцца асіміляваць залежныя ад іх нацыі. І гэта вельмі бачна было на адносінах пануючай расейскай вярхушкі да беларусаў пасля ўваходжання тэрыторыіі апошніх у склад Расейскай імперыі.

Ужо ў 1764 годзе ў наказе князю Вяземскаму Кацярына II давала загад, у якім гаварылася пра тое, што: “Трэба лягчэйшым спосабам прывесці да таго, каб яны абруселі і перасталі глядзець як ваўкі ў лесе”. Працягваючы палітыку сваёй бабкі, скіраваную на абрусенне беларусаў, Мікалай I закрыў Віленскі універсітэт, які быў адной з найвялікшых крыніц беларускай культуры, ліквідаваў унію і перадаў уніяцкія храмы праваслаўнай царкве, спыніў дзейнасць Статуту Вялікага княства Літоўскага і нават забараніў ужыванне слова “Беларусь”. Палітыка па абрусенню беларусаў была прадоўжана наступнымі царамі, а таксама, пачынаючы з канца 2-ых гадоў нашага стагоддзя, і савецкімі ўладамі, хаця апошнія і абвяшчалі роўныя правы для прадстаўнікоў усіх нацыяў.

Для таго, каб правы прадстаўнікоў залежных нацыяў сталі аднолькавымі з правамі прадстаўнікоў пануючай нацыі, неабходна спачатку выраўняць іх права кожнай мець сваю незалежную дзяржаву, як гэта, скажам, было зроблена ў Чэхаславаччыне, якая цывілізаваным шляхам падзялілася на Чэхію і Славаччыну. Бо толькі пры наяўнасці сваёй нацыянальнай дзяржавы можна забяспечыць рацыянальныя адносіны паміж уладамі і людзьмі, толькі нацыянальная дзяржава з`яўляецца роднай маці, а не мачахай свайму народу, а таму аб`ектыўна зацікаўлена ва ўстанаўленні шчыта (захаванні правоў і свабод чалавека), які б прыкрываў кожнага яе грамадзяніна ад замаху чыноўнікаў на яго годнасць. Прычым нацыянальныя дзяржавы аб`ектыўна зацікаўлены ў захаванні правоў і свабод не толькі тых прадстаўнікоў сваёй нацыі, якія жывуць на іх тэрыторыі і з`яўляюцца іх грамадзянамі, але і тых, якія пражываюць на тэрыторыі іншых дзяржаў. Менавіта таму з адраджэннем сваёй нацыянальнай дзяржавы Ізраілю становішча габрэяў значна палепшылася і ў іншых краінах. У іх з`явілася маці-абаронца. Менавіта таму тыя народы, якія яшчэ не маюць сваёй нацыянальнай дзяржавы, імкнуцца яе мець. І зусім ненармальным трэба лічыць становішча, у якое сёння сттавіць беларускі народ былы яго прэзідэнт А. Лукашэнка, імкнучыся аб`яднаць рэспубліку Беларусь з Расейскай Федэрацыяй у адну дзяржаву. Многія з расейскіх палітыкаў у адносінах да правоў беларусаў засталіся на ўзроўні

кацярынінскіх і мікалаеўскіх часоў. Беларусаў яны нават не лічаць за нацыю. У некаторых з іх нават стала звычайным гаварыць: “Усе мы рускія”. Ім і ў галаву не прыходзіць, што гэтым яны зневажаюць дзясяцімільённы народ, які, паводле ўсіх міжнародных пагадненняў, мае права мець і мае сваю дзяржаву. І калі сёння паўстала пагроза перад беларускім народам страціць гэтае права, на абарону яго павінны падняцца беларусы ўсяго свету. На жаль, пытанні ўзаемазалежнасці правоў і свабод чалавека і правоў народу (нацыі) распрацаваныя навукай пакуль што недастакова. Правы і свабоды чалавека разглядаюцца часцей за ўсё ў адрыве ад правоў нацыяў на самавызначэнне. Падцвярджннем таму з`яўляецца выказванне таго ж М. Навіцкага, які падкрэслівае, што “ў межах правоў чалавека нельга гаварыць аб правах меншасцяў”. Апошняе - гэта, маўляў, ужо “мова і прадмет палітыкі”, а “у рэчышчы правоў чалавека нельга гаварыць аб правах асобаў, якія належаць да нацыянальных меншасцяў”. Больш таго, спадар Навіцкі лічыць нават адступленнем ад гэтага правіла тое, што ў 60-ых гадах у абодвух ААНаўскіх міжнародных пактах аб правах чалавека зроблены запіс у іх першых артыкулах аб правах нацыяў (народаў) на самавызначэнне.

І сёння мы бачым, як многія народы дамагаюцца і нават вядуць барацьбу за ажыццяўленне гэтага права аж да права на стварэнне сваёй дзяржавы, без чаго, як ужо было паказана, не працуюць або працуюць ва ўрэзаным выглядзе правы чалавека. Прычым апошняе тычыцца не толькі прыгнечаных нацыяў, але і тых, якія спрабуць насільнымі метадамі падпарадкаваць іншыя народы. І тут К. Маркс І Ф. Энгельс мелі рацыю, калі падкрэслілі, што ”не можа быць свабодным народ, які прыгнечвае іншыя народы”. Сіла, патрэбная яму для падаўлення другога народу, у рэшце заўжды абарочваецца супраць яго самога”.

***(“Наша ніва”, 27 верасня 1999 года)***

# БЕЛАРУСЬ У ЕЎРОПЕ XXI ВЕКА
**Выступ на паседжанні Балтыйскай Асамблеі**
**28 верасня 1999 года**

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Спадарыні і спадары!

Заўтра, 29 верасня, спаўняецца 470 гадоў з дня ўвядзення ў дзеянне першага Статута Вялікага княства Літоўскага, які з`яўляецца своеасаблівай канстытуцыяй сярэдніх вякоў. У названым дакуменце быў закладзены адзін з неўміручых, маючых вялікае значэнне і сёння прынцыпаў дзяржаўнага будаўніцтва - неабходнасць захавання дзяржаўнага суверэнітэту Вялікага княства Літоўскага. У сувязі з гэтым у Статуце дакладна вызначалісь абавязкі кіраўніка дзяржавы захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, не дапускаць замежнікаў на дзяржаўныя пасады і не даваць ім маёнткаў.

У Статуце было абвешчана правіла, згодна з якім усе павінны былі судзіцца на падставе аднолькавых нормаў, закладзеных у дадзеным Статуце, а кіраўніку дзяржавы забаранялась без суда адымаць у мясцовых феадалаў пасады і маёмасць.

Статут замацоўваў прыярытэт пісанага права і патрабаваў назначаць пакаранне толькі тым асобам, віна якіх была ўстаноўлена судом, што абмяжоўвала самавольстване толькі феадалаў, але і кіраўніка дзяржавы.

Калі параноўваеш гэтыя прынцыпы з той сучаснасцю, якая сёння існуе ў Рэспубліцы Беларусь, міжволі думаеш, наколькі вякоў патрэбна было апусціцца ўніз па ўзроўню прававога мыслення і развіццю культуры, каб:

будучы кіраўніком дзяржавы, шукаць шляхі пазбаўлення сваёй краіны незалежнасці і дзяржаўнага суаверэнітэту;

даручыць курыраванне развіццём нацыянальнай культуры, навукі і асветы палкоўніку, па пашпарту расіяніну, спецыялісту па палітычных правакацыях;

аддаць у рукі палкоўніка ФСБ і генерала замежнай, усё той жа расейскай дзяржавы знешнюю палітыку і рашэнне пытанняў, звязаных з абаронай краіны;

прылюдна, перад тэлевізійнай камерай, аддаваць загады “надеть наручники без суда и следствия” на тога ці іншага бізнесоўца або нават і міністра;

пагражаць па тэлебачанню і радыё адабраць без рашэння суда маёмасць у асобных уласнікаў і кааператываў, што на практыцы і робіцца ў Беларусі;

зневажаць тую мову, на якой быў напісаны як вышэй названы, так і наступныя два Статуты Вялікага княства Літоўскага, якія з`яўляюцца найвялікшымі помнікамі прававой культуры сярэднявечча.

Паважаныя калегі!

Свой выступ на тэму “Беларусь у Еўропе XXI века” я пачаў з глыбокай даўніны, таму, што “гісторыя, - як падкрэсліваў вядомы палітычны дзеяч і гісторык Беларусі Вацлаў Ластоўскі, - гэта фундамент, на якім будуецца жыццё народа”. І для таго, каб будаваць свой нацыянальны дом будучага - беларукую дзяржаву XXI века, трэба быць упэўненымі ў моцнасці фундамента, трэба ведаць гісторыю беларускага народа, якая з`яўляецца дастаткова багатай, па-свойму арыгінальнай, але на жаль, трагічнай.

Дарэчы, маё пакаленне навогул было пазбаўлена магчымасці вывучаць у

школе гісторыю роднай Беларусі. Характарыстыка шляху, які прайшоў беларускі народ за сваю шматвекавую гісторыю да 1917 года, пры выкладанні гісторыі СССР змяшчаўся ў адну фразу - "отсталая окраина царской России".

Цяжка сказаць, чаго ў гэтай фразе больш - няведання гісторыі ці цынічнай хлусні? Хутчэй за ўсё першае спалучаецца з другім, у выніку чаго прыніжаецца цэлы еўрапейскі народ.

Для тых, хто знарок скажае, не ведае ці дрэнна ведае гісторыю Беларусі (а сярод гэткіх маецца нямала як расейскіх, так і беларускіх палітыкаў), хачу яшчэ і яшчэ раз падкрэсліць: Беларусь - гэта не ўскраіна Расеі, а самастойная этнічная тэрыторыя, дзе карэнным насельніцтвам з`яўляюцца беларусы.

"Зачацце", "нараджэнне" і "дзяцінства" беларусаў як нацыі, прайшло ў Полацкім і Турава-Пінскім княствах. Прычым, першае амаль на працягу ўсёй сваёй гісторыі было незалежным. "Падлеткавы ўзрост" і "юнацтва" беларусаў прайшлі ў Вялікім княстве Літоўскім, якое па праву можна лічыць нашым агульным з літоўцамі домам таго перыяду.

Беларусы ганарацца гэтым перыядам сваёй гісторыі, і не толькі таму, што ВКЛ было вялікім у Еўропе па сваіх памерах і ішло наперадзе многіх дзяржаў у сваім развіцці, але галоўнае таму, што яно ўяўляла сабою прыклад талерантнасці і ўзаемапавагі паміж пражываючымі ў ім народнасцямі. Народы, якія правялі ў гэтым доме цэлыя стагоддзі, могуць без перабольшвання сказаць, што мы паміж сабою ніколі не толькі не ваявалі, але і не варагавалі.

На жаль, у канцы XVIII-га стагоддзя гэты дом быў разбураны, ВКЛ было гвалтоўна далучана да Расейскай імперыі. Пачынаючы з другой чвэрці XIX стагоддзя стала ажыццяўляцца русіфікацыя беларускага народа. З гэтай мэтаю нават была прыдумана тэорыя "западного руссизма", згодна з якой беларускі народ нібыта навогул не існаваў. У выдадзеным у 1874 годзе "Русском энциклопедическом словаре" гаварылася, што "название Беларусь есть географический термин и не имеет особого этнического значения, потому что ни особой народности, ни даже племени белорусского не существовало…"

Аднак сённяшнім шавіністычным у адносінах да Беларусі расейскім палітыкам трэба памятаць, што беларусы, як, уласна кажучы, і літоўцы, і іншыя нацыі, ніколі не мірыліся са стратай сваёй дзяржаўнасці і вялі бесперапынную барацьбу за яе адраджэнне. Аб непакорнасці беларусаў і літоўцаў праводзімай царскімі сатрапамі палітыцы русіфікацыі гаворыць прызнанне Віленскага губернатара тых гадоў Міхаіла Мураўёва, які ўвайшоў у гісторыю Беларусі з мянушкай "Вешальнік". У прыватнасці, ён пісаў: "Край сей, при всем своем малом образовании, весьма медленно духом сближается с Россией, а в некоторых отношениях даже от оной отделяется".

Аднак, дзеля справядлівасці трэба сказаць, што ўжо ў той час у Расеі былі і такія палітыкі, якія разумелі злачыннасць праводзімай царскім рэжымам шавіністычнай палітыкі. Адным з найбольш вядомых прадстаўнікоў з іх быў Міхаіл Бакунін, які пісаў: "Я требую только одного, чтобы каждому народу, каждому малому и великому племени были предоставлены возможность и право самим решать свою судьбу… Бог с ней, с величавостью петровской, екатерининской, николаевской, заставивших российский народ выполнять роль палача… Мы искали силы и славы, а нашли бесславие, заслужили ненависть и проклятие придушенных нами народов. Благодаря Богу, двухвековая тюрьма - петровское государство - наконец разваливается. Мы же сами подталкиваем его в бездну. И свобода нам; свобода

героической Польше, свобода Беларуси, Литве, Украине".

Я прыношу прабачэнне за гэткую доўгую цытату, але думкі Бакуніна вельмі своечасовыя і павучальныя.

На жаль, не менш трагічным для Беларусі, як і для іншых народаў, аказаліся і гады панавання бальшавізму. Пачынаючы з канца 20-ых і да апошніх гадоў існавання СССР, ажыццяўлялась усё тая ж палітыка русіфікацыі народаў. А тыя, хто супраціўляўся гэтаму, абвяшчаліся "ворагамі народа" і адпраўляліся ў Сібір, на Салаўкі, а многія дзеячы Беларусі і зусім у "Курапаты", дзе ляжыць больш 200 тысяч чалавек. А на тэрыторыі Беларусі не адны гэткія "Курапаты". І тут нельга не пагадзіцца з рускім філосафам Мікалаем Бярдзяевым, што бальшавізм - гэта трэцяе з`ява рускай вялікарускасці, рускага імперыялізму. Першай, на яго думку, было Маскоўскай царства, другая з`ява - пятроўская імперыя.

Характэрызуючы самога Леніна, як стваральніка бальшавіцкай ідэалогіі, Бярдзяеў пісаў: "Ленин - антигуманист, как и антидемократ. В этом он человек новой эпохи, не только коммунистических, но и фашистких переворотов. Ленинизм есть вождизм нового типа, он выделяет вождя масс, который наделяется диктаторской властью. Это будут перенимать Муссолини и Гитлер. Сталин будет законченным типом вождя-диктатора. Ленинизм не есть, конечно, фашизм, но сталинизм уже очень подобно фашизму".

І сапраўды, бальшавізм у выглядзе сталінізму адрозніваецца ад фашызма толькі тым, што першы ішоў пад лозунгам гіпертрафіраванага класавага інтэрнацыяналізму, а нямецкі фашызм быў наскрозь пранізаны гіпертрафіраваным нацыяналізмам - нацызмам. У тактыцы ж яны - блізняты. Для адной і другой плыні галоўным была барацьба. Барацьба, а не стварэнне, - у гэтым заключаецца ўся іх сутнасць.

Давайце ўзгадаем, што адказаў Маркс на пытанне дачкі, - у чым ён бачыць сваё шчасце? - "У барацьбе", -адказаў бацька.

А як называлась галоўная праца Гітлера? - "Мая барацьба".

Барацьба - гэта тыя крылы, з дапамогай якіх бальшавіцкая і фашысцкая фантазіі аб нейкім прыносімым імі шчасці народам трымаліся высока над зямлёй, што не давала людзям магчымасці ўбачыць іх сапраўдную сутнасць.

Будучы крайнімі плынямі палітычнай думкі, бальшавізм і фашызм абавязкова павінны былі сысціся і падзяліць паміж сабою сферы ўплыву, што і было зроблена з дапамогай "пакта Молатава-Рыбінтропа".

Азіраючыся на гісторыю 6-гадовай даўніны, зноў-такі міжволі думаеш, колькі цынізму патрэбна было мець генсеку УКП(Б), каб падняць келіх за здароўе Гітлера, у той час, калі тысячы нямецкіх патрыётаў-камуністаў сядзелі ў турмах і чакалі свайго смяротнага часу.

Як можна было гэты ад пачатку да канца агрэсіўны пакт выдаваць за нейкае міралюбівае дзеянне?! Безумоўна, на гэта былі здольныя толькі злачынцы, розніца паміж якімі была толькі ў колеры афарбоўкі - чырвонай і карычневай.

Натуральна, што "пакт Молатава-Рыбінтропа" не мог быць даўгавечным, бо абедзве плыні ставілі сваімі мэтамі сусветнае панаванне: бальшавізм праз здзяйсненне сусветнай камуністычнай рэвалюцыі, а фашызм - праз стварэнне Трэцяга рэйха. Але свет толькі адзін. Таму абедзве гэтыя экстрэмісцкія плыні павінны былі сутыкнуцца паміж сабою. Абедзве павінны былі загінуць, як нежыццездольныя.

Аднак, будучы падобнымі на ракавую пухліну, агрэсіўнымі, яны пусцілі свае

метастазы. Адной з іх і з`яўляецца лукашызм - створаны ў Беларусі дыктатарскі рэжым, уяўляючы сабою спалучэнне фашызму, сталінізму і махровага папулізму. Не дарэмна Лукашэнка абраў для сябе кумірам Гітлера, а яго партрэты носяць побач з партрэтамі Сталіна.

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі скончыўся 20 ліпеня 1999 года. Рана ці позна перастане існаваць створаны ім дыктатарскі рэжым, як таксама нежыццездольны, бо галоўнай умовай яго існавання з`яўляецца таксама насілле і барацьба.

Аднак, пры гэтым важна ўлічыць урокі ўсё той жа гісторыі - Мюнхена і ”пакта Молатава-Рыбінтропа” і не даць рэцыдзіву дыктатарскага рэжыму развіцца. Лукашэнка ўжо не мае падтрымкі большасці народа Беларусі, бо, каб ён яе меў, пайшоў бы на перавыбары. Аднак ён карыстаецца падтрымкай многіх маскоўскіх палітыкаў. І беларускай апазіцыі прыходзіцца змагацца не толькі з лукашызмам, але і расейскім шавінізмам. У Маскве плануецца заключэнне “пакта Пуціна-Лукашэнкі”. Робіцца гэта за спіной беларускага народа. Мяркую, што аб гэтым не ведае і народ Расеі.

Прадастаўляючы Расеі крэдыты для правядзення рэформаў, заходнія краіны таксама ўскосным шляхам падпітваюць лукашызм і даюць яму магчымасць разрастацца на расейскай тэрыторыі, гэта значыць, там, дзе ёсць ядзерная зброя. І калі гэтага не прыпыніць, дык бяда беларускага народа можа стаць трагедыяй для Еўропы, незалежна ад прозвішча дыктатара, які будзе на чале аб`яднанай дзяржавы. Тым больш, што ў самой Расеі, як вядома, таксама ўстанаўліваецца дыктатарскі рэжым.

Паважаныя калегі!

Ва ўсё гэта не хацелася б верыць, але і недаацэньваць гэтага нельга. Не хочацца, каб развіццё грамадства зноў было затрымана, а тым больш каб рух яго быў павернуты назад. Развіццё дэмакратыі ў сусветным маштабе патрабуе як абарону правоў кожнага чалавека, так і стварэнне ўмоў для развіцця кожнага народа. І ў гэтай сувязі вельмі насцярожвае выказванне Лукашэнкі аб тым, што ён, маўляў, “Не павядзе свой народ за цывілізаваным светам”. Гэта яшчэ раз падкрэслівае, што аўтар гэтых слоў з`яўляецца чыста выпадковым кіраўніком нашага беларускага еўрапейскага народа.

Але, як я ўжо сказаў, тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў дыктатара скончыўся 20 ліпеня 1999 года і справа толькі часу. І я веру, Беларусь пазбавіцца ад гэтага антынароднага, па свайму складу і праводзімай палітыцы ў адносінах да беларускага народа акупацыйнага, дыктатарскага рэжыму.

Паслялукашэнкаўская Беларусь павінна быць незалежнай, дэмакратычнай і прававой дзяржавай. Эканамічнай асновай якой можа быць толькі шматукладная (з перавагай прыватнай уласнасці) рынкавая эканоміка.

Рэспубліка Беларусь павінна заняць сваё месца сярод іншых цывілізаваных дзяржаў і быць актыўным удзельнікам будаўніцтва нашага агульнага еўрапейскага дому.

Дзякуй за ўвагу.

# ЗВАРОТ ДА СУПРАЦОЎНІКАЎ ПРАКУРАТУРЫ, МІЛІЦЫІ І ІНШЫХ СІЛАВЫХ СТРУКТУР

Паважаныя сябры!

20 ліпеня 1999 года скончыўся тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А. Лукашэнкі.

Вынікам яго 5-гадовага кіраўніцтва сталі рэзкі спад жыццёвага ўзроўню людзей, беззаконне, нябачная дагэтуль карупцыя чыноўнікаў і міжнародная ізаляцыя Беларусі. Людзі ўсё больш і больш пачынаюць гэта разумець і пратэстуюць супраць таго становішча, у якім яны апынуліся.

У гэтай сувязі я звяртаюся да вас як да сумленных грамадзян нашай краіны:

Не прымяняйце сілы да сваіх суайчыннікаў, якіх выгнаў на вуліцу голад і холад. Яны змагаюцца за лепшую долю, у тым ліку для вас і вашых дзяцей!...

Не выконвайце злачынных загадаў, якія даюць вам ужо незаконныя пасля 20 ліпеня 1999 года ўлады!

Далучайцеся і дапамагайце дэмакратычна-патрыятычным сілам Беларусі!"

***("Народная воля", 19 кастрычніка 1999 года)***

KAMUNIKAT.ORG

# ЛУКАШЫЗМ – РАКАВАЯ ПУХЛІНА, ПУСЦІЎШАЯ МЕТАСТАЗЫ Ў СУСЕДНІЯ КРАІНЫ

*Сямён Георгіевіч, на Украіне Вы былі ў самы разгар выбарчай кампаніі. Якія вашыя сімпатыі? Наколькі вядома, запрасіў Вас Рух…*

Не хацеў бы ўмешвацца ва ўнутраныя справы Украіны. Самі вырашайце, за каго галасаваць. Скажу толькі адно: не дай Бог, выбераце таго, для каго ўзорам ці і ўвогуле іконай з`яўляецца Лукашэнка!

Хопіць таго, што мы ўжо напакутаваліся. Украінскі народ павінен быць удзячным свайму кіраўніцтву за тое, што яно захавала дзяржаву. У адрозненне ад Лукашэнкі, для якога суверэнітэт - разменная манета і які цягне беларусаў за панюшку табакі ў краіну, у якой ільецца кроў.

І ўсе гэтыя рашэнні ён прымае аднаасобна. Пасля антыдэмакратычнага рэферэндуму 1996 года ў Беларусі ўсталяваўся дыктатарскі антынародны рэжым з поўным, нічым не абмежаваным, самаўладдзем аднаго чалавека. Лукашэнка падмяў пад сябе увесь дзяржапарат, фактычна скасаваў правы і свабоды грамадзян, манапалізаваў сродкі масавай інфармацыі. Пад яго недраманым вокам прабываюць не толькі ТБ і радыё, але і недзе працэнтаў на 97 тыражу - друкаваныя сродкі масавай інфармацыі. Затое эканоміка - у поўным развале.

*Тым не менш у нас многія лічаць, што сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі лепшая, чым на Украіне. Напрыклад, таму што ў вашай краіне своечасова выплочваюцца пенсіі і заробак, а ў нас затрымліваюцца…*

Прыязджайце і паглядзіце на жыццё беларускіх пенсіянераў. Пенсіі сапраўды выплочваюцца. Але якія! Вось у мяне яе колькасць, да слова, складае 3,1 млн. беларускіх рублёў, а кілаграм каўбасы каштуе 2,5 млн. Мая мама атрымлівае 5,4 млн, што раўняецца 2 кілаграмам. А за малаком, ды і тое паўтарапрацэнтнай тлустасці, патрэбна дзяжурыць пад магазінам - раптам дастанецца. Як і ў савецкія часы, у нас мае месца таварны дэфіцыт. Нават калі ў каго і ёсць грошы, то яшчэ патрэбна знайсці, што за іх купіць. Людзям гэта не падабаецца, але дэманстрацыя незадавальнення ў нашай краіне - справа небяспечная.

Вось у вас, я бачу, вельмі многія незадаволены Леанідам Кучмам і адкрыта кажуць пра гэта. На Украіне, як я заўважыў пад час свайго візіту, Прэзідэнта чыхвосцяць удоўж і ўпоперак - і нікога за крытыку не саджаюць, парламент не разганяюць.

А ў нас незадаволеным адказваюць дубінкамі, падвяргаюць рэпрэсіям. Быў выпадак, глуханямога пратрымалі суткі ў міліцыі за тое, што ён… выкрыківаў антылукашэнкаўскія лозунгі. Бралі пачкамі - ну і яго загрэблі. Дзеці нешта напісалі на плоце супраць Лукашэнкі - дык і іх таксама павязалі.

Збіваюць людзей і за тое, што яны гавораць па-беларуску. У Менску - ніводнай школы, ніводнай вышэйшай навучальнай установы з беларускай мовай навучання. Не дзіўна: навуку і культуру ў нас курыруе палкоўнік расейскай арміі

Замяталін, КДБ узначальвае палкоўнік ФСБ РФ Урал Латыпаў.

Некаторыя палітычныя праціўнікі Лукашэнкі проста знікаюць. Першай у гэтым шэрагу стала старшыня Нацбанку Тамара Віннікава. Потым зніклі былы шэф МУС Захаранка, першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Віктар Ганчар. Улады лгуць, быццам яны з`ехалі за мяжу.

Лукашэнка здзяйсняе духоўны генацыд. Сумленне нацыі Васіль Быкаў жыве ў Хельсінкі. Старшыня Саюза пісьменнікаў Някляеў вымушаны пераехаць у Варшаву. Я зусім не добраахвотна жыву ў Літве - з тых часоў як атрымаў інфармацыю аб маім будучым арышце. А ў турмах ужо сядзяць экс-прэм`ер Чыгір, дэпутаты ВС Клімаў і Кудзінаў, міністр сельскай гаспадаркі Лявонаў, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы 75-гадовы Старавойтаў.

Сталінская пякельная машына адроджана і набірае абароты. Збілі сына Чыгіра, а ў самога прэм`ера рабіліператрус у кватэры. Пасадзяць, а потым па некалькі гадоў шукаюць, за што. Таго ж спадара Чыгіра апошні раз дапытвалі 12 красавіка. Дык навошта, узнікае пытанне, трымаць чалавека ў камеры?

Бізнесоўцы эміґравалі ці селі за рашотку. У краіне засталіся толькі тыя з іх, хто працуе на дыктатуру, добраахвотна ці вымушана.

*Калі Лукашэнка балатаваўся ў прэзідэнты, ён абяцаў пасадзіць прадстаўнікоў былой улады, аднак за рашоткай, атрымліваецца, апынуліся галоўным чынам тыя, хто яму дапамагаў прыйсці да ўлады...*

Маладыя хлопцы маглі адразу і не разабрацца, што гэта за фрукт. Бо Лукашэнка - майстра сацыяльнай дэмагогіі, ды такой, што сам Жырыноўскі можа адпачываць. Ён трымаў перад тэлекамерамі пустую, відаць, паперку і казаў, што перад ім спіс з 70-ці чалавек, якіх патрэбна арыштаваць. Чуліся падобныя пагрозы і на адрас тагачаснага прэм`ер-міністра Вячаслава Кебіча і яго першага намесніка Мясніковіча. Дарэчы, Мясніковіч сёння - правая рука Лукашэнкі, кіраўнік яго адміністрацыі. Авось Ганчар, які працаваў у штабе кандыдата Лукашэнкі, знік.

* * *

Тым не менш, кажуць, што простаму народу Лукашэнка па-ранейшаму сімпатычны...

А просты народ не чуе нікога, акрамя Лукашэнкі і лукашыстаў. Народу няма дзе выказацца. Таму ніхто не ведае, аб чым ён на самай справе думае. Калі б зараз правесці сапраўды дэмакратычныя выбары, Лукашэнка б іх, упэўнены, прайграў.

Лукашэнку ўжо цесна ў Беларусі. Ён хоча уладарыць над Расеяй - падобна таму, як аўстрыйскі яфрэйтар Шыкльгрубер імкнуўся стаць і стаў канцлерам вялікай Германіі! Дарэчы, ды будзе вам вядома, Лукашэнка публічна выказваў свае сімпатыі Гітлеру.

Гітлер сфармаваў магутную Германію дзякуючы магутнай прэзідэнцкай уладзе. Гэта былі 30-ыя гады, час вялікага крызісу ў Еўропе, а Германія паднялася дзякуючы магутнай уладзе, дзякуючы таму, што нацыя змагла кансалідавацца і аб`яднацца вакол лідэра.

І гэты чалавек хоча стаць на чале аб`яднанай расейска-беларускай дзяржавы. А ў Расеі ж ёсць людзі, якія падтрымліваюць яго вар`яцкія ідэі -

Бабурын, Селязнёў, Макашоў, Жырыноўскі. Яны хочуць праглынуць беларускую дзяржаву, пазбавіць беларусаў свайго дому, уласнай дзяржавы. Не магу на гэта глядзець без слёз. Мы ўсё будзем рабіць, каб гэта не ўдалося ні расейскім шавіністам, ні Лукашэнку.

Лукашэнку падтрымліваюць многія расейскія палітыкі. Акрамя таго, Менск з сяброўскімі візітамі наведалі, і тым самым падтрымалі дыктатарскі рэжым, прадстаўнікі фракцыі камуністаў парламента Украіны. Усё гэта сведчыць пра тое, што лукашызм - гэта не проста паводзіны неўраўнаважанага па свайму характару прэзідэнта Беларусі і яго прыспешнікаў, а грамадская і палітычная з`ява, якая стала набываць міжнародную сілу. Лукашызм - гэта рэцыдыў дыктатарскага рэжыму ў сучасных еўрапейскіх умовах, сумесь фашызму, сталіншчыны і махровага папулізму. І калі не зрабіць тэрміновых крокаў, то падобны на ракавую пухліну, ён не толькі замацуе сваю ўладу ў Беларусі, але і будзе ўвесь час імкнуцца пашырыць яе і на іншыя рэгіёны.

*Але, відаць, менавіта таму, што ў Расеі тыя палітыкі, ад якіх залежыць прыняццё рашэнняў, разумеюць, навошта Лукашэнку інтэграцыя, Масква да гэтага часу і не пайшла на аб`яднанне дзяржаў?*

Расея іматабалічная. Ёсць “Правое дело”, напрыклад, лідэры якога разумеюць небяспеку дыктатарскага рэжыму Лукашэнкі для іх краіны. Яны ведаюць, што ён хоча стаць прэзідэнтам Расеі. Яны ж бачаць, як у многіх рэгіёнах РФ левыя на сваіх мітынгах партрэты Лукашэнкі выносяць побач з партрэтамі Сталіна. Для іх, як і для нас, відавочна, што дыктатарскі рэжым Лукашэнкі ўжо не толькі падтрымліваецца за кошт недаплаты за пастаўленыя з Расеі нафту і газ, але і сам фінансуе многія кампаніі, накіраваныя на зрыў дэмакратычных рэформ. Яны разумеюць, што ў Лукашэнкі шанцаў стаць на чале вялікай дзяржавы нічуць не менш, чым іх было ў свой час у яго старэйшых братоў Гітлера і Сталіна.

* * *

*Як жа ж атрымалася так, што справа дайшла да відавочнай дыктатуры? Бо палітычны партрэт Лукашэнкі быў відавочны яшчэ ў 1994 годзе.*

У 1994 годзе Лукашэнка перамог на свабодных і дэмакратычных выбарах. І карыстаючыся аказаным яму даверам, павёў справу да ўсталявання дыктатуры. Галоўнай перашкодай на гэтым шляху быў парламент. Мы, безумоўна, рабілі намаганне пайсці на дыялог з прэзідэнтам. Але калі ён назваў дэпутатаў Вярхоўнага Савета рванню, для мяне стала зразумелым, што ні аб якім канструктыўным супрацоўніцтве з ім не можа быць і гаворкі. Парламент для Лукашэнкі як для любога дзяржаўнага дзеяча, які імкнецца стаць дыктатарам, з`яўляецца галоўнай перашкодай. Дыктатары не не трываюць ніякай апазіцыі.

Неабходнасць барацьбы з Вярхоўным Саветам тлумачылась ілжывымі сцвярджэннямі аб тым, што ВС перашкаджае правядзенню рынкавым пераўтварэнням. На самай жа справе, гаворка ідзе толькі аб жаданні атрымаць бескантрольную, нічым і нікім не абмежаваную ўладу. Дзеля гэтага падманвалі народ, абвінавачваючы Вярхоўны Савет у бяздзейнасці, сфабрыкавалі грубыя фальшыўкі супраць кіраўніцтва Вярхоўнага Савета і асобных дэпутатаў.

Выкарыстоўвалі шантаж і пагрозы. Справа дайшла да адкрытых правакацый. Гэтак, па тэлебачанню прагучала заява, быццам ВС пачаў назапашваць зброю.

Восенню 1996 года Лукашэнка правёў рэферэндум з грубымі парушэннямі Канстытуцыі і заканадаўства Беларусі, на якім была "адобрана" новая Канстытуцыя, а яго паўнамоцтвы "працягнуты" да 2000 года. Войскай у Менск на час рэферэндуму нагналі, як у ваенны час. Нават у ЦВК нікога не пускалі. Пры такім самавольстве можна было б і 120% набраць. А затым Лукашэнка разагнаў ВС і скляпаў паслухмяны парламент, які зараз складаецца не з абраных народам дэпутатаў, а з прэзідэнцкіх прызначэнцаў. Кіраўніка дзяржавы ніхто не крытыкуе і яго ініцыятывы падтрымліваюцца аданагалосна.

Усе 50 дэпутатаў Вярхоўнага Савета, не прызнаўшыя лукашэнкаўскага рэферэндуму, пазбаўлены працы. Дзяцей некаторых з іх павыключалі з ВНУ. Сына дэпутата Хоміча мелі намер пасадзіць у псіхушку. Праўда, пасля выправілі ў войска.

У апазіцыі да Лукашэнкі знаходзяцца ўсе партыі, якія не створаны асабіста прэзідэнтам і не фінансуюцца з яго кішэні - ад Беларускага Народнага Фронту да камуністаў.

Пры гэтым Вярхоўны Савет 13-га склікання, паўнамоцтвы якога сканчаюцца на пачатку 2001 года, з`яўляецца адзіным легітымным заканадаўчым органам улады. Ніводная структура не мае права падмінаць Вярхоўны Савет і прысвойваць сабе ягоныя функцыі. А паўнамоцтвы Лукашэнкі скончыліся ў ліпені 1999 года, яго абіралі на пяць гадоў, а рэферэндумам 1996 года нельга падмяніць прамых выбараў, тым больш, што ён, як я ўжо гаварыў, прайшоў з парушэннямі заканадаўства.

*Старшыня Вярхоўнага Савета Украіны Аляксандр Ткачэнка неаднаразова заяўляў аб сваіх сімпатыях да Лукашэнкі - у тым ліку і ў вераснёўскім інтэрв`ю "Ведомостям". У адказ на нашу рэмарку аб тым, што спадар Шарэцкі, відаць, па-іншаму ацэньвае Лукашэнку, Аляксандр Мікалаевіч адказаў: "Я Шарэцкага ведаю. Ён аграрый. Калі-нікалі крыўда туманіць розум. Я не думаю, што Лукашэнка не прапаноўваў Шарэцкаму пасаду. Ён, напэўна, ад яе адмовіўся. Але яму патрэбна паступіць так, як у свой час паступіў Мароз. Кансалідаваць залу і прыняць Канстытуцыю". Калі ласка, Ваш каментар.*

Ткачэнку павінна быць сорамна, калі ён так казаў. Безумоўна, Лукашэнка папаноўваў мне пасаду. Але я быў бы сволаччу, калі б прадаўся сінекуру.

***("Киевские новости", 21 кастрычніка 1999 года)***

# ЗАЯВА
# СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА
# РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Нельга без абурэння і болю ў сэрцы гаварыць аб тых падзеях, якія адбыліся 17 кастрычніка 1999 года ў горадзе Менску - сталіцы Рэспублікі Беларусь. На парозе трэцяга тысячагоддзя новай эры ў самым цэнтры Еўропы былі папраныя элементарныя правы і свабоды людзей, якія выйшлі на мітынг і дэманстрацыю “Марш Свабоды” у падтрымку перамоўнага працэсу паміж прадстаўнікамі працягваючых утрымліваць уладу структур і апазіцыйных ім дэмакратычных сіл, за суверэнітэт і незалежнасць Беларусі. Створаны А. Лукашэнкам дыктатарскі рэжым стаў на шлях правакацый ужо на стадыі рашэння пытання аб правядзенні “Маршу Свабоды” - было забаронена шэсце, а для мітынгу прызначана непрыдатная для гэткіх мэт плошча Багнгалор. Сам А. Лукашэнка, тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў скончыўся 20 ліпеня 1999 года, у чарговы раз абазваў прадстаўнікоў апазіцыйных яму сіл абразлівымі словамі.

Усё гэта груба парушае Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якая абвясціла чалавека найвышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы, дала права свайму народу на правядзенне і ўдзел у масавых мерапрыемствах, у тым ліку і для свабоднага выказвання нязгоды і пратэсту наконт праводзімай дзяржаўнымі стуктурамі палітыкі.

У час правядзення самога мерапрыемства, замест дыялогу са шматтысячнай калонай дэманстрантаў, якіх выгнаў на вуліцу голад і надыходзячы холад, бяспраўе і пастаянная знявага дзяржаўнымі чыноўнікамі, была зноў прыменена грубая сіла - дубінкі. Людзей білі, пачалі кідаць у турмы, падвяргаць непамерна вялікім штрафам за тое, што яны больш не хочуць цярпець таго жахлівага становішча, якое стварыў антынародны лукашэнкаўскі рэжым, падтрымліваемы расейскімі экстрэмістамі, якія, як і Лукашэнка, усё яшчэ мараць адрадзіць былы Савецкі Саюз з парадкамі казарменнага сацыялізму.

Дэманстранты заявілі, што яны хочуць жыць ва ўласнай беларускай дэмакратычнай дзяржаве і выказваюць свой рашучы пратэст супраць той авантуры - аб`яднанне Беларусі і Расеі ў адну дзяржаву, якую навязваюць беларускаму народа А. Лукашэнка і, на жаль, многія расейскія палітыкі шавіністычнага кшталту.

Асабліва хачу адзначыць, што рух за захаванне нацыянальнай годнасці і сваёй дзяржавы ўзяла ў свае рукі моладзь, а гэта азначае, што ён стаў непераможным.

У той час нельга не адзначыць і тое, што чарговае злачынства дыктатарскага рэжыму здзейснена пасля таго, як Кансультатыўна-Наглядальная Група АБСЕ па Беларусі (кіраўнік Ханс-Георг Вік) прыклала шмат намаганняў, каб пачаць перамоўны працэс паміж супрацьстаячымі сіламі, і пасля асабістай заявы дзеючага старшыні АБСЕ, міністра замежных спраў Нарвегіі Кнута Валебека ад 7 кастрычніка 1999 года, у якой ён заклікаў беларускія ўлады:

Даць пераканаўчыя тлумачэнні наконт знікнення першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Віктара Ганчара, бо гэта ўжо трэці нераскрыты выпадак знікнення аднаго з выбітных палітыкаў за апошні час;

Неадкладна спыніць пераслед незалежных газэт, таму што несумяшчальна з прынцыпамі дэмакратыі і перамовамі аб свабоднай магчымасці доступу ўсіх палітычных груповак да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі;

Вызваліць з-пад варты былога прэм`ер-міністра Міхаіла Чыгіра.

І цяпер ніякімі выдумкамі аб фінансаванні дэманстрантаў нібыта нейкімі замежнымі дзяржавамі нельга схаваць сутнасць антынароднага дыктатарскага рэжыму, які дзеля ўтрымання ўлады развязаў сапраўдную вайну супраць свайго народа і гандлюе самым дарагім для кожнага сумленнага грамадзяніна - суверэнітэтам дзяржавы.

Тыя падзеі, якія адбыліся 17 кастрычніка 1999 года і дзеянні пасля іх выканаўчых і судовых улад, яшчэ раз паказалі беларускаму народу і міжнароднай дэмакратычнай грамадскасці, што правячы ў Беларусі рэжым у чарговы раз груба растаптаў усе абавязацельствы, якія ён даваў 54 дзяржавам - членам АБСЕ. І ніякія перамовы не могуць праводзіцца ва ўмовах узмацнення рэпрэсій у адносінах да кіраўнікоў і актывістаў палітычных партый, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый, ізаляцыі апазіцыі ад дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, утрымання ў турмах і "знікнення" апанентаў, якія не падабаюцца рэжыму, да абароны правядзення дэманстрацый і пікетаў, аб чым ужо заяўляў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 8 кастрычніка 1999 года.

Дэмакратычныя сілы Беларусі будуць і далей рабіць усё неабходнае для захавання дзяржаўнага суверэнітэту і вяртання сваёй краіны на шлях дэмакратычнага развіцця ў агульны еўрапейскі дом. І ў гэты мы спадзяёмся на падтрымку ўсіх дэмакратычных дзяржаў.

Няхай жыве Незалежная, Дэмакратычная Рэспубліка Беларусь!

***("Народная воля", 26 кастрычніка 1999 года)***

# АСАБЛІВАСЦІ ДЫКТАТУРЫ І ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ

**Выступ у Бергене (Нарвегія) на семінары фонда ім. Прафесара Тгоральфа Рафта, 29 кастрычніка 1999 года**

Засталося ўжо няшмат часу і чалавецтва будзе развітвацца з апошнім векам другога тысячагоддзя новай эры. Адыходзячы век стаў векам шматлікіх навуковых адкрыццяў і тэхнічных вынаходніцтваў, якія ўзброілі чалавека ўнікальнымі электроннымі прыладамі і вылічальнай тэхнікай, ядзернай энэргіяй, спадарожнікамі, адкрылі таямніцы невядомых да гэтых часоў хімічных рэакцый і біялагічных працэсаў, што, у сваю чаргу, узняло развіццё вытворчых сіл на якасна новы ўзровень. Зараз у высокаразвітых краінах простай фізічнай працай занята зусім невялікая колькасць людзей, а астатняя іх частка займаецца вырашэннем задач, звязаных з далейшым развіццём навукова-тэхнічнага прагрэса і паляпшэннем умоў працы людзей, працяглацю іх жыцця, павышэннем матэрыяльнага дабрабыту і духоўным развіццём.

У галіне грамадскага развіцця адыходзячы век паказаў, спачатку на прыкладзе асобных краін, а пасля і цэлых рэгіёнаў свету, што для змянення галоўнай мэты развіцця вытворчасці - стварэнне дадатковай вартасці на мэту задавальнення пастаянна растучых патрэбаў усё большай колькасці жыхароў краіны не патрэбны сацыяльныя рэвалюцыі. Дасягнуць такіх змяненняў можна эвалюцыйным шляхам. Прыкладам гэтаму сталі ўвядзенне “новага курсу” Рузвельта ў ЗША, пасляваеннае развіццё многіх краін Заходняй Еўропы, Канады, Скандынаўскіх краін, Японіі і многіх іншых.

На жаль, Расея пайшла развівацца шляхам рэвалюцыі і пацягнула за сабою ўсе былыя ў той час у залежнасці ад яе народы.

У высокаразвітых краінах чалавек з яго патрэбнасцямі, правамі і свабодамі становіцца вышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы. Прыкладам гэтаму з`яўляецца і створаны фонд Тгоральфа Рафта, дзякуючы якому і знаходзімся сёння на дадзеным семінары.

Ад імя беларусаў я хачу сказаць шчырае беларускае дзякуй кіраўнікам Фонда, яго прэзідэнту пану Грыгу і арганізатарам дадзенага семінара за праяўленую цікавасць да нашай рэспублікі, сумеражыванне беларускай бядзе і падтрымку беларусаў у цяжкую гадзіну іх жыцця.

Паважаныя ўдзельнікі дадзенага мерапрыемства!

Дваццаты век вызначыўся і масавым стварэннем новых незалежных нацыянальных дзяржаў. У ліку першай з іх патрэбна назваць краіну - Нарвегію, якая ў 1905 годзе скасавала унію са Швецыяй і стала незалежнай. Новай хваляй стварэння незалежных нацыянальных дзяржаў стаў распад Савецкага Саюза. Дарэчы, Савецкі Саюз, як спадкаемца Расейскай імперыі, разваліўся найперш усяго з-за неканкурэтнасці яго эканомікі.

Галоўным пабуджальным матывам стварэння нацыянальных дзяржаў з`яўляецца тое, што толькі дзяржаўнасць забяспечвае рашэнне ў поўнай меры такіх агульнанацыянальных задач, як абарона сваёй тэрыторыі і абарона нацыянальных інтарэсаў на міжнароднай арэне, недатыкальнасць правоў асобы і яе маёмасці, рацыянальнае выкарыстанне прыродна-эканамічных і людскіх рэсурсаў дзеля

дабрабыту карэннага насельніцтва дадзенай тэрыторыі, арганізацыя сацыяльнага забеспячэння людзей, а таксама, што з`яўляецца не менш важным, атрыманне адукацыі на роднай мове і развіццё нацыянальнай мовы і развіццё нацыянальнай мовы і культуры, распрацоўку і прыняццё законаў у справе падтрымкі парадку з улікам нацыянальных традыцый і склаўшайся стагоддзямі псіхалогіі карэннага народа.

У шматнацыянальнай дзяржаве заўсёды ёсць тытульная нацыя, якая хоча падпарадкаваць сабе ці проста праглынуць іншыя нацыі. Прыкладам таму быў Савецкі Саюз, дзе пры развіцці культур уваходзячых у яго народаў на першы план высоўваўся нейкі агульны сацыялістычны змест, які з часам стаў патрабаваць і агульнай формы выказвання. На практыцы гэта прывяло да таго, што многія народы, у тым ліку і беларускі, сталі губляць сваю родную мову, свае нацыянальныя традыцыі і звычкі.

Такім чынам, без забеспячэння правоў народа на стварэнне сваёй нацыянальнай дзяржавы нельга ў поўнай меры забяспечыць правы і свабоды чалавека, хаця апошнія і з`яўляюцца шчытом ад пасягальніцтва на асобу самой дзяржавай. Таму распад Савецкага Саюза, як спадкаемцы расейскай дзяржавы, на шэраг нацыянальных дзяржаў патрэбна лічыць прагрэсіўнай з`явай.

У стварэнні і захаванні сваіх нацыянальных, дэмакратычна развіваючыхся дзяржаў зацікаўлены ўсе прадстаўнікі нацыі, як жывучыя на тэрыторыі яе кучнага пасялення, гэтак і на тэрыторыі іншых дзяржаў, бо нацыянальная дэмакратычная дзяржава, як родная маці, павінна клапаціцца аб забеспячэнні правоў і свабод усім сваім сынам і дочкам, незалежна ад месца іх пражывання. Гэта вельмі добра бачна на прыкладзе дзяржавы Ізраіль, якую кожна габрэй, дзе б ён ні жыў, лічыць сваёй, а яна, у сваю чаргу, з`яўляецца апірышчам для ўсіх габрэяў.

Адыходзячы век застанецца ў гісторыі і як век буйных прыродных катаклізмаў (паводкаў, разбуральных ураганаў і спяпляючых усё на сваім шляху лясных пажараў, землятрусаў), паказаўшы тым самым яшчэ слабасць чалавецтва перад прыроднай стыхіяй. Гаворачы аб катастрофах, асобным радком хацеў бы таксама адзначыць тыя незлічоныя беды, якія абрынуліся на чалавецтва ў сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Больш за ўсіх ад гэтай катастрофы пацярпела Рэспубліка Беларусь. І цяжка сказаць, што б здарылася з нашым народам, каб не міжнародная дапамога і самаахвярнасць саміх, на шчасце многіх беларускіх грамадзян, якія добраахвотна ўзяліся за выратаванне людзей, і перш за ўсё дзяцей. Адзін з гэткіх актывістаў - гэта Генадзь Уладзіміравіч Грушавы. І мне, як кіраўніку парламента, вельмі прыемна павіншаваць яго з высокай узнагародай, тым больш, што ён з`яўляецца і дэпутатам парламента.

XX век - гэта век двух сусветных войнаў, у час якіх усе дасягненні навукі і тэхнікі былі пастаўлены не на задавальненне патрэбаў людзей, а на іх знішчэнне, што сведчыць ужо аб праяўленні дзікасці і цемрашальства многіх палітыкаў.

Больш таго, у XX веку чалавецтва нарадзіла, мабыць, самыя экстрэмісцкія за ўсю сваю гісторыю дыктатарскія рэжымы - бальшавізм і фашызм, якія з`яўляюцца адлюстраваннем адзін аднаго.

Характарэзуючы Уладзіміра Леніна як стваральніка бальшавіцкай ідэалогіі і заснавальніка бальшавіцкай партыі, рускі філосаф Мікалай Бярдзяеў пісаў: “Ленин - антигуманист, как и антидемократ. В этом он человек новой эпохи, не только коммунистических, но и фашистских переворотов. Ленинизм есть вождизм нового типа, он выделяет вождя масс, который наделяется диктаторской властью. Это будет

перанимать Муссолини и Гитлер. Сталин будет законченным типом вождя - диктатора. Ленинизм не есть, конечно, фашизм, но сталинизм уже очень подобен фашизму".

І сапраўды, адрозненнем бальшавізму ў выглядзе сталінізму ад фашызму з`яўляецца толькі тое, што бальшавізм ішоў пад лозунгам гіпертрафіраванага класавага інтэрнацыяналізму, а фашызм быў наскрозь пранізаны гіпертрафіраваным нацыяналізмам - нацызмам. А ў якасці сваёй стратэгіі і тактыцы яны блізняты. Абедзве названых плыні ставілі ў якасці сваёй статэгічнай мэты сусветнае панаванне: бальшавізм праз здзяйсненне і экспарт сусветнай камуністычнай рэвалюцыі, а фашызм - праз стварэнне Трэцяга рэйха. Галоўным сродкам дасягнення пастаўленай мэты адзін і другі лічылі барацьбу. Барацьба і развязванне войн, а не стварэнне - у гэтым заключаецца ўся сутнасць і бальшавізму і фашызму.

Акрамя галоўнага сродку дасягненяя сусветнага панавання, барацьба з`яўляецца і тымі крыламі, з дапамогай якіх бальшавіцкая і фашысцкая фантазіі аб нейкім прыносімым імі шчасці сваім народам трымаліся высока над зямлёю, што не давала многім людзям магчымасці ўбачыць і разгледзець іх сапраўдную сутнасць.

Беларусі, на жаль, прыйшлося у поўнай меры паспытаць гэтае "шчасце" і ад бальшавізму і ад фашызму. Сведчаннем таму з`яўляюцца размешчаныя амаль побач "Курапаты", дзе ў гады савецкай улады работнікамі КДБ было знішчана больш 200 тысяч чалавек, і "Трасцянец", дзе быў арганізаваны лагер смерці фашыстамі. А калі да сказанага дадаць стогадовае вытраўліванне беларускасці царскім рэжымам, стане вядома, чаму многія беларусы лічаць сябе "Тутэйшымі". А зараз факты: па апошняму перапісу 1989 года, нягледзячы на ўсю трагедыю, 80% насельніцтва запісаліся не "тутэйшымі", а беларусамі (!).

Агульнымі для бальшавізму і фашызму з`яўляецца мілітарызацыя эканомікі, прывядзенне ўсіх бакоў чалавечага жыцця да заранёў вызначаных стандартаў, нецярпімасць да іншадумцаў і, як ужо было сказана, перабольшванне ролі правадыра, які, на думку Гітлера, нараджаецца "у краіне толькі раз у вельмі вялікі адрэзак часу". Будучы крайнімі плынямі палітычнай думкі і грамадскага развіцця, бальшавізм і фашызм абавязкова павінны былі спачатку сысціся, а пакуль не набралі сілу, падзяліць паміж сабою сферы ўплыву. Вынікам гэтага сталі змова Гітлера і Сталіна і падпісанне "пакта Молатава-Рыбінтропа".

Аднак, ставячы перад сабою адную і тую ж стратэгічную мэту - сусветнае панаванне, бальшавізм і фашызм павінны былі абавязкова сутыкнуцца паміж сабою, што і адбылося ў гады Другой сусветнай вайны.

Абедзве плыні павінны былі рана ці позна згінуць, бо як адна, так і другая былі рэакцыйнымі і імкнуліся павярнуць кола гісторыі назад, вялі масавае знішчэнне найбольш адукаванай і духоўна развітай часткі чалавецтва, для чаго выкарыстоўвалі ўсю моц навукова-тэхнічнага прагрэсу. Усё гэта рабіла іх нежыццездольнымі і паднімала супраць іх усю свядомую частку грамадства ў многіх краінах.

Але, будучы ракавай пухлінай на целе чалавецтва, абодва дыктатарскіх рэжымы імкнуліся пусціць метастазы. І, на жаль, ім гэта ўдалося зрабіць. Скажам, бальшавізм праявіўся не толькі ў Савецкім Саюзе ў выглядзе ленінізма і сталіншчыне, але ў выглядзе хаджарызма ў Албаніі, ракашызма ў Венгрыі, дыктатуры Чаушэску ў Румыніі, дыктатуры Кім Ір Сена ў Карэі, палпотаўшчыны ў Кампучыі і ў шэрагу іншых краін, хаця трохі ў менш агрэсіўных формах.

У самім жа Савецкім Саюзе першыя спробы нанесці ўдар бальшавізму былі

здзейснены, як вядома, у час так званай “Хрушчоўскай адлігі”. Але, праіснаваўшы некалькі дзесяцігоддзяў, знішчыўшы за гэты час найбольш супраціўляемую яму частку грамадства, бальшавізм адносна лёгка затлуміў мазгі і атруціў розум мільёнаў малаадукаваных людзей, у выніку чаго апошнія страцілі веру ў сябе і сталі чакаць новай цвёрдай рукі для кіравання дзяржавай. І бальшавізм стаў зноў адраджацца ў Савецкім Саюзе ў выглядзе брэжнеўшчыны, якая па сваёй сутнасці была састарэлай сталіншчынай.

Ішлі гады… Усё больш відавочным стала бачна ўся згуба створанага па бальшавіцкаму ўзору казарменнага сацыялізму. Само жыццё патрабавала карэннай перабудовы ўсіх сфер грамадскага развіцця: эканомікі, палітычнай сістэмы, прававых нормаў і маралі. І тут, безумоўна, нельга не адзначыць вялікую заслугу Міхаіла Гарбачова, прычым, на мой погляд, не столькі ў тым, што ён свядома шмат зрабіў для знішчэння бальшавізму, а хутчэй у тым, што ён першы з кіраўнікоў Саюза адкрыта сказаў аб тупіку, у які завёў грамадства бальшавізм, і стаў на кожным кроку агітаваць за перабудову. А далей, не ведаючы, як кіраваць працэсам перабудовы і што для гэтага трэба рабіць, ён стварыў умовы для стыхійнага развіцця працэса, у выніку чаго спачатку разваліўся так званы сацыялістычны лагер, а пасля, супраць волі галоўнага прараба перабудовы, разбурыліся КПСС і сам Савецкі Саюз, як носьбіт і аплот бальшавізму.

Аднак, хвароба грамадства ў гэтай частцы планеты зайшла надта далёка. Таму дыктатарскі рэжым стаў адраджацца ў выглядзе новых метастазаў, адной з якіх і з`яўляецца лукашызм, створаны ў Беларусі дыктатарскі рэжым. Лукашызм уяўляе сабою спалучэнне фашызму, сталіншчыны і махровага папулізму. Аднак, па сваёй сутнасці ён больш падобны да фашызму. Менавіта таму 3 лістапада 1995 года Лукашэнка ў інтэрв`ю нямецкай газэце “Хандэльсблат” сказаў: “Немецкий порядок формировался столетиями. При Гитлере это фомирование достигло наивысшей точки. Это то, что соответствует нашему пониманию президентской и роли в ней президента”. І далей Лукашэнка ўдакладніў: “Гитлер сформировал сильную Германию благодаря сильной президентской власти… Это были тридцатые годы, время большого кризиса в Европе, а Германия поднялась, блягодаря сильной власти, благодаря тому, что нация смогла консолидироваться и объединиться вокруг лидера”. Сказана шчыра і зразумела, але бязграматна; бо Гітлер ніколі не быў прэзідэнтам, і Лукашэнку, які мае дыплом гісторыка, патрэбна было гэта ведаць.

Усе наступныя крокі Лукашэнкі і дзеянні створанага ім рэжыму падцвярджаюць шчырасць сказаных ім у той дзень слоў. Стопрацэнтная манапалізацыя электронных сродкаў масавай інфармацыі і больш чым дзевяноста працэнтаў тыражу газэт і часопісаў; паралізацыя працы абранага народам Вярхоўнага Савета і стварэнне, замест яго, сваім указам, па тыпу існаваўшага ў час фашызму ў Італіі фашыстоўскага савета, зусім бяспраўнага так званага Нацыянальнага Сходу; падпарадкаванне ўсіх судоў; стварэнне магутнага паліцэйскага апарату; арганізацыю сваім указам антыканстытуцыйнага ваенізаванага падраздзялення і надзяленне яго правам урывацца без рашэння суду і санкцыі пракурора ў любое памяшканне з мэтаю правядзення там ператрусу, а таксама правам затрымання і заключэння любога чалавека пад варту; бескантрольнае распараджэнне значнай, таксама бескантрольна накапліваемай сумай грашовых сродкаў; увядзенне па сутнасці забароны на правядзенне мітынгаў і дэманстрацый грамадзян; жорсткі кантроль за дзейнасцю палітычных і грамадскіх арганізацый; нецярпімасць да іншадумства - вось няпоўны

пералік рысаў, характэрызуючых лукашызм як разнавіднасць дыктатарскага рэжыму, які ўстаноўлены ў Беларусі пасля здзяйснення Лукашэнкам у лістападзе 1996 года пад выглядам так званага рэферэндуму дзяржаўнага перавароту.

На практыцы ўсё гэта выліваецца ў катастрафічнае збядненне насельніцтва, свавольства чыноўнікаў, міліцыі і іншых сілавых структур, заключэнне ў турмы і знікненне незгодных з рэжымам людзей.

У сучасны момант сярод находзячыхся ў турмах па палітычных матывах з`яўляюцца чатыры дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь: Уладзімір Кудзінаў, Андрэй Клімаў, Валер Шчукін і Анатоль Лябедзька, былы прэм`ер-міністр рэспублікі Міхаіл Чыгір, былы міністр сельскай гаспадаркі Васіль Лявонаў, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі, 75-гадовы Васіль Старавойтаў, старшыня сацыял-дэмакратычнай партыі Мікалай Статкевіч.

Зніклі вядомая былая старшыня Нацбанку Тамара Віннікава, былы міністр унутраных спраў Юры Захаранка, першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Віктар Ганчар, бізнесовец Анатоль Красоўскі і некаторыя іншыя. Аб жорсткасці рэжыму гавораць і апошнія факты: везучы ў машыне узятых на дэманстрацыі 17 кастрычніка людзей, АМАП збіваў і ў той жа час прымушаў іх спяваць.

Для апраўдання сваіх дзеянняў рэжым выкарыстоўвае ўжо апрабаваныя бальшавізмам метады: хлусню, двудушша, падман. Дарэчы, на перыядычна наладжваемых рэжымам ваенных і фізкультурных парадах, маніфестацый партрэты Лукашэнкі выносяцца побач з партрэтамі Сталіна, пры гэтым зазначу, што ўжо не толькі ў Беларусі, але і ў асобных гарадах Расеі.

Сёння Лукашэнка і яго паплечнікі ўжо ўзялі курс на адраджэнне Савецкага Саюза з яго парадкамі казарменнага сацыялізму, асновай для якога, па іх меркаванню, павінна стаць аб`яднанне Беларусі і Расейскай Федэрацыі ў адну дзяржаву. І самае страшнае заключаецца ў тым, што гэтыя маніякальныя замашкі Лукашэнкі падтрымліваюцца многімі палітыкамі Расеі, і найперш кіраўніцтвам КПРФ. Камуністычная Дума ў Расеі вітае Лукашэнку стоячы, і над гэтым патрэбна сур`ёзна падумаць!!! Больш таго, Менск стаў цэнтрам прыцягнення экстрэмісцкіх цэнтраў і іншых краін. Вядома, што Лукашэнка наведаў і выразіў падтрымку Мілошавічу. Кажучы аб гэтым, нельга не задумацца: а ці паехаў бы ён аказваць дапамогу Мілошавічу з пустымі рукамі, калі б ў яго распараджэнні была ядзерная зброя?

Дзеля задавальнення шавіністаў створаны ў Беларусі рэжым здзяйсняе над беларускім народам па сутнасці духоўны генацыд - у рэспубліцы няма ніводнай навучальнай установы, якая б працавала на беларускай мове, у сталіцы рэспублікі - горадзе Менску няма ніводнай беларускай школы, засталіся ў некаторых школах толькі асобныя класы. З-за пастаяннай траўлі па палітычных матывах вось ужо цягам доўгага часу жыве ў Хельсінкі вядомы ва ўсім свеце беларускі пісьменнік Васіль Быкаў, папрасіў палітычнага прытулку ў Польшчы старшыня Саюзу пісьменнікаў Беларусі Някляеў. Пераводзяць свае капіталы і з`язджаюць за мяжу беларускія бізнесоўцы. І ўсё гэта таму, што беларускую культуру, навуку і асвету курыруе віцэ-прэм`ер - палкоўнік, расіянін па пашпарце Уладзімір Замяталін. Другім віцэ-прэм`ерам і міністрам замежных спраў Беларусі з`яўляецца таксама палкоўнік ФСБ, таксама расіянін - Урал Латыпаў. Расейскія генералы ўзначальваюць у Беларусі міністэрства абароны і міністэрства ўнутраных спраў. Беларусам рэжым не давярае з-за страху,

што злачынныя загады не будуць выконвацца. І, безумоўна ж, апублікаваная ў друку дамова аб аб`яднанні Беларусі і Расейскай Федэрацыі з`яўляецца прамым насіллем над воляй беларускага народа, які, як і іншыя народы, хоча мець сваю нацыянальную дзяржаву. Дарэчы, у Расеі ўжо пачалося абмеркаванне дамовы, нягледзячы на ўсе пратэсты з боку вядомых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, выступы моладзі, адсутнасць элементарных умоў для абмеркавання дамовы ў Беларусі.

Скажам, выступае па тэлебачанню Мікалай Ганчар - дэпутат Расейскай Дзярждумы і ў якасці аргумента неабходнасці аб`яднання Беларусі і Расеі ў адну дзяржаву прыводзіць тое, што нібыта ў беларускага і рускага народаў адна мова. А я і мае калегі па апазіцыі лукашэнкаўскаму рэжыму можам запытаць у названага шавініста: “Паважаны цемрашал (бо інакш яго назваць нельга), ці бралі вы ў рукі кнігі Якуба Коласа і аднаго з самых чытаемых у свеце пісьменнікаў Васіля Быкава? Ці ж яны напісаны на той мове, што і кнігі Пушкіна і Лермантава?”

Не магу не сказаць, хаця, як нарадзіўшыся ў праваслаўнай сям`і, раблю гэта з жалем, аб шавінізме Рускай праваслаўнай царквы, патрыярх якой Алексій ІІ узнагародзіў чалавека, які сваім кумірам лічыць праклятага светам забойцу Адольфа Гітлера вышэйшым сваім ордэнам. Праваслаўная царква ўганаравала сваёй узнагародай Лукашэнку як аб`яднальніка славян.

Такім чынам, калі гаварыць шчыра, дык Расеяй здзяйсняецца па сутнасці прамая агрэсія і гвалтоўная інкарпарацыя Беларусі ў Расейскую Федэрацыю і, не дай Бог, гэта здзейсніцца, на тэрыторыі былога СССР з`явіцца новы ачаг кравапраліцця, бо беларусы будуць адстойваць свае права на захаванне незалежнай нацыянальнай дзяржавы ўсімі даступнымі ім сродкамі, у тым ліку і ваеннымі, калі іх да гэтага прымусяць. І тут зноў-такі не трэба забываць гісторыю. Усе гады царскай акупацыі - гэта гады бесперапыннай барацьбы беларусаў за сваю незалежнасць. Аб высокім асэнсванні беларусамі сваёй нацыянальнай годнасці гаворыць і той факт, што першыя ўдары сталінскіх рэпрэсій былі скіраваны на ліквідацыю нацыяналізма ў Беларусі.

Паважаныя ўдзельнікі нашага форуму!

Як ужо было сказана, тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі скончыўся 20 ліпеня 1999 года. Ён не мае ўжо падтрымкі і ў большасці народа Беларусі. Каб ён яе меў, як аб гэтым гавораць яго паплечнікі і нанятыя, высока аплочваемые ім журналісты, ён пайшоў бы на выбары і не баяўся б ніякіх дэманстрацый і мітынгаў, дапусціў да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі сваіх апанентаў.

Аднак, нічога гэтага няма. Наадварот, як паказалі падзеі 17 кастрычніка ў Менску, ёсць іншае - народ не хоча, а дакладней ужо не можа больш цярпець таго цяжкага становішча, у якое завёў яго дыктатарскі рэжым Лукашэнкі. І ў гэтым супраціўленні народа таксама залог таго, што рана ці позна гэты рэжым пацерпіць пагібель. Ён, як і яго прабацькі - бальшавізм і фашызм, з`яўляецца таксама нежыццездольным, бо галоўным спосабам яго існавання з`яўляецца таксама барацьба і разбурэнне, а не стварэнне. Прычым, лукашызм пакуль што вядзе барацьбу са сваім народам, гэта значыць робіць тое, чым займаліся на першапачатковых стадыях развіцця бальшавізм і фашызм - знішчалі іншадумцаў і небяспечных для сябе апанентаў.

Таму вельмі важна улічыць урокі гісторыі (я маю на ўвазе Мюнхенскае пагадненне і “пакт Молатава-Рыбінтропа”) і не даць рэцыдыву дыктатарскага рэжыма разрасціся і здзейсніць цяжкія злачынствы перад чалавецтвам. Справа ў тым, што

лукашызм карыстаецца сёння не толькі спачуваннем, палітычнай і маральнай падтрымкай многіх расейскіх палітыкаў, але і матэрыяльна падкормліваецца за кошт Расеі, той самай Расеі, дзе шавіністычны настрой настолькі развіты, што чым больш ахвяраў у Чачні, тым вышэй падымаецца рэйтынг палітыка Пуціна, які з`яўляецца адным з самых актыўных пачынальнікаў новай бойні супраць народа гэтай рэспублікі. Гэта проста жахліва, але так.

Атрымліваючы ад заходніх краін крэдыты і беззваротную дапамогу на ажыццяўленне рэформ, Расея адначасова атрымлівае магчымасць шчодра дзяліцца усім гэтым з рэжымам Лукашэнкі. Напрыклад, спісаў Парыжскі клуб Расеі доўг у суме 4,2 млрд. долараў, і прыехаўшы ў Менск усё той жа Пуцін таксама падарыў рэжыму Лукашэнкі 300 млн. долараў... Звярніце ўвагу - перадаў асабіста, без рашэння Дзярждумы. Ці ж гэта не прыкмета дыктатуры? Добра б, каб на падтрымку беларускага народа, а то ж дыктарскага рэжыма.

Падкормліваемы такім чынам лукашысцкі рэжым мае магчымасць падтрымліваць, хаця і ў занядбалым стане, вытворчасць і выплочваць нейкі мінімум пенсій, стыпендый, утрымліваць велізарны карны апарат. А ў самой Расеі ўжо ствараецца бачнасць нейкага дабрабыту, створанага ў Беларусі лукашэнкаўскім рэжымам. А калі да гэтага дадаць яшчэ і сацыяльную дэмагогію, майстрам якой з`яўляецца Лукашэнка і падабраныя, спецыяльна абучаныя гэтаму людзі, дык і сам Лукашэнка становіцца пажаданым госцем у многіх рэгіёнах Расеі, што ўвогуле і патрэбна для задавальнення сваіх уладалюбівых амбіцый - стаць прэзідэнтам аб`яднананй дзяржавы.

Але нельга пры гэтым забываць, што на тэрыторыі Расейскай Федэрацыі ёсць ядзерная зброя і, не дай Бог, яна патрапіць у распараджэнне гэткага псіхалагічна неўраўнаважанага, эпілептоіднага тыпу дыктатара, якім з`яўляецц Лукашэнка, - бяда, якую перажывае сёння беларускі народ, можа стаць трагедыяй перш за ўсё для Еўропы. Узгадаем, што гэтым летам праходзілі сумесныя расейска-беларускія армейскія штабныя вучэнні, у час якіх адпрацоўвалася заняцце расейскімі войскамі Латвіі і Эстоніі, а беларускімі - Літвы. Усё гэта рабілася, на шчасце, на тапаграфічных мапах. Але ўсё гэта наводзіць на цяжкія роздумы. Менавіта таму, пакуль не позна, мы, беларускія палітыкі дэмакратычнага кшталту, і імкнемся як можна больш даходліва і грунтоўна паказаць, што ўсё тое, чым жывуць і што робяць Лукашэнка і яго паплечнікі, найперш у Расеі, з`яўляецца ў канцы XX стагоддзя ненатуральным і зусім не бяспечным не толькі для Беларусі, але і народаў Еўропы. Захад павінен разумець, што незалежнасць Беларусі і вяртанне яе на дэмакратычны шлях развіцця - гэта бяспека і нашых суседзяў ды Еўропы ў цэлым.

Дзякуй за ўвагу!

***(Змест выступу надрукаваны***
***ў газэце “Рунь”, 13 снежня 1999 года)***

# ДА ЧАГО ПРЫВОДЗІЦЬ ПАТУРАННЕ ДЫКТАТАРАМ

**Вынікі Стамбульскага саміту АБСЕ**

Кажуць, чалавецтва развіваецца па спіралі, і на новым вітку ўсё паўтараецца. Шматлікія прыклады з нашага жыцця падцвярджаюць гэта.

У верасні 1938 года на канферэнцыі ў Мюнхене, у якой узялі ўдзел прэм`еры Францыі і Англіі Даладзьё і Чэмберлен, верхаводы фашыстоўскіх Нямеччыны і Італіі Гітлер і Мусаліні, а таксама дэлегацыя Чэхаславаччыны, былі задаволеныя патрабаванні Гітлера аб новым пашырэнні тэрыторыі Трэцяга рэйху. (Першае такое пашырэнне адбылося ў сакавіку 1938 года за кошт далучэння Аўстрыі). На гэты раз было вырашана перадаць Нямеччыне Судэцкую вобласць, што належала Чэхаславаччыне. Прычым у апошняй згоды не пыталіся. Яе дэлегацыя прысутнічала толькі для таго, каб заслухаць прысуд “магутных свету”. І ўсё гэта рабілася з маўклівай згоды Лігі нацыяў, створанай у 1919 годзе з мэтаю абмежавання зброі, узаемнай гарантыі тэрытарыяльнай цэласці і незалежнасці членаў Лігі, барацьбы з агрэсарамі. Нямеччына пакінула Лігу яшчэ ў кастрычніку 1833-га года. Каб не звязваць сабе рук.

Калі кіраўнікі дзяржаў вярнуліся дамоў, і ангельцы запыталіся ў 69-гадовага і вельмі асцярожнага кіраўніка свайго ўраду, якія навіны ён прывёз з Мюнхена, Чэмберлен іх запэўніў: “ Я прынёс мір нашаму часу”.

Узрушаны гэткай палітыкай патурання агрэсару Чэрчыль сказаў:“ Гэта толькі пачатак расплаты. Гэта толькі першы глыток з горкае чары, якая будзе прапанаваная нам з дня на дзень”.

Пасля “Мюнхенскай згоды” быў “пакт Молатава-Рыбінтропа”, у часе падпісання якога яшчэ адзін дыктатар - Сталін - прапанаваў падняць келіх шампанскага за здароўе Гітлера як лідэра, быццам бы падтрыманага большасцю нямецкага народу. Два дыктатары ўступілі ў змову і падзялілі паміж сабою сферы ўплыву ў Еўропе.

Чым скончылася тагачасная палітыка “прымірэння” з дыктатарамі і задавальнення іх патрабаванняў, добра вядома.

Нешта падобнае, толькі на новым вітку спіралі, адбываецца і ў нашыя дні. Сведчанне таго - радасць шавіністычных колаў Расеі, з якой яны ўспрымаюць кожнае паведамленне пра захоп усё новых населеных пунктаў Чачні. Гаворка ідзе не пра барацьбу з бандытамі. Кожны сумленны чалавек падтрымліваў бы такую барацьбу, якой бы нацыянальнасці бандыты ні былі. Гаворка ідзе пра той экстаз шавіністычных пачуццяў, што выказваюцца ў расейскіх СМІ з нагоды, скажам, адкрыцця новых расейскіх школаў у захопленых чачэнскіх сёлах, дзе чачэнская мова вывучаецца толькі як прадмет.

Расейскія вайскоўцы і карэспандэнты ў Чачні прыдумалі нават слова “зачыстка”. Калі яно азначае зачыстку краіны ад роднай мовы, ад нацыянальных традыцяў і звычаяў, дык гэта і ёсць аднаўленне таго самага махровага шавінізму, што праводзіўся ў часы Расейскай імперыі і яе пераемніка - Савецкага Саюза. Сусветная практыка паказвае, што кожны народ, каб быць абароненым ад шавінізму тытульнай нацыі, імкнецца мець сваю нацыянальную дзяржаву. На гэта ён мае права і за гэта ён будзе змагацца, бо без стварэння нацыянальнай

дзяржавы нельга ў поўнай меры захаваць і правы чалавека. І таму вельмі шкада, што правам народаў на стварэнне сваіх нацыянальных дзяржаў Стамбульскі саміт кіраўнікоўдзяржаваў не надаў належнае ўвагі.

Экстаз шавністычных пачуццяў у дзеянні - гэта і ёсць агрэсія супраць іншых народаў, пад якім прыкрыццём яна б не ажыццяўлялася: ці пад прыкрыццём абароны правоў этнічных немцаў, як гэта было ў часе захопу Гітлерам Судэцкай вобласці, ці пад прыкрыццём барацьбы з бандытамі, як гэта сёння адбываецца ў Чачні.

Не прыкмеціў Стамбульскі саміт і тых парушэнняў правоў і свабодаў чалавека, якія сёння маюць месца ў Беларусі. Больш за тое, у выніковай дэкларацыі гаворыцца нават пра нейкі першапачатковы прагрэс у Беларусі ў справе палітычнага дыялогу з непасрэдным удзелам АБСЕ.

Цяжка сказаць, чым гэткі запіс прадыктаваны: ці тым, каб паказаць, што прадстаўніцтва АБСЕ у Беларусі і Рабочая Група АБСЕ па Беларусі нешта сапраўды могуць, і іх захады эфектыўныя, ці тым, што паводле парадку прыняцця пастаноў (кансэнсус мінус адзін голас), АБСЕ ўвогуле не можа прымаць больш канкрэтных рашэнняў. Так ці інакш, а прыняты пункт па Беларусі нікога ні да чаго не абавязвае і ставіць на адну дошку як тых, хто парушае законнасць, правы і свабоды чалавека, так і тых, чые правы парушаныя і хто вядзе барацьбу за ўсталяванне законнасці. Гэткі абцякальны запіс з`яўляецца амаральным у адносінах да тых, хто сёння па палітычных матывах падвяргаецца рэпрэсіям, без вестак прапаў, абылганы ў дзяржаўных СМІ і пазбаўлены права сябе абараніць.

Няўжо тыя, з чыёй прапановы рабіўся гэткі запіс, не ведаюць, што як у трыццатыя гады ўслед за "Мюнхенскай згодай" быў падпісаны ў Маскве "пакт Молатава-Рыбінтропа", так і сёння за Стамбульскай дэкларацыяй, якая сваім зместам патурае расейскаму шавінізму і дыктатарскаму рэжыму ў Беларусі, адбудзецца ва ўсё той жа Маскве, за спінамі народаў Беларусі і Расеі, падпісанне новага злачыннага пакту, які пры яго ажыццяўленні пазбавіць беларускі народ права мець сваю нацыянальную дзяржаву. Яшчэ "дамова" не падпісаная, а ўжо ва ўгоду расейскім шавіністам дыктатарскі рэжым Лукашэнкі зліквідаваў у сталіцы Беларусі ўсе беларускі школы, амаль не выдаюцца беларускія кнігі, гвалтоўна выцясняецца беларуская мова, робіцца ўціск на нацыянальныя меншасці, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі. Беларускую культуру, навуку і асвету ў Савеце Міністраў курыруе палкоўнік , грамадзянін Расеі У. Замяталін, людзі, якія прыбылі з Масквы, узначальваюць Міністэрства замежных спраў і Міністэрства абароны Беларусі і гэтак далей. А што будзе пасля падпісання "дамовы"?

Для абгрунтавання інкарпарацыі Беларусі ў склад Расейскай Федэрацыі выкарыстоўваюцца ўсё тыя ж злачынныя метады, якія выкарыстоўваліся ў часе "Мюнхенскай згоды" і "пакту Молатава-Рыбінтропа". Напрыклад, Пуцін, не пытаючыся ў беларускага народу пра яго статэгічныя інтарэсы, заяўляе, што аб`яднанне Расеі і Беларусі дыктуецца іх (гэта значыць, расейскімі) статэгічнымі інтарэсамі. А дэпутат Дзярждумы М. Ганчар навогул кажа, што ў беларусаў і расейцаў адна мова…

Да сказанага трэба дадаць, што тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А. Лукашэнкі скончыўся 20 ліпеня 1999 года і ўсе ягоныя подпісы на дзяржаўных дакументах не маюць сілы. І гэтага "не заўважыў" Стамбульскі саміт кіраўнікоў дзяржаў-членаў АБСЕ.

Вядома, што беларускі народ (і асабліва моладзь) не пацерпіць глумлення над яго правам мець свой родны дом - сваю нацыянальную дзяржаву і будзе абараняць гэтае права ўсімі сродкамі, у тым ліку і са зброяў у руках, калі яго да гэтага прымусяць. "Аб`яднальнікам" трэба было б памятаць урокі гісторыі, якія сведчаць, што ўсе гады знаходжання Беларусі ў складзе Расейскай імперыі - гэта гады перыядычных паўстанняў і барацьбы беларусаў за аднаўленне сваёй дзяржаўнасці. Беларусы памятаюць подзвігі Тадэвуша Касцюшкі і Кастуся Каліноўскага, і калі іх вымусяць, яны будуць гатовыя іх паўтарыць.

Тым жа, хто сёння патурае дамаганням расейскіх шавіністаў і недаацэньвае тую пагрозу міру, якую нясе ў сабе новая дыктатарская плынь - "лукашызм", хачу задаць пытанне: няўжо вы думаеце, што папярэджанні Чэрчыля ўжо састарэлі, і на гэты раз можна задаволіць шавіністаў і дыктатару нейкімі падачкамі, пасля чаго яны супакояцца? А калі не, дык чым скончыцца патуранне ім на гэты раз?...

***("Наша ніва", 29 лістапада 1999 года)***

KAMUNIKAT.org

# ВІНШАВАННЕ
# СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА
# РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Паважаныя суайчыннікі!

9 сакавіка 1918 года Беларусь была названа Народнай Рэспублікай, а ў ноч з 24 на 25 сакавіка Рада Беларускай Народнай Рэспублікі прыняла “Трэцюю Устаўную Грамату”, у якой БНР абвяшчалася “незалежнай і свабоднай дзяржавай”. Усё гэта адбывалася вясною, у пару сонца і наступлення цяпла, абуджэння прыроды і людскіх надзей. І хоць Радзе БНР не ўдалося правесці нейкіх значных эканамічных рэформаў і ўмацаваць заяўленую незалежнасць сваёй дзяржавы, але яна абнародавала галоўныя правы і свабоды чалавека, указала, што Беларусь павінна ахапіць усе беларускія землі і сумежныя часткі Вялікаросіі, дзе ёсць беларусы, адмовілася прызнаць зневажальную для Беларусі Брэсцкую дамову, заключаную бальшавіцкім урадам Расеі з Германіяй без удзелу прадстаўнікоў з беларускага боку, а ў апошні перыяд свайго існавання многа зрабіла ў вырашэнні праблем асветы.

Сказанае сведчыць аб тым, што Днём незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь павінен лічыцца менавіта дзень 25 сакавіка. Трэба аддаць належнае дзяржаўным і грамадскім дзеячам тых гадоў і тым, хто захоўваў і працягвае захоўваць за мяжою іх традыцыі. Пашану яны заслужылі сваёй барацьбой за свабоду і незалежнасць нашай Бацькаўшчыны.

Сімвалічна, што і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята таксама вясною - 15 сакавіка 1994 года. Нядаўняе святкаванне гэтага дня паказала, што ўрачыста аб`яўленая ў той далёкі 1918 год ідэя незалежнасці Беларускай дзяржавы працягвае жыць і сёння. Беларускі народ не хоча скарыцца дыктатарскаму рэжыму, які ўстанавіўся ў краіне пасля дзяржаўнага перавароту (лістапад 1996 году). Сёння гэты рэжым з`яўляецца не толькі нелігітымным, але і крымінальным, паколькі па факце захопу і ўтрымання ім дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам узбуджана крымінальная справа. І ніякія хлусня і запалохванні не могуць перашкодзіць адзначаць 25 сакавіка - Дзень волі і незалежнасці Беларусі.

Віншую ўсіх суайчыннікаў, дзе б яны ні знаходзіліся ў гэты дзень, са Святам! Жадаю вам, дарагія сябры, сілы, мужнасці і поспехаў ва ўсіх вашых справах.

Няхай жыве Вольная, Незалежная, Дэмакратычная Рэспубліка Беларусь!

***(“Народная воля”, 28 сакавіка 2000 года)***

# ЗАЯВА
# СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА
# РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**27 сакавіка 2000 года**

25 сакавіка 1918 года Рада Беларускай Народнай Рэспублікі прыняла “Трэцюю Устаўную Грамату”, у якой БНР абвяшчалася “незалежнай і свабоднай дзяржавай”. З тых часоў для ўсіх сумленных людзей нашай краіны дзень 25 сакавіка з`яўляецца святам - Днём Волі і Незалежнасці Беларусі. Адзначыць гэты дзень выйшлі людзі многіх населеных пунктаў рэспублікі і сёлета. Яны неслі нацыянальныя сцягі, кветкі, лозунгі, на якіх дэкларавaліся заклікі да волі і незалежнасці сваёй Радзімы, і, як гэта бывае ў такія дні, выказвалі свае патрабаванні да ўладаў. Святкаванне жыхарамі Беларусі Дня Волі і Незалежнасці знайшло шырокую падтрымку сярод нашых суайчыннікаў і ў шэрагу іншых краін.

Але, на жаль, у самой Беларусі свята Дня Волі і Незалежнасці вылілася ў сапраўдную трагедыю. У адрозненне ад святкавання Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якое прайшло мірна, таму што ўлады далі дазвол на шэсце і мітынг і са свайго боку не праявілі ніякіх правакацый, на гэты раз было ўсё наадварот. Рэжым паказаў свой сапраўдны твар. Напалохаўшыся шматтысячнай дэманстрацыі жыхароў рэспублікі, грамадзянін Лукашэнка, які пасля 20 ліпеня 1999 года незаконна ўтрымлівае дзяржаўную ўладу і супраць рэжыму якога ўзбуджана крымінальная справа, даў загад забараніць шэсце. З самага рання 25 сакавіка горад напоўніўся тысячамі ўзброеных “да зубоў” людзей, многія з якіх былі са спецыяльна падрыхтаванымі сабакамі, на вуліцах і плошчах з`явілася бронетэхніка. Усё гэта нагадала мінчанам карныя гестапаўскія аперацыі часоў Другой сусветнай вайны.

З паяўленнем людзей на вуліцах і плошчах іх пачалі хапаць, не разбіраючы, хто яны і куды ідуць. Безумоўна, што пры гэткім падыходзе да так званай зачысткі вуліц і плошчаў ад людзей, у спецпрыёмнікі і спецангары АМОНу патрапілі не толькі сотні мірных жыхароў, але і дэпутаты Сойма Польскай Рэспублікі, дыпламаты і журналісты, у тым ліку і расейскія. Пры затрыманні дзеянні спецслужбаў адзначаліся жорсткасцю і бязлітаснасцю: білі старых, жанчын і дзяцей, разбівалі рэпарцёрскую тэхніку і акуляры, нават пагражалі ужыць слёзацечны газ. Больш таго, сёння сотні людзей чакаюць прысуду.

Усё гэта не можа не выклікаць абурэння ў сэрцы кожнага сумленнага чалавека, бо названымі дзеяннямі ўладаў зневажаюцца правы і свабоды беларусаў, дэкларaваныя ім яшчэ ў 1918 годзе. Але разам з тым нельга не адзначыць, што той страх, які апанаваў дыктатарскі крымінальны рэжым, з`яўляецца пачаткам канца яго існавання. І набліжаецца той час, калі ўсе злачынцы, якія сёння аддаюць крымінальныя загады і выконваюць іх, паўстануць перад Сапраўдным Судом Свайго Народа.

# ЗАРАЗА ФАШЫЗМУ
## А. Лукашэнка капіруе А. Гітлера

У свой час французкі гісторык і палітычны дзеяч XIX стагоддзя А. Таквіль пісаў: “Гісторыя - гэта карцінная галерэя, дзе мала арыгіналаў і шмат копіяў”. Відавочным падцверджаннем сказанаму з`яўляецца сённяшняя Беларусь.

Атрымаўшы перамогу ў 1994 годзе на прэзідэнцкіх выбарах і будучы нездольным да самастойнай творчасці, А. Лукашэнка кінуўся шукаць у гісторыі гатовую карціну, з якой можна было б зняць копію. І спадабалася яму карціну, аўтарам якой быў самы крывавы дыктатар ХХ стагоддзя. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што А. Лукашэнка мае адукацыю гісторыка і перш, чым зрабіць свой выбар, мабыць, усё прадумаў і ўзважыў.

У сваім інтэрв`ю ад 23 лістапада 1995 года нямецкай газэце “Хандэльблат” навяўлены дыктатар сказаў: “...нямецкі парадак фармаваўся стагоддзямі. Пры Гітлеры гэтае фармаванне дасягнула найвышэйшай кропкі. Гэта тое, што адпавядае нашаму разуменню прэзідэнцкай рэспублікі і ролі ў ёй прэзідэнта”. І сапраўды, усе наступныя крокі дыктатара дзеля ўмацавання асабістай улады і ўсталявання ў Беларусі таталітарнага рэжыму былі скіраваныя на капіраванне “новага парадку”, што існаваў у Нямеччыне 30-на пачатку 40-ых гадоў ХХ стагоддзя.

У выніку правядзення так званага рэферэндуму (лістапад 1996 году), у часе якога былі груба парушаны Канстытуцыя і заканадаўства Рэспублікі Беларусь, выкарыстоўваліся адкрытая хлусня, подкуп, насілле і проста фальсіфікацыя вынікаў галасавання, быў зліквідаваны прынцып падзелу ўладаў (закандаўчай, выканаўчай і судовай) - неабходная ўмова існавання дэмакратычнай дзяржавы. Паралізавана праца абранага народам Вярхоўнага Савета і замест яго створаны зусім бяспраўны антыканстытуцыйны Нацыянальны сход”, які па сваёй сутнасці і правах нагадвае савет, што існаваў пры італьянскім дыктатары Мусаліні. Усё пракуроры і суддзі прызначаюцца і здымаюцца з пасадаў самім дыктатарам. Прававыя адносіны ў краіне рэгулююцца дэкрэтамі, указамі або і проста яго асабістымі вуснымі ўказаннямі. Створаны магутны паліцэйскі апарат - на 10 млн. жыхароў у краіне ўтрымліваецца 130 тысячаў паліцыянтаў. Больш таго, сваім указам дыктатар стварыў наогул антыканстытуцыйнае фармаванне і надзяліў яго правам па сутнасці, парушаць усякае права і законы. Гэтае фармаванне можа, згодна з дадзеным указам, урывацца ў любое памяшканне і без рашэння суду і санкцыі пракурора праводзіць там вобыск, а таксама затрымліваць любога чалавека і змяшчаць яго пад варту. Беззаконне дайшло да таго, што ў парушэнне Канстытуцыі і заканадаўства арыштаваныя і асуджаны дэпутаты Вярхоўнага Савета Уладзімір Кудзінаў і Андрэй Клімаў, інсцэнуецца суд над былым прэм`ер-міністрам Міхаілам Чыгіром, які адмовіўся падтрымаць дыктатара ў часе згаданага рэферэндуму; зніклі - і ніхто не дае адказу куды - былы міністр унутраных спраў Юры Заранка, першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Віктар Ганча, бізнесовец Анатоль Красоўскі. Як у свой час аўстрыяк А. Гітлер для задавальнення сваіх улалалюбівых амбіцыяў пайшоў на ліквідацыю дзяржаўнага суверэнітэту ўласнай краіны, так і беларускі дыктатар на працягу ўсіх гадоў свайго прэзідэнтва вялізнае намаганне прыкладаў не на вывад сваёй дзяржавы з крызісу, а на далучэнне яе да Расеі, каб была магчымасць вылучыць сваю кандыдытуру на пасаду прэзідэнта нейкага будучага Саюзу. Каб дагадзіць расейскім шавіністычным колам, якія заўзята

падтрымліваюць дыктатара ў ягоных памкненнях, ён стаў на злачынны шлях у адносінах да беларускага народа і праводзіць русіфікацыю краіны, стварыў па сутнасці акупацыйны ўрад, дзе ключавыя пасады займаюць галоўным чынам выхадцы з Расеі, шмат хто з якіх, як ва ўрадзе Гітлера, з`яўляецца кадравым вайскоўцам ці афіцэрам спецыяльных службаў. Вынікам гэткіх дзеянняў дыктатара стала ператварэнне краіны ў лагер, дзе пануюць гвалт і страх, падазрэнне і паклёп, карупцыя чыноўнікаў, груба парушаюцца правы і свабоды чалавека, народ даведзены да бясспраўя і жабрацтва.

І ўжо зусім не можа пакінуць абыякавым кожнага чалавека з цвярозым розумам тое, што ў Беларусі, дзе ў гады Другой сусветнай вайны загінуў кожны чацвёрты жыхар, сёння пад патранажам прадстаўнікоў сілавых міністэрстваў створана і актыўна працуе база па падрыхтоўцы баявых дружын расейскай фашыстоўскай арганізацыі "Русское национальное единство". Дык гэта ўжо не проста пагроза фашызму, а рэальны ягоны прыход у наш дом - у нашу краіну.

Зараджэнне фашыстоўскай бацылы на зямлі і працалюбівага беларускага народу - гэта вынік дзейнасці і самога дыктатара, і яго памагатых - прыбылых з Расеі генералаў і палкоўнікаў, якія цяпер узначальваюць у Беларусі гэткія жыццёва важныя сферы, як культура, навука, асвета, міністэрствы замежных і ўнутраных спраў, абароны, нават праваслаўную царкву, а таксама тых расейскіх шавіністычных колаў, што дапамагалі дыктатару ў лістападзе 1996 года здзейсніць дзяржаўны пераварот і працягвалі падтрымліваць стораны ў Беларусі рэжым і ў наступныя гады, у тым ліку і фінансава.

Усё гэта не магло адбыцца і без актыўнай падтрымкі з боку былых кіраўнікоў камуністычнай партыі Беларусі, якія некалі, выходзіць, крывадушна вучылі іншых справядлівасці, асуджалі фашызм і гвалт.

Не магу не сказаць і пра тых сваіх калегаў з Вярхоўнага Савета, а таксама прадстаўнікоў прэзідэнцкай вертыкалі і ўраду. Яны добра разумеюць небяспеку, што нясе ў сабе дыктатарскі рэжым, але пайшлі на яго падтрымку дзеля матэрыяльных дабротаў - кватэр, машын і высокіх заробкаў. Гэта і яны прыклалі рукі да стварэння ў краіне антынароднага дыктатарскага рэжыму.

Скрозь пальцы глядзяць пакуль што на ўжо рэальную заразу фашызму ў Беларусі і міжнародныя арганізацыі, якія павінны папярэджваць развіццё падобных рэцыдываў, а таксама могія цывілізаваныя дзяржавы, спадзеючыся, мабыць, пра гэтым, што падзеі ў Беларусі іх мала закрануць.

Але як было вядома яшчэ старажытным вучоным і філосафам, "тая ўлада, якая кіруе на шкоду народу, не можа доўга існаваць". Гэта тычыцца і беларускага рэжыму, тым больш, што тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў самога дыктатара скончыўся 20 ліпеня 1999 года. Супраць створанага ім рэжыму ўзбуджана крымінальная справа і вядзецца следства, ужо не кажучы пра тое, што з абраннем У. Пуціна прэзідэнтам Расейскай Федэрацыі беларускі дыктатар страціў усялякі шанец палітычнай гульні на расейскай сцэне.

Аднак, нягледзячы на гэта, рэжым працягвае адраджаць фашызм як ідэалогію, сее насенне злоснай плыні ў душах сотняў маладых людзей. Гэтая палітыка, пазбаўленая перспектывы, пагражае нам усё большымі стратамі і праблемамі ў будучыні, пасля падзення дыктатуры. Таму спыніць яе сёння - гэта клопат кожнага грамадзяніна Беларусі, які дбае пра заўтрашні дзень.

***("Наша ніва", 10 красавіка 2000 года)***

# ДАКЛАД У ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ АМЕРЫКІ
# НА КАМІСІІ ПА БЯСПЕЦЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВУ Ў ЕЎРОПЕ
**красавік 2000 года**

Перш за ўсё я хачу выказаць вялікую ўдзячнасць за тое, што Ваша дзяржава, якая ёсць самая магутная ў свеце і з`яўляецца узорам дэмакратыі для іншых, выказвае заклапочанасць аб стане правоў чалавека і ў іншых рэгіёнах свету, і, у прыватнасці, у нашай краіне. Менавіта так мы разглядаем і сённяшнія слуханні. Усё гэта для нас вельмі неабходна і дарагое таму, што, пачынаючы з лістапада 1996 года, Беларусь стала нейкім палігонам правядзення эксперымента па вяртанню былога таталітарнага ладу большавіцкага ўзору на постсавецкай прасторы.

Добра разумеючы, што абарону правоў чалавека ў кожнай дзяржаве неабходна разглядаць не толькі на нацыянальным, але і міжнародным узроўні, прычым менавіта апошняму павінна належаць галоўная роля, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, тады яшчэ 12-га склікання, прывёў сваё заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі і нормамі, а таксама вызначыў механізмы іх выканання. У першую чаргу ўсе гэтыя патрабаванні былі ўлічаны пры распрацоўцы і прыняцці 15 сакавіка 1994 года Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Больш таго, за час ад пачатку існавання Рэспублікі Беларусь як сапраўды незалежнай суверэннай дзяржавы і да лістапада 1996 года, многае было зроблена і практычна па дэмакратызацыі грамадскага ладу. Беларусь усё больш і больш стала заяўляць аб сабе як краіне, якая імкнецца не толькі быць незалежнай, суверэннай і дэмакратычнай, але і хоча стаць паўнапраўным членам усіх еўрапейскіх структур.

Вось з гэтым ніяк не магла пагадзіцца, па-першае, эліта камуністычнай партыі. У праграмах камуністычных партый, у прынамсі Расейскай Федэрацыі, Беларусі і Украіны, у якасці адной з галоўных задач прадугледжваецца адраджэнне Савецкага Саюза з яго былымі казарменнымі парадкамі. Па-другое, з гэтым не маглі пагадзіцца і шавіністычныя колы Расеі, якія працягваюць марыць аб адраджэнні былой Расейскай імперыі, спадчыннікам якой і быў Савецкі Саюз. І ў гэтым плане праграмы і дзеянні амаль усіх расейскіх палітыкаў, незалежна ад колеру іх афарбоўкі, супадаюць. Навогул, там дзе пачынаюцца міжнацыянальныя адносіны, там канчаецца дэмакратызм амаль усіх расейскіх палітыкаў. Гэта паказалі падзеі ў Югаславіі, аб гэтым гавораць іх адносіны да вырашэння чачэнскай праблемы, аб гэтым сведчаць іх погляды на незалежнасць і суверэнітэт беларускай дзяржавы. Па ўсім пералічаным яны кіруюцца толькі сваімі імперскімі інтарэсамі. На жаль, прыклад у гэтым паказвае і выконваючы абавязкі Прэзідэнта Расейскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, які ў якасці аргумента неабходнасці аб`яднання Беларусі і Расеі прыводзіць тое, што ў іх (гэта азначае, ў расіян) у Беларусі ёсць нейкія стратэгічныя інтарэсы. Пры гэтым ён і не збіраецца пытацца ў беларусаў: а якія ж у іх стратэгічныя інтарэсы? Трохі раней з экранаў расейскага тэлебачання Беларусь навогул называлі расейскім калідорам у Еўропу. Дарэчы, Расея не плаціць Беларусі ніводнага цэнта не толькі за нафта- і газаправоды, якія праходзяць праз нашу тэрыторыю, за карыстанне чыгункай і паветранай

прасторай, але і за ўтрыманне ў Беларусі вайсковых аб`ектаў. Менавіта ў гэтым і заключаецца адна з галоўных прычын, па якой пры спробе адраджэння былой Расейскай імперыі ў якасці першага кроку абрана далучэнне Беларусі да Расеі, якая сама па сабе яшчэ застаецца імперыяй і, як паказваюць падзеі ў Чачні, праводзіць на тэрыторыі гэтай рэспублікі чыста імперскую палітыку. Я не маю на ўвазе, пры гэтым, барацьбу з тэрарыстамі. Гэткую барацьбу, прычым самую жорсткую, неабходна праводзіць. Я маю на ўвазе тое задавальненне, з якім расейскія ваенныя і журналісты паведамляюць, напрыклад, аб адкрыцці ў Чачні расейскіх школаў, дзе чачэнская мова вывучаецца толькі як прадмет.

Вось гэта я хачу падкрэсліць асабліва таму, што на тэрыторыі Беларусі няма тэрарыстаў, якія б пагражалі Расеі ці яе грамадзянам, але, на жаль, расіянамі, якія занялі ў лукашэнкаўскім урадзе ўсе галоўныя пасады (цяпер ужо і ўключна пасаду прэм`ер-міністра), праводзіцца ўсё той жа духоўны генацыд, або, кажучы словамі расейскіх вайскоўцаў, ідзе “зачыстка” Чачні ад чачэнцаў, а Беларусі ад беларусаў. У сучасны момант у Беларусі няма ніводнай вышэйшай навучальнай установы, якая працавала б на беларускай мове, а ў сталіцы - горадзе Менску - не засталося ўжо і ніводнай беларускай школы (ёсць толькі асобныя беларускія класы). Беларуская мова выцеснена з усіх дзяржаўных устаноў, хоць, як паказаў перапіс 1999 года, на тэрыторыі рэспублікі пражывае беларусаў па нацыянальнасці больш за 80 працэнтаў. Значыць, названая палітыка - гэта і ёсць парушэнне галоўнага канстытуцыйнага права карэннай нацыі карыстацца сваёй роднай моваю, ужо не кажучы пра вырашэнне пытання ў гэтым плане для палякаў, украінцаў, габрэяў і іншых нацыянальных меншасцяў. Усіх іх хочуць гвалтоўна перарабіць у рускіх.

Першым крокам па адраджэнню на тэрыторыі Беларусі былой таталітарнай сістэмы з яе парадкамі казарменнага сацыялізму і стварэнню ўмоў для далучэння рэспублікі да Расеі была адстаўка з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча. Тады гэта рабілася нібыта на карысць вылучэння ў прэзідэнты Вячаслава Кебіча, які ў той час узначальваў урад. Аднак прадастаўленне пасля трыбуны Дзяржаўнай Думы, якая тады ў сваёй большасці была камуністычнай, толькі аднаму з шасці кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі - Лукашэнку, выразна паказала, каго Расея падмацоўвае козырамі для выйгрышу ў той передвыбарчай барацьбе. Як свайго стаўленніка, расейскае кіраўніцтва падтрымала Лукашэнку і пры здзяйсненні ім у лістападзе 1996 года пад выглядам так званага рэферэндуму дзяржаўнага перавароту.

Нельга назваць рэферэндумам мерапрыемства, якое праводзілася з дапамогай увода ў Менск столькі войск, колькі ён не бачыў з дзён заканчэння Другой сусветнай вайны. На вуліцах горада стаялі бронетранспарцёры, а будынак Цэнтральнай выбарчай камісіі на працягу двух тыдняў быў акупаваны аўтаматчыкамі з аховы Лукашэнкі, якія не дапускалі туды нікога, чым былі створаны ўсе ўмовы для прамой фальсіфікацыі вынікаў рэферэндуму. Бюлетэні друкаваліся і без усялякага ўліку развозіліся па раёнах прадстаўнікамі прэзідэнцкіх структур. Дарэчы, на бюлетэнях быў зроблены надпіс, у якім паведамлялася, што пытанні, якія выносяцца на рэферэндум па змяненню і дапаўненню Канстытуцыі, маюць кансультатыўны характар і падлягаюць разгляду на паседжанні Вярхоўнага Савета. Пасля правядзення рэферэндуму Лукашэнка сваім указам зрабіў яго вынікі абавязковымі па ўсіх пытаннях. Тысячы парушэнняў заканадаўства былі дапушчаныя і на месцах, на што былі састаўленыя акты, больш тысячы якіх я

перадаў у Генеральную пракуратуру рэспублікі, на што не атрымаў ніякага адказу.

Аб тым, што ў час правядзення так званага рэферэндуму (1996 год) было здзейснена насілле над народам, гаворыць і той факт, што за "паспяховую" яго арганізацыю цэлы шэраг работнікаў Камітэту Дзяржаўнай Бяспекі быў ўзнагароджаны імянною зброяй і іншымі ўзнагародамі.

Аб усіх гэтых фактах было добра вядома кіраўніцтву Расейскай Федэрацыі, у тым ліку і спадарам Ельцыну, Чарнамырдзіну, Строеву, Селязнёву. А што тычыцца асабіста самога Ельцына, дык ён пайшоў на ліквідацыю Савецкага Саюза не таму, што стаў гэткім дэмакратам, гатовым дапамагчы іншым народам стварыць на базе былых рэспублік Савецкага Саюза свае нацыянальныя дзяржавы, а таму, што толькі праз такі крок ён бачыў рэальную магчымасць прыйсці да вярхоўнай улады, хоць бы і ў адной Расеі. Стаць прэзідэнтам Саюзу ў яго у той час не было ніякай магчымасці. А пасля абрання яго прэзідэнтам Расейскай Федэрацыі, Ельцын ужо быў не супраць пачаць адраджаць былую Расейскую імперыю. І ў гэтым яго імкненні супадалі з праграмнай задачай тых жа камуністаў. Менавіта таму ён і падтрымаў Лукашэнку.

Расейскім шавіністычным колам патрэбен дыктатар Лукашэнка, які паралізаваў антыканстытуцыйнымі сродкамі работу дэмакратычных органаў: Вярхоўнага Савета і Канстытуцыйнага Суда, якія цвёрда стаялі на пазіцыях захавання незалежнасці і дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, далейшага правядзення эканамічных рынкавых рэформаў. Ім патрэбен дыктатар на Беларусі, які па свайму менталітэту не адчувае сябе беларусам і таму можа дапамагаць здзяйсняць далейшую русіфікацыю беларускага народа, пачатую царскім урадам і працягнутую бальшавікамі ў час Савецкага Саюза. Неабходна ім і манапалізацыя дыктатарскім рэжымам сродкаў масавай інфармацыі і барацьба з іншадумствам у Беларусі, бо названыя меры ліквідуюць перашкоду на шляху здзяйснення імі сваёй шавіністычнай палітыкі. Менавіта за стварэнне ўмоў для правядзення гэткай палітыкі яны гатовыя не толькі зачыняць вочы на грубае парушэнне лукашэнкаўскім рэжымам правоў і свабодаў чалавека ў Беларусі, але і дараваць самому дыктатару тыя абразы, якія ён дазваляе сабе дапускаць у адрас Ельцына, іншых расейскіх палітыкаў і Расеі цалкам.

Пасля правядзення так званага рэферэндуму (лістапад 1996 года) у Беларусі зліквідаваны ўсялякі падзел уладаў. Усе галіны дзяржаўнай улады (выканаўчая, заканадаўчая і судовая) знаходзяцца ў руках Лукашэнкі. Замест абранага народам Вярхоўнага Савета ім створаны зусім бяспраўны Нацыянальны Сход, які па сваёй сутнасці і правах нагадвае існаваўшы ў свой час фашыстоўскі савет пры дыктатуры Мусаліні. Усе катэгорыі пракурораў і суддзяў прызначаюцца і здымаюцца толькі Лукашэнкам. Адносіны ў краіне, у тым ліку і тыя, якія тычацца правоў чалавека, рэгулююцца дэкрэтамі і ўказамі, а то і проста вуснымі ўказаннямі Лукашэнкі. Яго ўказамі адмененыя шматлікія раней прынятыя законы, створаны магутны паліцэйскі апарат - на 10 млн. насельніцтва ўтрымліваецца 135 тыс. супрацоўнікаў міліцыі. Больш таго, сваім указам ён, наогул, стварыў антыканстытуцыйнае ваенізаванае фармаванне і надзяліў яго правам, па сутнасці, парушаць усялякія правы і законы. Гэтае фармаванне мае магчымасць, згодна названаму ўказу, урывацца ў любое памяшканне і без рашэння суда і санкцыі пракурора праводзіць тамператрус, а таксама па свайму рашэнню затрымліваць і змяшчаць пад варту любога чалавека. Беззаконне дайшло да таго, што ў

парушэнне Канстытуцыі і заканадаўства арыштаваныя і знаходзяцца ў турме дэпутаты Вярхоўнага Савета Уладзімір Кудзінаў і Андрэй Клімаў, апошні не так даўно быў жорстка збіты; інсцэнуецца суд над былым прэм`ер-міністрам Міхаілам Чыгірам, які адмовіўся падтрымліваць Лукашэнку ў час таго рэферэндуму; зніклі і ніхто не дае адказу, куды, былы міністр унутраных спраў Юры Захаранка, першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Віктар Ганчар, бізнесовец Анатоль Красоўскі.

Побач з дзяржаўным бюджэтам, які, дарэчы, узгаданым Нацыянальным Сходам зацвярджаецца на працягу літаральна некалькіх гадзін, у Лукашэнкі ёсць свой некантралюемы бюджэт, частка якога ствараецца крымінальнымі сродкамі, уключна і і бескантрольным продажам зброі. У рэспубліцы не толькі манапалізаваны яго структурамі ўсе электронныя сродкі масавай інфармацыі і больш як на 90% тыраж выдаваемай друкаванай прадукцыі, але, па сутнасці, ўведзена забарона на правядзенне мітынгаў і сходаў, жорстка кантралюецца дзейнасць усіх палітычных і грамадскіх арганізацыяў.

Паважаныя панове!

Тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі скончыўся 20 ліпеня 1999 года. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь распачаў 1 снежня мінулага года крымінальную справу па факту захопу і ўтрымання ўлады неканстытуцыйнымі сродкамі. У сучасны момант вядзецца следства. Усё гэта і дало нам падставу заявіць, што подпісы Лукашэнкі на дзяржаўных дакументах пасля названай даты не маюць юрыдычнай сілы. Гэткая заява зроблена мною напярэдадні падпісання Лукашэнкам і Ельцыным так званай дамовы аб аб`яднанні Беларусі і Расеі ў адну дзяржаву.

Няма падтрымкі ў Лукашэнкі ўжо і ў большасці насельніцтва Беларусі. І толькі ўсебаковая падтрымка рэжыму з боку Расеі дазваляе дыктатару зневажаць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і груба парушаць правы і свабоды чалавека, не звяртаючы пры гэтым увагі на ўсе заклікі міжнародных арганізацый і парламентаў дэмакратычных краін вярнуцца ў прававое поле і пачаць рэальныя перамовы з прадстаўнікамі апазіцыі. Стварэнне ўмоў для правядзення рэальных перамоў з апазіцыяй з удзелам прадстаўнікоў АБСЕ, сённяшнюю пазіцыю якіх і іх працу цалкам мы высока адзначаем (хоць калі-нікалі і праводзім з імі палеміку) Лукашэнка спрабуе падмяніць новымі авантурыстычнымі прапановамі, якія толькі заблытваюць і пагаршаюць сітуацыю ў Рэспубліцы. Але ўсё гэта і зразумела: паколькі сёння яго падтрымліваюць толькі прадстаўнікі створаных і фінансуемых ім структураў, якімі ён і хоча падмяніць сапраўдную апазіцыю.

А што тычыцца ўзгаданай дамовы, дык далучэнне Беларусі да Расеі падтрымлівае менш чым 5 працэнтамі жыхароў рэспублікі. Дарэчы, больш чым 500 тысяч чалавек заяўляюць аб тым, што калі, не дай Бог, гэта здарыцца, яны пакінуць рэспубліку і з`едуць у заходнія краіны. Таму ўсякую спробу расейскага кіраўніцтва ў гэтым напрамку мы разглядаем як агрэсію супраць нашай краіны з усімі вынікамі, што адсюль выцякаюць. І тут мы спадзяёмся на падтрымку міжнародных арганізацыяў і дэмакратычных краін свету, тым больш, што калі выводзілася з Беларусі ядзерная зброя, у 1994 годзе, Злучаныя Штаты, Велікабрытанія і Расея гарантавалі захоўваць бяспеку і цэласнасць Рэспублікі Беларусь як дзяржавы. Сёння адна з гэтых краін парушае дамову. У сувязі з гэтым я звярнуўся з лістом да прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі спадара Біла

Клінтана, прэм`ер-міністра Велікабрытаніі спадара Тоні Блэера і былога тады прэзідэнта Расеі спадара Барыса Ельцына. На жаль, адказу не атрымаў ні ад аднаго. Што тычыцца спадара Ельцына, дык тут усё зразумела. А вось як зразумець двух іншых? Дарэчы, у сувязі з іх маўчаннем, мой зварот быў надрукаваны ў некаторых беларускіх газэтах. І цяпер адказу ад паважаных асобаў чакае ўвесь беларускі народ і спадзяецца, што яго ў 1994 годзе не падманулі.

Кажучы аб маскоўскай змове, асаблівую заклапочанасць выклікаюць надрукаваныя ў расейскіх газэтах Тэзісы Савета па знешняй і абароннай палітыцы Расеі ў сувязі з расейска-беларускай інтэграцыяй, у якіх, у прыватнасці, сказана наступнае: "У выніку інтэграцыі з Беларуссю Расея атрымлівае шэраг бясспрэчных геапалітычных выгодаў...", у тым ліку: "павелічэнне ваенных магчымасцяў дзяржавы ў галіне звычайных узбраенняў за кошт інтэграцыі з беларускай арміяй, якая валодае высокай боездольнасцю, вывад Калінінградскага асобнага абарончага раёну з ваенна-стратэгічнай ізаляцыі". А далей сказана яшчэ больш выразна аб тым, што "аб`яднанне Узброеных сілаў двух краін значна ўмацоўвае групоўку, асабліва сухапутныя сілы, у рэгіёне і не патрабуе перабудовы сістэмы кіравання саюзнымі войскамі".

Пасля сказанага застаецца толькі запытаць: а якія ж выгоды названая інтэграцыя дае Беларусі, якая ўжо шмат разоў станавілася ахвярай шавіністычнай палітыкі Расеі?

З далучэннем Беларусі да Расеі, калі гэта, не дай Бог, адбудзецца, у Еўропу будзе ўкліньвацца больш чым сямісоткіламетровы выступ, які, як вынікае з названага дакумента, ператворыцца ў расейскі ваенны фарпост. Але пры гэтым напрошваецца яшчэ адно пытанне: як Калінінградскі асобны абарончы раён будзе выведзены з ізаляцыі? Беларусь жа не мяжуе з Калінінградскай вобласцю. Ці тут плануюцца і яшчэ нейкія крокі, аб якіх можна толькі здагадвацца?

Са сказанага бачна, што незалежнасць Беларусі і захаванне яе дзяржаўнага суверэнітэту, вяртанне на дэмакратычны шлях развіцця і ўступленне яе ў еўрапейскія структуры - гэта не толькі неабходнасць для стварэння нармальных умоў жыцця дзесяцімільённага беларускага народу з яго еўрапейскай ментальнасцю, але і гарантыя забеспячэння бяспекі нашых суседзяў і Еўропы цалкам. Разумеючы, што пытанні Беларусі павінны вырашацца самімі беларусамі, спадзяёмся, што сённяшнія слуханні яшчэ раз нагадаюць аб гэтым.

Дзякуй за ўвагу!

# ІСТЭРЫЯ,
## або аб тым, што чакае Беларусь, калі на яе тэрыторыю будзе ўведзена большчым двухсоттысячная расейская армія

Цяжка сказаць, аб чым думалі тыя, хто 11 красавіка сядзеў у Авальнай зале Дома Ураду, але кожны сумленны беларус, дзе б ён не жыў - у Беларусі ці за яе межамі, інакш як з уздрыгваннем у душы і боллю ў сэрцы за лёс сваёй Радзімы не мог успрымаць чарговы выпад А. Лукашэнкі. У сваім выступе перад так званым Нацыянальным Сходам ён заявіў аб тым, што будзе прапаноўваць толькі што абранаму прэзідэнту Расеі У. Пуціну стварыць на тэрыторыі Беларусі вайсковую групоўку колькасцю ў 300 тысяч чалавек. Сярод прычын, якія штурхаюць яго на гэткі, проста скажам цемрашальны крок, на першае месца ён паставіў набліжэнне да межаў Беларусі НАТА, якое, як вынікае з неаданаразовых заяў Лукашэнкі, з`яўляецца агрэсіўнай арганізацыяй, якая пагражае Беларусі і Расеі. Пры гэтым патрэбна мець на ўвазе: у час Балканскага крызісу ён ужо заявіў, што, маўляў, пасля Югаславіі НАТА пачне бамбаваць Беларусь.

Тады яго выпад, скіраваны на скажэнне сапраўднай сутнасці названай міжнароднай ваенна-палітычнай арганізацыі, дзякуючы якой пры ўсіх здзейсненых ёю памылках было прыпынена распаўзанне па ўсяму свету такой экстрэмісцкай палітычнай плыні, як бальшавізм, а таксама на нагнятанне знарок страху, чамусьці прайшоў без увагі кіраўнікоў таго ж НАТА і ўваходзячых у яго краін. Мала прыкметным аказаўся і высвечаны 3-га красавіка расейскім тэлеканалам НТВ факт падрыхтоўкі на тэрыторыі Беларусі пад апекай яе Камітэта дзяржбяспекі і міністэрства ўнутраных спраў расейскіх фашысцкіх баявых атрадаў РНЕ. Цяпер здзейснены новы выпад супраць міралюбівых сіл чалавецтва.

Усё гэта азначае, што кіруючы Беларуссю дыктатар, тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў якога скончыўся 20 ліпеня 1999 года, канчаткова растаптаў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, згодна якой наша краіна павінна быць прававой, дэмакратычнай і нейтральнай дзяржавай, а таксама грэбаваў усімі ўгаворамі з боку АБСЕ, Савета Еўропы, іншых арганізацый і многіх кіраўнікоў і парламентаў дэмакратычных дзяржаў. Ну і, не дай Бог, каб тым жахлівым ідэям, якія ён выказаў у сваім выступе, наканавана было збыцца, гэта навогул мела б фатальнае наступства, прычым не толькі для Беларусі, але і для ўсяго рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Для самой Беларусі гэта азначае, што яе тэрыторыя будзе акупавана велізарнай арміяй замежнай дзяржавы, бо ў самой рэспубліцы ў сучасны перыяд колькасць вайскоўцаў складае каля 80 тысяч чалавек. Гэта азначае, што будзе ўведзена больш 200 тысяч чалавек расейскіх саладат. І тут узнікае першае пытанне: за чый кошт плануецца ўтрымліваць гэткую вайсковую армаду? Няўжо за кошт усё таго ж беларускага народа, які і без таго даведзены за час кіравання А. Лукашэнкі да жабрацтва?

Па-другое, узнікае спрвядлівае пытанне і аб тым, што будзе ў гэткім выпадку з Рэспублікай Беларусь як дзяржавай? Яна ўжо кіруецца, па сутнасці, акупацыйнай адміністрацыяй, дзе ўсе ключавыя пасады належаць не беларусам, а людзям, прыехаўшым з Расеі, большасць з якіх з`яўляюцца вайсковымі работнікамі спецслужбаў, якія праводзяць адкрытую русіфікацыю насельніцтва. А калі да гэтага на тэрыторыю Беларусі будзе ўведзена яшчэ і 200-тысячная групоўка

расейскіх вайскоўцаў, аб якой незалежнасці і аб якім суверэнітэце пасля гэтага можна гаварыць? І які лёс чакае беларусаў?

Па-трэцяе, стварэнне шматлікай ваеннай групоўкі на тэрыторыі Беларусі паставіць яе міралюбівы народ, на які таксама ніхто не збіраецца нападаць, не толькі ў залежнасць ад знешняй палітыкі замежнай дзяржавы, але і пад пагрозу незлічоных ахвяр у выпадку праяўлення амбіцый у расейскай ваеншчыны. А сведчаннем таму, што апошняе нельга выключаць, з`яўляецца вайна супраць чачэнскага народа. І ў гэтай сувязі становіцца проста незразумелым, чаму кіраўнікі некаторых з гэтых краін усё яшчэ спадзяюцца на нейкае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з незаконным і, як паказваюць падзеі апошняга часу, вельмі агрэсіўным рэжымам. Пры гэтым хачу яшчэ раз падкрэсліць, што ўсе падпісаныя прадстаўнікамі гэтага рэжыму акты пасля 20 ліпеня 1999 года не маюць юрыдычнай сілы і з вяртаннем Беларусі на дэмакратычны шлях развіцця іх чакае такі ж лёс, як і падпісаны ў свой час у Маскве і таксама з самага пачатку незаконны “пакт Молатава-Рыбінтропа”.

Яшчэ больш жахлівай гэтая заява ўладалюбівага правіцеля з`яўляецца і таму, што яна зроблена напярэдадні будучай гадавіны са дня заканчэння Другой сусветнай вайны, якая прынесла свету незлічоныя ахвяры. Беларусь у гэтай вайне аказалася сярод найбольш пацярпелых рэгіёнаў. Няўжо ж яе зноў патрэбна паставіць на мяжу катастрофы?!

Безумоўна, новаму выпаду прыхільніка Гітлера (узгадайце адно з выказванняў А. Лукашэнкі) ёсць абгрунтаванне. За гады яго кіравання эканоміка ўвесь час дэградуе, народ даведзены, па сутнасці ўжо да крайняй мяжы галечы. Пасля здзейсненага ў лістападзе 1996 года дзяржаўнага перавароту ў краіне запанавала беззаконні самавольства, дасягнула нябачных памераў карупцыя дзяржаўных чыноўнікаў. Гэта прывяло да ўсеагульнага народнага абурэння, аб чым сведчаць зачасцелыя шматлікія дэманстрацыі і мітынгі. Праваліліся яго мары аб маскоўскім прэстоле, аб якім ён заяўляў журналістам яшчэ ў час папярэдняга прыезду ў Менск У. Пуціна. Беларусь апынулася ў жорсткай ізаляцыі. І ў склаўшайся сітуацыі дыктатар не бачыць іншага выйсця, акрамя як у далейшым нагнятанні ваеннай істэрыі і мілітарызацыі краіны, а таксама ў канчатковай здачы яе дзяржаўнага суверэнітэту, абы працягнуць тэрмін свайго існавання і пазбавіцца любымі шляхамі ад адказнасці за здзейсненае.

І тут нельга не ўзгадаць, што на апошнім перадваенным з`ездзе УКП(б) (сакавік 1939 года) менавіта гэткімі прычынамі абгрунтоўваліся нястрыманыя імкненні фашысцкай Германіі развязаць Другую сусветную вайну. Там, у прыватнасці, гаварылася: “Фашысцкім заправілам патрэбны войны, таму што яны не ў стане выканаць свае дэмагагічныя абяцанні масам, патрабуючым не гармат, а масла, не дрэднаўтаў, а хлеба. Вайна для іх - гэта сродак, каб падавіць незадавальненне мас і трымаць іх у падпарадкаванні. Ім патрэбны войны для захавання свайго “прэстыжу” у вачах іх уласных прыхільнікаў”. Праўда, сказанае ў роўнай ступені адносіцца і да самога бальшавізму як да разнавіднасці ўсё тых жа дыктатарскіх рэжымаў, рэцыдывам якіх і з`яўляецца лукашызм. Новыя няўдачы будуць прыводзіць дыктатара да яшчэ большай істэрыі. Таму ўсе яго далейшыя дзеянні могуць быць яшчэ больш авантурнымі і небяспечнымі. У сувязі з гэтым выхад са склаўшайся сітуацыі ў Беларусі патрэбна шукаць не ва ўгаворах дыктатара, які, як і яго кумір Гітлер,з дапамогай рэферэндумаў, а таксама нейкага

дыялогу і новага фарсу ў выглядзе выбараў у антыканстытуцыйны Нацыянальны Сход (ва ўмовах дыктатуры выбары ніяк не могуць быць дэмакратычнымі і свабоднымі) спрабуе прыдаць толькі бачнасць законнасці сваёй уладзе.

Пасля дадзенага выпаду ні ў кога не павінна ўзнікаць сумневу, што ўсе гэтыя гульні ў "дэмакратыю" з`яўляюцца чарговым падманам народа. У дадзеным выпадку патрэбны канкрэтныя дзеянні па законнаму адхіленню дыктатара ад улады, якую ён узурпаваў і займае ў сучасны момант незаконна.

***("Народная воля", 15 красавіка 2000 года)***

KAMUNIKAT.org

# БЕЛАРУСЬ ПАВІННА БЫЦЬ ВОЛЬНАЙ І НЕЗАЛЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВАЮ!

**Зварот да беларусаў свету ў сувязі з 55-годдзем заканчэння Другой сусветнай вайны**

Паважаныя суайчыннікі!

У пачатку мая бягучага года мінае 55 гадоў з дня перамогі над фашысцкай Германіяй, а 3 верасня 2000 года споўніцца такі ж тэрмін з дня заканчэння Другой сусветнай вайны навогул, якая па здзейсненых злачынствах супраць чалавецтва і матэрыяльных разбурэннях не ведае сабе роўных. Яе адрозненне ад Першай сусветнай вайны, галоўнай прычынай развязвання якой з`явіліся непрымірымыя эканамічныя супярэчнасці паміж дзвюма групоўкамі супрацьстаячых дзяржаў, заключаецца ў тым, што яна пачалася са змовы дзвюх палітычных дыктатарскіх рэжымаў, якія сапернічалі паміж сабою за ўсталяванне сусветнага панавання бальшавізму і фашызму, узнікненне якіх было адрыжкай мінулых манархічных дыктатур, што праіснавалі ў Расеі і Германіі аж да пачатку XX стагоддзя.

Свет, бадай, не ведае большых па сваіх памерах і цынізму злачынстваў супраць чалавецтва, чым падпісанне ў Маскве 23 жніўня 1939 года В. Молатавым і І. Рыбінтропам дамовы і пратаколаў аб супрацоўніцтве і падзелу паміж дзвюма дыктатарскімі рэжымамі сфераў уплыву ў Еўропе. Названыя дакументы і падняты ў той дзень І. Сталіным у Крамлі бакал шампанскага за здароўе А. Гітлера, як за лідэра, якога нібыта падтрымлівае нямецкі народ, былі па сутнасці благаслаўленнем адным дыктатарам іншага на развязванне Другой сусветнай вайны, пачаткам якой гісторыя лічыць напад 1 верасня 1939 года фашысцкай Германіі на Польшчу. Літаральна праз некалькі дзён у гэтую вайну амаль у якасці саюзніка агрэсара ўступіў і бальшавіцкі рэжым. Адабрэнне нападу фашысцкай Германіі на Польшчу і ўвод войскаў у заходнія вобласці Беларусі і Украіны, з якіх ужо ў першыя месяцы былі дэпартаваны ў раёны Сібіры і Казахстана тысячы ні ў чым не вінаватых людзей, правядзенне сумеснага ваеннага параду германа-фашысцоўскіх і савецка-бальшавіцкіх войскаў у Брэсце, зверскае знішчэнне польскіх афіцэраў у Катынскім лесе пад Смаленскам, ініцыятыва па развязванню вайны з Фінляндыяй, захоп Бесарабіі, акупацыя Прыбалтыйскіх дзяржаў - вось той няпоўны пералік злачынстваў бальшавізму, учыненых ім напачатку Другой сусветнай вайны па змове або ўзгадненню з фашызмам.

Недаацэньвалі як пагрозу для свету з`яўленне дзвюх экстрэмісцкіх і па сваёй сутнасці з самага пачатку варожых палітычных плыняў многія кіраўнікі і палітычныя дзеячы краін Заходняй Еўропы і Злучаных Штатаў Амерыкі. І гэта з`явілася адной з галоўных прычын мюнхенскіх уступак Гітлеру і вялага, галоўным чынам на словах, рэагавання на далейшыя злачынныя дзеянні па захопу новых тэрыторый абодвума дыктатарскімі рэжымамі.

І толькі з нападам гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз (ад намеру зрабіць гэта раней ці пазней Гітлер ніколі не адмаўляўся, як не адмаўляўся і Сталін устанавіць у сусвеце панаванне камуністычнага рэжыму), убачыўшы навіслую пагрозу цёмных сілаў рэакцыі над усім чалавецтвам, кіраўнікі многіх краін свету (перш за ўсё ЗША і Вялікабрытаніі) змаглі пераадолець палітычныя перашкоды і

пайшлі ў барацьбе з фашызмам на саюз з СССР, кіраўнікі якога, апынуўшыся перад смяротнай небяспекай, таксама супакоілі свае амбіцыі па ўстанаўленню камуністычных парадкаў ва ўсім свеце. Не скарыліся перад фашызмам прагрэсіўныя сілы ў акупаваных краінах, а таксама сапраўдныя патрыёты ў самой Германіі і саюзных з ёю дзяржавах.

Перамога над Германіяй і яе саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны пацвердзіла бясспрэчную перавагу аб`яднаных сілаў прагрэса над сіламі рэакцыі, трыумф здаровага сэнсу над цемрашальствам.

Другая сусветная вайна прынесла чалавецтву незлічоныя страты чалавечых жыццяў, мільёны калекаў і сірот, замест тысячаў гарадоў і вёсак яна пакінула папялішчы і груды руінаў, а там, дзе да вайны стаялі заводы і людскія сядзібы, засталіся стаяць адзінокія каміны і абпаленыя дрэвы. Беларусь выйшла з той вайны адным з найбольш пацярпелых рэгіёнаў свету. У рэспубліцы загінуў кожны чацвёрты яе жыхар. У гады вайны спалена ці зруйнавана больш як 200 гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу і больш як 9 тыс. вёсак, у выніку чаго каля 3 млн. людзей засталіся без даху. Сотні беларусаў былі вывезены фашыстамі ў Германію ў якасці працоўнай сілы, а яшчэ больш людзей пакінулі Беларусь па палітычных матывах у час уступлення на яе тэрыторыю Чырвонай Арміі (пазней яны знайшлі прытулак на самых розных кантынентах зямнога шару), больш чым паўмільёна жыхароў Беларусі выехалі за яе межы ў пасляваенныя гады ў сувязі з правядзеннем перасялення, звязанага са зменамі польска-беларускай мяжы; многія беларусы былі справядліва асуджаны за здзейсненыя імі ў гады вайны злачынствы, але яшчэ больш іх па палітычных матывах зноў апынуліся ў савецкіх турмах і канцлагерах Сібіры, Поўначы і Казахстана. Пры гэтым трэба падкрэсліць, што загінула, пацярпела і пакінула тэрыторыю Беларусі самая адукаваная і патрыятычна настроеная частка насельніцтва.

Юрыдычную ацэнку вынікаў Другой сусветнай вайны даў Нюрнбергскі працэс, на якім былі асуджаныя не толькі ваенныя злачынцы Германіі, але і сам фашызм як палітычная сістэма і ідэалогія. Першы раз у гісторыі агрэсія была прызнана цяжкім злачынствам супраць чалавецтва. Аднак гэта не было зроблена ў адносінах да другога дыктатарскага рэжыму. Карыстаючыся гэткай беспакаранасцю, бальшавізм змог усталяваць у пасляваенныя гады свой рэжым яшчэ ў некалькіх дзяржавах свету і стварыць так званы сусветны лагер сацыялізму, чым затрымаў развіццё многіх краін на цэлыя дзесяцігоддзі. І спатрэбіліся немалыя намаганні прагрэсіўнай часткі чалавецтва і працяглы час, каб бальшавізм як палітычная сістэма і ідэалогія прадэманстравалі сваю відавочную непрыгоднасць.

За гэтыя гады далёка наперад пайшлі ў развіцці эканомікі і дэмакратыі заходнія дзяржавы - былыя саюзнікі ў барацьбе з фашызмам, стала дэмакратычнай, цывілізаванай і высока развітай краінай і пераможаная ў Другой сусветнай вайне Германія. Няма ўжо і так званага сацыялістычнага лагеру, распаўся і сам Савецкі Саюз як апора экстрэмісцкай плыні бальшавізму. Пакутліва шукаюць свой шлях развіцця незалежныя дзяржавы, якія былі створаны на яго тэрыторыі. Усё больш накірунак у бок дэмакратычнага развіцця і ўсталявання сувязяў з заходнім светам робіць Расейская Федэрацыя як найбольш магутная на постсавецкай прасторы дзяржава.

Аднак, як паказалі падзеі апошніх гадоў, свет яшчэ не выпрацаваў імунітэту

супраць новага адраджэння былыхдыктатур. І найбольш слабаю ў гэтых адносінах часткаю еўрапейскага кантыненту апынулася Рэспубліка Беларусь. Рэцыдыў названых рэжымаў з`явіўся тут у выглядзе так званага лукашызму, які ўяўляе сабою сумесь фашызму і бальшавізму, здобраную махровым папулізмам. Верхавод рэжыму адкрыта заяўляў аб тым, што яго кумірам з`яўляецца Гітлер, а яго партрэты на перыядычна праводзімых яго атачэннем шоу выносяць побач з партрэтамі Сталіна. У Беларусі пад патранажам міністэрства ўнутраных спраў і КДБ створаныя базы па падрыхтоўцы расейскіх фашыстоўскіх баявых атрадаў РНЕ.

Новае праяўленне былых дыктатарскіх рэжымаў у Беларусі не магло расквітнець гэткім буйным цветам, ад якога цягне трупным смуродам адоленага 55 гадоў таму назад фашызму і пацярпелага катастрофу ў канцы 80-ых - пачатку 90-ых гадоў мінулага стагоддзя бальшавізму, каб яму не аказалі актыўную падтрымку былыя кіраўнікі кампартыі Беларусі і многія расейскія палітыкі шавіністычнага кшталту, і ў першую чаргу зноў-такі былыя і сённяшнія кіраўнікі КПРФ, што яшчэ раз сведчыць аб амаральнасці і злачыннасці бальшавізму як экстрэмісцкай палітычнай плыні і бесчалавечнай ідэалогіі і неабходнасці публічнага асуджэння яго міжнародным судом, як гэта было зроблена з фашызмам на Нюрнбергскім працэсе.

У апошні час у верхавода дыктатарскага рэжыму ў Беларусі, тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў якога скончыўся 20 ліпеня 1999 года і супраць рэжыма якога ўзбуджана крымінальная справа і вядзецца следства, зрабіў новы выпад супраць свайго народа і народаў краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы - прапанаваў кіраўнікам Расейскай Федэрацыі стварыць на тэрыторыі Беларусі 300-тысячную ваенную групоўку, што на практыцы азначае, па сутнасці, заклік да акупацыі рэспублікі замежным войскам і стварэнне ваеннай напругі ў рэгіёне.

Дарагія суайчыннікі! У якой бы краіне Вы ні жылі, у Беларусі ці за яе межамі, усе мы павінны зразумець тую небяспеку, якая навісла над нашай Радзімай - небяспеку страты ёю незалежнасці і дзяржаўнага суверэнітэту. У той жа час мы павінны зразумець і тую простую ісціну, што лёс Беларусі можа быць вырашаны, у рэшце рэшт, толькі самімі беларусамі. Нам могуць дапамагчы, але вырашаць нашыя праблемы ніхто за нас не будзе. Таму я звяртаюся да ўсіх Вас, паважаныя беларусы, і заклікаю Вас адкінуць усе дробныя разыходжанні паміж сабою і аб`яднацца вакол Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь як адзінага легітымнага заканадаўчага і вышэйшага прадстаўнічага, а пасля 20 ліпеня і адзінага легітымнага дзяржаўнага органа на тэрыторыі Беларусі ў імя святой справы - абароны свабоды і незалежнасці нашай маці - Беларусі і пазбаўлення яе ад дыктатарскай лукашысцкай брыдоты.

Беларусь павінна быць вольнай і незалежнай дзяржаваю, як аб гэтым было абвешчана Трэцяй Устаўной Граматаю 25 сакавіка 1918 года і як таго патрабуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Жыве Беларусь!

***(“Народная воля”, 25 красавіка 2000 года)***

# НА ЧУЖЫНЕ

**Гутарка карэспандэнта газэты "Эхо Литвы" са Старшынёю Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання Сямёнам Шарэцкім**

*Спадар Шарэцкі, як вы маглі б ахарэктарызаваць сучасную палітычную сітуацыю ў Беларусі?*

Як вядома, 20 ліпеня мінулага года скончыўся тэрмін, на які Лукашэнка быў абраны. І супраць яго рэжыму па факту захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам узбуджана крымінальная справа. Але зараз сваё прэзідэнцтва ён адлічвае ад рэферэндуму 1996 году. Аднак гэта не так! Значыць, падпісаў саюзную дамову з Расеяй ужо нелегітымны кіраўнік дзяржавы, якога ніхто, акрамя Расеі, не прызнае. Мы, і я ў тым ліку, некалькі разоў заяўлялі, што падпісаныя пасля 20 ліпеня Лукашэнкам і яго ўрадам дакументы, дамовы не будуць законнымі.

Аднак самае, мабыць жахлівае: ён жа "вызваліў" беларускі ўрад ад беларусаў... Там зараз усе ключавыя пасады, у тым ліку і Старшыні ўрада, займаюць рускія. Прычым не нарадзіўшыеся ў Беларусі, а прыехаўшыя з Расеі.

Большасць з іх - гэта вайскоўцы. Скажам, віцэ-прэм`ерам, які курыруе культуру, навуку, асвету Беларусі, з`яўляецца палкоўнік Замяталін. Безумоўна, расейскі палкоўнік, прыезджы. Вось ён і вымеў са сталіцы ўсе школы на беларускай мове, засталіся асобныя класы. На чале міністэрства абароны стаіць рускі генерал, МЗСам кіруе палкоўнік ФСБ. Такім чынам, усе прыезджыя...

*Але як бы там ні было, а ўсе дзяржавы, у тым ліку заходнія, маюць справу з сённяшнім прэзідэнтам, запрашуюць на саміты... Зыходзяць з рэальна існуючай сітуацыі. Дарэчы, і Вы, калі не памыляюся, гэта адзначалі, даючы ацэнку дзейнасці Камісіі Недалучыўшыхся Дзяржаў, КНГ АБСЕ ў Менску.*

Усе гэтыя перамовы, якія сёння, пасля ліпеня, распачаў Лукашэнка з апазіцыяй, і на што апазіцыя пайшла, ім жа і зрываюцца, таму што ніколі ён на доступ нас да СМІ не пойдзе. Пагэтаму, калі выбары не пройдуць свабодна, дэмакратычна, Вярхоўны Савет 13-га склікання сваю працу, згодна Канстытуцыі, працягне.

Паколькі ваша газэта карыстаецца папулярнасцю ў размаўляючага на рускай мове насельніцтва Літвы, хацеў бы яшчэ раз дадаць: а навошта Расеі Лукашэнка нелегітымны? Усё, што ён робіць, у рэшце рэшт, адштурхоўвае беларусаў ад Расеі. Беларусы вельмі добра адносіліся да расіян, я б сказаў, даверліва адносіліся. Зараз жа тое, што зроблена за апошні час, пачынаючы ад прыезду Строева, Селязнёва, Чарнамырдзіна і сканчаючы наступленнем па сутнасці на беларускасць, гэта ўсё супрацьпаставіла расіян беларусам. Беларусы пачалі глядзець на іх, як на прагнятальнікаў, як на людзей, якія зноў імкнуццаператварыць Беларусь у калонію, якой яна была ў царскі і савецкі час.

*Хіба ў Беларусі з`явіліся антырускія настрої?*

А што, Вы не бачылі па НТВ 26 красавіка, як выйшаў "Чарнобыльскі шлях"? У перадачы адкрыта гаварылася, што былі і антырасейскія лозунгі, і за захаванне Беларусі як дзяржавы. І калі, скажам, спадар Пуцін, пры ўсёй павазе да яго, прыехаў у нашу краіну і заявіў, што тут ёсць нейкія рускія інтарэсы, "нашы", як ён сказаў, дык, мабыць, патрэбна запытаць у беларускага народа, якія ў яго інтарэсы! Ці патрэбна запытаць толькі ў Лукашэнкі, якія яго інтарэсы?...

*Ну, мітынгі - гэта адно. Але цяжка паверыць, каб у быце, у пасляваенным жыцці ў беларусаў узніклі антырускія настрої.*

Вельмі кепска, вельмі. Вось я, напрыклад, перажываю за тое, што гэтыя настрої антырускія проста пашыраюцца. А Вы хацелі?! Пры гэтым узгадаю, у сталіцы няма ніводнай беларускай школы. Да чаго гэта прывядзе? Да чаго можа прывесці, калі асветай, навукай, культурай кіруе расіянін-палкоўнік? Дзе цяпер жыве Васіль Быкаў? У Германіі. Супраць якой калісьці ваяваў. Яна яму стала бліжэйшай, чым Расея. Старшыня Саюзу пісьменнікаў Уладзімір Някляеў выехаў у Польшчу. Людзі з`язджаюць з Беларусі ў Канаду, Аўстралію, Германію, Польшчу...

*Мы зноў вярнуліся да тэмы Захаду. Ён у сваёй палітыцы ўлічвае тое, што мае месца: прымае эмігрантаў і працуе з сённяшняй уладай.*

Дык не ваяваць жа з Беларуссю?! Не ўпадабляцца ж Лукашэнку! Я і мае калегі па Вярхоўнаму Савету вельмі заклапочаны, што ў Расеі ў адносінах да Беларусі верх узяла шавіністычная палітыка. Мы зараз з Вамі размаўляем дзе, у якім горадзе? Куды быў накіраваны Мураўёў. Дзе быў павешаны расейцамі выдатны сын беларускага народа Каліноўскі. Больш таго, да Мазурава ніколі - ні ў сталінскія, ні ўпаслясталінскія часы - першым сакратаром ЦК партыі не быў беларус. Таму "Курапаты", дзе расстралялі беларускіх патрыётаў, на сумленні тых, хто быў прысланы Масквою кіраваць Беларуссю. І пасля гэтага пасланць сюды генералаў і палкоўнікаў, якія растапталі беларускасць - культуру, мову! Як пасля гэтага?!

Гэта ж што ж такое?!

А калі Дарэнка з ГРТ гаворыць: не Беларусь, а расейскі калідор у Еўропу. Гэта мяне, як беларуса, зняважыла, пакрыўдзіла. Для Расеі Беларусь павінна быць дэмакратычная, незалежная, нейтральная краіна. Ад каго спадар Пуцін хоча нас бараніць? Гаворыць: калі патрэбна, мы абаронім Беларусь. Хто нападае на нас? Ці ён хоча бараніць Лукашэнку ад беларускага народа?

Вось гаварылі аб міжнародным супольніцтве. Маўляў, вымушана лічыцца са склаўшайся сітуацыяй. А яно можа паўплываць на працэсы ў Беларусі. Як? Ды праз Расею. Пакуль атрымліваецца так: яны даюць грошы Расеі, яна падтрымлівае рэжым Лукашэнкі. Ці ж спісаны Расеяй доўг у 300 млн. долараў не прыклад таму? Я не супраць таго, каб давалі грошы Расеі, але спадару Пуціну трэба ведаць, што гэтыя 300 млн. не пайшлі народу, а на ўтрыманне лукашэнкаўскай міліцыі.

*Спадар Шарэцкі, Вы ж аўтарытэтны, вядомы палітык. У Вас ёсць выхады*

*на замежжа. Ці можаце Вы паўплываць на мэтаскіраваную дапамогу Беларусі, на заходнія інвестыцыі ў эканоміцы, гаспадарку сваёй краіны?*

Магу. Але ў сучасных нашых умовах гэта зрабіць немагчыма.

*А Вы спрабавалі?*

Канешне... Безумоўна... Але Вы ведаеце аб тым, што нават гуманітарная дапамога праходзіць праз “сіта” лукашэнкаўскай адміністрацыі, праз прызначанага ім чалавека. Інакш, маўляў, усё раскрадуць. На самай справе, напрыклад, не перагружаючы, павезлі гэтую дапамогу ў Паўночную Карэю. Таму раіць Захаду інвеставаць грошы ў Беларусь - азначае, падтрымліваць рэжым, дапамагаць Лукашэнку.

*Але калі Вы эмігравалі і працягваеце выконваць функцыі Старшыні Вярхоўнага Савета, значыць, разлічваеце, што выбары могуць прынесці змены ў палітычнай сітуацыі ў краіне, што насельніцтва Вас падтрымае. Безумоўна, рэйтынгі Вам цяжка вызначыць, але як Вам здаецца, наколькі моцны ўплыў апазіцыі ў Беларусі?*

У нашых умовах гэта ў лічбах не высветліць. Але калі выбары будуць справядлівымі, адкрытымі, калі нам дадуць магчымасць напрамую - праз СМІ - выказаць сваю пазіцыю, упэўнены - людзі зробяць правільны выбар. Улада ж не можа належаць аднаму чалавеку, калі гэта не таталітарная, а дэмакратычная дзяржава. Сэрца дэмакратыі - парламент.

*Вы гаварылі аб трыбуне для выказвання сваёй пазіцыі. Мабыць, пакуль скарыстаецеся надаўшайся магчымасці?*

Мы - за сацыяльны арыентаваную рынкавую эканоміку з шматукладнымі формамі ўласнасці. Калі будзе магчымасць, гэткую пазіцыю выкажам і на Усебеларускім з`ездзе.

*Вы, дарэчы, ці прымаеце ўдзел у яго падрыхтоўцы? Навогул, мяркуючы па паведамленнях СМІ, выступам экпертаў, у тым ліку замежных, у беларускай апазіцыі няма адзінства. Адзначаюць і адсутнасць канкрэтных, эфектыўных прапаноўпа рэфармаванню эканомікі Беларусі.*

Ёсць у нас канструктыўныя падыходы. Ёсць! І свой погляд на рэформы маюцца. Акрытыкуюць нас, так бы мовіць, “увогуле”, не ўнікаючы звычайна ў нашы прапановы. Я лічу, што прыватызацыю патрэбна пачынаць з сярэдняга і дробнага бізнесу. І чэкавая прыватызацыя, як ў Расеі, таксама недапушчальна. Толькі рублёвая...

*У Літве на першым этапе таксама была чэкавая прыватызацыя...*

Ну і што гэта дало, да чаго прывяло?... А што тычыцца спрэчак у асяроддзі

апазіцыі - дык гэта нармальна, гэта і ёсць прыкмета дэмакратыі.

*Аднак спрэчкі часамі прымаюць у палітыцы гэткі востры характар, што прыводзяць да "разводаў" у, здавалася б, дружным, непахісным сямействе. Гэткія прыклады вы ведаеце і ў нашым Сейме. Ды і ў БНФ не ўсё гладка. Чуў, у Вас сур`ёзныя разнагалоссі з лідэрамі БНФ... Калі раскол, дакладней, "апазіцыя ў апазіцыі" - да Вас асабіста - прыме востры характар, Вы ў сэрцы "не плюнеце" на ўсё?*

Не, не лічу, што павінен зыходзіць з палітыкі. Мяне крытыкуюць па-рознаму. Адны патрабуюць, каб я сякеру ўзяў, другія - навошта, маўляў, гэты ВярхоўныСавет патрэбен. Няхай людзі, беларусы, скажуць, якога лідэра яны хочуць бачыць. А маналітным можа быць толькі дыктатарскі рэжым, і тое толькі па бачнасці.

*Вы аб будучых выбарах? А калі "працэс" пойдзе не па вашаму "сцэнару", гэта значыць, не гэтак, як вы бачыце, будуць вынікі... Ну, скажам, невыгадныя для апазіуцыі тэрміны, не дадуць вам гаварыць з народам праз СМІ... Увогуле, калі Лукашэнка нейкім чынам перашкодзіць свабоднаму волевыяўленню мас, не паўстанне ж падымаць...*

Так, паўстанне! Гэта старшная цана, гэта кроў. Але дыктатуру, лукашэнкаўскі рэжым інакш не адолець! Але Расея, якая яго падтрымлівае, выкарыстоўвае двайныя стандарты: у сябе можна па ТБ паказваць "Куклы", а ў Беларусі адзін чалавек узурпаваў уладу, не дае свабодадумства, на гэта заплюшчваюць вочы. Не, апазіцыя наша, калі не будзе свабоды слова, у выбарах удзельнічаць не стане. І няхай гэты грэх на сябе возьме Расея, якая падтрымлівае дыктатара, назваўшага ў канцы 1995 года сваім кумірам Адольфа Гітлера. Не трэба расейскім палітыкам адыходзіць ад адказнасці. Яны ведаюць гэтае выказванне Лукашэнкі. Гэта не працуе на аўтарытэт Расеі.

*І працягнецца спроба стварыць урад у выгнанні? Вы, калі не памыляюся, калісьці выказваліся за гэта. Што ўдалося зрабіць, ці фармуеце кабінет?*

Я не магу расказваць усё, што раблю... Шмат чаго...

*Ды што мы ўсё аб палітыцы... Як Вам у Літве жывецца?*

Я ж не дома, на чужыне. Адарваны ад радзімы. Цяжка жывецца.

*Гутарку вёў Барыс Закс*

***("Эхо Литвы", 5 мая 2000 года)***

# ВЫСТУП НА МІТЫНГУ КАЛЯ БЕЛАРУСКАЙ АМБАСАДЫ

**29 мая 2000 года**

Дарагія суседзі! Сябры!

Уся гісторыя нашых народаў вучыць, што мы павінны быць разам, як і ў 1863 годзе, калі супраць аднаго ворага - расейскага шавінізму - выступалі разам атрады пад кіраўніцтвам беларуса Кастуся Каліноўскага і паляка Сігізмунда Серакоўскага, а таксама літоўскія сяляне на чале з Анастасам Мацякявічусам.

Сёння ўсё той жа расейскі шавінізм зноў падняў галаву. Для ажыццяўлення сваёй палітыкі плацдармам ён зрабіў Рэспубліку Беларусь, якую цягнуць у ствараемы ваенна-палітычны саюз, які па колькасці ўваходзячых у яго дзяржаў і па сваёй тэрыторыі, з`яўляецца азіяцка-еўрапейскім.

Тэрыторыяй падпісання гэткага саюза абрана невыпадкова. За некалькі месяцаў да гэтага ў расейскіх газэтах была надрукавана канцэпцыя новай ваеннай дактрыны. У ёй недвухсэнсоўна сказана, што саюз Беларусі з Расеяй дае магчымасць разблакаваць ізаляцыю Калінінградскага абарончага рэгіёна.

Узнікае пытанне - як? Вядома ж, што Беларусь не мяжуе з гэтай вобласцю! Мяркую, што адказ на гэтае пытанне кожнаму вядомы. І ці не з гэтай жа мэтаю палкоўнік ФСБ Урал Латыпаў, адзін з прадстаўнікоў незаконнага дыктатарскага рэжыму ў Беларусі, праехаў усю тэрыторыю Літвы, аж да мора.

І яшчэ не паспелі абсохнуць далоні ад спацелых пацісканняў рук у тых, хто прымаў названага прадстаўніка той жа канторы, што і Уладзімір Пуцін, як ужо ў Беларусі ўсплыў на той жа хвалі шавінізму, зноў-такі, на якой усплыў і Пуцін, генерал Усхопчык.

Генерал выдатна ведае і тэрыторыю Беларусі, і тэрыторыю Літвы. Пры гэтым яго ўжо не палохае пах крыві літоўскага народа.

Створаны азіяцка-еўрапейскі саюз мае сваю мэту, нібыта, у тым ліку і барацьбу з тэрарыстамі. Але зноў-такі ўзнікае пытанне: дзе на тэрыторыі Беларусі тэрарысты? Хіба іх збіраюцца завезці сюды, а пасля пад выглядам барацьбы з імі ўвядуць на тэрыторыю Беларусі расейскія войскі ці ўзброенныя фармаванні спецслужбаў, а далей, глядзіш, з`явіцца пагроза для рускіх і ў Калінінградзе?!

Усё гэта вельмі насцярожвае, тым больш, што вопыт падобных злачынстваў на гэтай тэрыторыі накоплены ў 1939-1940 гадах. Ды і ва Усхопчыка таксама ёсць вопыт не барацьбы з тэрарыстамі, а з мірнымі жыхарамі Літвы, якія маюць права на сваю дзяржаву і ніякія Усхопчыкі не могуць яго адняць.

Паважаныя сябры!

Тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі закончыўся 20 ліпеня мінулага года. Супраць узначальваемага ім рэжыма ўзбуджана крымінальная справа і вядзецца следства. У сувязі з гэтым я, як кіраўнік цяпер адзінага легітымнага дзяржаўнага органа ў Беларусі - Вярхоўнага Савета - заяўляю яшчэ раз, што ўсе дамовы і іншыя дакументы, у тым ліку і аб стварэнні ўзгаданага саюза, і указ аб прызначэнні на пасаду Усхопчыка, падпісаныя былым прэзідэнтам і незаконна, насуперак Канстытуцыі, назначаныя ім на пасады асобы, да якіх адносіцца і палкоўнік Латыпаў, з самага пачатку з`яўляюцца незаконнымі. Таму іх чакае той жа лёс, які здарыўся і з ганебным “пактам Молатава-Рыбінтропа”.

Паважаныя суседзі!

Мы, беларусы, сёння разам з вамі, як і многія дэпутаты Вярхоўнага Савета былі разам з вамі ў тыя трывожныя віленскія дні, калі на гэтай мірнай зямлі свае злачынствы здзяйснялі “усхопчыкі” і тыя, хто іх сюды накіроўваў.

Мы сёння разам з вамі кляймім ганьбай тыя злачынствы і запэўніваем вас, што з адхіленнем ад улады незаконнага дыктатарскага рэжыму Беларусь будзе добрай міралюбівай суседкай Літвы.

Дзякуй за ўвагу!

KAMUNIKAT.org

# УДЗЕЛ АПАЗІЦЫІ Ў ВЫБАРАХ БУДЗЕ САДЗЕЙНІЧАЦЬ ЛЕГІТЫМІЗАЦЫІ ІСНУЮЧАГА Ў БЕЛАРУСІ РЭЖЫМУ

Удзел беларускай апазіцыі ў парламенцкіх выбарах будзе толькі садзейнічаць легітымізацыі існуючага ў краіне рэжыму. Такое меркаванне ў інтэрв`ю БелаПАН выказаў Старшыня Вярхоўнага Савета 13-га склікання Сямён Шарэцкі, які бярэ ўдзел у Міжнародным кангрэсе па ацэнцы злачынстваў камунізма, што праходзіць у Вільні.

Удзел у выбарах, лічыць спікер, магчымы толькі ў выпадку выканання ўладамі ўмоў, сфармуляваных Прэзідыумам Вярхоўнага Савета на паседжанні 5 чэрвеня. Сярод іх - доступ апазіцыі да дзяржаўных СМІ, перагляд паўнамоцтваў парламента, вызваленне палітзняволеных, вышук прапаўшых без вестак апазіцыянераў і спыненне праследу грамадзян па палітычных матывах. Вырашэнню гэтых задач, на думку С. Шарэцкага, маглі б садзейнічаць перамовы паміж уладамі і апазіцыяй, якія, аднак, былі сарваныя па віне Аляксандра Лукашэнкі. Улады, як зазначыў спікер, пажадалі падмяніць працэс перамоў дыялогам, які ні да чаго не абавязвае.

Сямён Шарэцкі таксама "халаднавата" ставіцца да заявы Лукашэнкі аб абвяшчэнні ў Беларусі "перыяду міру" і непагаршэння ўмоў дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб`яднанняў, якая была агучана 30 мая на паседжанні дыялогу грамадска-палітычных сіл. "Зараз партыі фактычна аддзелены ад сродкаў масавай інфармацыі, на іх ідуць ганенні, бясследна знікаюць палітычныя апаненты Лукашэнкі. Што яшчэ можна пагоршыць?" - сказаў С. Шарэцкі. Адзінае, чаго хочуць дамагчыся ўлады падобнымі маніпуляцыямі, - гэта ўцягнуць апазіцыю ў свае так званыя парламенцкія выбары і легітымізаваць рэжым, лічыць спікер Вярхоўнага Савета.

*Юрый Пацёмкін*

***("Народная воля", 15 чэрвеня 2000 года)***

# ВІНШАВАННЕ
# IV КАНГРЭСУ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ
**2 ліпеня 2000 года**

Паважаныя ўдзельнікі і госці Кангрэсу Дэмакратычных Сіл Беларусі!

Вітаю Вас з пачаткам працы гэтага знамянальнага ў жыцці беларускага народа форума. Зараз наша Айчына перажывае вельмі складаны і адказны перыяд сваёй гісторыі. І ад прынятых на Кангрэсе рашэнняў у многім будзе залежаць яе далейшы лёс.

Таму нелігітымнаму, антынароднаму, дыктатарскаму рэжыму, які пануе на Беларусі, сёння можна і патрэбна супрацьпаставіць аб`яднанне і адзінства дзеянняў усіх дэмакратычных сіл. Пагэтаму пытанне аб кансалідацыі ўсіх палітычных і грамадскіх аб`яднанняў і выпрацоўка адзінай пазіцыі ў адносінах да будучых выбараў, якія разглядаюцца на сённяшнім Кангрэсе, з`яўляюцца ў вышэйшай ступені актуальнымі.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, як адзінага легітымнага заканадаўчага і вышэйшага прадстаўнічага, а пасля 20 ліпеня 1999 года і адзінага вышэйшага дзяржаўнага органа на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ужо выказаў сваё прынцыповае бачанне на адносіны да будучых выбараў. Такое бачанне супадае з тымі рашэннямі, якія былі выпрацаваны на кансультатыўных нарадах палітычных партый дэмакратычнага накірунку з удзелам прадстаўнікоў Кансультатыўна-Назіральнай Групы АБСЕ па Беларусі. Гэтыя рашэнні і пералічаныя ў іх умовы, на мой погляд, і могуць стаць тым грунтам, абапіраючыся на які, сапраўды можна правесці ў рэспубліцы свабодныя дэмакратычныя выбары. У выпадку невыканання ўказаных умоў і патрабаванняў удзел у выбарах, як ужо падкрэслівалася ў Заяве Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 5-га чэрвеня 2000 года, з`яўляецца немагчымым.

Жадаю IV Кангрэсу Дэмакратычных Сіл Беларусі плённай працы і прыняцця рашэнняў, якія будуць садзейнічаць рэальнаму выхаду са склаўшайся ў краіне крызіснай сітуацыі.

# ПРЫЙШОЎ ЧАС ПАКАЗАЦЬ:
# МЫ ТАКСАМА ЛЮДЗІ!

**Да 10-ай гадавіны з дня прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі і пачатку працы Усебеларускага З`езду**
**27 ліпеня 2000 года**

95 гадоў таму назад у вершы "А хто там ідзе?" вялікі пясняр беларускага народу Янка Купала на поўны голас сказаў аб тым, што беларусы не хочуць быць век пагарджанымі, сляпымі і глухімі. Яны хочуць "людзьмі звацца". І гэтае жаданне беларусаў супадае з аб`ектыўнай тэндэнцыяй развіцця чалавецтва, якая вядзе, у рэшце рэшт, да стварэння кожным народам свайго нацыянальнага добраўладкаванага дому - сваёй суверэннай, дэмакратычнай, прававой дзяржавы. Бо, як паказвае гісторыя, толькі наяўнасць гэткай дзяржавы забяспечвае яго незалежнасць і права самому вырашаць свой лёс, а таксама стварае магчымасць абараніць правы і свабоды кожнага чалавека. Але, на жаль, дарога ў гэтай "агромністай" грамады беларусаў да жадаемай мэты аказалася вельмі цярністай.

Спроба беларусаў адрадзіць сваю незалежную дзяржаву ў 1918 годзе скончылася толькі абвяшчэннем 25 сакавіка незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, дэкларацыяй свабоды слова, друку, забастовак і арганізацый, фармаваннем урада, зацвярджэннем у якасці дзяржаўнай нацыянальнай сімволікі (бел-чырвона-белага сцяга і герба "Пагоні") ды прыняцця некалькіх мер па адраджэнню беларускай культуры і арганізацыі асветы на беларускай мове. Але, пры ўсім тым, гэтыя крокі аказалі значны ўплыў на развіццё самасвядомасці ў беларускага народа, а таксама паказалі ўсяму свету, што ў цэнтры Еўропы ёсць такі народ як беларусы, і ён, як і іншыя народы, хоча мець сваю дзяржаўнасць. Разам з тым абвяшчэнне незалежнасці БНР і яе практычныя крокі па адраджэнню беларускай нацыянальнай культуры выкрылі ўсю хлусню шавіністычных колаў Расеі, прыдумаўшых тэорыю "западно-руссизма" і сцвярджаўшых, што "название Беларусь есть географический термин и не имеет особого этнографического значения, потому что ни особой народности, ни даже племени белорусского не существовало…" (Русский энциклопедический словарь, т.4, отдел I, ст. 570).

Са стварэннем незалежнай, вольнай Беларускай Народнай Рэспублікі ніяк не маглі пагадзіцца бальшавікі, якія, захапіўшы ў кастрычніку 1917 года ўладу, адразу паставілі сваёй задачай стварэнне сусветнага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, а з канца 20-ых - пачатку 30-ых гадоў і наогул узялі на ўзбраенне шавіністычную палітыку царскай Расеі і сталі ажыццяўляць яе пад сцягам барацьбы з надуманым нацыяналізмам і стварэннем міфічнай адзінай камуністычнай нацыі. Створаная 1 студзеня 1919 года ў Смаленску ў якасці альтэрнатывы БНР Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь толькі на паперы лічылася суверэннай дзяржавай. На самай жа справе з першых дзён яе існавання ўсе вышэйшыя кіраўнікі рэспублікі прызначаліся Масквою, а першыя сакратары ЦК Кампартыі Беларусі да 1956 года нават не былі беларусамі. Сотні тысяч беларускіх патрыётаў, у тым ліку ўсе былыя актывісты БНР, большасць пісьменнікаў і вучоных сталі ахвярамі той нацыянальнай злачыннай палітыкі, якую праводзілі бальшавіцкія ўлады. І толькі ў канцы дваццатага стагоддзя створаная на

месцы царскай Расеі новая імперыя - Савецкі Саюз - стала распадацца разам з развалам пабудаванага бальшавікамі таталітарнага сацыялізму. Убачыўшы бездапаможнасць кіраўніцтва КПСС і СССР на чале з М. Гарбачовым, рэспублікі адна за адною пачалі прымаць рашэнні аб дзяржаўным суверэнітэце і шукаць выйсця з “турмы народаў”, якой былі царская Расея і яе нашчадак Савецкі Саюз. Дарэчы, прыклад у гэтым паказала Расейская Федэрацыя. Беларусь прыняла Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце 27 ліпеня 1990 года, а ў жніўні гэтага ж года Дэкларацыі была нададзена сіла закона.

Дзяржаўны суверэнітэт, гаварылася ў Дэкларацыі, абвяшчаецца ў імя вышэйшай мэты свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна на аснове забеспячэння правоў асобы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і міжнароднымі абавязацельствамі. 15 сакавіка 1994 года была прынята і сама Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, згодна з якой наша краіна з`яўляецца унітарнай дэмакратычнай прававой сацыяльнай дзяржавай. Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку.

На жаль, абраны згодна з прынятай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь прэзыдэнт, замест выканання сваіх перадвыбарчых лозунгаў барацьбы з карупцыяй і вываду краіны з крызісу, пад сваёй апекай стварыў нябачаную дагэтуль у рэспубліцы карупцыйную структуру - Упраўленне справамі прэзідэнта. Больш таго, амаль з першых дзён ён стаў праводзіць палітыку на ўзурпацыю ўлады і аб`яднаннне Рэспублікі Беларусь з Расейскай Федэрацыяй з мэтай стварэння ўмоў для таго, каб можна было вылучыць сваю кандыдатуру ў прэзідэнты вялікай дзяржавы. З дапамогай манапалізаваных сродкаў масавай інфармацыі людзям стала ўбівацца ў галовы, што Беларусь нібыта не можа жыць без Расеі. Пачала абражацца беларуская мова і зноў фальсіфікавацца гісторыя Беларусі. Але памехай, якая не дазваляла дыктатару здзейсніць названыя злачынствы, сталі Вярхоўны Савет і Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь. Менавіта таму і спатрэбілася хутка правесці так званы лістападаўскі (1996г.) рэферэндум, каб пазбавіцца ад гэтых канстытуцыйных органаў. Пасля здзяйснення дзяржаўнага перавароту быў створаны новы кішэнны парламент, які, падобна фашыстоўскаму савету пры дуча Мусаліні, не мае ні самастойнасці ў матэрыяльным забяспечэнні сваёй работы, ні заканадаўчай ініцыятывы. Кішэнным стаў і Канстытуцыйны Суд. Зліквідавана самастойнасць судовай улады.

Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусь зараз адсутнічае самы галоўны прынцып дэмакратыі - гэта падзел уладаў па выкананню дзяржаўных функцый на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Уся ўлада сканцэнтравана ў руках дыктатара, тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў якога скончыўся 20 ліпеня 1999 года. Таму створаны ім рэжым стаў з названага часу не толькі антынародным, якім ён быў, пачынаючы з лістапада 1996 года, але і злачынным, захапіўшым і ўтрымліваючым уладу неканстытуцыйным шляхам. У сувязі з гэткім фактам 1 снежня 1999 года Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь узбудзіў крымінальную справу.

Каб неяк сябе легітымізаваць, дыктатарскі рэжым спрабуе завесці міжнародную супольнасць у зман і правесці па свайму сцэнару, які супярэчыць міжнародным дэмакратычным прынцыпам, абранне так званай Палаты. Дзеля гэтага рэжым спачатку пагадзіўся нібыта пайсці на перамову з апазіцыйнымі яму

сіламі і ўдзелам членаў Кансультатыўна-Наглядальнай Групы АБСЕ. Але, як адзначана ў Заяве Парламенцкай Тройкі АБСЕ ад 22 чэрвеня 2000 года, па-першае, у працэсе размоваў аб перамовах практычна не дасягнута ніякіх значных станоўчых змен у вобласці пашырэння паўнамоцтваў новага парламента;

па-другое, нязначна палепшылася і празрыстасць выбарчага працэсу і не гарантуецца склад выбарчых камісій, у які ўваходзілі б прадстаўнікі розных палітычных сілаў;

па-трэцяе, адбыўся малы прагрэс і ў вобласці доступа ўсіх палітычных партый да СМІ, няма гарантыі гэтага доступу і на перыяд перадвыбарчай кампаніі. І ўпартасць рэжыма ў вырашэнні гэтых пытанняў тлумачыцца тым, што галоснасць і празрыстасць уздзейнічаюць на дыктатарскія рэжымы згубна, як сонечны свет на плесню;

па-чацвёртае, у краіне працягваецца парушэнне правоў чалавека, што выразілася ў знікненні вядомых палітыкаў В. Ганчара і Ю. Захаранкі, бізнесоўца А. Красоўскага, прысудаў па справах М. Чыгіра, М. Статкевіча, В. Шчукіна. Дарэчы, гэта падцвердзілася і ў апошнія дні ў сувязі са знікненнем журналіста Дзмітрыя Завадскага.

У склаўшайся сітуацыі ў краіне, гаворыцца далей у Заяве Парламенцкай Тройкі, “дэлегацыя не змагла б рэкамендаваць сваім інстытутам накіраваць міжнародных наглядальнікаў за парламенцкімі выбарамі ў Беларусі восенню гэтага года”. З гэткімі ацэнкамі прадстаўнікоў міжпарламенцкіх арганізацый згодны Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і прадстаўнікі дэмакратычных партый, аб чым апошнія заявілі ў Рэзалюцыі Кангрэса дэмакратычных сіл Беларусі “Пра адносіны да выбараў”. Больш таго, Кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі ў названай Рэзалюцыі адзначыў, што ў выпадку невыканання чатырох адпаведных умоў, лічыць немагчымым удзел у выбарах партый і арганізацый, што ўваходзяць у Каардынацыйную Раду дэмакратычных сілаў.

Аб неабходнасці выканання чатырох мінімальных умоў, устаноўленых Парламенцкай Тройкай АБСЕ для таго, каб за выбарамі ажыццяўляўся міжнарождны нагляд і каб да іх можна было адносіцца з даверам, гаворыцца і ў Рэзалюцыі “Па пытанню аб Беларусі”, якая была прынята на толькі што адбыўшайся ў Бухарэсце Парламенцкай Асамблеі АБСЕ.

Але, безумоўна, самае важнае стратэгічнае значэнне мае зараз пытанне аб захаванні дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь, разгляду якога будзе прысвечаны Усебеларускі З`езд. З`езд адбудзецца 29 ліпеня 2000 года ў сталіцы рэспублікі - горадзе Мінску. Праўда, у сувязі з абраннем у Расейскай Федэрацыі прэзідэнта і адсутнасцю ў бліжэйшы час перспектывы для беларускага дыктатара распаўсюдзіць сваю ўладу на Расейскія прасторы, у апошнія месяцы ён таксама загаварыў аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь. Прычым нават стаў чытаць дыклады на беларускай мове. Але, па-першае, усе гэтыя яго размовы аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі будуць адбывацца толькі да з`яўлення новых магчымасцяў гуляць на расейскім полі. Так ужо было ў час прэзідэнцтва Ельцына: калі апошні захворваў, беларускі дыктатар пачынаў гульню ў Расейскіх рэгіёнах, калі ачуньваў - супакойваўся і дыктатар. А, па-другое, беларускі дыктатар у гэтым так далёка зайшоў, што ўжо вырашэнне самага важнага для будучага лёсу Беларусі пытання - захаванне суверэнітэта Рэспублікі Беларусь - стала мала ад яго залежыць. Не займаўшыся на працягу мінулых гадоў рэфармаваннем эканомікі

і збліжэннем яе з еўрапейскай, дыктатарскі рэжым паставіў краіну ў значную эканамічную залежнасць ад Расеі. Ды і ва урадзе Рэспублікі Беларусь усе ключавыя пасады, пачынаючы цяпер ужо з прэм`ера, займаюць расіяне. Галоўнымі канструктарамі палітыкі і ў прэзідэнтуры з`яўляюцца таксама Расейскія палкоўнікі. Да сказанага трэба дадаць, што ў самой Расейскай Федэрацыі ў апошні час відавочна вызначылася тэндэнцыя да ўстанаўлення таксама дыктатарскага тыпу кіравання і ўзмацнення вялікадзяржаўнай шавіністычнай палітыкі.

Пералічаныя факты красамоўна падцвярджаюць, што вастрыня пытання аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь не змяншаецца. Таму правядзенне Усебеларускага З`езду, на якім будзе абмеркавана названае пытанне, з`яўляецца ў вышэйшай ступені актуальным і своечасовым. У гэтай сувязі Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прыняў рашэнне аб удзеле дэпутатаў Вярхоўнага Савета ва ўказаным форуме. Спадзяюся, шгто дэпутаты аднясуцца да гэтага станоўча і з павагай. А прынятыя на Усебеларускім З`ездзе дакументы прадэманструюць перад усім светам волю беларускага народа на вырашэнне пытання аб суверэнітэце яго дзяржавы, тым больш, што арганізатары З`езда робяць усё для таго, каб дэлегаты на ім прадстаўлялі ўсе вугалкі Беларусі і ўсе пласты яе насельніцтва.

Што тычыцца мяне асабіста, дык я цалкам падтрымліваю ідэю правядзення Усебеларускага з`езда і выказаў Аргкамітэту сваю просьбу залічыць мяне яго дэлегатам. Зараз я хачу выказаць і сваю думку наконт вырашэння пытання, якое будзе разглядацца на Усебеларускім З`ездзе:

Беларусь павінна не толькі вярнуцца на дэмакратычны шлях развіцця і быць незалежнай дзяржавай, але і, будучы у добрых адносінах з усімі суседзямі, імкнуцца ўступіць ва ўсе еўрапейскія структуры, што, як паказвае практыка, стварае неабходныя ўмовы для стабільнага развіцця эканомікі і вырашэння многіх сацыяльных пытанняў, гарантуе, што не менш важна, абарону ад пасягнення на яе цэласнасць і суверэнітэт. Нам патрэбна ісці ў еўрапейскі цывілізаваны свет, а не туды, куды нас цягне антынародны, па свайму нацыянальнаму складу і правядзенню палітыкі, па сутнасці, акупацыйны прарасійскі дыктатарскі рэжым.

Няхай жыве Незалежная, Вольная Беларусь, якой яе абвясціла Рада БНР яшчэ 25 сакавіка 1918 года, і Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі 1990 года!

***(“Рунь”, 3 жніўня 2000 года)***

## УСЕБЕЛАРУСКАМУ З`ЕЗДУ
**29 ліпеня 2000 года**

Паважаныя ўдзельнікі і госці Усебеларускага З`езду!

Дзесяць гадоў таму назад Вярхоўны Савет на сваім паседжанні прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Потым Дэкларацыі была нададзена сіла Закона, а ў снежні 1991 года кіраўнікамі трох рэспублік (Беларусі, Расеі і Украіны) было падпісана Пагадненне аб стварэнні СНД, якое паставіла апошнюю кропку ў існаванні Савецкага Саюза. Беларусь стала суверэннай незалежнай дзяржавай. У якасці дзяржаўнай Рэспубліцы была зноў вернута нацыянальная сімволіка - Бел-Чырвона-Белы Сцяг і Герб “Пагоня”.

Усё гэта стала лагічным працягам барацьбы беларускага народа за адраджэнне сваёй дзяржаўнай незалежнасці, аб неабходнасці якой было заяўлена ўжо на Усебеларускім з`ездзе ў снежні 1917 года. На жаль, па загаду прарасейскага бальшавіцкага кіраўніцтва Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронта той з`езд быў разагнаны салдацкімі штыкамі і прыкладамі.

Але воля беларускага народа была непахіснай на вызначэнне неад`емнага права мець сваю дзяржаўнасць. І першым практычным крокам у гэтым накірунку стала стварэнне вясною 1918 года Беларускай Народнай Рэспублікі і абвяшчэнне яе незалежнай і свабоднай дзяржавай.

Але сёння зноў, як і на пачатку XX стагоддзя, над Беларуссю навісла пагроза страты дзяржаўнага суверэнітэта і незалежнасці. Пануючы зараз на Беларусі прарасейскі нелігітымны дыктатарскі рэжым паставіў нашу краіну ў значную эканамічную і палітычную залежнасць ад Расеі і праводзіць актыўную работу па далучэнню Беларусі да Расейскай Федэрацыі, што з`яўляецца проціпаказаным еўрапейскаму менталітэту беларускага народа і груба парушае Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. І таму правядзенне Усебеларускага з`езду, на якім будзе разгледжана пытанне аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, з`яўляецца ў вышэйшай ступені актуальным і своечасовым. У гэтай сувязі Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прыняў рашэнне аб удзеле дэпутатаў ва ўказаным форуме.

Жадаю Усебеларускаму З`езду плённай працы і прыняцця рашэнняў, якія будуць садзейнічаць умацаванню дзяржаўнага суверэнітэта Беларусі, што з`яўляецца вышэйшай свяшчэннай каштоўнасцю кожнага народа.

Няхай жыве Незалежная, Вольная Беларусь, якой яе абвясцілі Рада БНР 25 сакавіка 1918 года і Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі 1990 года, і што замацавала Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у сакавіку 1994 года!

# ВОЛЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Цяпер няма ў свеце сумленнага беларуса, які не лічыў бы самай значнай падзеяй 2000 году Усебеларускі З`езд, што адбыўся напрыканцы ліпеня ў Менску і выказаў волю беларускага народа на будучыню нашай бацькаўшчыны.

Першы Усебеларускі З`езд быў праведзены ў снежні 1917 года. І на ім галоўным пытаннем, аб якім на якім на з`ездзе разгарнуліся гарачыя спрэчкі, таксама было пытанне аб суверэнітэце Беларусі. Адна частка дэлегатаў выступала за аддзяленне Беларусі ад Расеі ды яе самавызначэнне па ўзору еўрапейскіх краінаў, другая - за самавызначэнне Беларусі ў складзе РСФСР на савецкай аснове.

Для таго, каб зразумець, які з названых накірункаў быў больш слушны, неабходна пры іх аналізе абапірацца на грамадскія законы і сусветны досвед, якія сведчаць пра тое, што дэмакратычны шлях развіцця краінаў патрабуе суверэнітэту іхніх народаў, інакш кажучы, права вызначаць свой лёс самім. Без поўнага суверэнітэту, які можна здабыць толькі стварыўшы сваю нацыянальную дзяржаву, не можа быць і поўнай дэмакратыі, нельга забяспечыць поўную свабоду і правы ўсіх людзей.

У шматнацыянальнай дзяржаве заўжды ёсць тытульная нацыя, мова якой з`яўляецца дзяржаўнай і чые прадстаўнікі, будучы прызначанымі генерал-губернатарамі, сакратарамі ЦК нацыянальных кампартыяў, упаўнаважанымі прэзідэнта і гэтак далей - імкнуцца дыктаваць сваю волю іншым нацыям. Таму кожная нацыя, калі яна хоча быць суверэннай, павінна мець сваю дзяржаву. І ў суадносінах паміж суверэннымі народамі і захаваннем цэласнасці той ці іншай дзяржавы павінны аддаваць перавагу першаму. І зусім незразумела, чаму, напраклад, захаванне нейкай надуманай “цэласнасці Расейскай Федэрацыі” у ахвяру трэба прыносіць лёс іншых народаў.

Шматнацыянальнымі дзяржавамі могуць быць толькі дзяржавы з феадальна-манархічным або дыктатарскія рэжымам кіравання. Дарэчы, каб захаваць цэласнасць Расейскай Федэрацыі, апошні з названых рэжымаў там і ўстанаўліваецца. Прыкметай гэтага з`яўляецца адраджэнне ў якасці тыпу дзяржаўнага кіраўніцтва цэнтралізму, які ў былым Савецкім Саюзе прыкрываўся эпітэтам “дэмакратычны”.

Тады ж, амаль 80 гадоў назад, Расейская імперыя, як і іншыя манархіі феадальнага тыпу, развальвалася. У Польшчы і Фінляндыі, на Украіне і ў Беларусі прыйшлі ў рух сілы, якія павялі барацьбу за самавызначэнне нацыяў. І на Усебеларускім з`ездзе 1917 года таксама перамаглі тыя, хто хацеў бачыць Беларусь самастойнай дзяржавай.

Але з гэтым не хацелі мірыцца бальшавікі, якія, захапіўшы ў кастрычніку 1917 года ўладу ў Петраградзе, паставілі сваёй задачай стварэнне Саюзу Савецкіх Рэспублік. Загадам кіраўніцтва прарасейскага Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту Усебеларускі з`езд быў разагнаны салдацкімі прыкладамі і штыкамі. Камандаваў разгонам начальнік Менскага гарнізона Крывашэін, які сам у той момант быў на добрым падпітку.

На жаль, няўдачнай аказалася спроба адрадзіць дзяржаўную незалежнасць

Беларусі і вясною 1918 года. незалежнасць была толькі абвешчана. У якасці дзяржаўнай была зацверджана сімволіка: бел-чырвона-белы сцяг і Герб “Пагоня”. Пэўныя крокі былі зроблены і ў адраджэнні беларускай культуры, арганізацыі асветы на беларускай мове.

Толькі пасля распаду Савецкага Саюзу, у якім панаваў класічны таталітарны лад, і працягвалася русіфікацыя іншых народаў, беларусы адрадзілі сваю дзяржаўнасць. Але з гэтым зноў не могуць змірыцца шавіністычныя колы тае самае Расеі. Яны на самым высокім дзяржаўным узроўні падтрымалі ў лістападзе 1996 года здзяйсненне ў Беларусі дзяржаўнага перавароту, пасля якога ў краіне быў усталяваны дыктатарскі рэжым, а ключавыя пасады ва ўрадзе занялі расейцы. Расейскія палкоўнікі павялі рэй і ў Прэзідэнтуры. Над Беларуссю зноў навісла пагроза страты свайго дзяржаўнага суверэнітэту. Рэальнай небяспекай гэтаму стала так званая дамова аб стварэнні адзінай саюзнай дзяржавы з Расеяй, падпісаная 8 снежня 1999 года ў Маскве.

І сёння кожны сумленны грамадзянін Беларусі, кожны беларус, незалежна ад краіны яго пражывання, не можа стаяць у баку ад падзеяў, якія адбываюцца ў нашай краіне, і павінен усвядоміць сваю адказнасць за будучыню Беларусі. І таму ў вышэйшай ступені актуальным і своечасовым з`яўляецца той факт, што ў Менску быў зноў скліканы Усебеларускі З`езд.

Усебеларускі З`езд ад імя беларускага народа, які згодна з Канстытуцыяй, ёсць адзінай крыніцай дзяржаўнай улады, аднагалосна прыняў “Акт незалежнасці Беларусі”. У акце засведчана, што права мець сваю незалежную дзяржаву дадзена беларускаму народу Богам, а таму З`езд і абвясціў гэтае права неад`емнай каштоўнасцю нашага народа.

Воляй беларускага народа дэлегаты Усебеларускага З`езду, якія з`ехаліся з усіх куткоў краіны і прадстаўлялі ўсе пласты насельніцтва, прызналі немаючымі законнай сілы любыя пагадненні і рашэнні, скіраваныя на скасаванне або абмежаванне суверэнітэту Беларусі. У звязку з гэтым не больш як нікчэмным трэба лічыць папярэджанне міністэрства юстыцыі ўпаўнаважаным беларускім народам дэлегатам Усебеларускага З`езду пра тое, што іхнія рашэнні нібыта не будуць мець ніякай сілы.

Цяжка сказаць, чым кіраваліся тыя, хто рыхтаваў і падпісваў гэтае “папярэджанне”. Няўжо яны не разумеюць, што прэзідэнцкія паўнамоцтвы дыктатара, якога яны працягваюць падтрымліваць, скончыліся год таму - 20 ліпеня 1999 года? Ці яны сапраўды лічаць легітымным гэтак званы рэферэндум (лістапад 1996 года), які праводзіўся з дапамогай бронетэхнікі, аўтаматчыкаў з аховы прэзідэнта, хлусні і грубай фальсіфікацыі вынікаў галасавання? Гэты “рэферэндум” па-ранейшаму не прызнае сусветная супольнасць, акрамя шавіністычнага кшталту палітыкаў усё той самай Расеі. А супраць прарасейскага дыктатарскага рэжыму Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь узбудзіў і вядзе крымінальную справу паводле факту захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам. І я, як Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, што з`яўляецца адзіным легітымным заканадаўчым і вышэйшым прадстаўнічым, а цяпер ужо і адзіным дзяржаўным, органам на тэрыторыі краіны, - не стаўлю пад сумнеў незаконнасць і злачыннасць таго прарасейскага рэжыму, які сёння пануе ў Беларусі і верхаводам якога падпісана ў Маскве згаданая дамова аб стварэнні нейкай “саюзнай дзяпржавы”. І, безумоўна, не выклікае сумневу законнасць “Акту Незалежнасці Беларусі”,

прынятага Усебеларускім З`ездам 29 ліпеня 2000 года ў Менску, сталіцы суверэннай, незалежнай дзяржавы - Рэспублікі Беларусь.

Я цалкам падтрымліваю прыняты Усебеларускім З`едам Акт і ўслед за яго дэлегатамі заклікаю ўсіх суайчыннікаў, незалежна ад нацыянальнасці, веравызнання і месцазнаходжання, згуртавацца вакол ідэяў З`езду.

Разам з яго дэлегатамі звяртаюся да міжнародных арганізацый, урадаў дэмакратычных дзяржаў, сусветнай грамадскасці аказаць дапамогу беларускаму народу ў забеспячэнні гарантыяў суверэнітэту сваёй дзяржавы.

Жыве Беларусь!

***(“Наша ніва”, 7 жніўня 2000 года)***

KAMUNIKAT.org

# ВЫСТУП НА З`ЕЗДЗЕ
# БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫКІ
**2 верасня 2000 года**

Паважаныя суайчыннікі!

Няма слоў, якімі можна было б выказаць свае ўражанні пачуцці ад убачанага ў гэтым далёкім па адлегласці, але вельмі блізкім па падыходу ідэй да нашай агульнай Бацькаўшчыны - Беларусі - цудоўным куточку Амерыкі.

Шчырае вам дзякуй за гэта. Усё гэта, зробленае Вамі, і ёсць сведчанне таму, што ідэі 25 сакавіка 1918 года з`яўляюцца неўміручымі і непераможнымі.

Дзякуй вам і за тое, што вы запрасілі мяне і майго сябра спадара Хведара Нюньку на з`езд беларусаў Паўночнай Амерыкі, які безумоўна, з`яўляецца знакавай падзеяй у жыцці ўсяго беларускага народа.

Шаноўныя сябры!

Я не хацеў бы забіраць час на падрабязную характарыстыку таго, што зараз адбываецца ў Беларусі. Вы аб гэтым ведаеце. Я хацеў бы выказаць толькі адну думку наконт таго, аб чым я пачаў гаварыць ужо ўчора на паседжанні Рады БНР і аб чым так эмацыйна гаварыў Шукелойць.

Так, самым галоўным ворагам беларускага народа сёння, як і ў гады царскага самадзяржаўя, як і ў гады камуністычнага ленінска-сталінскага рэжыму, з`яўляецца расейскі шавінізм.

Ды і сам камуністычны рэжым па сваёй сутнасці з`яўляецца таксама дзяржаўнай формай, якая выкарыстоўвалася для пашырэння расейскай экспансіі на іншыя тэрыторыі.

Падхопленая бальшавікамі ідэя сусветнай камуністычнай рэвалюцыі, як і абвяшчэнне ў свой час Масквы Трэцім Рымам, мелі адну і тую ж мэту - ідэалагічна абгрунтаваць стварэнне таталітарнай Расейскай імперыі. І аб гэтым вельмі ўдала сказаў паважаны мною пісьменнік Кастусь Акула:

З Масквы, з Крамля праз сёлы і гумны
Чумою антычалавечай
Паўзе праклятая камуна,
Каб нам жыццё навек скалечыць.

З прыходам у Расейскай Федэрацыі КДБ, якое заўжды называла сябе ўзброеным атрадам КПСС, расейскі шавінізм звязвае адраджэнне сваёй былой палітыкі. Менавіта таму ў апошні час замену Ельцыну шукалі сярод прадстаўнікоў гэтай арганізацыі, якая пачынаючы ад Аракчэева і Мураўёва і прадаўжаючы Дзяржынскім, Ягодай,Яжовым, Берыяй, Андропавым, умее праводзіць сваю, часцей за ўсё звязаную з морам крыві, палітыку з халоднай галавой і гарачым сэрцам, а пасля здзейсненага злачынства памыць рукі, звярнуўшы ўсю віну на сваю ахвяру. Яскравым прыкладам у гэтым з`яўляецца вайна ў Чачні.

З пераабраных Прымакова, Сцяпашына і Пуціна найбольш прыгодным для названай мэты аказаўся апошні. Безпамылковасць у выбары кандыдатуры падцвердзілі як адкрытыя заявы, так і яго дзеянні.

Што тычыцца Беларусі, дык гэта лабараторыя, дзе ўсё тым жа КДБ адпрацоўваюцца спосабы адраджэння былога дыктатарскага рэжыму ў новых

умовах і выкарыстанне на прыкладзе Лукашэнкі марыянеткі пры ажыццяўленні ўсё той жа расейскай шавіністычнай палітыкі. Усё, што ўчора напрацавана ў Беларусі, сёння ўкараняецца ў Расеі. Пуцін ужо заявіў, што вядомыя палітыкі патрабуцюь ад яго пачаць шукаць ворагаў і садзіць у турмы. Адкрыта ён заявіў і аб інтарэсах Расеі не толькі ў Беларусі, але і на Балканах.

Як для прарасейскага акупацыйнага на тэрыторыі Беларусі рэжыму, так і для ўрада самога Пуціна, сцэнары пішуцца ў адной і той жа канторы. А звярніце ўвагу на сінхроннасць дзеянняў:

Лукашэнка едзе да Мілошавіча, а зараз да Фідэля Кастра, сам жа Пуцін шукае станоўчых рысаў у рэжыме Паўночнай Карэі. Абодва адкрыта гавораць аб сваіх добрых адносінах да рэжыму Садама Хусэйна;

У Расеі выпрацоўваюць, а праз Беларусь забяспечваюць дыктатарскія рэжымы зброяй.

Беларусь стала адкрыта выкарыстоўвацца для новага пранікнення расейскага шавінізму на тэрыторыю Прыбалтыкі.

Паважаныя суайчыннікі!

Аб усім гэтым я гавару для таго, каб паказаць, што дыктатарскі рэжым у Беларусі - гэта не нешта самастойнае, а створаны КДБ сродак для ажыццяўлення сваёй мэты - адраджэння таталітарнага ладу і ажыццяўлення палітыкі расейскага шавінізму. І ў барацьбе за незалежнасць Беларусі мы маем справу менавіта з гэтым заклятым ворагам.

На службу расейскага шавінізму сёння ў Расеі зноў пастаўлена ўсё: эканоміка, знешняя палітыка, аб`яднанне камунізму і распуціншчыны, Руская праваслаўная царква.

Для ажыццяўлення яго палітыкі зноў не шкадуюць ні сродкаў, ні людзей: чачэнцаў, беларусаў... Ды і саміх рускіх.

І ў гэтым нам трэба пераканаць урады цывілізаваных дэмакратычных краін, і ў прыватнасці Злучаных Штатаў Амерыкі і Канады.

Недаацэньваць варожасць і небяспеку для чалавецтва адраджэнне на тэрыторыі Расеі дыктатарскага рэжыму з яго палітыкай экспансіі было б раўназначна зноў наступіць на тыя ж самыя граблі.

Жадаю поспехаў з`езду беларусаў Паўночнай Амерыкі, а кожнаму з вас моцнага здароўя.

Жыве Беларусь!

# ВЫБАРЫ ЦІ… ЛЕГІТЫМІЗАЦЫЯ РЭЖЫМУ?

Свае адносіны да выбараў у так званую "Палату" я ўжо выказваў у інтэрв`ю газэце "Народная воля" (15 чэрвеня 2000 года). У прыватнасці ў гэтым інтэрв`ю падкрэслівалася, што Прэзідыум Вярхоўнага Савета лічыць рэальным выхадам са склаўшайся сітуацыі правядзенне дэмакратычных выбараў Парламента і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пры выкананні наступных умоў:

1) Аднаўленне заканадаўчых функцый Парламента ў адпаведнасці з палажэннямі, замацаванымі ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994 года).
2) Прывядзенне выбарчага заканадаўства ў адпаведнасць з нормамі міжнароднага права і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994 года).
3) Доступ да дзяржаўных СМІ прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных партый, грамадскіх арганізацый, дэпутатаў Вярхоўнага Савета 13 склікання.
4) Спыненне пераследу грамадзян па палітычных матывах. Прыняцце вычарпальных мераў па росшуку зніклых вядомых палітычных дзеячоў.

Пасля гэтая заява Прэзідыума была зацверджана сесіяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

У інтэрв`ю я таксама падкрэсліў, што без выканання пералічаных умоў удзел беларускай апазіцыі ў парламенцкіх выбарах будзе толькі садзейнічаць легітымізацыі кіруючага ў краіне рэжыму.

Яшчэ раней падобныя ўмовы ўдзелу ў выбарах былі распрацаваны і ўзгоднены паміж прадстаўнікамі апазіцыйных сіл, прадстаўнікамі існуючага рэжыму ў Беларусі і кіраўніцтвам Кансультатыўна-Наглядальнай Групы АБСЕ. З імі пагадзіліся і прадстаўнікі рабочай Групы АБСЕ ў Беларусі, якую ўзначальвае Адрыян Севярын.

2 ліпеня 2000 года Кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі таксама падцвердзіў у сваёй рэзалюцыі, што без выканання пералічаных умоў "любыя выбары ператвараюцца ў фарс, удзел у якім для дэмакратычных сіл немагчымы". Больш таго, Кангрэс заклікаў міжнародныя арганізацыі, парламенты і ўрады дэмакратычных краін заявіць, што ў выпадку невыканання гэтых умоў выбары ў Беларусі не могуць быць прызнанымі легітымнымі і дэмакратычнымі.

На жаль, асобныя дэпутаты Вярхоўнага Савета, а таксама некаторыя з тых, хто ўдзельнічаў у Кангрэсе дэмакратычных сілаў Беларусі, праз некалькі дзён пасля яго правядзення сталі заклікаць да ўдзелу ў выбарах, прызначаных нелігітымным рэжымам на 15 кастрычніка ўжо без усялякіх умоў. А многія з іх і актыўна ўключыліся ў выбарчую кампанію ў якасці кандыдатаў у дэпутаты. Я не буду пералічваць іх прозвішчы і крытыкаваць іх дзеянні. Няхай гэта застанецца на іх сумленні.

Здзіўляе іншае. Трэцяя Тэхнічная Канферэнцыя АБСЕ ў Вене, якая адбылася 30 жніўня 2000 года, і у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі Дзеючага Старшыні АБСЕ, Парламецкай Асамблеі АБСЕ, КНГ АБСЕ, Генеральнага Сакратара АБСЕ, Еўрапейскага Парламента, Еўрапейскай Камісіі, Аўстрыйскай дэлегацыі ў АБСЕ, Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы, дэлегацыі Міжпарламенцкай Асамблеі СНД, а таксама прадстаўнікі афіцыйных беларускіх уладаў і Кансультатыўнага Савета апазіцыйных палітычных партый, знайшла нейкі

прагрэс ва ўсіх чатырох умовах, звязаных з арганізацыяй дэмакратычных выбараў. У гэтай сувязі неабходна ўзгадаць, што знікненне вядомых палітычных дзеячоў: Віктара Ганчара і Юрыя Захаранкі, а таксама Анатоля Красоўскага і Зміцера Завадскага адбылося ў перыяд правядзення трохбаковых паседжанняў. І ўлады нічога не робяць па іх росшуку. Працягваюцца і здзекі над сям`ёю Міхаіла Чыгіра. Арыштоўваліся і рэпрэсаваліся іншыя члены апазіцыі. Дык які ж гэта прагрэс?! На мой погляд, гэта проста кашчунства ў адносінах да сем`яў, родных і блізкіх зніклых і пацярпелых.

Па сутнасці няма ніякага прагрэсу і ў адносінах доступу прадстаўнікоў апазіцыі да сродкаў масавай інфармацыі. Бо ці ж можна лічыць прагрэсам тое, што прадстаўнікам апазіцыі даецца магчымасць выступіць па тэлебачанню дзве-тры хвіліны, а пасля на працягу паўгадзіны прадстаўнікі дыктатарскага рэжыму паліваюць іх брудам.

Ніякіх крокаў не зроблена і ў адносінах прывядзення выбарчага заканадаўства ў адпаведнасць да міжнародных нормаў і да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Ужо не кажучы пра тое, што няма ніякага падзелу функцый паміж уладамі (заканадаўчай, выканаўчай і судовай): па сваіх функцыях “Палата” па-ранейшаму застаецца кішэнным парламентам дыктатарскага рэжыму.

Мабыць, усё гэта і прымусіла прадстаўнікоў еўрапейскіх структур прызнаць, што гэты прагрэс усё ж такі не дастатковы для задавальнення “міжнародна ўзгодненых крытэрыяў”. Дык тады незразумелым з`яўляецца і рашэнне аб пасылцы тэхнічнай місіі на выбары ў Беларусь. Тым больш, што, як і трэба было прадбачыць, гэтае рашэнне Трэцяй Тэхнічнай Канферэнцыі ў Вене ўжо выкарысталі прадстаўнікі дыктатарскага рэжыму і прадставілі прыезд тэхнічнай місіі АБСЕ як сапраўдных наглядальнікаў, што нібыта аўтаматычна пацягне за сабою прызнанне выбараў легітымнымі. І ўжо зусім незразумела, якім чынам прысутнасць Парламенцкай Тройкі і тэхнічнай місіі на выбарах будзе садзейнічаць развіццю і ўмацаванню дэмакратыі ў Беларусі, калі кіраўнік дыктатарскага рэжыму не аднойчы заяўляў, што яму ўсё роўна, якія высновы зробяць дадзеныя прадстаўнікі. І гэта не проста заявы. На практыцы ён працягвае рабіць сваю справу - вычышчаць урад Беларусі ад беларусаў, далей змыкацца з прадстаўнікамі шавіністычных колаў Расеі і кіраўнікамі камуністычнай экстрэмісцкай плыні, якія ставяць сваёй задачай інкарпарацыю Беларусі ў склад Расейскай Федэрацыі.

У склаўшайся сітуацыі застаецца толькі адна надзея - розум усё ж такі павінен узяць верх. І як і прадугледжана пунктам 10 “Заключэння і Рэкамендацый Трэцяй Тэхнічнай Канферэнцыі АБСЕ ў Вене”, погляды еўрапейскіх структураў на запланаваны фарс дыктатарскага рэжыму ў Беларусі могуць быць перагледжаны ў адпаведнасці з рэальнай сітуацыяй у Беларусі. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што выбары ў так званую “Палату” стануць пробай сілаў перад будучымі прэзідэнцкімі выбарамі і надзвычай важна, каб ужо зараз перамогу атрымала не хлусня і цемрашальства, а здаровы сэнс.

***(“Рунь”, 20 верасня 2000 года)***

# СПЫНІЦЬ НАСТУП ДЫКТАТУРЫ!

**Заява Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь на прэс-канферэнцыіі 19 верасня, Вільня**

Як ужо неаднаразова паведамлялася, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь лічыць рэальным выхадам з канстытуцыйнага крызісу, склаўшагася ў Беларусі пасля дзяржаўнага перавароту (лістапад 1996г.), канструктыўныя перамовы паміж усталяваўшымся ў краіне рэжымам і апазыцыйнымі яму сіламі. У сувязі з гэтым я яшчэ раз хачу выказаць удзячнасць кіраўніцтву АБСЕ і іншых міжнародных арганізацый, а таксама парламентам і ўрадам цывілізаваных краін, якія з самага пачатку не прызналі легітымным так званы лістападаўскі (1996г.) рэферэндум і падтрымалі Вярхоўны Савет як адзіны заканадаўчы і вышэйшы прадстаўнічы орган на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Хацеў бы адзначыць і тую вялікую працу, якую правялі КНГ, Рабочая Група АБСЕ па Беларусі і Тройка Прадстаўнікоў АБСЕ, Еўрапарламента і Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы па падрыхтоўцы перамоў аб правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь свабодных дэмакратычных парламенцкіх выбараў.

Аднак, як Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і кіраўнік Беларускай дэлегацыі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, заяўляю, што надуманыя выбары ў так званую "Палату", якія дыктатарскі рэжым збіраецца правесці ў Беларусі ў кастрычніку 2000 года, не могуць лічыцца легітымнымі з самага пачатку.

Па-першае, дадзеныя выбары прызначаны грамадзянінам А. Лукашэнка, тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў якога скончыўся 20 ліпеня 1999 года і супраць рэжыма якога ўзбуджана крымінальная справа па факту захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам.

Па-другое, ад арганізацыі выбараў адхілена законна ўтвораная Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь Цэнтральная выбарчая камісія на чале з дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Віктарам Ганчаром, а іх правядзенне даручана групе асобаў, якую ўзначальвае Л. Ярмошына, прызначаная на сваю пасаду былым прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь яшчэ да так званага рэферэндуму (лістапад 1996г.) у парушэнне Канстытуцыі і дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Па-трэцяе, па віне дыктатарскага рэжыму так і не пачаліся трохбаковыя перамовы па стварэнню ў краіне ўмоў для правядзення свабодных дэмакратычных выбараў, ужо не кажучы аб тым, што не выканана ні адна з умоў для правядзення гэткіх выбараў, распрацаваных і узгодненых паміж прадстаўнікамі выканаўчых уладаў, аб`яднанай апазыцыі, кіраўніцтвам КНГ АБСЕ і Рабочай Групай АБСЕ на чале з А. Севярынам. Больш таго, менавіта ў час перамоваў да зніклага раней былога Міністра унутраных спраў Рэспублікі Беларусь Юрыя Захаранкі, прыбавілася знікненне яшчэ і Першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета, Старшыні ЦВК Рэспублікі Беларусь Віктара Ганчара, вядомага бізнесоўца Анатоля Красоўскага і журналіста Зміцера Завадскага. Пры гэтым нагадаю, што адной з умоў арганізацыі парламенцкіх выбараў з`яўляецца атрыманне адказу ад сілавых структураў аб лёсе і месцазнаходжанні зніклых, што не зроблена да сённяшняга дня.

Працягваюцца здзекі над сям`ёю вядомага палітыка Міхаіла Чыгіра. Рэпрэсаваліся ў перыяд перамоў іншыя актыўныя прадстаўнікі апазыцыі рэжыму, у тым ліку адбылося судзілішча над дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Андрэем Клімавым, падвяргаліся адміністрацыйным арыштам дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, член Парламенцкай Асамблеі АБСЕ Анатоль Лябедзька і дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Валеры Шчукін. Працягвае заставацца ў месцах зняволення ў свой час арыштаваны і асуджаны з парушэннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь дэпутат Вярхоўнага Савета Уладзімір Кудзінаў. І гэта ў той час, калі адной з умоў правядзення выбараў таксама прадугледжвалася спыненне рэпрэсій супраць іншадумцаў.

Па сутнасці не выконваецца і ўмова па доступу прадстаўнікоў апазыцыі да сродкаў масавай інфармацыі.

Нічога істотнага не зроблена і па прывядзенню выбарчага заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі нормамі права і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Надуманыя і арганізоўваемыя рэжымам выбары плануецца правесці ў кішэнны орган дыктатара, які нават не мае заканадаўчай ініцыятывы, не гаворачы ўжо пра ўладныя функцыі.

Пад прыкрыццём перамоў дыктатар і створаны ім прарасейскі і па сутнасці акупацыйны ў адносінах да беларускага народа рэжым працягвае рабіць сваю злачынную справу - вычышчаць урад Беларусі ад беларусаў, далей змыкацца з прадстаўнікамі шавіністычных колаў Расеі і кіраўнікамі камуністычнай экстрэмісцкай плыні, якія ставяць сваёй задачай інкарпарацыю Беларусі ў склад Расейскай Федэрацыі. Гэта асабліва небяспечна яшчэ і таму, што ў самой Расеі сёння да ўлады прыйшло КГБ і ўсталёўваецца дыктатарскі рэжым.

Усё гэта сведчыць аб тым, што ніякага прагрэсу па выкананню трохбаковых умоў для правядзення свабодных і дэмакратычных выбараў у Беларусі не адбылося. І зусім не зразумела, як яго маглі знайсці на Трэцяй Тэхнічнай Канферэнцыі АБСЕ у Вене.

У сучасны момант з боку дыктатарскага рэжыму, як гэта і трэба было чакаць, здзяйсняецца падман пры інфармаванні насельніцтва Беларусі па Рэкамендацыях і Заключэнню Трэцяй Тэхнічнай Канферэнцыі АБСЕ, якая адбылася ў Вене 30 жніўня 2000 года. Яе рашэнне па накіраванню ў Беларусь тэхнічнай місіі падаецца людзям як рашэнне АБСЕ прыслаць на выбары паўнавартасных міжнародных наглядальнікаў і што нібыта аўтаматычна прывядзе да прызнання гэтых выбараў легітымнымі.

На жаль, трэба прызнаць, што гэткай хлусні з боку дыктатарскага рэжыму садзейнічае адсутнасць прынцыповай ацэнкі Трэцяй Тэхнічнай Канферэнцыі АБСЕ рэальнага становішча ў Беларусі і прынятае ёю рашэння па накіраванню на выбары ў Беларусь тэхнічнай місіі з незразумелымі для насельніцтва паўнамоцтвамі.

У сувязі са сказаным, я звяртаюся да Старшыні Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, кіраўніка Рабочай Групы АБСЕ па Беларусі спадара Адрыяна Севярына перагледзець, згодна з пунктам 10 Заключэння і Рэкамендацый Трэцяй Тэхнічнай Канферэнцыі АБСЕ, рашэнні, якія былі прыняты 30 жніўня 2000 года.

Пакуль не позна, трэба спыніць наступ дыктатуры ў Беларусі!

***(“Наша ніва”, 9 кастрычніка 2000 года)***

# УЗНІКНЕННЕ ПАРЛАМЕНТАРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ

**Выступ на Міжнароднай канферэнцыі “Праблемы парламентарызму ў Беларусі”, Вільня, 29 верасня 2000 года**

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Гісторыі вядомыя дзве формы дзяржаўнага кіравання: манархічная і рэспубліканская. Манархія (ад грэчаскага слова manarchia - адзінаўладства) - гэта такая форма праўлення, пры якой найвышэйшая дзяржаўная ўлада цалкам ці часткова належыць адной асобе і звычайна перадаецца (але можа і не перадавацца) ў спадчыну.

Рэспубліка (паходзіць ужо ад лацінскага respublica - грамадская справа) - гэта такая форма праўлення, пры якой вышэйшыя органы дзяржаўнай улады выбіраюцца на пэўны тэрмін.

Манархіі бываюць: саслоўныя, абсалютныя і канстытуцыйныя. Найбольш ранняй формай манархіі была саслоўная, пры якой улада манарха апіралася на органы саслоўнага прадстаўніцтва: гараджан, духавенства, дваранства.

Абсалютная манархія - гэта такая форма кіравання дзяржавай, пры якой вярхоўная ўлада неабмежавана належыць адной асобе, якая апіраецца не на саслоўе, а на магутны бюракратычны цэнтралізаваны дзяржаўны апарат.

Пры канстытуцыйнай манархіі ўлада манарха абмяжоўваецца парламентам, таму гэткая форма манархіі называецца яшчэ абмежаванай.

Рэспубліканская форма кіравання дзяржавай таксама дзеліцца на прэзідэнцкую і парламенцкую. У першай на чале дзяржавы стаіць прэзідэнт (ад лацінскага presidens - літаральна, які сядзіць наперадзе). Прэзідэнт абіраецца на тэрмін, вызначаны канстытуцыяй, прамымі (Расея, Беларусь, Літва і інш.), ускоснымі (ЗША, дзе прэзідэнта абіраюць спецыяльныя выбаршчыкі) і шматступенчатымі (Францыя). У гэткіх рэспубліках прэзідэнт узначальвае і ўрад (ЗША, Францыя, Расея, Беларусь). Прэзідэнту падпарадкуюцца і ўзброеныя сілы, разведка. Ён мае права вета, памілавання.

У парламенцкіх рэспубліках урад фармуецца парламенцкай большасцю і нясе перад ім (а не перад прэзідэнтам, як у першых) адказнасць. У гэткіх рэспубліках нават сам прэзідэнт можа абірацца парламентам ( Чэхія, Латвія), але можа і насельніцтвам усёй краіны (Літва).

Рэспубліканская форма кіравання дзяржавай, як найбольш прагрэсіўная ў параўнанні з манархіяй, была вядома ўжо рабаўладальніцкаму ладу (Карфаген, Рым, Афіны, Венецыя, Фларэнцыя).

Дэмакратычныя асновы дзяржаўнага кіравання былі ўласцівы і першай дзяржаве на тэрыторыі Беларусі - Полацкаму княству. Для вырашэння розных пытынняў склікаліся агульныя сходы палачан. І роля гэткага народнага веча (ад старажытнаславянскага вяшчаць, гаварыць) на пачатку XII стагоддзя вырасла да такой велічыні, што на ім вырашаліся пытанні вайны і міру, запрашэнне і выганне князёў. Напрыклад, у 1151 годзе Полацкае веча выгнала князя Рагвалода Барысавіча і пасадзіла на княжацкі трон мінскага князя Расціслава Глебавіча. Веча кантралявала дзейнасць князёў і ажыццяўляла вышэйшы суд.

У вырашэнні спраў на гэткіх вечавых сходах удзельнічала ўсё

паўнавартаснае мужчынскае насельніцтва, якое склікалася вечавым звонам ці вяшчальнікамі. Рашэнне прымалася выкрыкамі адабрэння.

Веча, як форма кіравання дзяржаўнымі справамі, было вядома таксама старажытным грэкам, германцам, чэхам, палякам, харватам і наўгародцам. У Ноўгарадскай феадальнай рэспубліцы, як і ў Полацкім княстве, фактычная ўлада належала не князю, а вечу. У Ноўгарадзе на ім выбіраліся пасаднікі, тысяцкія і архіепіскап, якія і вырашалі пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, распараджаліся казною. Пры гэтым адзначым, што князь, выконваючы функцыі ваеначальніка, быў абмежаваны ў праве суда.

Аднак далейшыя шляхі пры развіцці формаў дзяржаўнага кіравання на тэрыторыі Беларусі і Расеі пайшлі ў розных накірунках. Створанае ў XIII стагоддзі Вялікае Княства Літоўскае было шматнацыянальнай дзяржавай і ўяўляла сабою па форме дзяржаўнага кіраўніцтва своеасаблівую федэрацыю, у якой утвораныя замест княстваў ваяводствы мелі вялікія правы. Напрыклад, тыя ж палачане, землі якіх канчаткова ўвайшлі ў Вялікае Княства Літоўскае ў 1307 годзе, мелі права прызначаць ваяводу “па іх волі”. Была абмежаванай і судовая ўлада ваяводаў воляю баяраў і мяшчан. “А воеводе нашему Полоцкому мешчан не судити одному, судити ему с бояры - мешчаны” - гаварылася ў земскіх прывілеях.

У Вялікім Княстве Літоўскім абмежаванай была і ўлада Вялікага князя. Закон 1492 года ўстанаўліваў, што ў выпадку разыходжання меркаванняў Вялікага Князя з рашэннямі Рады князь абавязаны быў выконваць рашэнні Рады. Як і ў былым Полацкім княстве, Вялікі князь, як ужо сказана, не быў свабодным і ў прызначэнні ваяводаў.

Дэмакратызм назіраўся таксама і ў адносінах паміж прадстаўнікамі розных народнасцяў і рэлігій. Феадалы рознага этнічнага паходжання і розных вер уяўлялі сабою адну сацыяльную групу. Сведчаннем гэтаму з`яўляецца тое, што ў найвышэйшым органе ўлады - Гаспадарскай Радзе - не сустракалася груповак, якія б утварыліся на аснове этнічных ці рэлігійных адрозненняў.

Такім чынам, Вялікае Княства Літоўскае увайшло ў сусветную гісторыю як адна з першых еўрапейскіх дзяржаў, што стварала ўнікальны ўзор палітычнага і грамадскага ладу, прававой дэмакратыі, мірнага суіснавання розных народаў і царкоўна-рэлігійных сістэм. У гэтым плане трэба падкрэсліць асаблівую ролю прыняцця ў XVI стагоддзі Статутаў Вялікага Княства Літоўскага. Першы Статут быў прыняты ў 1529 годзе. Ён складаўся з 13 раздзелаў, першыя тры з якіх былі прысвечаны дзяржаўнаму праву. Статут замацоўваў права ваяводаў абіраць Вялікага князя, які, зразумела, надзяляўся вялікімі правамі выканаўча-гаспадарчай дзейнасці, быў галоўнакамандуючым войскамі і кіраваў знешняй палітыкай дзяржавы.

Але, акрамя Гаспадарскай Рады, уладу Вялікага князя абмяжоўваў і Сойм, які вырас з мясцовых вечаў і з`яўляўся саслоўна-прадстаўнічым органам. У працы Сойму прымалі ўдзел паслы, якія абіраліся ад паветаў. Сойм вырашаў пытанні, звязаныя з вайною і мірам, устанаўліваў падаткі на ваенныя патрэбы, разглядаў крымінальныя справы па абвінавачванню паноў у дзяржаўнай здрадзе. На яго пасяджэннях вырашаліся і некаторыя міжнародныя пытанні. На пасяджэннях Рады і Сойму старшынстваваў Маршалак земскі. Дарэчы, акрамя іншых функцый, менавіта Маршалак земскі даваў дазвол і на наведванне Вялікага князя са скаргамі і просьбамі.

Зародак падзелу ўладаў па функцыях назіраўся і ў тым, што дзяржаўнай канцылярыяй кіраваў канцлер, які да таго ж узначальваў дзяржаўны архіў і захоўваў дзяржаўную пячатку. Канцлер і яго намеснік (падканцлер) прымалі актыўны ўдзел у распрацоўцы заканадаўчых актаў. Дзяржаўную казну захоўваў Падскарбі земскі. І тут трэба падкрэсліць, што ўсе гэтыя службовыя асобы прызначаліся не Вялікім князем, а Радаю.

Дэмакратычнасць у кіраванні Вялікім Княствам Літоўскім праявілася і ў тым, што на прыняты Статут улады не глядзелі як на нешта застылае. І калі высветлілася, што ён патрабуе свайго ўдасканалення, дык для ўнясення з гэтай мэтаю пэўных прапаноў была створана камісія (зноў-такі зазначым) у складзе 5 каталікоў і 5 праваслаўных. Новы Статут Вялікага Княства Літоўскага быў прыняты ў 1566 годзе. Пры гэтым нельга не адзначыць вялікай ролі пры распрацоўцы прапаноў па ўдасканаленню Статута вядомага ў тыя гады юрыста і дыпламата, кальвініста па веравызнанню Еўстафія Валовіча. У якасці земскага Падскарбія ён удзельнічаў у распрацоўцы судова-адміністрацыйнай рэформы, згодна з якой павінен быў адбыцца падзел судовай і адміністрацыйнай уладаў. А паколькі ў 1566 годзе Валовіч абіраецца падканцлерам, у яго з`явілася магчымасць прыняць непасрэдны ўдзел ужо і ў рэдагаванні новага Статута.

Вялікая заслуга Валовіча заключаецца яшчэ і ў тым, што ён падрыхтаваў сабе замену на пасадзе канцлера ў асобе таленавітага палітычнага, грамадскага і ваеннага дзеяча Льва Сапегі. У 1581 годзе, ужо будучы канцлерам, Еўстафій Валовіч, падканцлер Хрыстафор Радзівіл і Леў Сапега, які ў той час працаваў пісарам пры двары Стэфана Баторыя, стварылі Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага - апеляцыйны дзяржаўны суд. Дадзены крок, акрамя ўмацавання законнасці, прадэманстраваў свету моц і сілу дзяржавы, яе здольнасць забяспечыць абарону сваіх грамадзян.

З імем Льва Сапегі звязана падрыхтоўка і выданне ў 1588 годзе Трэцяга Статута Вялікага Княства Літоўскага. Статут гарантаваў княству эканамічную і культурную незалежнасць, што было вельмі важна пасля Люблінскай уніі 1569 года, у выніку якой на базе Вялікага Княства Літоўскага і Польскай кароны была створана новая дзяржава - Рэч Паспалітая. Статутам істотна абмяжоўваліся правы манарха Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. У прыватнасці ў Статуце на гэты конт гаварылася: “Таксама мы, гасудар, абяцаем і клянёмся, што ў той дзяржаве, Вялікім Княстве Літоўскім і ва ўсіх землях, якія належаць яму, не будзем даваць ва ўладу ніякім замежнікам духоўных і свецкіх пасадаў, замкаў, маёнткаў, зямель, старостваў, дзяржаў, абавязаны даваць гэта толькі Літве, Жамойці і Русі, сваякам і народжаным у вялікім Княстве Літоўскім і тых землях, якія яму належаць”.

Вышэйшым заканадаўчым органам Вялікага Княства Літоўскага лічыўся Вальны (агульны) Сойм з месцам знаходжання ў Слоніме.

Кадыфікацыя крымінальнага закону і выданне Статутаў Вялікага Княства Літоўскага сведчыць аб тым, што ў дзяржаве адносна развітай была прававая навука. Да даволі значных асобаў у яе галіне ў той час адносіўся Андрэй Волан, які, дарэчы, па веравызнанню таксама быў кальвіністам. Паслом у Сойм Рэчы Паспалітай Волан абіраўся ад Ашмянскага павета. Распрацоўваючы прынцыпы права, Волан бараніў агульную карысць і сацыяльную гармонію. Пры гэтым вучоны абапіраўся на хрысціянскае сцвярджэнне аб тым, што як чалавек хоча, каб да яго

адносіліся, так ён павінен адносіцца да іншых людзей. У падтрыманні гармоніі грамадства і справядлівасці ў дзяржаве асобую адказнасць Волан ускладаў на вышэйшую асобу і яе асабісты прыклад. У сваім творы “Аб дзяржаве і яе асабістых дабрачыннасцях” ён пісаў, што Вялікі князь “павінен не толькі стрымліваць сябе ад прычынення крыўды іншым, але таксама стрымліваць сквапнасць сваіх пракурораў, якія валодаюць яго маёмасцю і вядуць яго справы”. “Пахвальна тое, што маральна”, - лічыў Андрэй Волан.

Значэнне прынятых Статутаў Вялікага Княства Літоўскага заключаецца ў тым, што яны па-першае, спрыялі цэнтралізацыі дзяржавы і ўмацаванню законнасці, а па другое, і гэта я хачу яшчэ раз падкрэсліць, заканадаўча замацоўвалі асновы дэмакратычнага кіравання, абмяжоўвалі феадальнае самаўпраўства і садзейнічалі нараджэнню парламентарызму, які з`яўляецца сэрцам дэмакратыі. Менавіта таму ўсе дыктатары імкнуліся пры ўмацаванні сваёй асабістай улады знішчыць у першую чаргу парламентарызм. Па гэтаму шляху пайшла і царская Расея, дзе пасля вызвалення ад татара-мангольскага іга пачаў умацоўвацца абсалютызм.

Справа ў тым, што прабыўшы цэлыя стагоддзі пад ярмом стэпавых качэўнікаў і перамешваючыся з імі біялагічна, шматлікія рускія баяры і дваране ўспрынялі многія рысы менталітэту названых народаў. І гэта не магло не адбіцца на дзяржаўным ладзе Маскоўскага княства, а пасля і Расейскай імперыі.

Маскоўскія князі, а пасля і цары ўсё больш і больш пачалі адчуваць цяжар прысутнасці побач з сабою народа. І земска-саборная дзейнасць, якая раней была характэрная не толькі Ноўгарадскаму, але і іншым княствам на тэрыторыі Расеі, пайшла на спад. Для ўсталявання абсалютызму маскоўскімі ўладарамі былі выкарыстаны ў тым ліку дэспатычныя метады, уласцівыя татара-мангольскім ханам.

Абсалютызацыі свецкай улады ў Расеі шмат у чым спрыяла і праваслаўная рэлігія, якая сама, пачынаючы з ліквідацыі Пятром І патрыяршаства, патрапіла ў залежнасць ад дзяржавы. Усталяваўшаяся ў Расеі абсалютная манархія праіснавала там амаль дзвесце гадоў.

Вось у гэткую дзяржаву і патрапіла Беларусь у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795г.г.). І калі б не Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года, які дзейнічаў да 1840 года, і стварэнне Уніяцкай царквы, якая ў тыя гады была для беларусаў нацыянальнай, дык вельмі праблематычным было б і захаванне самога беларускага народа.

Імкненне да адраджэння сваёй нацыянальнай дзяржавы і дэмакратыі засталося ў беларусаў і ў далейшыя гады. Сведчаннем таму з`яўляецца высунуты ў 1863 годзе Кастусём Каліноўскім лозунг: “Не народ для ўраду, а ўрад для народа”. Толькі парламенцкай рэспублікай уяўлялі сваю дзяржаву ў 1918 годзе стваральнікі і дзеячы Беларускай Народнай Рэспублікі. Менавіта гэткай яна заставалася і на першым часе сваёй незалежнасці на пачатку 90-ых гадоў мінулага стагоддзя. Але, на жаль, прынятая ў 1994 годзе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь павярнула яе ў бок прэзідэнцкай рэспублікі. А пасля дзяржаўнага перавароту (лістапад 1996г.) і наогул дзейнасць парламенту была паралізавана і ў краіне ўсталявалася дыктатура адной асобы. Беларусь апынулася па метадах дзяржаўнага кіраўніцтва ў сярэднеявеччы.

І сёння, мабыць, самым жахлівым з`яўляецца тое, што дыктатар у імя сваіх

уладалюбівых амбіцый гатовы зліквідаваць і дзяржаўную незалежнасць Беларусі, далучыўшы яе зноў да ўсё той жа Расеі, дзе таксама ўзнаўляецца ўлада адной асобы. Ды абраны прэзыдэнтам Расейскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін гэта і не хавае. Ён адкрыта праводзіць паралелі паміж царскай манархіяй, уладай бальшавіцкай партыі на чале з Генеральным сакратаром і сённяшняй прэзідэнцкай рэспублікай у Расеі.

Аб адраджэнні дыктатуры ў Расеі сёння сведчаць ужо нават тыя ўрокі з першакласнікамі Пецярбургскіх школ, на якіх усхваляецца новы правадыр - Валодзя Пуцін, які нібыта таксама ўжо з калыскі быў хлопчыкам-паінькай: ніколі не курыў, займаўся спортам, быў працалюбівым і настойлівым.

Беларусь для Расеі - гэта лабараторыя, дзе адпрацоўваюцца метады вяртання да дыктатуры і стварэнне марыянетачнага праРасейскага рэжыму, які б, як жаба да вужа, лез у пастку Расейскага шавінізму.

Заканчваючы свой выступ, хачу яшчэ раз падкрэсліць, што ўсе дзеянні дыктатара і створанага ім рэжыму ў Беларусі з`яўляюцца пасля 20 ліпеня 1999 года незаконнымі, бо менавіта тады скончыўся тэрмін яго прэзідэнцкіх паўнамоцтваў. Сёння супраць дыктатарскага рэжыму ўзбуджана крымінальная справа і вядзецца следства. Таму ўжо нават па гэтай прычыне з самага пачатку не могуць лічыцца легітымнымі выбары, якія дыктатар прызначыў на 15 кастрычніка ў сваю кішэнную “Палату”. Другой прычынай нелігітымнасці названых выбараў з`яўляецца адхіленне ад іх арганізацыі законнай Цэнтральнай выбарчай камісіі на чале з Віктарам Ганчаром. Што тычыцца “”ярмошынскай кампаніі”, якая выдае сябе за ЦВК, - дык гэта ад “лукавага”.

Трэцяй прычынай нелігітымнасці названых выбараў з`яўляецца невыкананне дыктатарскім рэжымам вядомых чатырох умоў трохбаковага пагаднення. Усё гэта і дало мне падставу звярнуцца 19 верасня з гэткай прапановай да Старшыні Парламенцкай Асамблеі АБСЕ і кіраўніка Рабочай Групы АБСЕ па Беларусі спадара Адрыяна Севярына.

Нельга сапраўдныя выбары і парламент падмяняць пародыямі на гэтыя атрыбуты сапраўднай дэмакратыі.

Не хацеў бы навязваць сваіх думак канферэнцыі, але лічу, што было б правільным, каб яна ў сваіх рэкамендацыях заявіла сёння патрабаванне да Лукашэнкі пакінуць незаконна ўтрымліваемую ім пасаду і звярнулася да міжнародных арганізацый, парламентаў, кіраўнікоў і урадаў краін свету падтрымаць гэтае законнае патрабаванне. Пры гэтым, мабыць, патрэбна падкрэсліць, што гэткі яго крок з`явіўся б падставай для забеспячэння яму гарантый недатыкальнасці ў будучым.

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Апошнія падзеі ў свеце, і ў прыватнасці, вынясенне свайго вердыкту Вільнюскім Міжнародным Грамадскім Трыбуналам камунізму, як экстрэмісцкай, антыгуманнай і злачыннай перад чалавецтвам тэорыі і практыкі, падзеі ў Югаславіі і прынцыповая пазіцыя Дзярждэпартамента Злучаных Штатаў Амерыкі ў адносінах да дыктатарскага рэжыму ў Беларусі пасяляюць надзею, што Рэспубліка Беларусь павінна не толькі застацца незалежнай дзяржавай, але і вярнуцца на дэмакратычны шлях развіцця.

Я веру ў адраджэнне сапраўднага парламентарызму ў незалежнай Беларусі.

Жыве Беларусь!

# ВІНШАВАННЕ
# СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**1 кастрычніка 2000 года**

Дарагія суайчыннікі!

Вітаю вас на Маршы Свабоды!

Разумею, што на яго вас вывела вашае сумленне і заклапочанасць аб лёсе Радзімы, якая сёння стогне пад ботамі прарасейскага, па сутнасці, акупацыйнага для беларускага народа дыктатарскага рэжыму.

Але ніякая сіла не здолее перамагчы свабодалюбства і імкнене нашага народа да Волі і Незалежнасці.

Жадаю вам, дарагія сябры, вытрымкі і мужнасці.

Намаганні народа не прападуць дарма! Перамога настане абавязкова.

Жыве Вольная, Незалежная, Дэмакратычная Беларусь!

KAMUNIKAT.org

# ЗАЯВА
# СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**17 кастрычніка 2000 года**

15 кастрычніка ў Беларусі скончыўся першы акт сацыяльнай трагікамедыі пад назвай выбары ў так званы Нацыянальны Сход, які з`яўляецца кішэнным органам дыктатара. Я ўжо неаднаразова заяўляў, што так званыя выбары не могуць лічыцца легітымнымі з самага пачатку.

Па-першае, яны прызначаны ў парушэнне Канстытуцыі і заканадаўства Рэспублікі Беларусь дыктатарам, тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтвах якога скончыўся больш года таму назад і супраць рэжыма якога ўзбуджана і вядзецца крымінальная справа па факце захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам.

Па-другое, названае “мерапрыемства” даручана праводзіць групе асобаў, якія былі прызначаны на пасады яшчэ напярэдадні так званага лістападаўскага (1996г.) рэферэндума ўсё тым жа дыктатарам у абыход усіх прававых нарматываў.

Па-трэцяе, дыктатарскім рэжымам была сарваная падрыхтоўка да трохбаковых перамоў і не выканана амаль ніводная з чатырох дамоў заключанага Пагаднення, што змаглі б забяспечыць правядзенне свабодных дэмакратычных выбараў у парламент, які б валодаў хаця б нейкімі рэальнымі заканадаўчымі функцыямі.

Як і трэба было чакаць, з грубымі парушэннямі (у тым ліку і з фальсіфікацыяй яго вынікаў) прайшло і само галасаванне, што зафіксавана многімі грамадскімі наглядальнікамі і прадстаўнікамі Міжнароднай тэхнічнай місіі.

Разам з тым гасаванне паказала, што дыктатарскі рэжым ужо не мае падтрымкі народа, які, будучы маральна ўніжаным і даведзеным да галечы, па сутнасці праігнараваў так званыя выбары, нягледзячы на падман, подкуп і пагрозы з боку дыктатарскага рэжыму.

Усё гэта і дало падставу Злучаным Штатам Амерыкі, а пасля і прадстаўнікам міжнародных арганізацый даць названаму фарсу, які не мае нічога агульнага з сапраўднымі свабоднымі дэмакратычнымі выбарамі, аб`ектыўную ацэнку. І толькі расейскія шавіністычныя колы засталіся задаволенымі гэткім глумленнем над дэмакратыяй і здзекамі над беларускім народам. Прычым, пры ацэнцы так званых выбараў і на гэты раз адкрыта аб`ядналіся захапіўшыя ўладу прадстаўнікі ФСБ з самымі цёмнымі камуністычнымі сіламі, да якіх належыць і сам беларускі дыктатар.

Мяркую, што адбыўшыся фарс стаў павучальным урокам і для тых, хто праігнараваў рашэнні Кангрэсу дэмакратычных сіл аб няўдзеле апазіцыйных дыктатарскаму рэжыму структур у праводзімых ім мерапрыемствах, скіраваных на яго легітымізацыю, і прыняў удзел у так званых парламенцкіх выбарах.

Нельга не адзначыць і тое, што аналізуючы падрыхтоўку і правядзенне адбыўшыхся так званых выбараў, і некаторыя журналісты - прадстаўнікі незалежных СМІ, таксама чамусьці працягваюць называць дыктатара і ўзурпатара ўлады ў Беларусі прэзідэнтам, а Ярмошыну - старшынёй Цэнтрвыбаркама, забыўшыся пры гэтым нават узгадаць, што названая асоба пасаджана ў

парушэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь з дапамогай грубай сілы на месца, якое законна належыць знікшаму ў ліку іншых вядомых у рэспубліцы палітычных дзеячоў, бізнесоўцаў і журналістаў Віктару Ганчару.

Адбыўшыеся ў Беларусі падзеі, звязаныя з так называемымі выбарамі і вакол іх, яшчэ раз наглядна паказалі, што без адхілення ад улады па свайму складу і паводзінах прарасейскага, шавіністычнага, у адносінах да беларускага народу па сутнасці акупацыйнага, незаконна ўтрымліваючага ўладу дыктатарскага рэжыму нельга правесці ніякіх свабодных дэмакратычных выбараў. Бо дыктатар і яго паплечнікі, здзейсніўшыя за гэтыя гады цэлы шэраг злачынстваў, а таксама падтрымліваючыя іх расейскія шавіністычныя колы не пойдуць ні на якія пазітыўныя змены. Для іх вяртанне Беларусі на дэмакратычны шлях развіцця раўназначна смерці.

Таму са склаўшагася становішча ёсць толькі адно законнае выйсце: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, як адзіны легітымны заканадаўчы і вышэйшы прадстаўнічы ў краіне орган, што зноў падцвердзілі прадстаўнікі міжнародных арганізацый, павінен неадкладна прыступіць да фармавання Часовага ўрада нацыянальнага даверу, які б замяніў збанкрутаваўшую, ўтрымліваючую незаконна і працуючую на ліквідацыю незалежнасці Беларусі групу асобаў, і разам з Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь арганізаваў бы сапраўды свабодныя дэмакратычныя выбары як парламента, так і прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Са свайго боку, як Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, гатовы, згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, узяць на сябе ўсю адказнасць і прыступіць на гэты конт да перамоў з усімі зацікаўленымі сіламі ў захаванні незалежнасці Беларусі і вяртання яе на дэмакратычны шлях развіцця.

Спадзяюся на больш цеснае аб`яднанне і падтрымку ў гэтым накірунку ўсіх дэмакратычных партый і рухаў, мудрасць нашага беларускага народа. Адначасова хачу звярнуцца і да тых, хто па тых ці іншых абставінах быў уцягнуты ў дыктатарскія структуры і сёння асэнсаваў сваю памылку, вярнуцца да актыўнай дзейнасці па перабудове грамадскага жыцця на новых дэмакратычных умовах.

Спадзяюся і на паразуменне міжнародных арганізацый, парламентаў і кіраўнікоў усіх дэмакратычных краін і звяртаюся да іх з просьбай не пакінуць у бядзе шматпакутны беларускі народ і дапамагчы яму пазбавіцца ад прагніўшага, ў адносінах да Беларусі акупацыйнага, дыктатарскага рэжыму, які грэбуе ўстанавіўшыміся ў цывілізаваным свеце нормамі паводзін і прадстаўляе сабою небяспеку стабільнасці і міру ў рэгіёне.

***(“Наша ніва”, 23 кастрычніка 2000 года)***

## ЗМЕСТ


МЫ МАЕМ МАРАЛЬНАЕ ПРАВА ПРАМА ГЛЯДЗЕЦЬ
У ВОЧЫ СВАІМ СУАЙЧЫННІКАМ

АБАРОНІМ НАШ ДОМ БЕЛАРУСЬ

ЗГУБІЦЬ СУВЕРЭНІТЭТ - ЗГУБІЦЬ БЕЛАРУСЬ!

БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

СВАЮ ГІСТОРЫЮ ТРЭБА ВЕДАЦЬ, ПАМЯТАЦЬ
І Ў ЯЕ ВУЧЫЦЦА

АСНОЎНЫ ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:
СУТНАСЦЬ І ТРАГЕДЫЯ

ПАКУЛЬ БЕЛАРУССЮ БУДЗЕ КІРАВАЦЬ
ЛУКАШЭНКА, А БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІКАЙ
І КУЛЬТУРАЙ - ПАЛКОЎНІКІ, НАРОД БЕЛАРУСІ
АСУДЖАНЫ НА ГАЛЕЧУ І ПБЕННЕ

ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МАЛІТВА

ЦЯРНІСТЫ ШЛЯХ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

ЧОРНЫ ДЗЕНЬ

ЗАЯВА СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 13-ГА СКЛІКАННЯ

КАМУ СПАТРЭБІЛАСЯ САЮЗНАЕ ГРАМАДЗЯНСТВА,
АБО НА ШТО АСУДЖАЕ БЕЛАРУСКІ НАРОД
А. ЛУКАШЭНКА?

БЕЛАРУСЬ ВАЧЫМА АПАЗІЦЫІ

БУДУЦЬ ВЫБАРЫ. БУДЗЕ ВЫБАР

НАВАГОДНІ ЗВАРОТ ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

АДКРЫТЫ ЛІСТ

…КАЛІ СУМЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА
ПАСАДЖАНА Ў КЛЕТКУ

ЗВАРОТ

ПАТРАБАВАННІ КАНСТЫТУЦЫІ ПАВІННЫ
ВЫКОНВАЦЦА БЕЗДАКОРНА


kamunikat.org

ВЯСНА НАДЗЕЙ І ТРЫВОГ

АЛЬТЭРНАТЫВА ПРЭЗІДЭНЦКІМ ВЫБАРАМ -
ГЭТА ДАЛЕЙШАЯ ГАЛЕЧА, БЯСПРАЎЕ
І МІЖНАРОДНАЯ ІЗАЛЯЦЫЯ БЕЛАРУСІ

КУДЫ ЁН НАС ЦЯГНЕ?...

ЦЯРПЕННЕ ЛЮДЗЕЙ СКОНЧЫЛАСЯ

ЛІСТ У ТУРМУ

ДЫК ХТО ЖАКАЗАЎСЯ ПРАВЫМ?

ВЕРУ, ШТО БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ СВАБОДНАЙ

Я ЦЭЛЫ МЕСЯЦ МАЎЧУ

ЗВАРОТ ДА ЎРАДА І ГРАМАДЗЯН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
МІЖНАРОДНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

ЗАЯВА
СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ПРА:
ПРАДСТАЎЛЕННЕ

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА І ПРАВЫ НАРОДУ

БЕЛАРУСЬ У ЕЎРОПЕ XXI ВЕКА

ЗВАРОТ ДА СУПРАЦОЎНІКАЎ ПРАКУРАТУРЫ,
МІЛІЦЫІ І ІНШЫХ СІЛАВЫХ СТРУКТУР

ЛУКАШЫЗМ - РАКАВАЯ ПУХЛІНА,
ПУСЦІЎШАЯ МЕТАСТАЗЫ Ў СУСЕДНІЯ КРАІНЫ

ЗАЯВА

АСАБЛІВАСЦІ ДЫКТАТУРЫ І ПАЛІТЫЧНАЯ
СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ

ДА ЧАГО ПРЫВОДЗІЦЬ ПАТУРАННЕ ДЫКТАТАРАМ

ВІНШАВАННЕ СТАРШЫНІ
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЗАЯВА СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЗАРАЗА ФАШЫЗМУ

ДАКЛАД У ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ АМЕРЫКІ
НА КАМІСІІ ПА БЯСПЕЦЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВУ Ў ЕЎРОПЕ

KAMUNIKAT.org

ІСТЭРЫЯ

БЕЛАРУСЬ ПАВІННА БЫЦЬ
ВОЛЬНАЙ І НЕЗАЛЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВАЮ!

НА ЧУЖЫНЕ

ВЫСТУП НА МІТЫНГУ КАЛЯ БЕЛАРУСКАЙ АМБАСАДЫ

ВІНШАВАННЕ IV КАНГРЭСУ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ

ПРЫЙШОЎ ЧАС ПАКАЗАЦЬ: МЫ ТАКСАМА ЛЮДЗІ!

УСЕБЕЛАРУСКАМУ З`ЕЗДУ

ВОЛЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

ВЫСТУП НА З`ЕЗДЗЕ БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫКІ

ВЫБАРЫ ЦІ…ЛЕГІТЫМІЗАЦЫЯ РЭЖЫМУ?

СПЫНІЦЬ НАСТУП ДЫКТАТУРЫ!

УЗНІКНЕННЕ ПАРЛАМЕНТАРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ

ВІНШАВАННЕ СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА
САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

KAMUNIKAT.org